

Уладзімір
Саламаха

# Цяпло чужога сэрца

Аповесці
Апавяданні

МІНСК
«МАСТАЦКАЯ
ЛІТАРАТУРА»
1990

ББК 84Бел7
С16

Рэцэнзент Леанід Дайнека

Какой бы ни была сложной судьба, человек преодолевает ее, если ставит перед собой конкретную цель. Об этом повесть «Дамба», герои которой живут и трудятся в первые послевоенные годы. Поиск молодыми людьми своего места в жизни, первая любовь, радости и разочарования — через все это проходят герои повести «В начале весны».

Повесть «Тепло чужого сердца» и рассказы посвящены современности. Автор (род. в 1919 г. на Могилевщине) исследует проблемы экологии, остро ставит вопрос об ответственности человека за свои поступки.

С $\frac{4702120201-134}{М 302(03)-90}$ 28—90

ISBN 5-340-00442-2

У. П. Саламаха. 1990.
© Л. М. Шукалюкаў.
Афармленне. 1990.

# апоьесці





# Дамба

## 1

У той год рана з Нямкоўскіх балотаў пацягнуліся гусі ў вырай. Іх доўгія кліны шарэлі ў блакітным небе, а журботнае гагатанне чулася з вышыні, заглушаючы ціхае трапятанне жоўта-чырвонага лісця, што сыпалася пры кожным подыху ветру на прыхопленую за ноч халаднаватай скарынкай зямлю.

Рана і зіма легла ў той год. Як пасыпаўся мяккімі белымі вохлапкамі снег з нізкага цёмнага неба ў апошнія дні кастрычніка, так і не спыняўся, за рэдкімі перапынкамі, ажно да паловы лістапада.

За снегам людзі не заўважылі, як счарнела, скруцілася ў трубачкі лісце, як пакрылася лёдам рэчка, як, нібы акрэслены шэранню, пабліжэў далягляд — яны быццам прагледзелі канец восені і пачатак зімы.

За два тыдні снег вырас да падстрэшша скасабочанай пуні, якая чарнела наводшыбе Буды — пуню перасыпалі і зладзілі з абгарэлых бёрнаў мужчыны яшчэ летам, — зраўняўся са свежым зрубам калодзежа сярод вёскі, ухутаў мяккай белай коўдрай чэзлы лазняк і навіс цяжкімі сіняватымі шапкамі на разлапістых старых дубах ля дамбы. Ён засыпаў больш як напалову стажкі ў лузе за Дабаснянкай, зраўняў рэчку і мост.

І раптам праяснела. Пачысцела каламутнае неба. Спачатку ў пралысінах з'явілася вялізнае ружовае сонца, праз дзень-два ачысцілася ад хмар, стала высокае-высокае.

Вецер зусім сціх, нібы выдахся. Снег наўкола каляна заблішчэў. Цяпер далёка чуліся галасы дзяцей на рэчцы, залівісты брэх сабакі і шоргат палазоў, іржанне ко-

ней у пуні і мэканне казы, рып старога калодзежнага жураўля над новым зрубам.

У паветры востра запахла ніШчымнымі дымкамі, якія шызымі высокімі слупамі ледзь узнімаліся ад зямлянак, горка-даўкаю сажаю, што, чарнеючы, віхурылася з каміноў былых буднянскіх хат па абодва бакі некалі доўгай вуліцы. На коміны садзіліся вароны, узнімаючы вусцішны згэлк.

Вёска, якая, здавалася, калі ішоў снег, вымерла, цяпер, у пагоду, нібы абудзілася ад сну, і гэтае абуджэнне нагадвала водгаласкі некалі сапраўднага жыцця па мінулым часе людпага селішча.

Такою пароюо трое буднянцаў Яўхім Баравец, Міхей Міхасёў і Мікола Бязродны меліся ехаць на санях за рэчку па сена.

Там, за Дабаснянкай, у заліўным і топкім лузе напачатку восені яны скідалі тры стажкі — на большае не хапіла сілы і часу — сена тады нельга было звезці ў вёску: да маразоў туды з канём ходу няма, грузне ледзь не да жывата, ды і чалавек, калі касіў, цаляў на купіну.

Тады, у сенакос, коней у вёсцы не было. Гэта пазней, як вайна адкацілася далей на чужыя землі, Міхей, былы партызан — яго не ўзялі на фронт, бо не загаілася яшчэ рана, якую ён атрымаў, як нашы наступалі сюды — неяк прывёў з раёна парку карослівых нямецкіх коней, якіх там далі на разжытак гаспадарцы.

Вядома, як з'явіліся тут коні, можна было па мёрзлым з'ездзіць на луг, але мужчыны гэтак не зрабілі. «Будзе ім яшчэ час нам рукі падмяніць, — казаў Яўхім, — дужа ж далікатныя коні...»

Тыя коні, можа, і былі далікатныя, пакуль іх не ўпрэглі ў ваенныя лямкі, цяпер жа ледзь цягалі ногі, ды і кароста... А на першы час ля пуні меўся стажок накошанага сена ля дамбы. Гэтага сена, ашчаджаючы, якраз хапіла да сённяшняга дня.

Цяпер коні, не раз абкураныя дымам, вычышчаныя ад каросты, былі ўга якім багаццем буднянцаў, дзе да вайны быў ладны калгас.

Учуўшы мужчын, што ішлі да пуні, коні заржалі ў цесным закутку.

Яўхім, сямідзесяцігадовы стары, сухі, як жэрдка, са зрэзаным маршчынамі тварам, з сухімі жылістымі рукамі — ён ішоў наперадзе, — пачуўшы коней, здаецца,

пасвятлеў тварам, шпарчэй зашоргаў цяжкімі ботамі па снезе, выдыхаючы клубы белай пары, сказаў:

— Го!.. Зачакаліся. Скажы ты, не было б то жывое.

На яго няпэўныя словы ніхто не адказаў, ды і казаў Яўхім больш да сябе. У руках ён трымаў старую, з чорнай расшчэлінай уздоўж, драўляную лапату, на якой звычайна садзяць у печ хлеб.

Ля пуні боты Яўхімавы зашоргалі па снезе яшчэ хутчэй, здавалася, спяшаючыся, ён не паднімаў ног, а слізгаў імі па снезе — і раптам спыніўся, крэкнуў, уторкнуў лапату ў шорсткі снег. Крыху пастаяў у нейкім аднаму яму вядомым роздуме, потым таропка пацёр чырвоныя рукі, устрасянуў плечуком, як маладзён, затым схапіў лапату і пачаў адкідваць снег, якога за ноч намяло да варотцаў.

— Скажы ты, дзядзька, — гледзячы, як спорна шоргае лапатай, адкідваючы далей вялізныя снегавыя шапкі, заскакаў побач Мікола, — які снег. Я дык і не памятаю, ці была калі такая зіма.

Мікола грукаў па ўмёрзлым драўлянай нагой, пакідаючы ямкі, здавалася, што гэтая драўляная нага балюча ўпіваецца яму вышэй калена ў жывое, таму ён і скача.

— Можа, калі і была, — заспакойна, на хвіліну спыняючыся, каб перадыхнуць, сказаў стары. — Толькі і я не памятаю такой зімы не толькі тут, а і наогул у сваім жыцці. Не буду маніць.

Сказаўшы так, Яўхім зноў узяўся за лапату.

Яўхім Баравец быў цяпер самы стары з буднянцаў, што летам сорак трэцяга года ўратаваліся ад гібелі, калі немцы палілі вёску. Тады мала хто пазбег смерці: некалькі жанчын і дзяцей на досвітку пайшлі ў лес, каб набраць малін і абмяняць потым на соль у барвіцкім гарнізоне. Соль пасля павінен быў Яўхім аднесці партызанам, што стаялі лагерам у Нямкоўскіх балотах. Немцы ж на вёску наляцелі пазней, а восьмай гадзіне, ягаднікаў не перахапілі.

І яшчэ жывым са старых застаўся Язэп Кучынскі. Дык яму як не ўратавацца? Яго сын Стась знюхаўся з немцамі з пачатку акупацыі і служыў ім.

Праўда, колькі дзён да гэтага, Язэп, вярнуўшыся ад сына з гарнізона, казаў, што, можа, людзі пайшлі б у лес, нешта капошацца немцы, хто іх ведае...

— Чуе сабака пагібель, лашчыцца, — сказаў нехта

з буднянцаў, якія стаялі сярод вуліцы і слухалі Язэпа.

— Чаму ета сабака? — павярнуўся на голас Язэп. — Я нічога дрэннага нікому не зрабіў.

Яўхім тады і разануў яму ў вочы:

— А таму, што скуголіш. Ведаеш, што на фронце немцам добра-такі хвост прышчамілі, дык трасешся.

— А ты скуль ведаеш?

— Добрыя людзі кажуць.

— Якія гэта добрыя людзі? — спытаў Язэп, зыркаючы з-пад рэдкіх, нібы вышчыканых, рыжых броў.

— Так я табе і сказаў! — усміхнуўся Яўхім. — Можа, шапнуць каму хочаш? Глядзі, не паспееш...

Усе, хто стаяў на вуліцы, пазіралі то на Яўхіма, то на Язэпа. А Яўхім разышоўся, з кожным словам бліжэй падступаў да Язэпа. Язэп тым часам згорбіўся, патупіўся ў зямлю:

— Дарэмна ты так, Яўхімка, да мяне. Можа, Стась і ваўкалака. А я пры чым?

— Твой корань!

— Што праўда, то праўда, — нібы здаўся Язэп. — Гэтага не адсячэш... Але ж быў час, людзі гэта ведаюць, я па завуголлі не хаваўся.

Тоўстыя сіняватыя Язэпавы губы дрыжалі, ён стараўся глядзець міма людзей. Яўхіму нават на імгненне зрабілася яго шкада. Але пры людзях ён цяпер не мог дазволіць сабе пашкадаваць чалавека, з якім некалі сябраваў, не дазваляла яму і тое, што ўжо не першы раз Язэп напамінаў пра сваё былое: нібы ўскідваў на вагі добрае і дрэннае. Дрэннае не сваё, сынава, бо сам Язэп, і сапраўды, шкоды не рабіў людзям.

— Былое — не сцяна, не схаваешся, — сказаў Яўхім, — было — сплыло, як вада ў рэчцы. Ты пра цяперашняе думай.

— Я перад богам чысты!

— Вось гэта яму і скажаш, як час надыдзе, — холадна, адны́мі вачамі ўсміхнуўся Яўхім. — Не з ім жывеш. Я такі ж, як і ты, стары чалавек, можа, таксама адной нагой стаю ўжо там, але няма яго, бога. У немцаў на спражках напісана «З намі бог». Калі ён дазваляе смерць, здзекі, дык які гэта бог? Сярод людзей жывеш, па-чалавечы гаворыш, перад людзьмі і адказ трымаць будзеш. А мы, — ён павярнуўся да вяскоўцаў, — асцерагаемся, каб ты ведаў...

... — Яно добра, што снегу столькі насыпала, — ска-

заў Яўхім. Ён скончыў работу, паставіў лапату да сцяны. Высокі, роўны, з сівой, латачком, аб'інелай вакол бяззубага рота барадой, з маленькімі вострымі вачамі і апалымі шчокамі, ён паглядзеў наўкола, дадаў: — Маё вам слова, калі на вясну расстараемся насення ды засеем клінок на грудку ля дамбы, восенню будзем з хлебам.

— Далёка ідзеш, а пад ногі глядзі, — усміхнуўся Мікола. — Тут хаця б пра сённяшні дзень не думаць. Яшчэ і да стажкоў не дабраліся, а ты, дзядзька, нас ужо будучым хлебам корміш.

— Клопат — стажкі, — сказаў Яўхім. — Снег трымаецца моцна, хоць ты таўкачом скарынку ламі. Але трэба ўжо сена звозіць, коні мох павыскубалі са сцяны, салому са страхі цягаюць. А там у лузе — сена, як чай.

— Снег, снег, — умяшаўся Міхей, — от як накоціцца паводка, дык будзе табе снег!

— Гэта чаму? — спытаў Мікола. — А дамба навошта? Як накоціцца вада, так і адкоціцца.

Яўхім не стаў слухаць далей, каўзануў руку ў кішэню штаноў, адкінуў палу доўгага шэрага шыняля, дастаў ключ, збіў рукавіцай снег з іржавага цяжкага замка, шчоўкнуў ключом.

У пуні пахла прэллю, было паўзмрочна. У цемры слаба вымалёўваўся закуток, слізганулі па сцяне два доўгія цені, падаліся да людзей.

Тут, у пуні, драўляная Міколава нага грукала так гулка па намерзлым праходзе, нібы ў якой скрынцы, і Яўхім ад гэтага аж сцяўся — ён не мог спакойна глядзець на гэтага скалечанага чалавека, маладога, у самой сіле. І каб не думаць пра гэта, стары хутчэй падаўся да стойлаў, лагодна пагладзіў цёплыя шыі коней, прыгаворваючы:

— Цярпіце, цярпіце, каб жа была якая крошка...

Яўхім развёў перад коньмі рукамі, нібы яны маглі разумець, потым адкінуў завалы, накінуў вараному аброць, пацягнуў з цемры. Белага пакінуў у стойле, той заржаў, пачаў трывожна хадзіць з кута ў кут.

— Бачыш, фанабэрыцца, — сказаў Міхей, — далікатны, няйнакш які афіцэр на ім гарцаваў. Як вёў яго з раёна, дык усё стараўся схапіць мяне зубамі за плячо. Але так я яму і даўся, прыструніў уражыну як след!

— Ну і дзяўбень, — нязлосна сказаў Яўхім, — гэта ж жывёла, што яна разумее? Ёй адно каго вазіць, ці нем-

ца, ці цябе. Яе пакармі, дагледзь, ды ў работу. Конь без работы псуецца. Хопіць яшчэ і варанному, хопіць і беламу.

Міхей, пачуўшы такое, разгублена залыпаў вачамі, відаць, ён меў намер пажартаваць, развеяць папурасць, але стары яго жарту не прыняў.

На двары Яўхім моўчкі, думаючы пра нешта сваё, надзеў каню хамут, падвёў да саней, запрог. Потым лёгенька ўскінуў у сані жоўты, як свечка, пакручасты пагубень, згроб скукарэчанымі рукамі наледзь з нямецкага шыняля, тужэй зацягнуў на поясе сырычку, пахукаў на ахаладзелыя рукі, сказаў, зноў вяртаючыся да ранейшага:

— Ге-е!.. Не журыцеся, хлопцы, будзе хлеб. Куды ж без яго? Вайна не сёння-заўтра скончыцца. Столькі ўсяго прахам пайшло! Помачы пакуль нам нямашака ад каго чакаць, наадварот, мы павінны памагаць. Тут ужо нікуды не дзенешся.

— Павінен быць, — пагадзіўся Мікола. — Але ж, землі нашы якія... Я ж, пакуль нагу мне не адчыкрыжыла, дык ці не па ўсёй Украіне прайшоў. Там зямля тлустая, хоць на скібу намазвай. Толькі кінь зерне ў яе. А ў нас што? То затопіць, то ссушыць, адно слова, пясочак...

Мікола змоўк, як параненая птушка заскакаў вакол саней.

— Яно, можа, і так, — пагадзіўся стары, — але ж нечага і нам грашыць. Гэта па цяперашнім часе пасеялі клінок азіміны ля рэчкі, сняжок яе цёпла ўхутаў, не вымерзне. А яравыя — будзе бачна. Нешта ж прыдумаем, добрае і нас не міне. Скончыцца вайна, калгасы пачнуць станавіцца на ногі, во і коней нам далі на разжытак, не можа быць, каб зерня не далі па вясне. У бядзе-горы не адны мы, але ж глядзі ты, тым-сім і нам памагаюць. А вось каб гэта цяпер дзяцей падтрымаць ды Кацю. Па добрым часе ёй цяпер за дзвюх трэба сілкавацца... Як падумаеш, дык сціскаецца сэрца, хоць ты плач.

— Тут, дзядзька, нічога не зменіш, — сказаў Міхей. — Ці ж у аднаго цябе баліць?

— Ведаю, ведаю гэта. Мабыць, ужо так на раду ёй напісана, планіда яе такая, як казалі даўней. Як насланнё. Тады свёкар і свякруха, бацька, а цяпер вось і Пятрок...

— Планіда, кажаш? — падышоў да яго Міхей. — Ця-

пер ва ўсіх нас адзін лёс-планіда. Гэта як луста з аднаго бохана, адзін смак.

— Што праўда, то праўда... Толькі грэх нам менш пра яе руліцца, чым пра сябе.

— Але ж, — уздыхнуў Мікола, — я з яе Петраком дык і не бачыўся. Ды і Міхей таксама. Я вунь дзе быў — аж у Крыму, а Міхей пераправу праз Бярэзіну ладзіў, як Пятрок завітаў. Аднаго цябе ён з мужчын, дзядзька, і пабачыў.

— Але, аднаго... Пятрок ведаў, што вы жывыя, я казаў яму, дужа хацеў ён пагаварыць з вамі. Казаў, што вайна хутка скончыцца. Казаў, што і яго, як і цябе, Мікола, добра-такі пакруціла. З-пад Бабруйска да Мажайска з акружэння выйшаў. І на засады напорваўся, і па мінных палях ішоў. Хаця б дзе шкрабанула. І ў рэйды ў тыл хадзіў, і ўзнагароды меў. Іх жа, як на мой розум, за так не даюць.

— Не, за так не... — сказаў Мікола.

— Я вось багата пражыў, — працягваў Яўхім. — І дрэннае бачыў, і добрае. Але ж ніяк не зразумею, як іншы чалавек можа насіць у сабе столькі зла...

— Ты пра Стася? — спытаў Міхей. — Не называй яго чалавекам. Гадзюка, як яе ні грэй запазухай, усядно ўджаліць.

— Я не пра гэта, — перабіў яго стары. — Не ад гадзюкі ж ён нарадзіўся. Я так разумею, што ўсе людзі нараджаюцца аднолькавымі, хоць кажуць, што яблык ад яблыні далёка не коціцца. І плачуць малыя аднолькава, і смяюцца, і птушачак шкадуюць, і кветачкамі мілуюцца. А вось вырастаюць... Як зразумець гэта? Тут хоць тры жыцці пражыві, а не даведаешся... Вазьмі ты Стася. Хто мне скажа, дзе ён пераступіў мяжу між добрым і злым?

— Ты, дзядзька, бачу, хочаш дакапацца, чаму Язэпаў сын да немцаў пайшоў, чаму стаў ізвергам, — сказаў Міхей. — Я і сам думаю чаму? Іншы раз здаецца, варта чалавеку аступіцца адзін раз, далей ужо яго пацягне, як у вір... Можа, тут далей трэба глядзець, трэба паглядзець на Язэпа. Кажаш, яблык ад яблыні... Не намі прыдумана. І, мабыць, людзьмі не дурнейшымі за нас, так мовіць, выцякае з чалавечага вопыту.

— Што гэта мы пра адно ды пра адно, — перабіў яго Яўхім. — Ат, давайце лепш закурым, янчэ і нагаворымся і наробімся.

Яўхім палез у кішэню, нязграбнай пяцярнёй дастаў шчопаць тытуню, ашмёткі пажоўклай нямецкай газеты, павярнуўся да Міколы і Міхася:

— Курыце.

Міхей глянуў грэбліва на паперу:

— Зноў, ты, дзядзька, сунеш нямецкую. І як ты гэты тытунь з яе смокчаш? Немцам смярдзіць!

Між тым Міхей рукі не адняў, узяў тытунь, скруціў цыгарку, зацісуў яе між пальцамі, выставіў, нібы паказваў каму дулю, цвыркнуў слінай.

Яўхім пазіраў на ўсё моўчкі, калі ж Мікола паднёс Міхею запалку і той салодка зацягнуўся, стары кінуў:

— Бач ты, немцам яму мая табака смярдзіць! А мне — мёдам?! Я вінаваты, што ў мяне, акрамя гэтае гадасці, нічога няма? — ён рэзка, нібы хацеў парваць, шкуматнуў полы нямецкага шыняля.

Гэта ўжо быў не жарт. Міхей разгублена пацісуў плячамі, адступіў на крок, паглядзеў недаўменна на Міколу, шукаючы падтрымкі.

— Хопіць! — сказаў Мікола. І да Міхея: — Калі ў цябе ёсць добрая папера ды шыкоўны палітон, дык дай дзядзьку. Ай, у гэтай апратцы не пазнаеш яго! А я пазнаю!..

— Так, так, Міколка! Я што, немцу служыў, што ён мяне так? — аж затросся стары. — Ці ж я не хадзіў у раён, каб забралі на фронт? А там — не, нягеглы, як пячатку паставілі на лоб! А як ты ў лесе быў, чаму мяне не мінаў? Чаму тады я табе быў патрэбен? А цяпер ужо я немцам смярджу яму!

Яўхім разышоўся. Здавалася, што ён вось-вось схопіць Міхея за каўнер.

— Ды кінь ты, дзядзька! — сказаў Міхей. — Будзя, трэба ж часам і пасмяяцца. Нібы не ведаю, колькі ты дабра нам зрабіў.

— А ты мяне не ўлагоджвай!.. Скажы ты, немцам яму ад мяне патыхае. Ты лепш да Язэпа прынюхайся... Бач, моду займелі, бацька за сына не адказвае. З цябе свет гарыць, Мікола, ты ж так казаў?

— Казаў.

— Не мой сын Стась, не я яго гадаваў, а Язэп, бацька яго. І глядзі ты, ніхто Язэпа не чапае. А ён пад тую марку недзе месяц пабадзяўся, ты спытаў дзе? І як вады ў рот набралі, маўчок! А ты спытай у яго, чаму ў яго дымок скаромны, а не такі, як у Каці? Думаеш, у

Язэпа камора пустая і, як у мяне, мышам няма што тачыць?

Стары пераходзіў ад адной гаворкі да другой, ён ужо забыўся, што пакрыўдзіла асабіста яго, яго ўжо крыўдзіла, што гэтыя маладыя мужчыны не звяртаюць увагі на Язэпа Кучынскага, а з яго кпяць іншы раз.

Конь ішоў вуліцаі, скіраваны да месца, мінаў зямлянкі і чорныя, засыпаныя снегам каміны, набліжаўся да хаты Язэпа, якая стаяла наводшыбе.

Спрэчка аціхла так жа нечакана, як і ўсчалася. Яўхім плёўся за санямі, Міхей крыху воддаль ад яго, часам скоса зіркаючы ў бок старога. Мікола чыкільгаў побач з канём, трымаў наматаныя вакол правай рукі лейцы.

— Замяло, замяло, — зноў сказаў Яўхім, калі конь выйшаў на цалік і пачаў глыбока правальвацца ў снег. Гэтай фразай ён нібы шукаў прымірэння з мужчынамі, бо адчуваў сябе ў нечым вінаватым перад імі, разумеў, што пагарачыўся. Полы яго шыняля, пакідаючы дзве крывыя баразёнкі, цягнуліся па снезе.

— Ага, замяло, — сказаў, прыпыняючы хаду, Мікола. — Трэба нешта думаць з хлебам.

Тым часам сані параўняліся з хатай Язэпа Кучынскага. Яўхім і Міхей паглядзелі на яе непрыязна. Старому здавалася, што хата падобна на самога Язэпа: вокны глядзяць падслепавата, нібы яго вачамі, нізкая, нязграбная, як ён сам. Яўхіму падалося, што за наледдзю акна, якое выходзіла на вуліцу, нібы мільгануў цень.

— Паслухай, Мікола, — сказаў Міхей, — а што, калі ў яго хлеба папытаць? У яго павінен быць. Нешта ж восенню цягаў у мяшэчку з горада.

Пачуўшы гэта, Мікола як спатыкнуўся. Спыніўся і Яўхім, паглядаючы на яго.

— У Язэпа? — раптам прысеў Мікола і тарkануў пугаўём у бок хаты пад старой вялікай ліпай.

Міхей не адказаў.

Мікола толькі цяпер заўважыў, што драўляная нага глыбока правалілася ў снег, паспрабаваў яе выцягнуць, але адразу гэта яму не ўдалося. Тады, пераводзячы дыханне, збіраючыся з сілай, ён сказаў:

— Ці чуеш, дзядзька, што ён плявузгае?

Мікола сціснуў кулакі, аж пабялелі пальцы, і раптам закашляўся, яго грудзі пад шынялём закалаціліся,

ірвануў драўляную нагу са снегу, выскачыў на цвёрдае.

— Аддалі б, як разжывёмся, — нібы падтрымаў Міхея нечакана Яўхім.

— А цябе, дзядзька, я не разумею, — сказаў Мікола. — То ты на Язэпа, то...

Мікола закашляўся, сагнуўся, абхапіў рукамі грудзі, пачаў паволі апускацца ў снег. Кашаль хутка даводзіў яго. Мікола схапіў прыгаршчы снегу, прыклаў яго да твару. Але гэта не дапамагала.

Яўхім і Міхей падбеглі да яго, падхапілі пад пахі, паднялі.

Мікола ўзняў галаву, паглядзеў на іх вільготнымі вачамі, як выдыхнуў:

— Не трэба... Чуеце? Ён ад нас адвярнуўся, а вы...

Ён не хутка супакоіўся, а калі супакоіўся, заскакаў да саней, перакуліўся ў іх, схапіў лейцы, закруціў імі ў паветры:

— Но!..

Конь ірвануў з месца, Мікола расцягнуўся ў санях. Яўхім і Міхей павярнуліся адзін да аднаго: Яўхім у нямецкім шынялі, Міхей — у нашым.

— Але чаму ты так на мяне глядзіш? — сказаў Яўхім. — Ды я...

Ён з усяе сілы рвануў за полы шыняля, лопнула, перацёртая на поясе, сырычка. Здалося, стары вальней уздыхнуў, потым крыкнуў:

— Ды хай гэтае непаразуменне возьмецца сінім полымем!.. — і, не чакаючы адказу, пабег даганяць сані.

Пра што ён казаў, пра шынель ці пра няпэўнасць сваіх адносін да Язэпа, не было зразумела.

## 2

Язэп Кучынскі, з-за якога між мужчынамі ўзнікла спрэчка, жыў адзін. Яго хата стаяла наводшыбе, ля дамбы. Язэп стараўся не паказвацца на людзі.

Ужо колькі гадоў ён не спаў як след начамі. Варта было яму толькі вечарам укласціся ў настылы драўляны ложак, заплюшчыць вочы, як цяжкія думкі роем круціліся ў галаве, наслойваліся адна на адну. Былі яны няпэўныя, здаецца, ні пра што канкрэтнае, але гнялі, вярэдзілі душу і, урэшце, тычыліся цяперашняга яго становішча.

Язэп адчуваў сябе адзінокім, як палявая былінка.

Як ні мяркуй, а несці табе свой цяжкі крыж да скону. І, можа, калі і памрэш, ніхто не памяне цябе добрым словам, ніхто не дагледзіць тваю магілу.

Калі ж і ўдавалася заснуць, то звычайна пад раніцу, як спакутуецца душа, як сам сабе знелюбееш, калі мо ўжо соты раз асудзіш сябе, што нарадзіўся, што жыў, пусціў на свет таго, каго праклялі людзі.

І прачынаўся ён заўсёды ад няпэўных, але страшных сноў, у якіх ад некага ўцякаў, але так і не мог уцячы.

Звычайна, прачнуўшыся, ён разважаў так: ад сябе ўцякаў, ад лёсу. А хіба ад яго ўцячэш, хіба перайначыш тое, што было?

І на гэты раз ён прачнуўся зацемна, толькі ў сне сёння ні ад каго не ўцякаў, а як за ім беглі, нібы сеў ля дамбы і чакаў, калі дагоняць. Вось толькі не памятаў, ці дагналі, ці схапілі яго, а калі схапілі, ці адбіваўся, ці казаў што ў сваё апраўданне.

Ён ляжаў у мулкім, пабітым шашалем ложку, пазіраў праз акно ў цемру, чакаў, калі пасвятлее, хоць ведаў, што і гэтая раніца, як і папярэдняя, нічога не зменіць у яго жыцці.

Святло ў хату ўлівалася паступова. Калі быў марозны ранак, як сёння, яно спачатку высвечвала насупраць ложка акно: на яго абледзянелыя краі нібы знутры спачатку насоўвалася тоненькая светлая палосачка, потым яна рабілася зялёна-празрыстай, шырылася, пачынала чырванець. Пасярод шыбы, там, дзе менш намярзала, пакалыхваўся жоўты сонечны зайчык.

Калі чырвань залівала наледзь, шэрань, як цень, саслізгвала з падлогі на столь. Чорная столь, здавалася, цяжэла яшчэ больш, нібы апускалася ніжэй.

Сцены, крутыя бакі бёрнаў, адлівалі чарнатой, аж пакуль на падлозе льга было бачыць чыстыя, нікім не запэцканыя маснічыны.

Узоры хутка добра вымалёўваліся на шыбе, нібы хто ўціснуў у лёд лісты папараці.

Рыпнуў ложак. Язэп цяжка ўзняўся, гупнуў на падлогу босымі нагамі, падэшвы апякло холадам. Адчуваючы холад, Язэп нават узрадаваўся, яму нібы зрабілася лягчэй на душы, нібы хто студзіў яго боль.

Басаnож ён пратупаў да печы, у паўзмроку намацаў за засланкай цёплыя, залапленыя дэрмацінам на пятках буркі, патрымаў іх у руках, вярнуўся назад.

Буркі ён паставіў пад ложак.

Нетаропка, як заўсёды, Язэп аглядаў хату, быццам прывыкаў да яе. Яго позірк спыніўся на фотаздымках у цёмна-карычневай рамцы на сцяне. Язэп узіраўся ў фотакарткі, ён нібы ў думках размаўляў з людзьмі, вобразы якіх яны адлюстроўвалі.

Вось ён з Марыляй на здымку, зробленым на кірмашы ў Добасне. Здымак зжоўк, як вераснёвы кляновы ліст. Але бачна, як Марыля і ён пазіраюць прама ў аб'ектыў, нібы вераць, што адтуль вылеціць птушка.

Цяпер яму і сапраўды хочацца пагаварыць з нябожчыцай, з некалі блізкім чалавекам, хоць з-за яе ўсё жыццё пайшло рыкашэтам. Язэпу хочацца паскардзіцца, сказаць, што ён бядуе — хоць атруты глыні.

Даўно спіць вечным сном Марыля. Здаецца, ніколі ён яе не любіў, нават не прывык да яе, а звязаны яны адным. Была Марыля — і няма яе. І няма ў яго, як на грэх, да яе жалю, адно, чужы чалавек. Памерла Марыля перад самай вайной. Ёй бы яшчэ жыць ды жыць, толькі дуплісты род Варывончыкаў, ніхто з жанчын да сапраўднай старасці не дажыў. У маладосці ўсе цвітуць, а як народзяць дзяцей, пачынаюць чахнуць, а чаго?

«Во, Марылька, — думаў Язэп, — на тым свеце ты. І нічога цяпер табе не трэба: ні зямлі, ні куфэркаў, ні сварак».

Пагаварыўшы ў думках з Марыляй, Язэп перавёў позірк правей, дзе сярод зжоўклых фотакартак зеўрала карычневая пляма. Была там раней фотакартка, была... Выдраў яе Язэп. Фотакартку выдраць можна, а як выдраць з сэрца тое, што гняце?

Зноў рыпнуў пад Язэпам ложак, стары ўстаў, выпраміўся. У вачах на момант пацямнела, яго захістала. Язэп ступіў крок, другі да акна, усё мінулася. Ступіў таму, што пачуў на вуліцы галасы.

Прыхінуўшыся да шыбы, Язэп пачаў прахукваць вочка ў зледзянелай шыбе. Лёд раставаў павольна, стары спяшаўся, і калі ўжо можна было зірнуць, паглядзеў на двор.

Па вуліцы да пуні ішлі Яўхім, Мікола і Міхей. Яўхім трымаў драўляную лапату, Міхей — сахор і жмут вяровак. Мікола скакаў следам, у яго руках нічога не было.

«Толькі пры яго сіле і здароўі рабіць», — падумаў Язэп.

Правёўшы вачамі мужчын, Язэп хуценька ўсунуў

халодныя ногі ў буркі, накінуў на плечы світку і выйшаў з хаты на падворак.

Язэп не ведаў, куды ён пнецца, пакуль не спыніўся пад паветкай і яго позірк не наткнуўся на сахор.

Ступаючы пад паветку, ён нібы адчуў дотык рук да халоднага гладкага дрэва, яму нібы запахла лугавым сенам, ён, здаецца, пачуў людскія галасы, як некалі было да вайны на сенажаці, адчуў лёгкую стомленасць і даўно забытую радасць. Хуценька, баючыся, што гэтае адчуванне раптам знікне, Язэп схапіў сахор і нібы апёк рукі — дрэва было нязвыкла халоднае, настылае.

Патрымаўшы сахор мінут колькі, няўцямна пазіраючы на вуліцу, Язэп паставіў затым яго на месца, вярнуўся да ганка.

Зноў, як у хаце, закружылася галава, засмактала пад лыжачкай — Язэп ужо каторы дзень нічога не еў, хаця есці ў яго было што. Язэп ашчаджаў сапраўднае багацце па цяперашнім часе — мех зерня, цэлы мех. Зерне ён зарабіў восенню ў горадзе, разгружаючы вагоны. Але да зерня не дакранаўся ўвесь гэты час. Можа, шкадаваў — яго толькі ў раллю, можа, адкладваў надалей: жыццё ёсць жыццё. Сёння яму не салодка, а заўтра, можа, будзе яшчэ горш.

Неўзабаве ён падняўся на ганак, не абіваючы снег з бурак, пайшоў у хату, прысеў ля акна на зэдлік, зноў праз вочка ў шыбе пазіраў на вуліцу. Пуні з акна не было бачна, яе закрывалі каміны і вялізны аб'інелы куст бэзу на агародзе.

## 3

Гэты куст бэзу быў стары. Цяпер ён быў абсыпаны бухматым інеем. Стаяў куст ад хаты крокаў за дваццаць. Пасярод агарода. Цяпер белы, як скамянелы, з сярэдзіны адліваў гнятлівай чарнатой. Здавалася, што яна ішла ад тоўстых, у руку, першародных сцяблоў. Калі доўга глядзець на гэту чарнату, здаецца, яе гнятлівасць запаўняе ўсё ўсярэдзіне, выціскае адтуль нават тыя крупінкі святла, якія цепліліся з раніцы. Яна нібы пакалыхвалася перад Язэпам, гэтая чарната, паглынаючы святло, якое лілося на куст з ружовага халоднага сонца.

Язэпу здавалася, што куст ссох, што вясною яго ўжо не кране квецень і зеляніна, што яго ўжо ніколі не абу-

дзіць птушыны гоман, ласкавы вецер і тонкія пахі не будуць плысці ў паветры, не ап'яняць лёгкім одумам.

Спруцянела голле яшчэ летам, нібы хто перасек карані. Тады лісты ўвачавідкі пажоўклі, і калі налятаў вецер, яны сыпаліся на зямлю, нібы ў лістапад.

Можа, куст ссох таму, што некалі полымя лізнула і яго — як гарэла вёска. І яшчэ Язэп часам думаў, што бэзу лёсам наканавана загінуць.

Бэз тут рос сам па сабе, яшчэ да таго, як Варывончык гэтую зямлю купіў Язэпу ў пасаг за дачку. Варывончык, як ставілі Язэпу хату, раіў выкарчаваць бэз: лепш на гэтым лапіку пасадзіць кош бульбы. А то ніякай карысці — карані смокчуць з зямлі сокі, а голле кідае цень. Але Язэп заўпарціўся, адабраў у старога сякеру.

— Чакай, ты з гэтага бадылля пад'ясі, — заступілася тады за бацьку Марыля.

Але і яе Язэп не паслухаў, аддаючы сякеру старому, прымірэнча сказаў:

— Хай расце. Дужа ж прыгожа цвіце. Не ўсё ж капацца ў гнаі.

І добра, што настаяў на сваім. Дужа ж хараша куст некалі цвіў. Вясною ён нібы кіпеў у бела-блакітнай квецені, і калі Язэп выходзіў на ганак, галава хмельна кружылася ад пахаў.

Тады Язэпа радавала, што ад старых каранёў кожную вясну цягнуцца парасткі. Куст разросся, і чым больш займаў зямлі, тым больш сварылася Марыля, можна сказаць, ела яго поедам.

Гледзячы на маладыя галінкі, Язэп думаў: няма на свеце такой сілы, якая магла б парваць тую пупавіну, што злучае куст з зямлёю, са светам.

Неаднойчы, калі сварыўся з-за чаго з Марыляй, Язэп пакідаў хату і шпацыраваў на агарод. Ён спыняўся ля бэзу, пазіраў на куст, нібы ні пра што не думаў, а цяпер ведае: хацеў зразумець, чаму вецер адшчыквае лісточкі толькі тады, калі наляціць нечакана, згінаючы куст, ломячы сухія галінкі.

І вось ссох куст. Трэснула яго пупавіна. Цяпер вось чарната сярод белі,плыве, пакалыхваецца.

Язэп з паўзмроку хаты глядзеў праз прагал у акне на адзінае, што некалі яго суцяшала, радавала, — на аб'інелы куст. Здавалася, калючы холад сціскае сэрца, і яно абмярзае, мярцвее, як гэты куст.

Бяльмо на воку, няйнакш, для ўсіх гэты бэз. А можа, толькі Язэп не мае сілы звыкнуцца з тым, што сча̃ўрэў бэз, а людзям няма да гэтага клопату? Язэпа вось яны не заўважаюць...

Што рабіць?.. Куды табе кінуцца? У каго яшчэ спагады шукаць?

Вось чакаў з нецярпеннем халадоў. Снегу чакаў. Здавалася, змена ў прыродзе прынясе заспакаенне душы. Здавалася, што снег назаўсёды зацярушыць тыя сцяжынкі, якія адмежавалі яго ад людзей.

Увосень ён хадзіў у горад, прыглядаўся да людзей, яму незнаёмых, а ўсё роўна адчуваў сябе адарваным ад галінкі з лістом...

Язэп не заўважыў, як ад дыхання шырыцца кружок, як пагляду спакваля адкрываецца ўсё больш і больш прастора. Вось злева ад куста, за чорнымі камінамі ўжо бачны рог пуні, грудкі зямлянак, над якімі ледзь пакалыхваюцца дымкі, мужчыны — яны чэпаюць за санямі.

Мужчынам можна пазайздросціць. Як цяпер ні цяжка ім, але яны ўтрох. Ён жа — адзін... «Што запляміў, не адмыеш». Яўхім так казаў. Мабыць, праўду казаў. Без яго гэта зразумела, было зразумела яшчэ даўно, калі ляжаў у гэтым кусце, калі збіраўся зрабіць тое, што не зрабіў, а павінен быў...

## 4

Лета сорак трэцяга не абмінула і Буду.

Сонечным ранкам, калі яшчэ не высахла раса на траве, у вёску ўехала некалькі крытых брызентам машын. З іх высыпалі немцы. А праз некаторы час з калгаснага клуба чуліся нечалавечыя крыкі, плач і стогны. Над зямлёй плыў даўкі дым. Языкі полымя лізалі яблыні, платы, ліпы. Яблыкі чарнелі, лопаліся, ацяжэла падалі на зямлю.

Язэп ляжаў непрытомны ў зялёным кусце бэзу, прысыпаны леташнім сухім лісцем.

Калі па хатах пачалі хадзіць паліцаі і немцы і выпорваць на «сход» буднянцаў, Стась прыбег да бацькі і сказаў, каб хаваўся.

— Так я і паслухаю цябе, вылюдак! — крычаў стары. — Бога ў вас няма!.. Што надумалі?!

— Твая справа! — гыркнуў Стась. — Прышпокнуць, як пацука, ды яшчэ і падсмажаць!

— Не, ты мне адкажы! — Язэп ухапіў сына загрудкі, затрос, адкуль і сіла бралася ў нямоглым целе.

Стась цяжка дыхаў яму ў твар, ад яго смярдзела часнаком і самагонкаю. Адразу, як стары схапіў яго загрудкі, ён утрупянеў, потым перахапіў сухія Язэпавы рукі і з усяе моцы адштурхнуў ад сябе.

Язэп кулём паляцеў у кут, стукнуўся патыліцай аб рог услончыка, спачатку асеў, потым, перасільваючы боль, падхапіўся на ногі, сплёўваючы кроў, коршакам кінуўся на сына.

Стась выставіў перад сабой стрэльбу, надзіва спакойна сказаў:

— Кажу табе — хавайся! Не паглядзяць, што ты мой бацька!

Язэпа стрэльба не спыніла, ён ляцеў на Стася, той вывернуўся, і стары паваліўся ля дзвярэй, прахрыпеў:

— Звер ты!! Які табе я бацька?.. Што людзям — тое і мне!

Язэп зноў усхапіўся на ногі, але Стась перагарадзіў яму дзверы прыкладам, а калі Язэп, агледзеўшыся, кінуўся да акна і наважыўся выбіць нагой раму, з усяе сілы пацэліў яму прыкладам пад дых, потым зацягнуў непрытомнага ў куст бэзу і прысыпаў леташнім лісцем.

Язэп апрытомнеў, калі вёска ўжо дагарала. Дыхаць яму было цяжка, дым перасядаў у горле, у грудзях, еў вочы. Твар гарэў, як апечаны, гарачыня сцягвала скуру на шчоках.

Навокал ні гуку, толькі недзе ля дамбы ў кустах жаласна выў сабака.

Лежачы на зямлі, Язэп доўга прыслухоўваўся да наваколля перш чым прыўзняць цяжкую, як налітую свінцом, галаву. І тады праз сетку галінак убачыў на месцы хат чорныя кучы галавешак і голыя слупы каміноў. У пялёнцы шызага дыму яны здаваліся жудаснымі прывідамі, і Язэп доўга не мог зразумець: ява гэта ці сон, ды зноў страціў прытомнасць.

Калі ён апрытомнеў, над зямлёй ужо ляжала ноч. Нязвыкла востра блішчэлі зоркі, чорны полаг ночы пакалыхваўся над зямлёй.

Язэпа калаціла дрыготка, хоць зямля над ім была гарачая, як чарэнь.

Першае, што ён пачуў — галасы. Яны даносіліся з яго хаты. Спачатку ён не разумеў — чые.

Ён, адштурхнуўшыся рукамі ад зямлі, узняўся на

калені. Зямля пад ім вагалася, і, каб не ўпасці, Язэп хапіўся рукою за тоўсты шурпаты сук. Вочы туманіліся, у іх не было яснасці, быццам яшчэ не апрытомнеў.

Прыслухоўваючыся да галасоў, ужо збіраючыся паклікаць каго на дапамогу, Язэп нечакана ў сваёй хаце заўважыў слабае святло, у якім убачыў невыразныя твары людзей, агідна скалануўся і са стогнам апусціўся на зямлю.

Яны!

Так, гэта былі яны... За сталом насупраць акна сядзеў Стась. Яго галава пахітвалася, чорныя ліпкія валасы навіслі на лоб і закрывалі вочы.

Часам Стась зграбаў набок іх рукой. Побач з ім сядзеў немец, трымаючы ў руцэ шклянку. Хто яшчэ быў у яго, Язэпавай, хаце, ён не разгледзеў, але па п'янай, бязладнай гамане зразумеў, што там сынавых сяброў шмат.

Лежачы на зямлі, Язэп левай рукой намацаў у кішэні запалкі, правай пачаў паспешліва скубці сухую траву, сціскаў яе ў жвель.

Ён ужо ведаў, што зробіць: падпаўзе да хаты і падаткне жвель пад страху, чыркне запалкай.

Ён выпаўз з куста і падаўся далей, да хлява. Трымаючыся за сцяну, узняўся на ногі, выпраміўся. Запахла перапрэлым сенам, сухім, як порхаўка, дрэвам, і гэта падказала яму, што спачатку ўдумае не тое: калі ён падпаліць хату, немцы ўратуюцца, знойдуць яго. Не, што заб'юць, не баяўся. Баяўся, што выскачаць, і тады ўсе яго намаганні будуць марныя.

Думаючы так, ён таропка мацаў салому пад страхой, пакуль рукі не наткнуліся на загорнутую ў анучу стрэльбу. Адразу дзе дзелася і дрыготка ў руках.

Гэтую стрэльбу, нямецкую вінтоўку, Язэп схаваў яшчэ ў сорак першым годзе, калі Стась уступіў у паліцыю, а па наваколлі пайшла чутка пра партызанаў.

Што партызаны прыходзяць у вёску, Язэп ведаў. Не адзін раз ён бачыў ноччу, як па загуменні да Яўхімавай сядзібы рухаліся чалавечыя постаці.

Вялікай здалася Язэпуануча, у якую ён некалі загарнуў стрэльбу, і калі рука адчула гладкую цёплую ложу, у скроні затахкала, і ўжо амаль подбегам ён сігануў назад да куста.

Сухія галінкі затрашчалі пад нагамі, Язэп прысеў на левае калена, таропка клацнуў затворам і хутка

знайшоў у цемры квадрат цьмянага святла, рэзка тарзануў у той бок рулю стрэльбы.

На імгненне бліснула сталлю руля, задрыжала на яе канцы мушка, нібы прывязаная за нітку. Язэп павёў стрэльбу лявей, цень куста накрыў яго. Тады ён рэзка расхіліў галінкі — і бліскучая тоненькая палосачка прабегла ад ложы да мушкі, якая цяпер паволі паўзла па квадратным лапіку святла, спынілася на Стасевым пераноссі.

Язэп, здаецца, не разумеў, што робіць, і разам з тым разумеў, што праз некалькі хвілін усё скончыцца.

Вось Стась зноў згроб з вачэй зліплыя валасы, і па яго руках прабег чырвоны водбліск ад лямпы, слізгануў па пераноссі, потым па скроні, а з яе — уніз па шчацэ.

«Няўжо ён пра мяне забыўся? — думаў Язэп. — А калі я выйду, калі ўбачаць немцы, яны ж яго па галаве не пагладзяць... А можа, думае, што і мяне ўжо няма, я для яго — пыл...»

Не, не злосць цяпер валодала Язэпам, а ярасць. Бездапаможнасць, бязвыхаднасць. Няма ў яго жыцця, няма...

Як Стась падобны на Марылю: такая ж вялікая галава, тонкія, як шнуркі, вусны, доўгі, палазком, нос. І чорныя валасы.

Язэп доўга ўглядаўся ў сынаў твар, аж пакуль аблічча таго стала раздвойвацца ў яго ўяўленні: Стась — Марыля... Марыля — Стась... І калі палец ужо ляжаў на курку, Язэп чамусці бачыў перад сабой толькі Марылю... Ён са стогнам апусціў рулю. Ён ведаў, што больш не зможа ўзняць стрэльбу, выпусціў яе, сціснуўся ў камяк і паваліўся на пакручастыя карані. Яго калаціла ліхаманка...

Успамінаючы гэта, Язэп нібы зноў перажыў той момант і зразумеў, што і цяпер не змог бы зрабіць тое, на што наважваўся... На вуліцы пачуліся галасы. Ён як праз туман убачыў каня, сані, Яўхіма, Міхея, Міколу і адхіснуўся ад акна...

## 5

Пасля спрэчкі, якую пачалі мужчыны ля хаты Язэпа Кучынскага, едучы па сена, кожны цяпер адчуваў сябе ніякавата. Яны моўчкі мінулі мост праз Дабасням-

ку, скіравалі з дарогі на цалік і цяпер паволі пляліся за санямі.

Па цаліку конь ішоў цяжка. Ён гулка ламаў капытамі снежную скарынку, глыбока правальваўся, сані ехалі паверсе. Конь выцягваў шыю, рыпеў стары хамут. Бачачы, што каню цяжка, мужчыны часам стараліся пафмагчы яму, але як дапаможаш, калі самі правальваюцца?

— Цяпер усялякаму зверу, пры такім снезе, няма жыткі, — разважаў Яўхім. — Цяпер, калі ваўкі і абложаць лася, не ўратуецца. Толькі ногі парэжа. Той жа заяц у снезе не схаваецца, калее звер і галадае.

— Што табе, дзядзька, звер? — паціскаў плячамі Мікола, цяжка клыпаючы па шарпаку. — Пра чалавека трэба думаць.

— А ты б менш размаўляў ды садзіўся б у сані. Яшчэ надзугаешся, — адказаў Яўхім.

— Сядай, сядай, — падтрымаў яго Міхей. — Дарога ўга якая не блізкая.

Мікола так і не сеў, усё клыпаў, выбіваючыся з сіл.

Заснежаныя стагі з шэрымі, падобнымі на паясы палоскамі пасярэдзіне, здаваліся, не набліжаліся. Часам, калі сані спускаліся ў нізіну, стажкі знікалі з вачэй і доўга, аж пакуль конь не ўзнімаўся на пагорак, не вынырвалі са снежнай белі. Далекаватая палоска лесу, што апяразваў луг на фоне блакітна-ружовага неба, здавалася празрыста-сіняй.

Міхей ішоў, не тулячы твару ў каўнер шыняля, часам жмурыў вочы, калі на ўзгорку віхурыў сняжок і вецер сыпаў калючы пылок у твар. Яўхім жа і Мікола туліліся. Холаду Міхей не баяўся, ва ўсякім выпадку ён так лічыў, прывучыў сябе да гэтага, не ведаючы, што ўсё роўна чалавек да холаду прывыкнуць не можа, дашто ні рабі. За час партызанскага жыцця яму не раз даводзілася мерзнуць і ў снезе, і ў ледзяной вадзе. Цяпер у лёгкай сваёй ваеннай апратцы Міхей, былы акружэнец, нагадваў байца, якому ісці ды ісці. Трапіў ён у акружэнне пад Віцебскам, на пачатку зімы сорак першага ён вярнуўся ў Буду, а потым, як пайшлі чуткі пра партызанаў, падаўся ў лес.

Бліжэй да стажкоў на шляху мужчын сустрэліся глыбокія сляды ад капытоў. Ланцужкі, прысыпаныя крыху снегам, цягнуліся ад надрэчных кустоў да стагоў, і Яўхім, прыгледзеўшыся, сказаў:

— Так... Пакуль мы, дык ласі, напэўна, спалавінілі сена.

Стагі і сапраўды былі добра паабскубаны. Міхей, скідваючы з саней на снег парубень і вяроўкі, роспачна кажа:

— Даашчаджаліся...

— А ты думаеш, дзядзька, ля пуні яно ацалела б...

— Ацалела б не ацалела, але...

Міхей узяў сахор, правальваючыся ў снег, пайшоў да стажка. Воз яны накідалі хутка. Работа прайшла няўзнак, у ахвоту. Падавалі на сані Міхей і Яўхім, Мікола ўкладваў, прытоптваў.

Калі ўціснулі воз, Яўхім параіў Міколу застацца на возе.

— Чаго вам мая нага муліць? — зазлаваў той. — Думаеце, калі я з дрэвам (ён пастукаў пратэзам па парубню), дык нічога і неварты? Можа, таму мяне старшынёй выбралі, што пашкадавалі? Не трэба мяне шкадаваць!.. Ёсць каго шкадаваць у нас, тую ж гарэтніцу Кацю...

Ён лёг набок, ухапіўся рукамі за вяроўку, прывязаную за канец парубня, саслізнуў з воза ў снег.

— Нічога мы пра цябе не думаем, — азваўся незадаволены Міхей. — Але пяклуешся. Каго вось тут шкадаваць, у лузе, чалавека ці каня?.. Ды воўк яго рэж! Будзем мы — усё будзе.

Яўхім махнуў рукой, таргануў каня за аброць, сані крануліся, цяпер ужо ломячы скарынку палазамі. Конь ішоў спяшаючыся, правальваўся, выбіваўся з апошніх сіл, хоць мужчыны і папіхалі воз.

— Я так мяркую, — праз нейкі час сказаў Мікола, — днямі трэба збірацца ў лес. Пакуль трымаецца снег, будзем траляваць бёрны. Не чакаць жа, пакуль вайна скончыцца і вернуцца мужчыны.

— Ды не сядзім мы склаўшы рукі! — запярэчыў Яўхім. — Як думаеш, Міхей?

— Як спытаюць, знойдзем што адказаць, — сказаў Міхей. — На вуліцы ніхто не жыве? Хоць зямлянкі зляпілі. Тое-сёе пасеялі... За гэта я не баюся. А вось што я скажу, што Стась тут доўга хадзіў крывасмокам? Я ж тут ваяваў, за ім тры гады цікаваў, але так і не ўпільнаваў. Як вуж між карчоў выслізгваў. Сыходзіліся нашы сцежкі. Адзін раз у Нямках, здаецца, ужо мог яго прышчаміць, а ўсядно ўцёк. У канцавой хаце сядзеў, сама-

гонку з дружкамі піў. Мы наляцелі, пакуль туды-сюды, дык ён за рэчку ўцёк.

Міхей змоўк, мабыць, успамінаў мінулае.

— Не пра гэта трэба цяпер думаць, — сказаў урэшце Мікола. — Натралюем дзерава, адну хату паставім, другую. Я вось што думаю, да наступнай зімы зраўняем мы зямлянкі, у хатах усе жыць будзем. Вядома, работы вясной будзе багата. Але ўсё ж трох мы, мужчыны... Толькі рана зброю было кідаць...

— Рана, — згадзіўся Яўхім. — Не мы на іх зямлю прыйшлі, а яны на нашу.

— Каб жа толькі яны, а тут дома ў нас усялякая нечысць завялася. Вазьмі ты, той жа Стась... — сказаў Мікола.

— Ды хопіць! — перабіў яго Яўхім. — Заладзіў, як дзяцел. Язэпа, яго бацьку, я добра ведаў, разам некалі гулялі. Маладым ён быў хлопец як хлопец. Бацькі яго гаравалі. Зямлі ў іх было, як бабе сесці. І дзяўчына ў Язэпа была бедная, гожая. З Нямкоў. І любіліся яны. А вось трэба ж, ці сам з Марыляй знюхаўся, ці зацугляла яго. І пайшло з таго часу рыкашэтам яго жыццё. Не ведаю, не буду маніць, хто ў гэтым вінаваты. Ці дзяўчына тая, ці Язэп. Быў там, у Нямках, нехта Банахват Камароўскі. Пакуль мы з Язэпам у Варывончыка жыта малацілі, дык звёў ён, Камароўскі, Язэпаву Тэклю. Язэп як даведаўся, месца сабе не знаходзіў. Хто іх ведае, можа, жыццё па-другому пайшло б яго. А як Тэклю Банахват пад вянец вёз, дык папярок дарогі выцягнуўся Язэп. Была, значыць, у чалавека душа.

— Была, ды выветрылася, — сказаў Міхей.

— Але ўсё ж мне здаецца, што пагналася Тэкля за багаццем. Банахват ладны надзел меў добрае зямлі... Не скажу вам, як Язэп з Марыляй сышоўся, не ведаю. Можа, агледзеў, што ў Варывончыка засекі не пустыя, можа, Тэклі помсціў. Тая ж замужам багата жыла. Знаю, што ў калгасе Язэп рабіў добра. Ды вы самі гэта ведаеце.

— Але, — усміхнуўся Міхей, — як было не рабіць? Цесця раскулачылі, ён і быў крывасмокам, шкадаваць не трэба. А Язэпа не кранулі, застаўся гол як сакол. Што было яму, з голаду паміраць? Цесць жа яго сям'ю на свеце трымаў: то жыта, то хаціну, то каравёнку, а потым і дзіця гадаваў.

— Во і выгадаваў, — уставіў слова Мікола.

— А што ты думаеш? Можа, і так, — раптам пагадзіўся Яўхім. — Стась людзей не любіў змалку. Бывала, сядзіць на дзедавай прызбе, есць хлеб з маслам, а побач той жа Пятрок галоднымі вачамі блішчыць. Не, Стась разламаць напалам не здагадаецца. Можа, і сапраўды Варывончыкавы адгалоскі ў яго душы былі. Я ж не забуду, як зямлю дзялілі. Тады Варывончык на сваёй дняваў і начаваў з сахорам напагатове. А не разумею, што рака назад не цячэ, калі праўве, дык прарве ўжо.

— Я думаю, — сказаў Мікола, — будзе час ва ўсім разабрацца. Вайна столькі ўсяго нарабіла, столькі лёсаў пераламала. Тут з пляча не сячы! Трэба мець яснасць. Некалі адстоіцца, асядзе муць, светлае — яно выплыве. Але разумею і так, калі Язэп па закону не вінаваты, дык вінаваты як чалавек. Ён жа бацька. Ёсць жа нейкія чалавечыя законы. Яны вякамі складаюцца. Продкі нашы па іх жылі, і нам па іх жыць, дзецям нашым.

— Я не дужа разбіраюся ў тваіх мудрасцях, — пацікнуў плячамі Яўхім. — Стары я. Мой дзень — век. Мне сёння трэба ведаць, я цяпер хачу яснасці. І не магу я адразу вось так узяць і выкінуць з свайго жыцця Язэпа. Калі Язэп вінаваты, значыць, вінаваты. Калі ж няма яго віны ў тым, што сын вытварыў, іншы клопат. І тут няма для мяне вялікай або малой віны. Віна яна і ёсць віна. Іголачка тоненькая, а балюча колецца. Таму і кідаецца мая душа з аднаго кутка ў другі. І перад вачамі то светла, калі думаю пра Язэпа, то цёмна. Я чалавек маленькі, але мне не ўсядно, што пасля мяне на зямлі будзе. Мне не ўсё роўна, як вы жыць будзеце, Каця, дзіцё яе, а яно народзіцца, павінна нарадзіцца. І мне хочацца, каб дзіцё тое вучылася хадзіць не ў зямлянцы, а ў хаце, па масніцынах, якія я пасцялю, калі паспею. Мне хочацца ведаць, якому Язэпу я ў маладосці руку падаваў: такому, як Стась, ці, можа, іншаму.

— Выберамся, выберамся мы з зямлянак, — перавёў гаворку Мікола на іншае.

— А ты не перабівай, слухай, — спыніў яго Яўхім і працягваў: — Калі ў чалавека ёсць сумленне, дык не можа быць, каб не прарвала яго. Злыя мы цяпер, злыя. А чаго, каб хто спытаў? І я адкажу: зашмат перажылі, не адталі яшчэ душой. І ніхто нас за гэта не асудзіць, бо нам і цяпер цяжка ой як! І разбірацца быццам няма калі. Але пакуль я ведаю адно: нельга жыць, трымаючы ў сэрцы зло. Ёсць крыўда і ёсць зло, ці не так?

— Па-твойму, дзядзька, па адной шчацэ б'юць, а другую падстаўляй? — засмяяўся Міхей.

— Я сваю шчаку нікому не падстаўлю, — адмахнуўся ад яго стары, — толькі злы чалавек ён і ёсць злы.

Яўхім затуліўся ад ветру, пахукаў на пачырванелыя сухія рукі, пацёр адна аб адну, узяў лейцы ў Міколы.

Мікола адышоўся ад воза, паглядзеў на Міхея, асуджальна паківаў галавой, маўляў, не чапай старога.

Міхей усміхнуўся, паціснуў плячамі:

— Ат...

Калі пад'ехалі да моста, Мікола сказаў:

— А будавацца пачнём з Каці.

## 6

Каця Грудніцкая, якой першай у Будзе было вырашана ставіць хату, стала жыць з Петраком перад самай вайной. Родам Каця была з суседняе вёскі, якую таксама спалілі немцы летам сорак трэцяга.

Да вайны будзянскія хлопцы часта хадзілі гуляць у яе вёску, нягледзячы на перашкоды: рэчка вакол яе вёскі Заброддзе ад Буды двойчы кружыла. Трэба было праз яе перабірацца, потым ісці ўзбалоткамі, усяго кіламетраў восем.

У Заброддзі, вёсцы разы ў два большай, чым Буда, меўся клуб, было багата моладзі, туды нават правялі электрыку.

Хадзіў туды гуляць і Пятрок Журавец. Хто ведае, калі ён упадабаў Кацю, можа, у адзін з ціхіх летніх вечароў, калі дыміцца ля рэчкі луг, калі зоры падаюць у траву, а можа, вясною, у час паводкі, бо прывёз ён дзяўчыну ў Буду вясною. Самай звычайнай, як усе вёсны. На гэтую зямлю прыйшла паводка — недзе ў Карпатах раставаў снег, ільды, і вада неўтаймаванымі рэкамі сцякала з гор, залівала, круціла вянцы зрубаў, узрывала грэблі, даходзіла да Заброддзя, прымушала тут упартых жыхароў перабірацца з хат на стрэхі.

З раніцы да вечара па вуліцах плавалі лодкі, веславалі мужчыны, дзеці, жанчыны, крычалі пеўні, брахалі сабакі, усё было звыклым, як год, пяць, дзесяць назад — была паводка.

Буда стаяла крыху вышэй Заброддзя, але яе таксама, пакуль не пабудавалі дамбу, кожны год затапляла паводка, толькі вада звычайна вышэй прызбаў не ўзні-

малася. Калі ж тут пабудавалі дамбу, паводка абыходзіла вёску бокам, і будняцны добрым словам успаміналі вайскоўцаў, якія дапамаглі ім пасля вучэнняў за два гады да вайны насыпаць дамбу, ці, як казалі, вал.

Апошняй перадваеннай вясной будняцны дапамагалі ў час паводкі суседзям. Чаўны і лодкі будняцаў снавалі між вёскамі. Людзі вазілі туды харч, корм жывёле, якая стаяла на ферме на ўзгорку ля лесу.

У тую вясну вынес з хлеўчука прасмоленую лодку і Пятрок, прынёс да вады і, адштурхнуўшыся вяслом, скіраваў таксама ў Заброддзе.

Высокі, шыракаплечы, з вясёлымі вачамі і добрым адкрытым тварам, ён гнаў, ажно згіналіся вёслы, лодку да далёкай вёскі, гнаў супраць цячэння, не зважаў, што раз'юшаная вада нясе бёрны, карчы, кусты, вываратні, якія, калі не быць абачлівым, могуць тараніць.

Ля вёскі Пятрок скіраваў да фермы, прывязаў лодку да старога, расшчэпленага маланкай дуба і пахлюпаў да фермы. Потым там чуўся смех, шчаслівыя галасы.

Зачасціў Пятрок у Заброддзе. А калі паступова адыходзіла вада, калі ачысціўся луг, а на грудках зацвілі вербы, узялася тонкаї зелянінай зямля, аднойчы пад высокім сонцам гайдалася лодка і наўкола чулася песня:

Жаваранак, ранняя птушачка,
Чаго так рана з выраю вылятаеш?
А там пры даліне — там ляжаць крыгі,
А там пры дарозе — снягі і марозы.
— А я тыя крыгі крыламі разаб'ю,
А я тыя марозы нагамі растапчу...

Спяваў Пятрок, і падпявала яму Каця, ведаючы, што напаткала сваё шчасце, з якім ёй жыць давеку.

І было вяселле ў Будзе. На ім гуляла ўся вёска, і быў каравай, і былі прыказкі і пажаданні, каб жыта радзіла, каб Каця любіла, каб пчолы раіліся і нараджаліся дзеці. І быў на гэтым вяселлі Стась Кучынскі. Ён нават сядзеў поручкі з маладымі і сыпаў дружкам-дзяўчатам прыгаршчамі цукеркі... А для Пятра і Каці быў заранак шчасця. А потым была позва Петраку і Стасю на службу. І разам пайшлі яны ў горад, а калі пачалася вайна, іхнія сцежкі разышліся на доўгія чатыры гады. Сустрэліся Пятрок і Стась, калі нашы вызвалілі раён. Тады камандаванне часці (яна праходзіла побач) на некалькі дзён адпусціла Петрака наведаць родных. Прыйшоў Пятрок у канцы ліпеня. І верыла і не верыла Каця

гэтаму, быццам разумела, што шчасце яе будзе недаўгавечнае.

У страху яна чакала таго моманту, калі Пятрок зноў пойдзе на вайну, нібы хто падказваў, што чакае яе нядобрае. І не пускала яна яго тады ў лес, упрошвала не ісці. Пайшоў сачыць вепра, ды там і застаўся...

У Вылазах, глухім забалочаным месцы, калі, пахадзіўшы па лесе, Пятрок сеў адпачыць на старую падгнілую калоду, нечакана на яго выйшаў Стась з сябруком-паліцаем. Як прыйшлі нашы, Стась уцёк у лес і цяпер там хаваўся. Сустрэліся яны нечакана твар у твар, Пятро нават не паспеў зняць стрэльбу з плячэй, убачыўшы Стася і яго хаўрусніка, не кінуўся ўцякаць — як сядзеў, так і сядзеў. Пазналі яны адзін аднаго. Доўга пазіралі вочы ў вочы, потым Пятрок сказаў, каб Стась адумаўся, пакуль не позна, пайшоў павініўся.

— Мне ўжо дарогі назад няма, — сказаў Стась. — Ды нікому і непатрэбна маё раскаянне. Усядно да сцяны паставяць... Ты ж за мяне слова не замовіш.

— Не, не замоўлю, што зарабіў, тое і атрымаеш, разбяруцца, у чым вінаваты, у чым — не. Толькі нельга хадзіць па зямлі ваўкалакам, нельга зло тварыць далей, — сказаў Пятрок.

Ён узняўся з месца, наважыўся яшчэ нешта сказаць, але ў гэты час грымнуў стрэл...

У гэтым Стась і яго сябрук прызналіся, калі ля Рагачова іх арыштавалі, а Петрака праз колькі дзён знайшлі ў лесе буднянцы.

Цяпер Каця адна жыла ў зямлянцы, чакаючы таго часу, калі ў яе народзіцца дзіця. Па яе падліках, гэта будзе вясной...

## 7

Пасля таго як немцы спалілі вёску, Язэп як ніколі востра адчуў сваю бездапаможнасць і старасць.

Старасці, звычайнай, чалавечай, ён не баяўся. Некалі, як быў малады, дык наогул пра яе не думаў. Здавалася, што будзе жыць вечна.

Прыдбаўшы за Марыляй палоску зямлі, ён атрымаў да ўсяго і каня. Думаў, што зажыве як хоча, пабагацее, прыкупіць яшчэ зямлі, не будзе ні ад каго залежаць. Больш за ўсё ён думаў пра гэта, пра незалежнасць.

Але колькі ён ні рваў жылы на сваёй пясчанай па-

лосцы, зерня ў засеках не прыбывала, гаспадарка не шырылася, хромавыя боты ён так і не абуў, як марыў, харомаў не паставіў. І жыў ён, як кажуць, з аглядкай на Марыліных бацькоў. Ды і жонка сіпела, што гаспадар ён нікчэмны, не тое што яе бацька, які нават парабкаў трымаў.

— Але ж, — казаў Язэп, — на яго ўся вёска горб гне, яму лацвей багатым быць з-за чужое працы.

— Не задарма ж робяць, — заступалася за бацьку Марыля.

— Лічы, што задарма...

— Ён нікога да сябе сілком не цягне, — цыўкала Марыля падслепаватымі вачамі.

— Пацягне само, калі жывот падцягне!

— Ну калі ты і надалей так будзеш варушыцца па гаспадарцы, як цяпер, дык і ў нас з сынам жываты да спіны прырастуць! Усё зіркаеш, каб бацька памог.

— Не трэба мне яго помач, — абураўся Язэп, — без яго абыдуся... Жывуць жа людзі. Кажуць, арцель арганізоўваць будуць, пайду туды.

— Ідзі, ідзі, — казала Марыля, сціскаючы тонкія вусны, — калі розум выветрыўся. Мо Яўхіма слухаешся? Дык жа ён голы, як палка. Яму лацвей у арцель ісці, на чужое. Бізула ты!.. Тады з ім па лясах туляўся, як з ланцуга сарваўшыся, бач, бандытаў лавіў, каб цябе нарадка лавіла!

— Не туляўся, а за ўладу хадзіў. Вось толькі ў цябе і тваййго бацькі не спытаўся!..

— Каб жа заікнуўся, я б табе пабегала! Галавы яшчэ не скруціў, ну добра, сваю, а маглі б і мяне, і дзіця забіць... А табе Саветы нават кавалак зямлі не прырэзалі за гэта.

— А ты хацела, каб за ўсё табе кавалак давалі! — абураўся Язэп. — І чаму я тады ў войску не падаўся вучыцца на камандзіра!

Яму ўспаміналася, як разам з чырвонаармейцамі выпорваў бандытаў з лясоў, як яго хваліў камандзір, пажылы чалавек, які нібыта ў цара служыў, а потым стаў за народную ўладу. Дык той камандзір казаў, што трэба Язэпу падавацца ў горад вучыцца, ну а пра камандзірскія курсы, мусіць, смехам казаў... Які з яго вайсковец? Куды было падацца, калі ў вёсцы жонка і малое дзіця, калі табе хутка сорак стукне?.. Можа, дарэмна збаяўся, можа, трэба было плюнуць на Варывончыкаву

палоску, пасадзіць жонку і сына на калёсы ды паехаць у горад. Ва ўсякім разе, ніхто не папікнуў бы кавалкам хлеба, ніхто не грыз бы за палоску пяску. Што яго тут трымала? Хіба што Тэкля... Дык і яна ўжо даўно была не яго, а ён не яе...

— Прыся, прыся ў арцель, —ківала галавой жонка, — там бага-а-та што дадуць табе! Аж пуп развяжацца, як дахаты будзеш несці.

Больш Язэп слухаць не мог. Ён моцна грукаў цяжкімі дзвярамі, выходзіў з хаты. Ён кіраваўся праз падворак на агарод, доўга хадзіў па палосцы, думаючы, што заўтра абавязкова пойдзе да Яўхіма, той параіць, як быць. Трэба ж яго падтрымкай заручыцца, а то яшчэ і ў калгас не запішуць. Ён жа зяць крывасмока, як тады казалі пра такіх, як Варывончык.

Але ніхто яго не папракаў. У калгасе вальней стала жыць. І хлеба паеў уволю, а перад самай вайной нават хромавікі справіў, праўда, ні разу ў іх па вёсцы так і не прайшоўся, думаў аддаць Стасю, як той будзе жаніцца. А той, як пайшоў у паліцыянты, без дазволу забраў тыя боты.

А Марыля ўсё жыццё сіпела, сіпела і чахла з кожным годам усё больш, пакуль не сканала перад вайной...

Цяпер, пазіраючы на фотакарткі, Язэп спыніў позірк на Марылі — стаіць адна ля цяжкой шырмы, паклаўшы руку на высокі столік.

Цяжкі чалавек была Марыля. Слова ёй насуперак не кажы. Хіба што цяпер... А цяпер кажы не кажы — адно, нічога не перайначыш.

Вось, Марылечка, думаў ён, не слухала ты мяне дарэмна не слухала. Нібы я і не быў бацькам тваіго дзіцяці, а так, парабак твой. Сварыліся мы з табою, было, і мірыліся. А сэрца да сэрца не гарнулася. І сына ты ад мяне адарвала, аддала яго ў чужыя рукі, бацьку сваіму аддала. Ого, той выгадаваў! Не хацеў я гэтага, як чула сэрца, што не туды паверне ў жыцці сын, як усе людзі. Ды і які я бацька, калі сваё дзіця аддаў некаму!.. Праўда, пярэчыў табе, але ж ты сіпела, што яму лепей будзе ў бацькі тваіго, майго бясхлеб'я баялася. Але ж перажылі бясхлеб'е, ці ж толькі адзін я перажыў?.. Цяпер, во, і сына перажыў... Ён, можа, і жывы, толькі ж хіба цяпер ён чалавек?.. І хлеб быў у мяне, і да хлеба было. І цяпер крыху ёсць. У каморачцы, а як жа. Цэлы мех. А ты ведаеш, што па цяперашнім часе гэта

як мех грошай, да якіх сквапная ты была? Толькі навошта мне цяпер той хлеб, тыя грошы? Хлеб той горкі, ой які горкі... Праўду кажуць, што не хлебам адным жыве чалавек... Эх, Марыля, Марыля! Мы з табой вінаваты, што са Стасем так атрымалася. Табе лёгка, ты нічога не ведаеш. А калі б і ведала, то невядома, што казала б. Толькі крываточыць сэрца ў мяне, смыліць душа. Іншы раз думаю, ці не накласці на сябе рукі? Накласці-то можна, дык хіба ж гэта выйсце?.. Ніхто мне не спачувае, ніхто мяне не суцешыць... Даруй, чужыя мы былі з табой, чужыя. Горка прызнацца: не любіў я цябе. Ды і ты мяне не любіла. Што цяпер казаць? Сам вінаваты, асляпілі вы мяне з бацькам палосачкай зямлі, сыпнулі яе ў вочы, як Тэклю страціў, пасватаўся, прадаў душу, а цяпер расплачваюся за ўсё горам. Мабыць, і мая часіна апошняя недалёка, а ўсядно так кажу...

Язэп круціў адна за адной цыгаркі. У хаце было як у смалакурні. Ён адчуваў, што зноў,як раніцою, кружыцца галава. Паціху ўзняўся з месца, апрануў стары, заляжалы кажух, пратупаў да дзвярэй.

У твар адразу, як раніцай, дыхнула пякучым холадам, ля ганка з-пад дзвярэй набівала снежнага пылу. Язэпу здалося, што гэты калючы пыл упіваецца ў твар.

У паўзмроку сянец ля дзвярэй у куце ён намацаў гальнік, потым піхнуў рукой дзверы на ганак. Яны рэзка рыпнулі, і адразу ў вочы ўдарыла бель: на імгненне зажмурыўся.

Калі Язэп расплюшчыў вочы, зноў, як раніцай, убачыў наўкола ружавата-сляпучую бель. Ён глыбока, на поўныя грудзі, уздыхнуў, быццам яму выпала адзіная хвіліна ў жыцці ўвабраць у сябе гэтую халодную чысціню, адчуў, як холад супакойвае сэрца, як вызваляецца ад вярэдлівых думак.

Упершыню за сённяшні дзень ён так ясна пачуў гукі вёскі: галасы дзяцей ля рэчкі, залівісты брэх сабакі, мэканне казы ў пуні, трэск сухіх галінак бэзу, сакатанне сарокі недзе і глухі стук драўлянага вядра па абледзянелым зрубе калодзежа.

Язэп зноў скіраваў пад паветку.

Снег суха рыпеў пад нагамі, непрыемна, нібы пясок на зубах. Ён узяў драўляную лапату і пачаў рабіць ад ганка да студні сцежку. Хутка ён упарыўся, расшпіліў каўнер кажуха, скінуў рукавіцы ў снег і з кожным крокам набліжаўся да студні.

Пракапаўшы сцежку, ён схадзіў па вядро і, задаволены работай, вярнуўся да калодзежа.

Галасы дзяцей чуліся ўжо зусім блізка, недзе крокаў за сто за спіной. Язэп не паварочваўся, толькі чамусьці яго пальцы хутчэй заслізгалі па шасце, да якога было прымацавана драўлянае вядро.

Выцягнуўшы вады, Язэп знарок нетаропка наліваў яе, наглядаючы, як вецер выдзімае ваду на снег. Галасы раптам абарваліся.

Язэп паглядзеў у вядро. Яно было няпоўнае. Другі раз чэрпаць ён не стаў, узяў за вочапку і заспяшаўся дахаты. Ён стараўся ісці свабодна, адчуваючы за сабой лёгкія, як украдне, крокі.

Вось ён ужо ступіў на ганак, ужо ўзяўся левай рукой за пякучую клямку, як у дзверы, побач з ім, бухнуў важкі лядзяш.

Язэп разгублена паставіў вядро, павярнуўся, думаючы, што з ім жартуюць, нагнуўся, схапіў камячок снегу, каб адказаць на жарт, шпурнуць у дзяцей, і, як акамянелы, знерухомеў: з-за частаколу на яго пазіралі дзве пары дзіцячых вачэй — Валік і Света. У гэтых малых вачах быў гнеў і агіда. І больш за ўсё Язэпа ўразіла, што дзеці, калі ён павярнуўся, не кінуліся ўцякаць, а Валік нават згінаецца, каб узяць другі лядзяш.

Гэта было занадта. Язэп моўчкі чакаў, што будзе далей. Ні адна жылка, здаецца, не тарганулася на яго твары. «Значыць, і для дзяцей я...»

А Валік глядзіць прама ў вочы, упэўнены, што робіць правільна, што мае права так рабіць, вось яго рука ўзнялася, вось ён ужо адводзіць яе назад, і тады Язэп пачуў жаночы голас:

— А-я-яй! Ану адыдзі! Ці ж дзед табе раўня?

Далей ён не чуў, павярнуўся, адчыніў дзверы. Ён не хацеў сустракацца з Кацяй. Ён баяўся гэтай сустрэчы.

У тую ноч ён доўга не мог заснуць.

## 8

Гэта нельга было растлумачыць. Прачнуўшыся назаўтра, Язэп адчуў на душы незвычайную палёгку. Магчыма, усяму прычынай было ўчарашняе рашэнне: пакінуць вёску.

Колькі часу ён ляжаў, баючыся паварушыцца, каб не страціць гэтую лёгкасць, уяўляў, як ногі хутка ад-

чуюць казытлівы халадок падлогі, як пачнецца яго шлях у зманлівае і невядомае, як за мяжою ўчарашняга дня застанецца ўсё яго тое, чым жыў раней, і амаль усміхнуўся.

Ён не заўважыў, як пачало віднець. Неяк непрыкметна азначыліся крутыя, як літыя, чорныя сцены хаты, павышэла столь і зашарэла падлога, ён адчуў усім целам, істотай: час.

Язэп рэзкім рухам скінуў з сябе коўдру, прайшоўся па хаце ўзад-уперад, прыслухоўваючыся да сваіх цяжкіх крокаў, акідваючы хату абыякавым паглядам.

Здаецца, цяпер зроку не было за што зачапіцца, хіба што за ўсё тую ж чорную рамку з фотакарткамі, ад якіх цяпер веяла нечым чужым і халодным.

Збіраўся ён нядоўга: паклаў у зрэбную торбачку пару сподняга, счарсцвелы кавалак хлеба, жменьку дробных галовак цыбулі, каўзануў рукі ў рукавы кажушка і, не азіраючыся, выйшаў у сенцы. Там ён у паўзмроку адчыніў дзверы ў каморку. Перад вачамі калыхалася палоска святла, што ўлівалася сюды праз вузкае, як рукавічка, акенца ў сцяне.

Святло падала на падлогу, ламалася на ёй, клалася на важкі мех у куце ля супрацьлеглай сцяны, высвечвала побач сухія жорны.

Паветра ў каморцы востра пахла пылам і пяском. Язэп пратупаў да святла, адчуваючы, як угінаецца пад нагамі падгнілая масніцына, звыклым лёгкім рухам узяўся за старую слізкую драўляную ручку жорнаў, крутнуў. Пачуўся халодны, звыклы грукат. З латачка на падлогу сыпанулася жменька пылу і пацярухі. Пылок доўга асядаў у палосцы святла.

Язэп пастаяў, потым нахіліўся, рэзка шмаргануў завязку меха і таропка, нібы хто мог яго заспець за гэтым, сунуў рукі ў цьмяную медзь зерня. Яно было сухое і прыемнае. Здалося, што запахла рошчынай. Язэп нібы пачуў звон каласоў на полі, гэтае імгненне, якое так нечакана авалодала ім, слізганула ў яго душу самай вялікай радасцю за апошнія гады, ап'яніла.

І разам з тым, стоячы так, ён разумеў, што неадкладна павінен адысці. Бо калі пастаіць тут яшчэ хвіліну-другую, сёння яму ўжо цяжка будзе здзейсніць тое, што ўдумаў учора — застанецца ў палоне цяпла і хаты, у палоне хлеба, які толькі што адчувалі рукі і якога нават не памятае калі еў уволю.

Перасільваючы сябе, Язэп завязаў мяшок і як не подбегам выйшаў з каморкі, і спыніўся толькі на ганку, накідваючы на клямку прабой. «Хай снег мяце, — падумаў ён, — можа, яшчэ каго мая стадола сагрэе...»

Ён ішоў па вуліцы не азіраючыся, не прыслухоўваючыся да сваіх крокаў, не звяртаючы ўвагі, што сляды яго ланцужком кладуцца па свежым — за ноч сцежку добра-такі прысыпала.

«Нічога, Язэп, — супакойваў ён сябе, — ты яшчэ не зломак. На кавалак сабе заробіш... Там цябе ніхто не ведае. Ніхто не будзе капацца ў тваёй душы. Усё там адыдзе ў нябыт...»

Спыніўся ён на мінуту толькі ля дамбы, акінуў позіркам высокую, выцягнутую падковай яе спіну, махнуў галавою, успамінаючы, што немцы тут пры адступленні нешта спешна капалі, ці не акопы. Але, памятаецца, так і не замацаваліся, мабыць, перадумалі.

Ужо зусім развіднела. Снег каляна блішчэў. Недзе ля берага пад снегам гулка трэснуў лёд. Звонкі гул ускалыхнуў паветра, і гэта як падштурхнула яго. Ён рушыў наперад.

Да шашы яму трэба было прайсці кіламетраў пятнаццаць, а там Язэп меўся суняць якую машыну ці падсесці на спадарожную фурманку і, калі пашчасціць, дацямна трапіць у горад.

У лесе было яшчэ паўзмрочна, не тое што на чыстым. Неба, як здавалася Язэпу, тут было крохкім, як крыга, сінявата-ружовым. Гэтая сіневатасць цяжка ляжала на вяршалінах дрэў, спакваля яна раставала, сосны бялелі, ён прыкмячаў гэта, ідучы вузкай вілюжыстай дарогай, зацярушанай снегам. Ад дрэў па сінім шурпатым снезе паўзлі цёмныя, як не вільготныя, цені, а хутка іх парэзалі бліскучыя сонечныя зайчыкі.

Ісці па вузкіх, прысыпаных снегам слядах ад палазоў было нязручна, нібы па глыбокай баразёнцы. Язэпа хістала ў бакі, і, каб не ўпасці, ён тыркаў папірачом то справа, то злева ад сябе.

Хутка ён ужо звыкся з дарогай, ступаў больш упэўнена, папірач цягнуўся збоку па снезе, пакідаючы неглыбокую баразёнку. Язэп пачаў прыглядацца навокал, праводзіў вачамі купкі дрэў, заснежаныя паляны, лысыя блішчастыя ўзгоркі, якія часам выбягалі да дарогі. На гэтых узгорках некалі сеяў калгас. У вайну яны пуставалі, зараслі асотам, утравелі.

Ён не разумеў, што глядзіць навокал не проста так, а развітваецца з усім тым, што жыло ў яго сялянскай душы ад нараджэння, што любіў, ён не ведаў, ды і не думаў, ці зможа там, у горадзе, без усяго гэтага жыць яго збалелая душа.

9

Ніхто з будняпцаў спачатку не заўважыў, што Язэп Кучынскі сышоў з вёскі. Людзям было не да яго. У кожнага хапала сваіх клопатаў, ды яшчэ і агульных па гаспадарцы.

Да вайны ў Будзе быў ладны калгас. Аднаго ворыва дзвесце гектараў. Праўда, землі тут бедныя, пясчаныя, падзол. У засушлівае лета, хоць вясною паводка і затапляла палеткі, збожжа збіралі не надта. Затое на лугах расла трава — касу не пацягнуць. Сена касілі ўдосталь і сабе, і на продаж, на выручанае куплялі хлеб. Трымалі тут багата жывёлы, пашы хапала. Жывёлу таксама прадавалі, паступова расшырылі малочную ферму, і перад вайной па лугах тут хадзіў вялікі статак.

Трымалі будняпцы і ладны табун коней. Была ў калгасе і тэхніка. Сезонныя работы тут заўсёды выконвалі ў тэрмін, людзі на працадзень па тым часе атрымлівалі добра, словам, жылі, будаваліся, гадавалі дзяцей, жанілі маладых — усё ішло як у людзей.

Перад самай вайной буднянскі старшыня Мацей Кавальчук нават збіраўся правесці электрыку ў вёску, пра гэта гаворкі было на кожным сходзе. Мацей казаў, як будзе электрыка, дык і працаваць стане лепей, і жыць весялей. Будавалі калгаснікі і свой клуб, школу, і раптам — вайна.

У першыя дні на вайну пайшлі Мацей Кавальчук, Яўхімавы сыны, крыху пазней — мужчыны ці не з кожнай хаты, хто мог трымаць зброю, меў здароўе. Тады з мужчынамі пайшоў у раён і Яўхім. Усе думалі, што ён сабраўся праводзіць сыноў, але пасля казалі, што Яўхім разам з мужчынамі стаў у строй, ды на фронт не ўзялі, сказалі, што гадок яго не той. Яўхім крыўдзіўся, даказваў, што ваяваць ён яшчэ можа, хоць сабе і ў абозе, бо без абозаў ні адна вайна не можа абысціся. Але і ў абоз яго не ўзялі, і праз колькі дзён, калі немец быў ужо зусім блізка, вярнуўся Яўхім у Буду нейкі прыціхлы, маўклівы.

А праз дзень ён пагнаў калгасных коней у раён, але па дарозе табун і Яўхіма перахапілі дыверсанты ў форме чырвонаармейцаў, загадалі гнаць коней назад, а ён пагнаў у лес. На дарогу выскачылі нямецкія танкі, і невядома, як ўратаваўся стары.

За вайну немцы разрабавалі ўсё калгаснае, ды агонь выкаціў вёску разам з людзьмі ў сорак трэцім.

Пасля, як адкацілася вайна, Міколу прызначылі старшынёй, Мацей Кавальчук загінуў недзе пад Харкавам, яго ж сям'ю спалілі — род Кавальчукоў перастаў існаваць.

Цяпер у Будзе, акрамя Яўхіма, Міколы, Міхея, Каці, Надзі Сапёрскай і яе дзяцей — Валіка і Светы, больш нікога не было, калі не лічыць Язэпа, якога ў разлік не бралі.

Буднянцы гэтым часам думалі, як захаваць коней да вясны, дзе ўзяць насенне пад яравы клін, бульбу, чым карміць людзей, дзе шукаць плугі, бароны. Неаднойчы з раёна сюды прыязджала начальства, але, акрамя добрага слова, падтрымкі не мелі людзі. Ды і разумелі яны, што не трэба ім чакаць дапамогі, а, наадварот, яе чакаюць ад іх.

Хоць вайна і адкацілася на чужыя землі, яе адгалоскі не міналі і Буду. Нямкоўская паштарка, калі завітвала сюды, дык несла пахавальныя — часта ў тыя сем'і, якіх ужо не было. Чытаючы казённыя паперы, мужчыны ўздыхалі: не толькі пераставалі знікаць з зямлі цэлыя сем'і, але знікалі і чалавечыя роды.

Не было ў Будзе роду Русінавых, вялікага, у чатыры сям'і, не было ўжо роду Іванцовых, Круталевічаў, бо хто быў у акупацыі — згарэў, а хто быў на вайне, загінуў там.

Язэпа звычайна ўспаміналі, калі раны крываточылі новым чарговым буднянскім горам, калі кожнаму рабілася нясцерпна, невыносна балюча, калі Язэпаў лёс, яго жыццё, выплывалі на паверхню. Тады ў людскіх сэрцах не было месца Язэпу, не было да яго спагады, тады хацелася, каб ён назаўжды знік з памяці, з вачэй і больш нічым не напамінаў пра сябе.

Пакуль мужчыны вазілі з засыпаных снегам лугоў сена, жанчыны і дзеці даводзілі яго тут да ладу, усцягвалі на гарышча, каб не мазоліла вока, скідалі невялікі стажок ля сцяны будыніны, абгароджвалі яго, падпіралі жэрдкамі.

Апошні вазок Яўхім, Міхей і Мікола прывезлі толькі на схіле трэцяга дня. Яны добра-такі ўрабіліся, цягнуліся за санямі панурыя, ледзь перастаўляючы ногі, і Яўхім, абышоўшы стажок, прыдзірліва агледзеўшы яго, сказаў да жанчын:

— Дзе ж вашы рукі былі, маладзічкі? Быццам па найме рабілі. Загуляе завіруха, як бачыш аберне, расцягне па полі, замяце. Як і не было тае работы.

— А там, дзядзька, і былі, — не ўцярпела Надзя Сапёрская, — дзе і былі. Не аберне, воўк яго рэж! Ці ты спадзяешся, што гэта жменя прастаіць да вясны? Ці думаеш, што жывёла святым духам сыта будзе?

Яўхім пашкадаваў, што зганіў жанчын; што з іх возьмеш, не жаночая гэта справа стагі кідаць, але, каб не адступіцца ад свайго, не сунімаўся:

— Ты на гэта не дужа спадзявайся, Надзька, святым духам, вядома, сыты не будзеш. Але ж ашчаджаць трэба, вясна чакае... А тое, бачу, што развучыліся мы рабіць за вайну, дык хіба гэта дзела!

— Хто і развучыўся, — сказала Каця, — а хто і не навучыўся. Вось што дрэнна, дзядзька. І ты не дужа на нас крычы. Гэта Валік са Светай таптаті. Калі ім было вучыцца?

Каця прыставіла да стажка граблі, паглядзела на дзяцей, якія забаўляліся ля пуні і цяпер сцішыліся, пакрыўджана шморгалі насамі: во, рабілі ў ахвоту, а іх работу зганілі, ды хто — дзед Яўхім!

— Каб жа знаццё, што гэта таптаді дзеці, — разгубіўся стары.

— А хто ж яшчэ? — сказала Каця. — Яны, можа, сапраўднага лугавога паху не ведаюць. Не па сваёй ласцы.

— Я іх не вінію, — пачаў адступаць Яўхім, — вядома, калі і ад каго ім было навучыцца? Не разабраўся я, стары чаўпень, ляпнуў... Бывала, у іх гады дзяцей сама на луг браць. Там і днявалі і начавалі. Толькі, думаю, цяпер ім не стагі трэба кідаць, а за партай сядзець, пераросткі ж. Не памятаю, ці хадзіла каторае хоць зіму ў школу?

— Калі ж было? — нібы здзівілася Надзея. — Яны ж у мяне блізняты. Акурат у сорак першым трэба было ісці ў школу. Дзякуй, Каця чытаць навучыла, я сама — непісьменная, зіму пахадзіла ў школу, ахвочая да вучобы была, але дзед насцёбаў анучай, пасадзіў за кросны. Вось і ўся мая грамата,казаў, што з навукі хлеба

не пад'ясі, трэба глядзець, каб мурог не быў зялёны, трэба палотны ткаць для пасагу.

А во, на табе, зялёны ці белы мурог, усё скруціла, усё пайшло прахам... Света добра чытае, а Валік — праз пень-калоду. Ды што ты з яго возьмеш? Падрасце хлопец, паразумнее.

Валік, пачуўшы гэта, унурыўся, адвярнуўся.

— Вось табе і маеш, — развёў рукамі Язэп, — як жа бацьку лісты пішаш?

— Ат, маўчыце, дзядзька, — Надзея выцерла слязу ражком старой вязанай хустачкі, — ці ж не ведаеце, што ад самае восені ад Ігната ні слыху ні дыху? Якія лісты? Можа, дзе ўжо і костачкі сапрэлі...

— Кінь дурное! — зазлаваў Яўхім. — Ці мала што бывае? На вайне чалавек, а не на гулях. Ты глядзі, ваб'еш яшчэ што дрэннае ў галаву і сабе, і дзецям!..

Яўхім падышоў да хлопца, паклаў яму на плячо руку, паглядзеў у твар, паспрабаваў усміхнуцца. Але ўсмешкі не атрымалася, і Валік яшчэ больш насупіўся.

— Памыляецца, Валічак, твая маці, — заступілася за хлопца Каця. — Чытаеш ты пакуль не шыбка, як коўзаешся, а лічыш добра. Падвучымся, праўда?

Апранутая ў старую выцвілую плюшаўку, у вялікія, не для яе нагі, залапленыя валёнкі, яна стаяла ля хлапчука і ўсміхалася, суцяшаючы. Два ніжнія гузікі на яе плюшаўцы не былі заплікнуты, не сыходзіліся, і было бачна, што ёй ужо рабіць і хадзіць цяжка.

— Вось аддаць бы іх у раён, у школу, — сказаў Яўхім.

— Але, дзядзька, — сказала Надзея, — каб там з нейдзі памерлі? У мяне ж нямашака чаго ім у торбачку пакласці. Тут яны пры мне, хоць і не сытыя, мне дзень святлейшы, а там — бог бацька.

— Што вам гэта бог даўся? — зноў зазлаваў Яўхім. — Набожкаліся.

— Я так, да слова. Вунь у Язэпа на куце іх некалькі, багоў. І Стась, здаецца, крыж на целе насіў. А што вытвараў?

— А стары тут пры чым? — сказала Каця. — Мы тут яго душу перамываем, а яго ўжо даўно не відаць. І дым з коміна не ідзе. Хата як амярцвела, і сцежка на падворак засыпана снегам.

— Можа, акалеў? — сказаў Міхей, падыходзячы да стажка і атрасаючы з апраткі пацяруху.

— Ну і язык у цябе! — кінуў Яўхім. — Не сабака ж. Можа, занядужаў і няма каму лыжкі вады паднесці.

— А ты, дзядзька, ідзі, ідзі, — заківаў галавой Міхей, — паглядзі, вады падай, каб ён смалы глынуў!

— І пайду, Міхейка, пайду...

Яўхім паправіў шапку, якая ссунулася на лоб, павярнуўся, пастаяў крыху, бы раздумваючы, потым рашуча пакрочыў да Язэпавай хаты.

Усе моўчкі пазіралі яму ўслед. Спачатку Яўхім ішоў вуліцай, ступаючы ў наезджанае, пахістваўся з боку на бок, потым ступіў на цалік, каб скроіць шлях, ішоў не аглядваючыся, мусіць, гонар не дазваляў, ведаў, што пазіраюць услед.

Каця наважылася памкнуцца следам, можа, не да Язэпавай хаты, можа, хацела спыніць старога, што яму сказаць, але па яе твары каўзануўся цень, яна ціхенька войкнула, прыклала руку да жывата, сцялася, прыслухоўваючыся, потым шырока адкрыла вочы і ўсміхнулася сама сабе таемна і радасна, цяпер ужо далёкая ад таго, што тут адбываецца. Яна асцярожна апусцілася на бярэмя сена, не знесенага яшчэ на гарышча.

Яўхім дайшоў да жардзяніка, перакуліўся цераз яго, мінуў аб'інелы куст, зачапіўшы голле плячом, і вось ужо яго калматая шапка ўзнялася над бэзавым кустом, мабыць, стары ўзышоў на ганак.

Усе як застылі, чакалі, што будзе далей, не адводзілі вачэй ад дзвярэй. Яўхім выйшаў з хаты мінут праз пяць, заспяшаўся назад тым жа шляхам. І калі ўжо ўсіх ахапіла нецярпенне, сказаў неяк разгублена:

— Няма яго! Няма...

## 10

Язэп Кучынскі стаў працаваць у горадзе на чыгуначнай станцыі. Работы тут было вельмі багата, можа, таму ніхто не цікавіўся Язэпам, не пытаў, адкуль і чаму ён прыйшоў сюды, дзе жыве, чым займаюцца родныя.

Ён працаваў грузчыкам, разам з ім працавалі такія ж, як і ён, летныя мужчыны, былі і падлеткі. Хоць яшчэ далёка на захадзе ішла вайна і праз станцыю ці не кожны дзень праходзілі вайсковыя эшалоны з тэхнікай, папаўненнем, тым не менш даводзілася Язэпу разгружаць вагоны з цэментам, цэглай, з іншымі будаўнічымі матэрыяламі. Яны прыбывалі з самых розных месц, і было

зразумела, што цяпер у Сібіры, у Казахстане ці Расіі паступова наладжваецца жыццё, што там робяць не толькі танкі, самалёты, гарматы, але і ўсё тое, без чаго немагчыма аднаўляць жыццё. Значыць, думаў Язэп, вайна скончыцца не сёння-заўтра, ды і, напэўна, у нас сіла вялікая, раз людзі не толькі на вайну працуюць.

Думаючы так, Язэп не аддзяляў сябе ад таго, што цяпер рабілася на свеце, яго крыху супакойвала тое, што і ён нешта робіць. Яму здавалася, што ідуць вагоны з глыбіні краіны таму, што там таксама працуюць не пакладаючы рук такія ж, як і ён, пажылыя мужчыны, жанчыны, падлеткі, ведаючы, што без іх справы не будзе. Разумеў ён, што там людзі адрываюць ад сябе апошняе, каб падзяліцца з другімі, і ім, напэўна, не лягчэй, чым тым, хто прымае іх дапамогу. «Напэўна, — думаў Язэп, — пройдзе яшчэ не адзін год, а можа, і дзесяткі, пакуль зямля залечыць раны, пакуль людзі адужаюць гора, забудуцца на яго, толькі ўжо тым часам мяне не будзе...»

Часам пасля работы ён выходзіў у горад. Горад быў разбураны, у ім, здаецца, не было ні аднаго цэлага будынка, людзі туліліся ў падвалах, у наспех збітых бараках, але ўсюды адчувалася жыццё: у нішчымных дымках, як і ў Будзе, што віліся раніцаю, у дзіцячых гульнях, якія ён бачыў ля станцыі, у тых жа натоўпах, якія, здаецца, ні днём ні ноччу не знікалі са станцыі.

Іншы раз Язэпа цягнула на рынак. Рынак, як люстэрка ўсякага горада, добра выяўляе настрой людзей, іх клопаты, сапраўднае, ні ад кога не схаванае жыццё. Тут абменьвалі ўсё, што толькі можна было абмяняць, каб атрымаць кавалак хлеба, не гаворачы ўжо аб сале ці мясе.

Хадзіў Язэп на рынак без усялякай для сябе патрэбы, каб паглядзець на людзей, пачуць іх, як жывуць, паслухаць іх гаворку. Мяняць або прадаваць што Язэп не меў, ды каб і меў, напэўна, не рабіў бы гэтага. Яму хапала таго, што атрымліваў за работу на станцыі.

Звычайна Язэп спыняўся ля сялян, прыглядаўся да іх, і калі яны пачыналі на яго падазрона касавурыцца, не бянтэжыўся, а падыходзіў бліжэй, казаў, што сам з вёскі, але цяпер жыве ў горадзе, дык яму цікава, як людзі жывуць у вёсцы.

Калі хто з мужчын падтрымліваў гаворку, спачуваў Язэпу, што ён тут, што ў вёсцы ўсё ж лягчэй цяпераш-

нім часам, Язэп казаў: «Можа, калі і вярнуся, пакуль не з рукі, у вёсцы ў мяне нікога няма...»

— Загінулі тут ці на фронце? — пыталі ў яго.

— Але, — няпэўна адказваў Язэп і, здаецца, не думаў у такі час пра тое, што было з сынам, з ім самім, з вёскай, будняпцамі. Усё мінулае для яго нібы пераставала існаваць, яго нібы не было, гэтага мінулага. Часам здавалася, што ўсё ранейшае жыццё — сон. І толькі ў рэальнасць вяртала тое, калі хто з сялян, пагаварыўшы, паціху, азіраючыся, пытаў, ці няма ў Язэпа нечага такога, за што яму можна даць колькі яек ці брусочак сала. Тады Язэп разумеў, што такі чалавек прыехаў на рынак не толькі таму, каб апрануць дзяцей, адарваўшы ад сям'і і без таго не лішнюю лусту хлеба, а з нейкай іншай мэтай. Ён ведаў, што тут нямала ёсць і такіх людзей, якія нажываюцца на чужым горы, і, здаецца, сярод іх было больш гарадскіх жанчын, трапляліся і мужчыны, якія невядома чаму не былі на фронце.

Такія звычайна рвалі ўсё, што траплялася пад рукі, за бясцэнак, а калі самі мянялі, дык абдурвалі сялян. Язэп іншы раз на свае вочы бачыў, як за акраец хлеба людзі аддавалі пярсцёнкі, цёплую апратку, усё, што толькі можна было аддаць.

Аднойчы, калі ён хадзіў па рынку і прыглядаўся, што б гэта прыдбаць паесці, яго спыніў мужчына гадоў сарака, турзануўшы за рукаў кажушка.

— Бяру кажух, — мацаў яго мужчына, — даю кавалак каніны. Ну?..

Язэп павярнуўся да таго, на імгненне застыў на месцы. Вочы прыжмураныя, бегаюць па баках, твар як акамянелы, хаця б жылка таргапулася на ім, рэдкае белаватае шчэцце на шчоках, апранены, як і Язэп, у кажух, даволі-такі паношаны, але дабротны, цёплы.

— Навошта табе, чалавеча, кажух? — знарок здзівіўся Язэп. — У цябе ж ёсць. Ды і мой памер на твае плечы не налезе. Я ж дробны, а ты спраўней, на галаву вышэй за мяне.

— А твая якая справа? — ціха сказаў мужчына. — Сабе ці не сабе хачу ўзяць. Калі ёсці хочаш, дык скідай. А не — ідзі сваёй дарогай, я цябе не бачыў.

Мужчына ўжо адышоў, як Язэп паклікаў:

— Пачакай...

Мужчына спыніўся, павярнуўся на голас, кінуў позірк з-пад густых белых броваў:

— Надумаў?

— Занадта ж дзёшава хочаш.

— А ў цябе ёсць чым іншым таргавацца? Пярсцёнак ці яшчэ што?

— Нямашака, толькі мне здаецца, лёгка табе дасталася тая каніна...

— Што? — мужчына падступіўся да Язэпа, заціснуў ў кішэні нешта. — Ды я зараз міліцыю паклічу, яны табе пакажуць, спекулянт няшчасны, як да чалавека прыставаць!

Такога нахабства Язэп не чакаў.

Мужчына ўзняў галаву, стаў глядзець па баках, быццам некага вышукваць. Язэп разгубіўся, потым увабраў галаву ў плечы, падумаў, што такі і сапраўды можа паклікаць міліцыю, тады высветліцца хто ён, Язэп, такі, не абярэшся непрыемнасцей.

Мусіць, бачачы, што Язэп разгубіўся, мужчына сказаў:

— Так што, дзядзя, давай тэпай адсюль! Недзе ж хаваў кажух, а можа, зняў з каго? Хто такі?..

Усё гэта спудзіла Язэпа, здалося, мужчына бачыў яго наскрозь, ведаў усё пра яго сына. Сапраўды, калі б не Стась, садралі б паліцаі кажух з плячэй.

Язэп заспяшаўся прэч, пакрыўджаны і абражаны не толькі такім паваротам гаворкі, але і сваім мінулым, якое адразу ясна выявілася ў яго памяці. Язэп думаў, што і тут, у горадзе, пра яго ведаюць.

Ён таропка ішоў пустэльнай вуліцай, не зважаючы, як звычайна на разваліны, не баючыся пакаўзнуцца на слізкім, ён быццам уцякаў ад нахабнага мужчыны, якому, здаецца, усё было вядома.

## 11

У той дзень Язэп доўга снаўдаўся па горадзе. Ён удыхаў горкі пыл, глядзеў на пачарнелы сухі снег, не зважаў на холад, і яму здавалася, што тут, як і дома, няма да каго прыхінуцца. Ісці ў катушок, у якім на станцыі жыў разам з трыма, такімі ж, як і сам, пажылымі мужчынамі, не хацелася. Не было між імі ніякай душэўнасці, а нейкая адчужанасць, Язэпу іншы раз думалася, што ў кожнага з іх таксама нейкае сваё гора, якое не выставіш напаказ, якое не можа мець спачування. Сам жа з роспытамі не лез, ды і яны нічога не пыталіся.

Пад вечар ён прыцёгся на станцыю, каб выпіць кубак варголы, сагрэцца.

Браўся мароз, ветру не было, але ў вышыні дым ад паравозаў разрываўся на стужкі, плыў у паветры, узнімаючыся ўсё вышэй і вышэй, раставаў у зялёна-ружовістым небе. Снег пад нагамі каляна хрумсцеў, бліпічаў кавалачкамі дробна патоўчанага шкла.

Да буфета падступіцца было цяжка. У зале тоўпілася багата людзей, цывільных і вайскоўцаў. Людзі мітусіліся, некуды спяшаліся.

Язэп, крыху адагрэўшыся ў будынку, выйшаў на перон. Тут таксама было людна. На пуцях стаялі і пыхкалі парай два вайсковыя эшалоны. Адзін з іх кіраваўся на захад, другі на ўсход. Ля эшалона, што ішоў на ўсход і нямоцна пыхкаў парай, было людна. Узад-уперад бегалі вайскоўцы. Нехта нёс у кацялку варголу, нехта нешта крычаў ахрыплым голасам, мабыць, падаваў каманду, слоў разабраць нельга было. Нехта лаяўся, размахваючы пісталетам, гразіўся аддаць пад суд буфетчыцу, якая чамусьці не можа даць пляшку. Язэп зразумеў: штосьці здарылася. Ён праціснуўся ў натоўп. У натоўпе, акружаныя цывільнымі і вайскоўцамі, стаялі двое ў армейскім. Стаялі моцна абняўшыся, нібы застылі, стаялі моўчкі і не звярталі ні на кога ўвагі. Нехта таксама праціснуўся ўсярэдзіну, стоячы побач з Язэпам, пытаўся, што здарылася. Жанчына пажылога веку, сівая, у лапленай куфайцы, не адводзячы вачэй ад вайскоўцаў, сказала:

— Ёсць нешта на свеце. Гэта ж брат з братам сустрэліся. Адзін адтуль, другі — туды. Адзін знявечаны, а другі мо на смерць едзе. Вось што робіцца... Але ж дарожкі іх перакрыжаваліся, барані іх божа.

— Як сустрэліся?

— Пытаецеся вы ў мяне, — адказала жанчына, — як людзі сустракаюцца?..

Язэп не стаў далей слухаць, яго цягнула праціснуцца бліжэй да шчаслівых вайскоўцаў, што стаялі на пероне абняўшыся. Ён, можа, упершыню за вайну быў сведкам сапраўднага чалавечага шчасця, і яму зноў захацелася верыць у жыццё, у дабро, у лёс і спагадлівасць чалавека да чалавека. Ён не ведаў гэтых людзей, ніколі іх не бачыў і не ўбачыць напэўна. Але ў яго сэрцы цяпер цяплілася радасць за іх і разам з тым нарастала трывога: адзін на фронт, другі з фронту. Вайна ж яшчэ

не скончылася, і можа здарыцца так, што гэта іх апошняя сустрэча, сустрэча братоў.

Язэп зноў ірвануўся наперад, некага адштурхнуў локцямі, стаў побач з братамі, нібы баючыся, што подых гэтага шчасця абміне яго, не закране сваёй цеплынёю.

Паравоз пыхкаў параю ўжо часцей, пачуўся нават свісток, і Язэп, углядаючыся ў твары братоў, жахнуўся, нібы маланка жагнула перад вачамі. Вайсковец у шынялі з пагонамі радавога раптам выпраміўся, нібы адштурхнуў сваё цела ад брата, узняў галаву, сцяў вусны: пазіраў сінімі-сінімі вачамі ўдалечыню. Брат, маладзенькі лейтэнант, усё яшчэ торгаўся ў яго на плячы, прыгаворваючы:

— Братка мой, дадому едзь, чуеш, дадому! Больш нікуды. Выкінь усё з галавы! Там цябе чакаюць людзі...

У радавога твар быў у ліловых цяжкіх рубцах, вусны сцягвалі сінія шнары. Гэта быў абпалены твар, які яшчэ як след не зарубцаваўся. І яшчэ ў радавога замест нагі была дзеравяшка, да якой ён, напэўна, яшчэ не прывык, бо стаяў, не абапіраючыся на яе, падцягнуўшы крыху ад зямлі. Дзеравяшка, як у Міколы.

— Божа праведны, — перахрысцілася побач з Язэпам нейкая старая, — што вайна з людзьмі робіць? За што такая кара? Закрый, божа, гэтага хлапчука...

Апошняе было сказана пра лейтэнанта, і сапраўды, на выгляд юнака гадоў васемнаццаці, няйнакш. Напэўна, ён толькі што скончыў курсы і едзе на вайну. І невядома, што яго там чакае, але што б з ім ні здарылася, пра яго людзі ніколі не скажуць так, як пра Стася, думаў Язэп.

А Стась... Ён таксама быў прызваны на вайну, а потым з'явіўся ў вёсцы. Аб'явіўся ноччу, асцярожна пастукаў у акно. У Язэпа тады так і ёкнула сэрца — сын! Дрыжачымі рукамі ён адчыніў дзверы, прывёў сына ў хату, пасадзіў за стол, нічога спачатку не пытаў. А раніцай, прачнуўшыся, Стась сказаў:

— Усё, бацька, адваяваўся я!

— Бог з табой! — сказаў Язэп. — Як гэта? У акружэнне трапіў? Дык крыху пасядзі дома, нікуды не высоўвайся. Не можа быць, каб у лясах людзі не аб'явіліся.

Стась засмяяўся нягучна, потым развёў рукамі:

— Эх, бацька, бацька! Што ты разумееш? Такая сіла

прэ, усё крышыць на сваім шляху, а ты — пасядзі. Ды каб былі жывыя дзед і баба, яны б мяне зразумелі. Саветам — капут. У дзеда з бабай усё забралі. І зямлю, і хлеб, а саміх вунь куды выслалі, дзе Макар цялят не пас. І як у ваду... А яны мяне гадавалі. Пакуль ты з Яўхімам на сходы хадзіў, дык я з голаду б тады памёр. Ды каб не Саветы, я б таксама нешта меў, лапленымі штанамі не свяціў бы. Мне ж дзед абяцаў усё на мяне перапісаць, а вы адабралі. Хопіць, бацька!

Стась моцна стукнуў кулаком па стале, ажно зазвінела шыба. Язэп здрыгануўся.

— Хопіць! — паўтарыў Стась. — Паглядзім, пад кім кладачка пераломіцца! У гарнізон пайду.

— Аксціся! — Язэп усхапіўся з месца, нахіліўся праз стол да сына, працягнуў рукі, каб схапіць таго за грудзі. Стась адшатнуўся.

— Ды хто тваю галаву затлуміў? — крычаў Язэп. — Зломіць немец хрыбет на Расіі. Што тады з намі будзе? Бацька я табе ці не?

— Раз на свет пусціў, то лічышся бацькам, — сказаў залішне спакойна Стась. — Але не ты мяне гадаваў. Ды і што ты мне даў? Так што не ты мне суддзя. Але шкада мне цябе, старога дурня. А немца нішто не спыніць, пад ім уся Еўропа.

— Адумайся, — цяпер ужо прахрыпеў Язэп. — Мала што было, ну кінуў па дурасці зброю, хто гэта ведае? Колькі ўсяго за вайну перамелецца. Падавайся ў лес, вазьмі зброю. Партызаны ва ўсе войны былі. Я тваёй ганьбы не вытрымаю!

— А дзе ты дзенешся? Жыць захочаш — будзеш трываць. А не вытрымаеш, знаць, сваё адхадзіў...

Апошняе Стась сказаў зусім адчужана. І Язэп зразумеў, што перад ім сядзіць чужы чалавек, з якім, здаецца, яго ніколі нічога не звязвала, зразумеў, што Стась ад задуманага не адступіцца не таму, што перакананы ў сваім, а таму, што ім кіруе злосць, нянавісць да людзей, сярод якіх жыў.

— Мне дарогі назад няма, я для сябе ўсё даўно вырашыў, — сказаў Стась.

— Душа твая дуплістая! — сказаў Язэп. — Гнілая, ткні пальцам — рассыпецца...

Ён узняўся з-за стала, адышоўся да дзвярэй, доўга і няўцямна глядзеў на сына, які цяпер ужо, не зважаючы на бацьку, сёрбаў крупнік.

...Усё гэта ўспомнілася Язэпу цяпер на пероне, калі пачуў, як старая, не знай не ведай вайскоўцаў, прасіла бога, каб ён адвёў кулю і агонь ад маладзенькага лейтэнанта, які едзе на фронт, насустрач смерці. Ён і не прыкмеціў, як у марозным паветры хваляй пракацілася: «Па эшалонах!» — і паравоз даў доўгі гудок. Ляснулі настылым жалезам буферы, здаецца, прагнуліся рэйкі, нібы ўцiснуліся ў чорны ад вугальнага пылу снег, абудзіўся, як яго хто моцна штурхнуў у плечы — пажылы вусаты салдат прабіраўся праз натоўп да цягніка.

Язэп саступіў, даючы яму дарогу, і зноў убачыў вайскоўцаў, якія стаялі абняўшыся цяпер ужо так моцна, што здавалася, няма такой сілы, якая магла б іх разлучыць.

А колы на стыках ужо тахкалі часцей і часцей, і нехта крычаў з праплываючага міма вагона: «Васілій, час, хутчэй» — і тады радавы адштурхнуў ад сябе лейтэнанта, пракрычаў: — Бяжы, Васіль!.. Гэта ж фронт!..

Малодшы лейтэнант нібы абудзіўся, спачатку няўпэўнена адыходзіў ад брата, пахістваўся, потым пабег, азірнуўся:

— Ваня, толькі дадому? Чуеш?.. Дадому!..

Язэп, як і астатнія, хто быў на пероне, не ведаў, што здарылася ў лёсе братоў, не ведаў, чаму салдат, знявечаны вайной, не збіраўся ехаць дамоў. Можа, у яго там былі жонка і дзеці, маці, а можа, ужо нікога не было. Можа, ён не мог там, дома, паказацца знявечаны ці што іншае перашкаджала, але вось гэтае, разарванае ветрам «Дадому...» невыносным болем і крыўдай за сябе, за салдата працяло яго, Язэпаву, душу. І ён сагнуўся, забыўшыся на людзей, якія неадчэпнымі позіркамі праводзілі эшалон, абхапіў галаву рукамі, сціснуў скроні, быццам баяўся, што яна расколецца ад гнятлівых думак, застагнаў. І праз боль, праз стогн пачуў рэзкае да хрыпаты:

— Бяжы, Васіль... Не бойся, дамоў я, дамоў!.. Бі там гада!

Адна, з безлічы трагедый вайны, якая цяпер праявілася ў лёсе двух людзей, адкрылася Язэпу надзіва ясна і балюча. Гэта была не толькі асабістая трагедыя двух вайскоўцаў, але і яго, Язэпава, трагедыя. І яго асабістая цяпер нібы знайшла выйсце, падказала Язэпу, што рабіць далей. Страсянуўшыся, выпраміўшыся, ён кінуўся прэч, а ў галаве як адгукалася рэха: «Дамоў, дамоў...»

Нейкі час Язэп бег за эшалонам, а калі апошняя платформа знікла за паваротам, і ён выскачыў да тупіка, ля якога сляпіў зрок чырвоны агеньчык семафора, спыніўся як укопаны, зразумеўшы, што гэтыя хвіліны быў непадуладны сам сабе, цяжка апусціўся на чорны, ужо наздраваты ды зноў скамянелы снег.

І цяпер ён нібы ўпершыню зразумеў, што там, дома, у Будзе перапляліся ўсе яго беды, і што толькі там ён і ніхто іншы зможа развязаць, разблытаць гэты цяжкі вузел свайго лёсу, і што ён павінен быць цяпер на зямлі, на якой нарадзіўся.

Праз два дні буднянцы заўважылі над комінам Язэпавай хаты сцярожкі дымок.

## 12

Яўхім Баравец на гэтай зямлі кораня не меў. І наогул, ён не ведаў, ці ёсць дзе на свеце людзі яго роду, радня. Быў ён тут прышлы, як некалі казалі. Яўхім з'явіўся ў Будзе гадоў сорак назад, ды так і застаўся тут, прыжыўся, пусціў парасткі, палюбіў гэты край, людзей.

Да Буды ён, сірата, які не ведаў і не памятаў бацькоў, хадзіў па зямлі, адзін час, хлапчуком, вадзіў ад вёскі да вёскі старцаў, потым, як падрос, наймаўся рабіць людзям, навучыўся ўсяму, чаму толькі можа навучыць жыццё.

У Буду ён трапіў не адзін, а з таварышам, такім жа, як і сам, бадзягам, якога сустрэў аднойчы ў час вандровак. Згаварыліся разам хадзіць, так лягчэй. Якраз была зіма, рабіць на полі няма чаго, жыта абмалочана, і яны наняліся да Хведара Ружлевіча рабіць гонту. Хведар ставіў зруб, меўся аддзяліць ад сябе дарослага сына, тут яны і наняліся памагчы.

Тады яшчэ занадта прамы, высокі, чорны як смоль Яўхім падабаўся не адной тутэйшай дзяўчыне. Як пойдзе з таварышам на вечарынку, дык вачэй ад яго не адрываюць. За гэта неаднойчы мясцовыя хлопцы збіраліся яго адлупцаваць, але пабойваліся, таварыш пусціў чутку, што ён не адну турму прайшоў. Гэта, як кажуць, умервала пыл тутэйшых хлопцаў, чапаць баяліся.

Але тым не менш некалькі начэй запар пачалі знікаць іх інструменты, якія хавалі пад паветкай. Мусіць, мясцовыя хлопцы такім чынам хацелі ім дапячы. Яўхім і яго таварыш вымушаны быў ездзіць у мястэчка, куп-

ляць там інструмент, але, неяк не вытрымаўшы, Яўхім сказаў на вечарынцы таварышу, каб усе пачулі:

— Зноў інструмент укралі, Ігнат. Але памянеш маё слова, той, хто гэта зрабіў, прыцягне яго ў зубах ды яшчэ ваўком павые пад акном дзядзькі Хведара. Не пагляджу, што грэх, начарую!

Чаму ён так сказаў, і сам растлумачыць не мог, мабыць, яго падштурхнула набожнасць мясцовых жыхароў, а пра ведзьмакоў чаго толькі не наслухаўся, як старцаў вадзіў.

Назаўтра мясцовыя хлопцы пыталіся ў Хведара, няўжо і сапраўды Яўхім чараваць умее.

— А хто яго ведае? — паціскаў той плячыма, — можа, і вядзьмак. Вочы ў яго гарань, мабыць, ведае нешта.

Тут падвярнуўся Яўхімаў таварыш, які запэўніў, што і сапраўды Яўхім вядзьмак, нагледзеўся, разам бадзяючыся па вёсках.

На наступны дзень увесь інструмент быў на месцы. «Абыходзьце гэтага знахара, — казалі старыя маладзейшым, — не чапайце, трымайцеся далей ад бяды...»

А пад вясну зачасціла да Хведара суседка, удава, старая Аўгінка. Усё нешта шапталася з Хведарам, украдне паглядала на Яўхіма. Аднойчы яна прынесла ў прыполе дзесятак яек, пастаяла ў парозе, потым згорбілася, нерашуча падышла да яго, паклала на стол яйкі, узмалілася:

— Дзіцятка ты маё! А мой ты татачка!.. Не плюнь старой у вочы... Гора ў мяне несуцешнае, памажы! Век буду богу за цябе маліцца.

Старая пазірала яму ў вочы так жаласліва, безабаронна, і Яўхім, нічога яшчэ не ведаючы, пачаў суцяшаць яе, казаць, што дапаможа, калі ў яго сіле.

— Дачка ў мяне нягеглая, — зашапялявіла бяззубым ротам старая. — Васемнаццаць гадочкаў ёй, а чэзнуць пачала, свайго ценю баіцца, іншы раз і мяне не пазнае. Як памутненне на яе хто наслаў. Гэта ж восенню ў грыбы хадзіла, ля Вылазаў перастрэлі яе нейкія дзецюкі, кажа, згвалціць хацелі, ледзь уцякла, у балоце хавалася, як не захлынулася. З таго часу няма з ёй ладу. Дзе толькі рады не шукала. Дык, можа, ты б пашаптаў, можа, адпусціла б. Дзеўчына нібы кветка цвіла, а цяпер — як сухая лісцінка...

Упершыню пашкадаваў Яўхім, што тады сказаў пра знахарства. Паверылі людзі, не да дабра гэта. Чым ён

мог памагчы гэтай кабеце, калі сам, як пень, непісьменны і, акрамя сілы, нічога не мае? Вось каб тады ён выпадкам быў на Вылазках, то, канешне, дапамог бы, заступіўся. Як сказаць старой пра гэта? Можа, ён адзіная яе надзея?.. Адмовіш, падумае, што з-за платы... Чуў Яўхім ад старцоў, што ад спуду чалавека можна вылечыць, трэба толькі яму ўнушыць, што страху няма, ды словы боскія казаць. Што можна чалавеку ўнушыць — у гэта Яўхім верыў. Ён не раз, калі было страшна, прымушаў сябе верыць, што страху няма.

— Не трэба мне, цётка, твае яйкі. Але паглядзець дачку — пагляджу. Калі ў маёй сіле, дык памагу гору.

А праз паўгода ўстала на ногі Аўгінніна Марфа, зноў зацвіла дзеўка, заружавеліся шчокі, вярнуліся да яе смех і весялосць. Толькі ўсім яна казала, што нічога такога Яўхім не знае, а падышоў да яе з ласкай ды ўпэўненасцю, не адыходзіў увесь гэты час ні на крок, вады падаваў, ці не з лыжкі карміў, вось і ўсё. І застаўся Яўхім у старой, падслепаватай Аўгіннінай хаце, і не прымаком стаў, а, як казалі людзі, гаспадаром Марфіным і мужам. Пра знахарства хутка забыліся. Рабіў Яўхім, як усе, дзень і ноч, знахарствам не жыў, тоўкся па гаспадарцы, а ў багацеі не выйшаў.

Успомнілі людзі пра яго знахарства, а дакладней, успомніў Язэп, калі пачалася вайна, калі адпраўлялі сыноў на яе. Падобныя, як блізняты, рослыя, як ён у маладосці, Яўхімавы сыны мелі адзін дваццаць, другі дзевятнаццаць гадоў. Працавалі яны ў калгасе, Мікодзя на трактары, а Іван на ферме. Праводзячы іх на вайну, разам з мужчынамі, Петраком і Стасем, Яўхім і сам наважваўся ісці ваяваць. За вёскай ён апусціўся на мосце на калені, нібы засланяючы дарогу назад, спыніў сыноў, дрыжачай і скукарэчанай рукой перахрысціў іх, сказаў:

— Хай не кране цябе, Мікодзя, і цябе, Іван, куля, хай агонь абміне, меч... Я, дзеці, бласлаўляю вас на подзвіг ратны. Так ужо выпала на ваш век, што трэба ісці зямлю бараніць, замест таго каб зерне ў яе сыпаць. І памятайце, не забіваць ідзяце, а зямлю бараніць. І няма вам шляху назад без перамогі.

Сыны слухалі моўчкі, схіліўшы галовы, слухалі і мужчыны, і Язэп Кучынскі. Ён пазіраў на Яўхіма недаўменна, шырока адкрытымі вачамі.

— Не адступім, бацька, — сказаў Мікодзя. — Зямля ж наша — краіна, не на гулі ідзём...

І калі мужчыны моўчкі рушылі далей па дарозе, патанаючаі у гаркавым, падобным на дым, пыле, а сыны Бараўца і Стась праз кожны крок азіраліся ўсё назад, Язэп прыўзняў Яўхіма з калень, сасмяглымі вуснамі вымавіў:

— Хадзем, Яўхімка...

А праз гадзіну Яўхім таксама ішоў у райцэнтр...

## 13

Не адзін раз за вайну Яўхім успамінаў гэты дзень, як праводзіў сыноў і буднянцаў на фронт, і сваю размову з Язэпам. Асабліва часта ўспамінаў Язэпа, калі праз некалькі часу пасля акупацыі ў вёсцы з'явіўся яго Стась і хутка начапіў на рукаў паліцэйскую павязку. Неяк адразу, ці не з першага дня, паміж Яўхімам і Язэпам стала халодная сцяна адчужанасці. Колькі разоў Язэп ні спрабаваў зачапіць Яўхіма, пагаварыць з ім, нічога не атрымлівалася. Яўхім, здаецца, пазіраў на яго звысака, грэбліва, калі выпадкова сустракаліся на вуліцы, або адварочваўся, ці рабіў выгляд, што не прыкмячае яго. А Стасю, калі той стаў паліцыянтам наогул пляваў услед. А калі аднойчы Стась на падпітку паспрабаваў ухапіць Яўхіма загрудкі, той вывернуўся жвава і, пазіраючы прама ў вочы, сказаў:

— Ты, тхор, лапы не распускай, адыдзі! Глядзі, знойдуцца людзі, укароцяць, ясна?

Стась такога не чакаў, разгубіўся адразу, а калі ачомаўся, каўзануў руку пад рэмень вінтоўкі, наставіў у грудзі старому і, наліваючыся крывёю, па-бычынаму выгінаючы тоўстую, зарослую шчэццем шыю, клацнуў затворам.

— Ну?! — прыкрыкнуў на яго Яўхім. — Адыдзі! Калі яшчэ не напіўся людской крыві, адумайся!.. Некалі ж адрыгнецца, смаркач!..

Яўхім павярнуўся і, не азіраючыся, спакойна пайшоў да хаты. А Стась усё стаяў сярод вуліцы ў запыленых ботах, трымаў у руках вінтоўку, увесь калаціўся і скрыгатаў зубамі. На шум выйшаў з хаты Язэп, убачыўшы Стася і Яўхіма, падбег да сына, павіс на руцэ:

— Што ж гэта ты ўдумаў, га?

— Адыдзі, бацька! — хрыпеў Стась. — Адыдзі, а то не пагляджу. Абаронца знайшоўся... Ды я...

Больш ён не знайшоў што сказаць, рэзка закінуў він-

тоўку за плячо, павярнуўся і падаўся ў Баравіцу, дзе стаяў гарнізон, але крокаў праз пяць спыніўся, сказаў:

— Памятайце, гэта вам не вытоптваць людзей з балотаў, калі іх жменька была!.. Сёння я вас, дурняў, шкадую, бо свайго розуму не ўставіш. Пажывіце, паглядзіце, што робіцца навокал, добра паглядзіце. Можа, трохі асядзеце. Але наступны раз — не!

Ён узмахнуў рукой, як адсек...

Успамінаў той дзень Яўхім і думаў, што для такіх, як Стась, няма ні бога, ні чалавека, ні малітваў, няма нічога святога.

Памятаў Яўхім і тое, калі агонь выкаціў Буду, калі, вярнуўшыся з лесу, убачыў галавешкі замест хат, чорныя камяні, якія балюча рэзалі вочы. Ад Марфы сваёй ён не знайшоў нават костачак...

Успамінаў, потым у бяссіллі калаціўся, стагнаў, зваў сыноў, быццам зноў бачыў іх перад сабой, быццам зноў гаварыў з імі: «...і памятайце, не забіваць ідзяце, а зямлю бараніць... І няма вам назад шляху без перамогі...» І чуў у адказ: «Не адступім, бацька...» І як ніколі востра адчуў тады Яўхім, што казаў праўду, адчуў і зразумеў, што, калі ў яго дзяцей душа яго і матчына, наказ споўняць...

Успамінаў і тады, калі з акружэння прыйшоў у вёску паранены Міхей і, пабыўшы крыху дома, зайшоў ноччу да Яўхіма, не стукаў у шыбу, а напаўголаса пазваў:

— Дзядзька Яўхім, а дзядзька Яўхім!.. Выйдзі...

Бач ты, не казаў «адчыні», быццам баяўся, што не зразумее яго Яўхім, што не пусціць на парог, пракляне, плюне ў вочы за тое, што ён дома, а не на фронце. Значыць, не вінаваты, значыць, разумеў Міхей, што калі там яго выштурхнула з сядла, дык тут ёсць яму справа.

І калі Яўхім выйшаў, накінуўшы на плечы старую куфайку, Міхей сказаў:

— Дзядзька, віна мая, што к фронту не прабіўся, а другой віны няма, куля падшчыкнула, ледзь не пад корань... Толькі знай, зброі сваёй не кінуў!.. Дзе ж мне цяпер людзей шукаць, скажы, дзядзька!..

— Усюды людзі, Міхейка, — сказаў Яўхім. — А тых, што табе трэба, шукай на Вылазах ды скажы, што я табе так раіў, чуеш?..

Шчымела сэрца ў Яўхіма: можа, дзе і яго сыны так прабіраюцца дадому. Таму спытаў:

— А маіх не бачыў?

— Не, дзядзька. Іх ад нас адлучылі. Яны ж танкісты, а я — пяхота. Не даводзілася іх больш бачыць. Ды наогул пра нашых нічога не чуў, быццам вецер нас развеяў, а дзе хто стаў — не ведаю.

На развітанне яны абняліся, і яшчэ доўга ў цемры перад Яўхімам пакалыхвалася нязграбная постаць Міхея.

Праз некаторы час, як пачаў партызаніць, ноччу прыйшоў Міхей у Буду, зноў-такі да яго, Яўхіма. Адубелы, галодны, схуднелы. Пераапрануўшы яго і перавязаўшы рану, Яўхім завёў Міхея на Вылазы, бо нельга было трымаць яго дома — у вёсцы круціўся Стась.

Добра помніў Яўхім, калі пасля вызвалення вярнуўся з фронту Мікола. Ён скакаў на драўляным пратэзе па пустой, не так даўно спаленай вёсцы, жаласна вітаўся з тымі, хто астаўся жывы.

— Адваяваўся?.. — казаў Яўхім, абдымаючы Міколу і прытуляючыся няголенаю шчакою да яго пляча.

— Адваяваўся там, а тут, дзядзька, мабыць, не! — казаў Мікола. — Вочы баляць, не магу глядзець наўкола... Ну, а як твае хлопцы, што ад іх чутна?

Яўхім уздыхаў:

— Чуткі няма пакуль... Міхей вярнуўся яшчэ на самым пачатку...

— Як?..

— Акружэнец ён... Увесь час партызаніў.

— Але, — змяніўся, змякчэў Мікола. — Значыць, так павярнулася. А я ўжо быў падумаў...

— Не хаваўся ён па завуголлі ды за бабскую спадніцу не трымаўся, партызаніў. Цяпер кірхае, грудзі яму прастрэлілі.

## 14

Пакуль вочы звыкаліся з густой цемрай, Яўхім пільна прыслухоўваўся да наваколля. Было чутна, як у хляве мэкае каза, у хмызах за рэчкай іншы раз глуха, як вецер у завіруху, выў воўк. Яўхім намацвае жалезны прэнт ля дзвярэй зямлянкі, бярэ яго ў рукі і, адварочваючы ад ветрыка твар — апошнім часам нават слабы вецер выціскаў з вачэй слёзы — шкрэгае па шурпатай дарозе да хлява. Крокі гулка раздаюцца ў настылым нішчымным паветры.

Калі месячна і бязветрана, ён доўга ўзіраецца наў-

кола: як прывіды, пабліскваюць, кідаючы цяжкія цені, коміны, гіганцкай здавалася дамба, маўклівыя плямы дубоў: чыгунна-ўчарнелыя ля яе, нібы спакваля насоўваліся на вёску, і бязмежна пустэльнай выдавала ўкрытая снегам зямля.

Такія ночы ён не любіў, не мог спаць такімі начамі, гняла адзінота і бяссілле перад вялікім, так і неспазнаным за жыццё светам.

Яўхім ідзе да хлява, нетаропка дастае з кішэні ключ, адмыкае замок. Поруч з ім самотна скрыпіць пратэзам яго напарнік Мікола.

З вуліцы ў будынак з шоргатам улятае вецер, шамаціць рэшткамі саломы па кутках, заціхае, аслабеўшы, на гарышчы. Са стойла патыхае прэлым цяплом, фыркаюць коні.

Яўхім прычыняе дзверы, намацвае ў кішэні карабок, запальвае стары задымлены ліхтар. Трапяткое слабае святло высвечвае кругляк ля сцяны, хамуты, вупраж, падвешаныя на цвіках, рассоўвае па кутах цемру, з заградзі выцягваюцца доўгія конскія морды, па сценах слізгаюць іх цені.

Яўхім, крэкчучы, узбіраецца па ўсходках на гарышча, наскубвае там па невялікім ахапку сена. Асцярожна, каб не расцерушыць, спусціўся ўніз. Раздае коням харч, разважае ўслых:

— Вясной будзе лягчэй. Снег згоніць з дамбы, там заўсёды раней, чым дзе, трава выпстрыкаецца. Там грыва рана падсыхае, леташняе бадылле нечапанае, траўка па прагалах хутка расце, сяк-так выкруцімся. Жывёле вясной толькі дай волю, не прападзе. Дзе галінку адшчыкне, дзе траўку-красачку схопіць, глядзіш, і весялей жыць. А цяпер во глядзі, мох са сцен павыскубалі, дзерава грызуць.

Мікола слухае Яўхіма, згаджаецца з ім. Пагаварыўшы, яны ідуць да зямлянак. Мікола гулка стукае драўляным пратэзам, Яўхім тупае ботамі. Каля зямлянак моўчкі разыходзяцца — кожны скіроўваецца да сваёй.

## 15

На згоне зімы Яўхім, Мікола і Міхей началі вазіць бёрны з лесу. Стаялі ясныя, бязветраныя дні, з чыстым полагам неба, з сонцам, якое кожны дзень узнімалася ўсё вышэй і вышэй і днём станавілася па-вясноваму яр-

кім, сляпучым. Снег наўкола пасінеў, асеў, на дарозе зрабіўся наздраваты, і, калі ступаць на цаліку, адчувалася пад нізам вада. Дрэвы, здавалася, страцілі чарнату, зрабіліся карычневыя, пасвятлелі прыдарожныя бярозкі, асыпаліся з галін іней, наледзь.

Днём пахла вясной, свежым ветрам, які прыносіў з лесу пах хвоі і елкі, толькі дубы стаялі ўсё яшчэ чорныя і дробна трапятала пажухлае, не апалае за зіму лісце.

У вёсцы адчувалася жыццё, брахаў, заліваўся, амаль не перастаючы, сабака, мэкала каза, іржалі коні, дзеці гойсалі па вуліцы між чорных каміноў, жанчыны выходзілі да рэчкі ў пралабках мыць і паласкаць бялізну. Тады далёка па наваколлі чуўся пляскат праніка.

Спаўзла спакваля і наледзь з шыб Язэпавай хаты. За вокнамі чарнелі галінкі бэзу, а калі зноў браўся марозік, каляна блішчэлі, патрэсквалі суха.

Язэп па-ранейшаму рэдка выходзіў з хаты. Калі трэба было схадзіць да калодзежа ці прынесці з-пад паветкі бярэмя дроў, ён цікаваў з акна, каб на вуліцы нікога не было.

Вярнуўшыся з горада ў Буду, ён жыў ранейшым жыццём, разумеючы, што ніхто яго не чакае, што людзі не маюць у ім ніякай патрэбы. Раніцаю Язэп бачыў, як мужчыны ехалі па дзерава, гаваркія, павесялелыя, можа, і радасныя. Цэлы дзень ён сноўдаўся без справы па хаце, а падвечар зноў садзіўся да акна, углядаўся ў дарогу. Спачатку ля левага берага рэчкі з'яўлялася абшарпаная чырвоная дуга, яна то апускалася за грудок, то ўзнімалася над ім, пакалыхвалася мерна, потым плыла над грэбенем дамбы, а ў тым месцы, дзе дамба агінала вёску, неўзабаве паказвалася галава коніка, выгнутая шыя. Урэшце з'яўляліся сані з падсанкамі, нагружаныя бёрнамі. За санямі, час ад часу папіхаючы іх, ішлі мужчыны.

Калі яны міналі яго, Язэпаву, хату, ён бачыў, што твары ў мужчын стомленыя, агрубелыя. Якраз насупраць Язэпавай хаты да саней падбягалі Валік і Света, побач, радасна павіскваючы, скакаў сабака.

Потым, калі конь скіроўваў да Кацінага пляца, з зямлянкі выходзіла і гаспадыня. Ступала яна, як прыкмячаў Язэп, грузна — была цяжарная. Каця выносіла драўлянае вядро і карэц. Па чарзе мужчыны доўга, са смакам, пілі ваду.

Язэп з цікавасцю глядзеў на Кацю. Жывот у яе быў

востры, як некалі ў яго жонкі, калі хадзіла цяжарная Стасем. І ён падумаў сам сабе, што ў Каці абавязкова павінен быць хлопчык. Вядома, будзе ён падобны на Петрака. Думаў ён і пра тое, што некалі, калі яму, Язэпу, яшчэ адпушчана пажыць на гэтым свеце колькі гадоў, аднойчы сыдуцца, перакрыжуюцца дарогі: сына Петрака і Каці, і яго... Думаў чамусьці і не баяўся таго часу, а, наадварот, супакойваў сябе ў чаканні, уяўляючы гэтую сустрэчу. Бо яна вельмі неабходна будзе Язэпу. Ён павінен ведаць на астатак дзён, калі ляжа ў зямлю: здраднікам, бацькам здрадніка ці чалавекам, у якога няма віны перад людзьмі.

Мужчыны, Яўхім і Міхей, скідвалі бёрны з саней. Мікола стаяў наводдаль, паказваў, куды класці.

А праз некалькі дзён Язэп бачыў, як шахаюць у руках мужчын сякеры, як з-пад вострага ляза ляцяць па баках цёскі. Ён уяўляў, як там, на пляцы, цяпер пахне смалою, свежым, вымазаным аб галавешку шнурам і як з ахвотаю працуюць мужчыны.

Тады нешта шчымліва-салодкае падкочвалася пад сэрца, кружыла галаву, рукі пачыналі ныць, ім патрэбна была справа. Але...

І рос паступова зруб, вянец лажыўся на вянец, і ўсё вышэй хадзіла па крузе сонца, шырэў далягляд.

## 16

Вясна па-сапраўднаму адчулася толькі ў пачатку красавіка. Увесь сакавік снег яшчэ трымаўся, адступаў нехаця, вечарамі браўся мароз і скоўваў лядком усё, што раставала за дзень.

А тут неяк ураз перайначылася, палагоднела сонца, якое так доўга вышэла, асцярожна саграваючы зямлю, і вось ужо пабеглі да ракі звонкія гаманлівыя раўчукі, кругом паплыло, вецер хоць і памацнеў, але ўжо не было таго холаду, што раней, заварушыліся, як абудзіліся ад сну, галінкі бэзу, пацягнуліся да сонца. А неўзабаве прыляцелі шпакі і хутка пацягнуліся ў Нямкоўскія балоты гусі.

А праз нейкі час над Будай закружыў бусел.

Да вайны тут на старым дубе ля дамбы было гняздо, і кожнае лета буслы хадзілі на лузе ля рэчкі, выводзілі дзяцей, вучылі лятаць, каб восенню павесці за сабой у вырай. Перад самай вайной жанчыны, якія рвалі каля

дуба шчаўе, прынеслі вестку, што буслы скінулі адно птушанё.

У свеце было неспакойна, і жанчыны гаварылі, што гэта дрэнная прыкмета, хаця наогул перад вайной людзі жылі ў трывозе і на многае, чаго раней, здаецца, не заўважалі, цяпер звярталі ўвагу.

Жыў тут бусел і ў вайну, здавалася, яна павінна была абысці яго, гэтую святую птушку. Але ж не, як гарэла Буда, птушкі ўстрывожыліся, пакінулі сваё гняздо і, трывожна курлыкаючы ў задымленым ад пажару небе, доўга кружылі над вёскай...

Можа, гэта той бусел, які жыў тут раней, зноў вярнуўся ў сваё гняздо. Людзям хацелася, каб ён пасяліўся тут зноў. Асабліва жадалі гэтага дзеці, Валік і Света. Убачыўшы бусла, яны бегалі па вуліцы, махалі рукамі:

— Бусел, бусел, ляці сюды!.. Не будзе тут табе бяды...

Хто іх навучыў гэтым словам, людзі не ведалі, але, гледзячы, як дзеці заклікаюць бусла, усміхаліся, на іх тварах быццам адтавала жорсткасць, і Міхей, збіўшы з лучыны, як ён казаў, «седала», зацягнуў яго на дуб.

Але дарэмна дзеці зазывалі птушку, дарэмна ўглядаліся ў неба дарослыя, бусел доўга кружыў над спаленай вёскай, але так і не сеў.

...Коні, калі Яўхім зняў з іх вупраж, нібы зразумелі, што пасля цяжкай работы ім дадуць волю. Яны застрыглі вушамі і, памахваючы хвастамі, зацёпалі капытамі, па раскіслай дарозе. Яўхім вёў коней на пашу.

Сёння мужчыны не ладзілі зруб, нібы спахапіліся, што хутка спатрэбяцца кроквы, запрэглі ў старыя калёсы парку, паехалі ў лес. Намучыліся яны там добра. Дзе коні ішлі самі, дзе даводзілася папіхаць, аднак прывезлі ажно два вазы жэрдак, мабыць, і многавата на адну хату. Дык жа, — меркавалі, — ці адна сёлета ў нас хата будзе? Не прападзе.

А зруб яны ўзвялі ладны, ужо да паловы акон. Так Каця захацела, каб у хаце вокны былі з усіх бакоў, каб сонца ўвесь час свяціла, бо насядзелася ў сырой зямлянцы. І цяпер зруб жаўцеў гладкай сасной, радаваў вока.

Сёння першы раз Яўхім вёў пасвіць коней на дамбу. Як былі ў лесе, дык заўважыў, што там-сям зелянець пачынае, асабліва па грудках, слаба, але пралескі ёсць на сухіх грыўках, леташняе бадыллё можна скубануць, словам, можа, не столькі таго наедку будзе, колькі волі.

Адсюль, з вёскі, добра бачна, як за мастком ля дамбы

ўпіваюцца ў бераг, ледзь прыхопленыя лёгкай зелянінай, вострыя, як змылкі, крыгі, як пеніцца цёмная вада, якая з таго боку затапіла ўвесь луг і падбіраецца пад Нямкоўскі лес. Вада на тым беразе пахавала дарогі, ні прайсці, ні праехаць цяпер да райцэнтра будзе аж да лета, пакуль Дабасна не ўвойдзе ў берагі.

«Скажы ты, — думаў Яўхім, — рэчцы ці цяперся трэба было ачысціцца ад крыг, а іх вада ўсё нясе і нясе невядома адкуль. Мабыць, адрывае ад балотаў, яны ж заўсёды адтаюць, калі рака чыстая. Вялікая вада, цяжкая будзе вясна для многіх вёсак, дзякуй, у нас дамба, міне...»

Сонца апускалася за блакітны грэбень Нямкоўскага лесу, халаднаватае, чырвонае, нібы пацягнутае сіняй плёнкай, зеленавата-ружовістае чыстае неба падказала староме, што ноччу возьмецца марозік, дрэвы ля дамбы пачарнелі, як і не было карычневага іх свячэння днём. Іх густа абляпілі гракі, безупынку крычалі.

На зямлі ад дубоў ляжалі доўгія вільготныя цені, пакалыхваючыся на снежаніцы. Адчуваўся халадок. Стары падвёў коней да дамбы, спыніўся, прыжмурыўшы з асалодаю вочы. Яму ўявілася лета, лугі ў духмяных травах, у якія ён на начлег павядзе коней, невялікі касцёр на беразе ракі, крыкі начных птушак.

Колькі разоў за сваё жыццё, парабкам у маладосці, гаспадаром, як спыніўся ў Будзе, а потым пры калектывізацыі ён ганяў коней на начлег. І заўсёды нібы дакранаўся душой да таямніцы вольнасці і неабсяжнасці свету, да яго вечнасці — у небе ляжыць бясконцы Млечны Шлях, мігаюць зоркі, скочваюцца з полага начы, прачэрчваючы на ім вогненную дугу, і фыркаюць коні, час ад часу лязгаюць падковамі аб камяні ў траве. І плынь ракі, адвечная рачная плынь, нагадвае чалавечае жыццё ў вечным імкненні наперад.

Яўхім спутаў коней, паляпаў па маршчыністых шыях, агледзеў на дамбе сушэйшае, прагалы, якія здалёк выдавалі сапраўды зялёнымі, цяпер былі больш шэрымі, на іх ляжала пераблытаная леташняя трава, — крыху пастаяў, наглядаючы, як коні, трасучы грывамі, паскакалі да кустоў, потым павярнуліся да ракі.

Вада ля дамбы была каламутная, ля карчоў пакалыхваліся пеністыя грывы. Далей плынь несла дробныя крыгі, аскабалкі, вываратні, лёгка, як пушынкі, кружыла іх, а ў лугах яна здавалася бясконцым чорна-карыч-

невым шклом, з водбліскамі дарожкі ад нізкага сонца.

Стары са смакам выкурыў самакрутку, паслухаў, паглядзеў на гракоў, нязлосна замахнуўся: «Ну, хеўра, калі ўжо раскрычацца, дык хоць ты вушы затыкай!» І падаўся памалу ў вёску.

Пад нагамі цяпер ужо хрумсцеў тоненькі лядок калюжын, дарога падмерзла, і пальцамі ног Яўхім адчуў, што мокрыя, у дзіравых ботах ногі пачынаюць мерзнуць.

Адсюль, з дамбы, якая моцна трымала ў сваёй падкове раз'юшаную ля берага ваду, Буда была бачна як на далоні: у рыжых падцёках слупы каміноў чарнелі на фоне цяпер ужо сіняга неба, шэрыя нізкія грудкі зямлянак, чорная хата Язэпа Кучынскага наводшыбе — вокны не блішчаць, промні слізгаюць міма, а далей — жоўтыя бёрны Кацінага зруба.

Над зямлянкамі ледзь варушыліся тонкія стужкі дымкоў, з коміна Язэпавай хаты нічога не было бачна.

«Бач ты, — падумаў Яўхім, — з курамі ў адзін час кладзецца. Можа, днём што варыць...» — смачна каўтануў стары сліну.

...Яўхіма нешта моцна штурхнула ў плечы, сарвала з галавы шапку, і яна пакацілася па лёдзе. Адчуў, што апякло карак, перацяло дыханне і, нібы пераламаўшы сярэдзіну, кінула на зямлю, пацягнула па шурпатым, як рашпіль, лёдзе.

Нечаканы выбух аглушыў яго, пакаціў на зямлю. Перавярнуўшыся дагары, шырока адкрытымі вачамі Яўхім убачыў у счарнелай сіняве камякі зямлі, аскабалкі дрэў, кусты, якія паволі распаўзаліся ў вышыні, на імгненне нібы застылі там, а потым рынуліся назад.

Паветра звінела. Яму здалося, што ў гэтым пранізлівым звоне ён чуе ржанне коней: яно то наплывае, то аддаляецца ад яго, нібы патанае ў лугах. Праз хвіліну гукі зніклі, насунулася цяжкая цішыня, даўкія хвалі гарачага паветра, апёкшы горла, твар, рукі, адкаціліся, і, жмурачы вочы ад запозненага страху, ён прыўзняў галаву, каб паглядзець на дамбу. Дамбы не было, не было дрэў, коней, гракоў, толькі дым над успененай, у чалавечы рост хваляй, якая вялізным валком кацілася на яго.

У Яўхіма хапіла сіл, перамагаючы слабасць і боль, абапіраючыся на рукі, здзіраючы іх у кроў, узняцца, павярнуцца тварам да вёскі. Адтуль, спатыкаючыся, беглі Мікола і Міхей, і ён, разумеючы, што іх можа накрыць

хваля, слаба замахаў рукамі, абвялымі, як перабіты чарот, сціснуўся ў камяк, потым з намаганнем выпрастаўся і кінуўся напярэймы.

Ён нешта крычаў ім, але голасу свайго не чуў, і калі хваля, растраціўшы сваю сілу, дагнала ля вёскі яго і слаба таўхнула пад калені, ён утрымаўся, павярнуўся да ракі, убачыўшы, што чорнае шкло вады распаўзаецца, затапляе нізіны, нясе мост, паўзе сюды, зноў закрычаў:

— Коні!..

## 17

Язэп і сапраўды рана клаўся спаць, як толькі пачынала шарэць, бо ведаў адно: калі не ляжа, спацца яму будзе, як заўсёды, неспакойна. Ён ужо амаль задрамаў, як пачуў працяжны гул, грукат, а праз імгненне яго скаланула, нібы адваліліся ножкі ў ложку, зазвінелі шыбы, са столі пасыпалася кастрыца. Нічога не разумеючы, ён інстынктыўна сціснуўся ў ложку ад страху. Навакол усё дрыжала, нібы страляла артылерыя, і гэты гул шырыўся, каціўся па зямлі.

На вуліцы нешта гучна лёпала па гразі, потым трашчала, чуліся крыкі, перапалоханыя мужчынскія галасы і слабыя жаночыя ўскрыкі, потым доўга, глуха і працяжна, як перад хаўтурамі, выў сабака.

Гул заціхаў, але нешта на вуліцы па-ранейшаму трашчала, людскія галасы чуліся побач з яго хатай, потым адкаціліся далей, да пуні. Язэп кінуўся да акна. У гэту хвіліну знадворку нібы хто з нечалавечай сілай ударыў у раму. Яна затрашчала, паволі адарвалася і ўпала на Язэпа. Разбілася, зазвінела шкло. У тое ж імгненне ў твар ударылі пыркі халоднай, калючай, як град, вады. Язэп ледзь утрымаўся на нагах, чакаючы, што ўсё гэта паўторыцца зноў. Але хваля адкацілася, нібы знясілела, і ён убачыў, як паволі вада адносіць ад яго раму, падобную на крыж.

«Паводка!» — мільганула думка. І ён не думаў ужо пра дамбу. Язэп нібы забыўся, што яна была. Яму здалося, што прыйшла звычайная паводка, якая штогод прыходзіла ў Буду, калі яшчэ не было дамбы. А потым аж жахнуўся: паводка ніколі не была такой нечаканай. Значыць, дамба... І тады ён, нібы гэта было ўчора, уявіў сабе, як па ёй, пакрытай жнівеньскай квеценню, поўза-

юць немцы, зразумеў усё. Яны ж, адступаючы, замініравалі!..

Язэп адчуў, што стаіць у вадзе і ногі пячэ холад, інстынктыўна кінуўся ў сенцы. Фанерныя дзверы ў каморку сарвала з крука, і яны павіслі, перакасіўшыся.

У каморцы было мокра, вада толькі-толькі дайшла сюды. Язэп ашчаперыў рукамі важкі мяшок, зрабіў крок да жорнаў, з вялікім намаганнем паставіў на іх. Выціраючы з ілба вільгаць, з палёгкай уздыхнуў: «Паспеў».

Па ранейшых паводках Язэп ведаў, што праз дзень-другі вада загоніць яго на страху. Але цяпер ён быў спакойны — зрабіў самае галоўнае, што павінен быў зрабіць — выратаваў збожжа. Адпачыўшы, намацае на паліцы сякеру, стане на жорны, адарве колькі дошак на столі, зробіць лаз на гарышча.

Здаецца, вада больш не прыбывала, таму ён не спяшаўся, аддыхваўся. А калі крыху адпачыў, захлюпаў босымі нагамі назад у хату.

У хаце было цёмна, вада, як абцугамі, сціскала ногі. Не зважаючы на холад, Язэп абмацаў у пячурцы запалкі, запаліў свечку. У вадзе, на падлозе, задрыжаў, захістаўся слабы язычок агню.

Свечка жыганула вострым язычком цемру, яна рассунулася, згусла пад столлю, і стары амаль зусім супакоіўся, убачыўшы, што па хаце, як жывы, рухаецца яго цень.

«Нічога, дзень-другі, схлыне, — падумаў ён, — гэта ж трэба так знячэўку!.. Колькі ў яго жыцці было гэтых паводак? Не злічыць. Усе перажылі людзі, прывыклі да іх. Праўда, раней чакалі іх, рыхтаваліся. А цяпер... Во, праўду кажуць, як гром на галаву...»

Язэп вырашыў, што сёння на гару не пойдзе — за ноч азызнеш. Ды чаго ісці? Вада, здаецца, не прыбывае, печ яшчэ цёплая. Вада можа пабольшаць раніцаю, а дакладней, днём, як добра возьмецца сонца... Збожжа ён ўратаваў, а можа, яго ўсё-такі трэба зацягнуць на гарышча?

Разважаючы так, не ведаючы, што робіцца на вуліцы, паклаў пад галаву дзяружку, заціх, прыслухоўваючыся, як ціха качаецца вада ў хаце. Здаецца, ён ужо задрамаў, сагрэўшыся на печы, як у сцяну нешта моцна стукнула. Са сцяны сарвалася і плюхнула ў ваду рамка з фотакарткамі. Ён расплюшчыў вочы і здзівіўся, што не патушыў свечку і пры яе цьмяным святле ўбачыў, як,

кружачыся ў густой чорнай вадзе, рамка з фотакарткамі паволі асядае на падлогу.

«Ну вось, цябе ўжо і зусім няма, — слаба прашаптаў ён. — Эх, Марыля, Марыля... Так нас жыццё скруціла... А была ж Тэкля ў мяне...»

...Язэп прыглядаўся да Тэклі доўга, усё баяўся падысці да яе, загаварыць. Была яна прыгожая, акурат з карціны. Вочы вялікія. Доўгія, ніжэй пояса, косы, гнуткая станам, высокія вострыя грудзі... А калі выпадкам пагляды іх сустракаліся, дык сэрца ў Язэпа абмірала.

Асмеліўся ён падысці да яе, як у Нямках разам з Яўхімам малацілі Банахвату Юхнаўцу жыта. Тэкля разам з Банахватавай Кацяй падавалі снапы.

— Ты чаго гэта мяне абыходзіш, нібы кусаюся? — спытала яна, пасміхаючыся, калі ім выпала двaім застацца.

— А я і не абыходжу, — саромеючыся, сказаў ён. — Няма калі дужа прыглядацца.

— Ага, няма калі, — нібы пагадзілася яна, — дык ты нанач не пляціся ў Буду, а прыходзь на вячоркі.

Зачасціў ён на вячоркі, а пасля іх стаў знікаць з Тэкляй да самай раніцы.

— Глядзі ў мяне, — аднойчы перахапіў яго руку і замахнуўся на Язэпа сын Банахвата Аўдзей.

Такі ж самы, як і Язэп, жаніх — ішоў яму дваццаць трэці год, Аўдзей бліснуў на Язэпа з-пад ілба, больш нічога не сказаў, потым адпусціў руку. Але Язэп зразумеў, што Аўдзей стане папярок яго і Тэклінай дарогі.

Так і атрымалася. Язэп у той жа дзень пайшоў начаваць у Буду, трэба было змяніць апратку, а калі назаўтра прыйшоў на ток, Аўдзей, пасміхаючыся, адвёў яго ў кут і шапнуў:

— Во, усё зразумеў, і розум табе ўстаўляць не трэба, сам усё дапяў.

З таго дня і не адступаў Аўдзей ад Тэклі. Язэп баяўся падыходзіць да яе на вячорках, бо ў куце тоўпіліся сябрукі Аўдзея.

Так і разышліся іх шляхі. Праўда, аднойчы яшчэ перакрыжаваліся, і мог Язэп быць шчаслівым, мог быць з Тэкляю. Але не хапіла ў яго смеласці.

...Тады гладкія, сытыя коні Аўдзея Юхнаўца пад звон шамкоў неслі вяселле з Нямкоў у Дабасну, у царкву, вянчацца. З-пад капытоў пырскамі разлятаўся змакрэлы снег, чулася: «Гані! Гані!..», а Язэп і яшчэ чала-

векі тры будиянцы якраз ля рэчкі перагарадзілі па звычцы дарогу жэрдкамі — кінулі заіца.

Хлопцам трэба было зарабіць гарнец гарэлкі, Язэп згадзіўся ісці з імі толькі таму, каб пабачыць Тэклю.

Дарога спускалася з узгорка, мінала невялікі ельнік і якраз самы разгон саней быў ля моста. Вось тут і ўздыбіліся, захраплі коні. Убачыўшы, што дарога перагароджана, паганятыя спынілі коней.

З пярэдняга вазка іываліўся шулай Аўдзей, пасунуўся па шорсткім снезе, абдзіраючы рукі і твар.

Гоман, крыкі, перапалох.

Аўдзей падхапіўся, скінуў з сябе выпацканую падзёўку, выверну ці не з коранем сасонку і, замахваючыся, прахрыпеў:

— Хлопцы!.. Бі галоту!.. Іш, Аўдзеевай гарэлкі захацелі. А трасцу ім у бок!

Як па камандзе, з вазоў паўскаквалі Аўдзеевы сябрукі, закрычалі, загаласілі жанчыны. Усчалася бойка. Што маглі ўчатырох будняпцы зрабіць супроць такой хеўры?

Праз колькі хвілін яны, акрываўленыя, пахістваючыся, пляліся па глыбокім снезе да рэчкі, якая ля моста не замярзала, каб абмыць акрываўленыя твары і рукі.

— Язэпка, — чуў ён услед знаёмы голас. — А што яны з табой зрабі-лі...

Гэта галасіла Тэкля, і ён, паварочваючыся да яе, чуў, як роў Аўдзей:

— Назад, сучка!.. Абаіх парашу!..

А Тэкля, падцягнуўшыся да Язэпа, хапілася выціраць яго акрываўлены твар белай насовачкай і праз слёзы шаптала:

— Адно тваё слова, Язэпка, на ганьбу пайду, нялюбы ён мне...

Язэп бачыў, як, грузнучы ў снезе і цяжка сапучы, трымаючы за рыльца вялікую бутлю, да яго цягнуўся Аўдзей. Язэп адмоўна пахітаў галавой.

— Даўно б так, — харкнуў Аўдзей, падхапіў левай рукой пад пахі Тэклю, а правай шпурнуў у снег гарэлку. — Бярыце, зарабілі ж...

Не сказаў Язэп тады аднаго-адзінага слова. Аказваецца, як мала іншы раз трэба зрабіць чалавеку, каб жыццё яго перайначылася.

Спыніўшыся на гэтай думцы, Язэп зразумеў, што

шкадуе сябе, шкадуе, што жыццё не атрымалася, і нібы хто яму падказаў, што ўвесь час, стараючыся даказаць сваю нявіннасць, ён толькі і рабіў, што шкадаваў сябе. Яму заўсёды хацелася, каб яму спачувалі. Ён не мог цяпер вызначыць, чаму так, але неадчэпным, як назола, было адно: ён шкадаваў сябе...

Дык вось чаму ён, імкнучыся да людзей, ні разу, пасля таго як згарэла Буда, не прыйшоў да іх: не ведаў, ці зразумеюць яны яго...

А што ім трэба было разумець? Тое, да чаго ўрэшце дайшоў сам, што адкрылася сёння вось так нечакана з-за паводкі, з-за таго гора, якое яна прынесла буднянцам і яму. Бо хто скажа, чым усё гэта скончыцца ў галодную бясхлебную вясну, калі асабіста ў яго ёсць мех збожжа, ёсць страха над галавой. А яны, буднянцы, у якіх паводка забрала не толькі надзею на лепшае, але і страху над галавой?

А можа, ён ад самаго сябе ўцякаў увесь гэты час?.. Язэпу ад гэтай думкі зрабілася млосна, але ён ужо не мог спыніцца, яна пацягнула другія, патрабавала абгрунтавання, разумення свайго стану... Але ж ніколі не думаў, што ад самога сябе не ўцячэш... Значыць, ён такі сама павінен пакутаваць, і, можа, пакуты, як напісана ў Бібліі, аблегчаць душу. Але ў бога ён даўно не верыць і, магчыма, ніколі не верыў. Яўхім сказаў: «Між людзей жывеш, перад імі і адказвай, а не перад богам...» Праўду сказаў. Калі так падумаць, дык, можа, ужо дажывае... Толькі ці працякала яго жыццё побач з людзьмі? Быццам працякала і быццам не. Слізганула яно ўбаку ад іх, іншы раз выходзіла да людзей, як да святла, але не хапіла ў яго моцы, каб застацца на гэтым святле, каб не збочыць у цень. Бо так, здаецца, і лягчэй яму было. А калі падумаць з другога боку: што лёгкага? Пакуты ў адзіноце, шкадаванне сябе, безуцешнае чаканне спагады. Вось яно, аказваецца, жыццё сапраўднае іншы раз залежыць ад аднаго слова, сказанага шчыра і ў час, без усялякай баязлівасці... Магчыма... А можа, яно залежыць яшчэ і ад кроку, калі ты павінен ступіць, нават ведаючы, што на злом галавы... Не трэба абачлівасці пры гэтым, трэба паверыць у людзей, у іх гнеў і дабрату, як у самаго сябе. Наводшыбе ён, і хата яго наводшыбе... Таму і ацалела. Толькі ці лягчэй ад гэтага? Не, не лягчэй. Бо хата гэтая самому муліць сэрца цяпер не менш, чым успаміп пра Стася... Ён павінен хоць раз у

жыцці цвёрда зрабіць крок, ён павінен нешта прыдумаць, ён не мае права сам перад сабой застацца тым, кім лічаць!.. Божа, слова і крок, крок і слова. Як гэтага не хапала яму ўсё жыццё! І як не хапае цяпер.

На дварэ зусім сцямнела. Праз праём акна ў хату ўрываўся халодны вецер. Было бачна, як у цёмным небе слаба трапечуць зоркі, іх адбіткі пакалыхваюцца ў чорнай вадзе яго хаты зусім побач.

«Не! — прастагнаў Язэп, быццам прымаючы нейкае рашэнне. — Не, наперад...»

Ён хуценька злез з печы. Калыхнуліся пад нагамі зоркі, ён зноў адчуў пякучы холад вады.

## 18

Калі мужчыны дабеглі да Яўхіма, а Яўхім да іх, вада ўжо піхала іх у калені. Мікола і Міхей, нічога не кажучы, падхапілі яго пад рукі.

Яўхім аддыхаўся, яго галава ўпала на грудзі, знясілена выдыхнуў:

— Коней рашыў...

— Не ты рашыў — вайна, — сказаў Мікола. — Замініравалі дамбу. І нашы ніхто не праверыў... Мост праверылі — цэлы... Спяшаліся... Як гэта магло быць, вініць каго? Няма каго вініць, дзядзька. Хто ж думаў, што наша Буда, з адной хатай, з купкай людзей з'яўляецца для ворага нечым моцным? Як змяя, здаецца, забітая, а іншы раз уджаліць можа. Ты пры чым тут?.. Супакойся, супакойся, — ён угаворваў яго спачувальна-строга, — няма тваёй віны ў гэтым. А калі б хто з дзяцей пагнаў туды коней ці быў побач?

— Я — нічога... Адзін я... А вось, баронь лёс нас, што нікога не было, Валіка, Светы...

— Пайшлі, — сказаў Міхей, — вада ідзе і будзе ісці, а там жа жанчыны.

Падтрымліваючы адзін аднаго, яны ўтрох, нібы абняўшыся, рушылі да людзей, якія акамянелай купкай стаялі на ўзгорку ля пуні. Вада пераціскала ногі, хлюпала, накочвалася, штурхала ў калені, потым, аслабеўшы, заціхала на міг.

— Я голас свой чую, — слаба сказаў Яўхім. — Значыць, не скантужыла... А думаў, калі шпурнула на зямлю...

— Маўчы, дзядзька, маўчы, — сказаў Мікола. — Ад-

коціцца. Ці ж першы раз? Ці ж не памятаеш, як на стрэхах ды на гарышчах жылі?

— Во, во, — слаба ўсміхнуўся стары, — і куры былі з табой на гарышчы, ды яшчэ як ціснуліся, як ціснуліся. А скажы ты, як вада адкочвалася, дык і не ўзяць каторую...

Яны падыходзілі да людзей. Яўхіма ўразіла, што ніхто з іх не крычаў, не галасіў: ні жанчыны, ні дзеці, ні старыя. Ён паспрабаваў усміхнуцца, каб падбадзёрыць, разумеючы, што гэта зусім не стасуецца да таго, што адбылося. Але яго ўсмешку ў змроку ніхто не заўважыў. Перасільваючы шум у галаве, спытаўся:

— Ці ўсе хоць тут?

— Усе, — сказала Каця, — толькі Язэпа няма...

— Язэпа? — сказаў Яўхім. — У яго ёсць дзе схавацца, хата ж...

Яўхім заўважыў, як пасля яго слоў тарганулася Каця, яе рукі інстынктыўна хапіліся за жывот. Яўхім памкнуўся да яе, перахапіў рукі, зацііснуў у сваіх:

— Не трэба, Кацька. Ты, мабыць, спужалася?

— Не, дзядзечка, спачатку крыху... Дужа страшны выбух быў. Нядоўга мне адной быць...

— Ага, бачу, бачу... Жанкі, вы вядзіце Кацю, хадзем, мая ясачка, хадзем. Там цёпла, адпачні! А рукамі не чапай, не трэба, не чапайся за цела. Спуд ёсць спуд...

— Глупства гэта, — сказала Каця.

— Канешне, глупства, хай са спакоем народзіцца...

Жанчыны падышлі да Каці, хацелі ёй памагчы, але яна выпрамілася, уздыхнула з палёгкай:

— Адпусціла крыху, я сама...

Мужчыны і дзеці ішлі следам за імі да пуні, вада зноў прыбыла.

— Дзядзька, дзядзька! — амаль закрычала з пуні Сапёрская, — вада ж не кранула тут. Ну, ведалі, дзе пуню ставіць!..

Яўхім увайшоў у пуню, намацаў ліхтар. Мікола чыркнуў запалкай, запаліў ліхтар. У пуні і сапраўды было суха.

— Садзіцеся на калоду, — сказаў Яўхім, — тут застаўайцеся, а ты, Каця, і ты, маладзічка, — звярнуўся ён да Сапёрскай, — на гарышча.

Яўхім бачыў, як балюча таргануліся Кацін шчокі.

## 19

Блізка да поўначы, калі дзеці, скруціўшыся клубочкам, спалі на палацях, зробленых з жэрдак Міхеем, а Каця на гарышчы ціха стагнала, мужчыны пачулі з вуліцы разарваны ветрам голас:

— Людзі!.. Людзі!..

Яўхім усхапіўся, прачыніў дзверы і, пазіраючы ў цемру, крыкнуў:

— Каго гэта да нас прыбіла ў такую пару?..

— Ліхтар, ліхтар вазьмі, пасвяці, дзядзька! — параіў яму Мікола, падаючы ліхтар.

Яўхім узяў ліхтар, захлюпаў з пуні, спыніўся.

Голас аціх на хвіліну, потым недзе збоку ад пуні зноў пачулася хрыпла:

— Людзі...

Спачатку, калі Яўхім пачуў голас з вуліцы, ён здзівіўся, падумаўшы, каго гэта магло занесці сюды такою парою і адкуль? Дамбы ўжо няма, няма і моста, і адзіная дарога, якая злучала вёску са светам, адрэзана вадою. Ніхто чужы не мог сюды прыбіцца. Значыць... А можа, гэта яму здаецца? Можа, ён, Яўхім, яшчэ не ачуняў ад выбуху і ўсё яму прытрызнілася?

Не, ужо дужа ўсё, што нядаўна адбылося, было жудасным і рэальным, і непрыемная думка мільганула ў яго галаве. Ён ужо ведаў, хто гэта шукае ля іх паратунку, і помслівая зласлівасць, як ніколі раней, агарнула яго душу. Папераменна цяпер у ім змагаліся два пачуцці. Адно — адправіць таго, што прыйшоў, прэч. Так і сказаць яму, сказаць, каб стала невыносна крыўдна. Абразіць, каб ніколі не мог апамятацца, каб адчуў усю сваю нікчэмнасць як чалавек, нікому тут не патрэбны... Другое — злітавацца, прытуліць, даць сваё месца. Не ад дабра ж той прыйшоў сюды. Мабыць, многае перадумаўшы, перасіліўшы страх перад гэтымі людзьмі.

Калі выбраць першае, даць волю пачуццям непрыязні, дык як да гэтага паставяцца мужчыны? Можа быць, яны пагадзяцца з ім, Яўхімам. Можа, яны цяпер менавіта і чакаюць ад яго, як самага пажылога чалавека, адзінага правільнага рашэння, чакаюць гэтага — «прэч!», іх жа адносіны да таго, хто прыйшоў — зменлівыя, больш за ўсё ў іх непрымірымасці. Яны ж адкрыта часта жадалі яму бяды, гора і не хавалі гэтага.

Але ж часам і спачувалі, стараліся апраўдаць, раз-

думвалі, ці вінаваты ён у тым, што ім давялося перажыць. Ён, Яўхім, бачыў людзей і злых, і спагадлівых. І часцей за ўсё ён думаў, што чалавек ад зла — слепне. Ён перастае быць чалавекам і прагне толькі аднаго — зла. Але са злом жыць на зямлі нельга... Людзі павінны заставацца людзьмі ў любых абставінах. Ці не гэты чалавечы закон часта парушаецца намі самімі?

Не, у чалавечых сэрцах не павінна быць месца злу, калі бяда...

— Сюды, сюды, на святло! — Яўхім прыўзняў ліхтар.

Потым ліхтар высвеціў постаць чалавека. Яўхім пазнаў Язэпа — згорбленага, прыгнечанага, як пад цяжкай ношай. Яўхім ад нечаканасці застыў на хвіліну, потым спытаўся ціха:

— Гэта ты, Язэпе?..

— Я, я, Яўхімка...

— Адкуль ты?

— З дому я, з дому, — слабеў яго голас.

Яўхім павярнуўся і, апускаючы ліхтар, святло якога цяпер вострым трохкутнікам адмяжоўвала яго ад Язэпа, пахлюпаў у пуню.

Язэп спыніўся. Яго постаць, здаецца, застыла. І цень, цяжкі і чорны, некалькі разоў ускалыхнуўся на гэтым трохкутніку, слізгануў і знік у цемры.

— Ідзі сюды, няма чаго калець там, — сказаў Мікола.

— Людзі, — зноў прахрыпеў Язэп, падыходзячы. — Збожжа ў мяне там... дома... Вада прыбывае... Хлеб там. І печ яшчэ цёплая. Як жа вы тут... Дзеткі ж...

— Тут яны, тут, — выціснуў з сябе Мікола. — Каці дрэнна.

Язэп неяк бокам усунуўся ў пуню, цяпер ужо добра асветлены ліхтаром, ён раптам, выстаўлены як напаказ перад людзьмі, выпраміўся, мокрай рукой выцер твар, патупіў галаву ў ваду, якая ўжо лізала калоду ў куце, затым узняў на іх поўныя смутку і болю вочы і, бачачы як Мікола торгае за плечы Валіка і Свету, сказаў глуха:

— Хлеб, як жа вы без хлеба, дзеці... І хата...

Позірку ён не адвёў, калі Яўхім падышоў да яго, паглядзеў сурова, цяжка выдыхнуў паветра з грудзей і сказаў, як да сябе:

— Але ж...

## Напрадвесні

### 1

У гэтым старым цагляным будынку лесвіца была вузкая. Яе акантаваныя алюмініем прыступкі былі высока адна ад другой, і, узбіраючыся на трэці паверх, дзе размяшчалася рэдакцыя раённай газеты, Васіль Федаровіч трымаўся рукой за сінія, месцамі з паадставанай, нібы лушпінне, фарбай, парэнчы.

Злева ад яго на сцяне паўз лесвіцу красаваліся графікі, дыяграмы, стэнд «Лепшыя людзі гаспадарчай часткі» адной установы, якая займала два ніжнія паверхі будынка, справа, пад парэнчамі, былі падвешаны вазоны з кветкамі, якія прыдавалі ўсяму экзатычнасць.

Калі Васіль параўняўся са стэндам, шэрыя плямы фотаздымкаў на іх набылі выразныя абрысы. З-пад шкла на яго, нібы пытаючы, што тут патрэбна гэтаму юнаму чалавеку, пазіралі пажылыя мужчыны і жанчыны і потым праводзілі Федаровіча да патрэбнага яму трэцяга паверха.

На двух ніжніх паверхах панавала цішыня. Васіль чамусьці падумаў, калі нават ён пачне працаваць у рэдакцыі, наўрад ці знойдзе тут сабе сябра — ён жа такі малады.

На трэцім паверсе на лесвічнай пляцоўцы меўся невялікі ўтульны хол. Тут стаяў нізкі столік для часопісаў, мяккія зялёныя крэслы: з попельніцы на століку віліся пасмы шызага дыму — відаць, толькі што курылі хлопцы з рэдакцыі, але іх перапынілі і некуды тэрмінова паклікалі.

Васіль ступіў у цемнаваты калідор, прайшоў па мяккім варсістым дыване і сумеўся — таксама ні душы.

Звычайна, калі яшчэ школьнікам ён прывозіў у рэдакцыю заметкі, ужо на калідоры сустракаў супрацоўнікаў: хто хадзіў узад-уперад, нешта абдумваючы, хто курыў, раз-пораз ляпалі дзверы пакояў — яму здавалася загадкавай рэдакцыйная мітусня.

Цяпер цішыня насцярожвала. Федаровіч падышоў да вялікіх дубовых дзвярэй, на якіх было напісана «прыёмная», асцярожна, нібы па шкле, ціхенька, як баючыся, пастукаў.

Яму не адказалі. Васіль патаптаўся на месцы. Вырашыў пайсці назад, не ведаючы, ці хопіць у яго смеласці вярнуцца сёння сюды, але падумаў, што яму няма дзе бавіць час у райцэнтры — знаёмых тут у яго не было, а шлындаць па раскіслых ад дажджоў вуліцах не хацелася, і ён нечакана для сябе піхнуў дзверы. Магчыма, яму трэба было пераканацца, што ў пакоі нікога няма, тады ён пашыбуе на аўтастанцыю, купіць білет на аўтобус да Масткоў, а дома вырашыць, ісці працаваць на лесаўчастак ці не.

Дзверы рыпнулі, адчыніліся лёгка, і ён зусім сумеўся, нібы расчараваўся ў яшчэ не вырашаным для сябе — пайсці назад або застацца, — ля акна за сталом, знізу якога быў прымацаваны вялізны аркуш ватмана, сядзела сакратарка і вязала.

— Даруйце, — сказаў ён, — мяне сёння выклікаў Ігнат Сяргеевіч.

Сакратарка пакінула свой занятак, уважліва паглядзела на яго, потым усміхнулася.

— Праходзьце, праходзьце.

— У мяне позва ад яго.

Васіль каўзануў руку ў кішэню плашча.

— Не хвалюйцеся, я ж сама яе друкавала. Федаровіч?

— Федаровіч... Васіль.

— Дык вось вы які. А я падшываю нашу газету, амаль у кожным нумары бачу ваша прозвішча, во, думаю, нехта сталы з Масткоў піша, а вы вось які...

— Але...

— Падабаюцца мне вашы заметкі. Нашы ж хлопцы як пішуць? Нехта прывёз на поле сем вазоў гною, раўняйцеся на яго... Ды і тарфакрошка на зубах. А ў вас і сонца, і трава, і вецер, і фіранкі трапечуцца на акне, нібы ўсё на свае вочы бачыш.

— Дык жа ўсё адно крэсляць, — сказаў ён.

— Правяць? — нібы не паверыла яна. — А «Крокі да мары» за вас ніхто не перапісваў?

— «Крокі да мары»? — пацісну́ў ён плячыма. — Ат, не памятаю, — не прызнаўся ён і апусціў галаву.

— А што крэсляць, асабліва калі рэдактар, дык нічога. Я вам скажу, з кім не было? Добра, калі ёсць што і выправіць, горш, калі няма. Гэта не сорам. У нас многа добрых хлопцаў працавала. А цяпер, глядзі ты, адзін — старшыня калгаса, другі ў Мінску, у акадэміі, а Венядзікт Палікарпавіч у райкоме. Вось...

Жанчына гаварыла ветліва, усміхалася, у такт гаворцы ківала галавой.

— Прабачце, — сказаў ён, — як мне зайсці да Ігната Сяргеевіча?

— Пачакайце. Ён паклікаў усіх на лятучку. Вы ведаеце, што гэта такое.

— Чуў.

— Але, лятучка — гэта чысцільня. А калі яшчэ нечарговая, калі з некага здымаюць стружку, аж пыл курыцца, як сёння з фотакарэспандэнта Гайдука, дык вельмі павучальная для іншых... Гляджу на вас — не думаю, што калі-небудзь і новы супрацоўнік трапіць у чысцільню.

— А калі б і трапіў, дык нічога, жывы б застаўся, — сказаў ён, — гэта ж не хімічная.

— Яшчэ горш... Ведаеце, па сакрэту, людзям выдаюць рэдакцыйныя пасведчанні, а яны імі размахваюць, дзе б вы думалі? У піўной, як...

Жанчына не дагаварыла. За дзвярамі, абабітымі чорнай цыратай, якія былі ў левай сцяне прыёмнай, раптам загрукалі крэслы. Сакратарка таропка пачала друкаваць на машынцы.

Дзверы адчыніліся. З пакоя рэдактара, нібы хто яго выштурхнуў, выскачыў фотакарэспандэнт Гайдук, чырвоны як мак, пасміхаючыся, выйшлі супрацоўнікі.

Гайдука Васіль добра ведаў. Віктар колькі разоў прыязджаў у Масткі, заходзіў у школу, размаўляў з ім. Гайдук фатаграфаваў для газеты лесарубаў, пра якіх пісаў Васіль.

Віктару было гадоў сорак. Хадзіў ён у саламяным рыжым капелюшы. Высокі, лысаваты, калі здымаў капялюш, неяк смешна, кругамі, загладжваў лысіну, тым самым больш яе адкрываючы. Здавалася, Віктар быў наіўным: убачыць дзяцей на вуліцы, пачне фатаграфа-

-ваць, доўга пстрыкае апаратам, аж пакуль тыя не разбягуцца. Гайдук ніколі не намякаў, як гэта рабілі — таксама наведваліся ў Масткі — Панкевіч і Кудлацін, што не шкодзіла б паабедаць, узяць чарачку.

Таму, пачуўшы ад сакратаркі пра Гайдука, які нібыта выкінуў коніка ў піўной, Васіль здзівіўся. Калі б так сказалі пра Панкевіча ці Кудлаціна, справа іншая.

— Чаму мне ніхто не верыць? — крычаў Гайдук, размахваючы рукамі, — я за людзей заступіўся. Ім не было чым разлічыцца. Ну, заплаціў я за іх грошы, што тут такое?

Панкевіч і Кудлацін пасмейваліся.

— Ат! — Гайдук у роспачы ляпнуў дзвярыма, аж зазвінелі шыбы. На грукат выйшаў рэдактар, сказаў яму ўслед:

— Вы гэта кіньце!..

Супрацоўнікі, вітаючыся з Васілём, адзін за адным пакінулі прыёмную.

Васіль стаяў ля дзвярэй, не ведаў, што рабіць. Рэдактар крутнуўся на месцы і толькі цяпер заўважыў Васіля.

— А, Федаровіч, — сказаў ён, — я вас чакаў.

— Добры дзень...

Васіль зніякавеў: чалавек яго чакаў, а ён толькі цяпер, перад абедам, з'явіўся.

— Ведаеце, раніцой аўтобуса не было, я чакаў спадарожную, пакуль трапілася.

— Але, — рэдактар паглядзеў на гадзіннік, — абедаць пара. Давядзецца пачакаць.

Васіль сеў у крэсла.

Рэдактар павярнуўся да дзвярэй і моўчкі прашоргаў вялізнымі, ці не сорак апошняга памеру, чаравікамі ў калідор.

— Ну вось, — спачуваючы Васілю, сказала сакратарка, — цяпер давядзецца чакаць.

— Нічога, — знарок заспакоена сказаў Васіль. — Пачакаю.

Васіль разглядаў пакой. Прасторны, чысты, бліскучыць паркетная падлога, ладнае акно на галоўную вуліцу гарадка, у куце доўгі стол, на ім падшыўкі газет.

З калідора расчыніліся дзверы, у прыёмную нечакана ўвайшоў рэдактар.

— Заходзьце, — сказаў ён, — што з вамі зробіш?

Рэдактар прапусціў яго наперад, прапанаваў сесці.

Васіль прыткнуўся на край крэсла ля сцяны. Рэдактар паглядзеў на яго з прыхаванай усмешкай.

— Вось што, шаноўны, даю вам першы журналісцкі ўрок. Для журналіста ці сталічнай, ці раённай газеты не павінна быць дзвярэй, якія б ён не мог адчыніць. — Рэдактар узняў указальны палец правай рукі. — Вас не прымаюць, а вы павінны дабіцца, каб прынялі. Вас не пускаюць у дзверы, лезьце праз акно, праз комін, калі ён ёсць. Вас выкідваюць за каўнер, пакіньце каўнер у тых руках, а свайго дамагайцеся.

«Жартуе або кажа сур'ёзна? — думаў Васіль. — І што гэта за прынцыпы, няўжо ёсць людзі, якія пазбягаюць газетчыка?»

— А калі...

— А калі, — перахапіў яго думку рэдактар, — для газетчыка не існуе. Ён павінен заўсёды быць там, дзе трэба, хоць памры! Вы ж прыехалі за столькі кіламетраў не разглядаць мой пакой, а вам трэба быць у мяне. Дык вось, заходзьце, нават калі я і моцна заняты. Бо справа газетчыка не належыць асабіста вам, гэта справа газеты. А яе выхаду чакаюць людзі. Ім жа не скажаш, чаму ў газеце не напісана пра тое, што іх хвалюе, чаму яны не ведаюць пра тое, што павінны ведаць. Хіба вы будзеце тлумачыць людзям, што не ўзялі матэрыял, бо вас вытурылі, што з вамі не захацелі гаварыць? Калі б гэта была ваша асабістая справа — спіце ў шапку, а так...

— Але ж я прыйшоў па асабістай справе.

— Не зусім. Якая ж гэта асабістая справа, калі вас бяруць на работу ў газету? А можа, я павінен даць вам адразу заданне, можа, сёння ў мяне няма чалавека, каб паслаць, скажам, на маслазавод? Там малако сапсавалася. Ужо не першы дзень яго несвоечасова прывозяць у магазіны. Што скажуць людзі? Што ў нас няма малака? А яно ёсць! Згублена праца многіх людзей, якія досвіткам ішлі на фермы, якія спяшаліся прывезці малако ў горад. А хто вінаваты? Магчыма, адзін-два чалавекі на заводзе.

Рэдактар узняўся з крэсла, прайшоў узад-уперад па пакоі, нібы прыслухоўваўся да сваіх слоў, спыніўся ля акна. Твар яго быў сур'ёзны.

— І тады кожны чалавек на сваім месцы: ля станка ці на будоўлі, за рулём машыны ці ў зубапратэзным кабінеце — успомніць гэта і падумае: а калі я буду працаваць праз пень-калоду? І дос! Яму варта толькі так па-

думаць, і, паверце мне, малады чалавек, сумленне яму не дазволіць дрэнна працаваць! І тады вы зразумееце, што мелі права грукаць у дзверы, якія нехта зачыніў, ледзь не прышчаміўшы вам нос, грукаць да таго часу, пакуль той, хто сядзіць за тымі дзвярыма, не пачне глытаць анальгін, хапацца за галаву, пакуль не зразумее: калі будзе дрэнна выконваць свае абавязкі, яго пратурацць адсюль, што галоўнае — дзяржаўнае, наша народнае, а потым ужо — сваё.

— Прабачце, Ігнат Сяргеевіч, — сказаў Васіль, — мне здаецца, што гэта павінен разумець кожны, ды і разумее.

Рэдактар прыжмурыў вочы, доўга глядзеў на Васіля, потым вярнуўся на месца, сеў у крэсла.

— На жаль, ёсць і такія, хто не хоча разумець гэта.

— Дык што, у газетчыкаў нібыта няма нічога асабістага?

— Ёсць, ёсць! Гэта шырокае паняцце, асабістае. Калі браць больш вузка, для нас, напрыклад, — радасць. Так, так, звычайная чалавечая радасць і разуменне таго, што ты карысны грамадству... Калісь я напісаў першую заметку. Калі даведаўся, што яе надрукуюць, то ноч прастаяў пад вокнамі друкарні. Я ўдыхаў цёрпкі пах фарбаў, які даносіўся з прачыненых фортак, а раніцой у кіёску скупіў усе газеты. А допіс той — сем радкоў.

Васіль не разумеў, што гэтым хоча сказаць Ігнат Сяргеевіч: ці ён ужо такі вялікі журналіст, ці як ніхто ўмее радавацца зробленаму? Дык у газеце, колькі сябе памятае Васіль, Ігнат Сяргеевіч не надрукаваў ні радка. Радасць ад свайго першага надрукаванага верша Васіль таксама памятае. Так, пакуль што найвялікшая радасць у жыцці, пакуль яшчэ невялікім... Шосты клас. У піянерскай газеце на першай старонцы восем радкоў пра вясну і подпіс: «Васіль Федаровіч, піянер Масткоўскай школы». Вучні ўсёй школы пазіралі на яго з зайздрасцю. А старшакласнікі на перапынках заглядвалі ў клас, каб паглядзець на паэта...

— Ці яшчэ, — перабіў яго думкі рэдактар, — калі я вучыўся ва універсітэце, там выкладаў чалавек, які не прамінаў пахваліцца, што надрукаваў чатырнаццаць карэспандэнцый. Якая дакладнасць! Далей гэтага ён не пайшоў, але я цяпер разумею, што з яго выкладчык дрэнны, ды, мабыць, горш было б, калі б ён быў дрэнным журналістам. Выкладчык — жыццё...

Рэдактар гаварыў доўга, гэта стамляла, у галаве ўсё блыталася, словы яго ўжо былі для Васіля, як гарох аб сцяну, таму, калі на стале зазваніў адзін з трох тэлефонаў і Васіль не ўцяміў, якім чынам Ігнат Сяргеевіч беспамылкова ўзяў патрэбную трубку, паднёс да вуха, ён уздыхнуў з палёгкай.

Рэдактару нешта казалі, ён смяяўся, з нечым згаджаўся, ківаў галавой, быццам яго бачылі на другім канцы дроту, і Васіль баяўся: раптам тэлефонная размова скончыцца, зноў пачнуцца павучанні, ад якіх кружыцца галава. І размова скончылася.

Ігнат Сяргеевіч асцярожна паклаў трубку — няйнакш як гаварыў з начальствам, падумаў Васіль, — сказаў:

— Другі ўрок. Я вам нагаварыў вядро дыму. А там жа на дне вугольчыкі. Вы, як газетчык, і выберыце з яго адзін-два, якія вам спатрэбяцца. А астатняе — міма... Пішыце заяву.

Ён падаў Васілю чысты аркуш паперы.

## 2

Выйшаўшы з кабінета рэдактара, Васіль развітаўся з сакратаркай, — яна павіншавала яго з тым, што залічылі ў штат газеты, — весела заскакаў па прыступках лесвіцы ўніз. Што ні кажы, а яго, Васіля Федаровіча, сына лесаруба, запрасілі на сталую работу, не абы-куды, а ў газету. «Во будзе дома гаворкі, — думаў ён, — ды і з бацькам я яшчэ паспрачаюся».

Бацька не ўхваляў захаплення сына — пісаць у газету. Мабыць, таму, што паштарка два разы ў месяц прыносіла ганарары, хай і невялікія, за надрукаваныя Васілёвы допісы. Калі Васіль аддаваў грошы маці, бацька казаў:

— А ты падумаў, сын, што людзі скажуць? Гэта ж каб ты іх, грошы, зарабіў сякерай, мазалём, а то сеў і за паўгадзіны напісаў... Сонца, лісточкі, назбіраў сяготаго па слову. А я, можа, як працую, дык і не бачу гэтых лісточкаў, мне план трэба рабіць.

— Парфен, — заступалася за Васіля маці, — не дужа хто і напіша, як ён.

— Не дужа, — не згаджаўся бацька, — даўней дзяк пісаннем таксама карміўся. А людзі пра яго як казалі?

— Дык жа Васіль не дзяк. А пра дзяка казалі ўсялякае. Хто і зайздросціў. А хто і...

— А я — праклінаў. Некалі хлапчуком, ад малодшых, ад сям'і адарваўшы, насіў дзяку ў шапцы яйкі, каб ён майму бацьку на вайну ліст напісаў.

— Збіраеш мох з балота. Колькі вады ўцякло? Тады ж усе цёмныя як ноч былі. А цяпер — вучыся і не хачу.

— А ведаеш, тата, — смялеў Васіль, разумеючы, што маці на яго баку, — ты сякерай на жыццё зарабляеш, напрыклад, а журналісты і пісьменнікі пяром. І кожны на сваім месцы павінен рабіць, галоўнае, каб добра рабіў.

— Што ты мяне вучыш? То ж пісьменнікі і журналісты, — з павагай казаў бацька і выпрамляўся, уздымаў галаву, паглядаў на сына быццам звысака, — яны вучаць людзей, як жыць, працаваць. Хіба яны раўня табе, сталыя людзі? Што ты бачыў, акрамя школы?

— Чаму што? Вунь усё лета пасля дзевятага класа працаваў на дарозе, — заступалася за сына маці.

— Во, во, лета папрацаваў і ўжо ўсё ведае, — не згаджаўся бацька. — Што працаваў — добра, а то ў такія гады розум як бачыш выветрыцца ад гуляў. Ты ж паглядзі, Марыя, якія дзеці шкоду робяць па завуголлі? Тыя, што палец аб палец не ўдараць, летам выгульваюцца, шлындаюць абы-дзе. Ды хіба адзін Васіль рабіў? Хількава дзяўчына таксама, хлопец Вяргейчыка Ладзімера, Віталь... Рабіць — не красці, грэху няма... Ну пішы, калі ўжо так. Толькі каб гэта... каб не дужа павучаў, ды каб грошы не прысылалі.

Васілю і самому стала няёмка з-за тых грошай. Вунь бацька як працуе, а калі прыносіць у хату прэмію, дык столькі радасці ў яго, столькі гаворкі пра гэта. А прэмія тая — Васілёў ганарар за месяц.

Васіль ведае, што справа не ў грашах для бацькі, а ў тым, што ён робіць не горш за другіх.

— Тата, — пытаў Васіль, — табе прыемна, што далі прэмію?

— А як жа?

— Мне таксама, што прыслалі ганарар. Можа, гэта мая прэмія.

— Хай будзе так, — нарэшце згаджаўся бацька, — толькі зноў прашу, не дужа людзей вучы. Каб самому вучыць другіх, трэба многа ведаць...

Цяпер Васіль вырашыў зайсці ў кнігарню, купіць падручнікі па журналістыцы. Вядома ж, калі ў Мінску ва універсітэце ёсць факультэт журналістыкі, дзе вучаць пісаць, то павінны быць і дапаможнікі.

Кнігарня, новы вялікі аднапавярховы будынак, абліцаваны блакітнымі блішчастымі пліткамі, размяшчалася на суседняй вуліцы. Калі з рэдакцыі ісці туды вуліцай, то далекавата, мінут дваццаць хады. Калі ж праз рынак, то як бачыш будзеш там. Праўда, праз рынак няёмка — трэба пералазіць праз плот. Ды, урэшце, усе так робяць. Васіль неаднойчы на свае вочы гэта бачыў. Ён скіраваў праз рынак.

На рынку за доўгімі пачарнелымі драўлянымі сталамі сядзелі пажылыя жанчыны і бабулькі. Перад імі ляжалі грудкамі крамяныя сакаўныя яблыкі, але пакупнікоў было мала. Бабулькі цікавалі ці не за кожным, хто праходзіў міма, запрашалі пакаштаваць, той-сёй браў малюсенькі, як зубок часнаку, скрылік яблыка і, пакаштаваўшы, купляў.

У канцы рынку прадавалі гусей, качак, курэй, індыкоў. Тут стаяў гармідар ад гэгату, кудахтання, людзей тут было больш.

Мужчына ў белай кашулі, пры гальштуку, у скураным капелюшы трымаў за бліскучы ланцуг вялізнага індыка. Васіля здзівіла — на такі ланцуг звычайна навязваюць сабак, а тут прывязаны за нагу індык. Мусіць, мужчына, купіўшы яго жывога, не ведаў, як данесці да кватэры. Індык распускаў хвост і нагадваў казачную птушку.

— А вы вазьміце жар-птушку пад паху. Калі будзеце моцна трымаць, ваша шчасце не ўцячэ, — весела параіў яму Васіль.

— Дзе ты яго ўтрымаеш, шчасце гэта? — сказаў сур'ёзна мужчына. — Індыка б забіць, ды ў мяне рука не ўзнімаецца.

Васіль ужо хацеў ісці далей, але мужчына затрымаў яго:

— Слухай, хлопец, а можа, ты гэта зробіш? Я заплачу.

— Ды вы што? — адступіў далей Васіль, — навошта мне вашы грошы?

Васіль заспяшаўся прэч, а перад вачамі яшчэ доўга бачыўся разгублены твар мужчыны і самотны індык, нагу якога моцна абвіваў ланцуг.

У кнігарні яму сказалі, што кніг па журналістыцы ў раён не завозяць, бо ніхто не цікавіцца, супакоілі, што ўвогуле іх хоць адбаўляй, калі верыць выдавецкім планам, якія ляжаць на століку.

Васіль не стаў гартаць планы, ён падышоў да раздзела беларускай літаратуры і сярод некалькіх дзесяткаў кніг знайшоў зборнік літаратурна-крытычных артыкулаў па сучаснай прозе, купіў яго. Яму здавалася, што нічога, акрамя падручнікаў, не дапаможа ў будучай газетнай рабоце.

Але на аўтастанцыі, чакаючы ў Масткі аўтобус, Васіль уважліва прагледзеў некаторыя артыкулы і разгубіўся. У артыкулах было столькі цытат, як у непрасееным просе чорных зярнят.

3

У Масткі Васіль прыехаў пад вечар. Ён выйшаў з аўтобуса ля аўтастанцыі і сцепануўся. Было холадна. Па небе плылі цяжкія шэрыя хмары, здавалася, што яны перакочваюцца па цёмна-чырвоных вяршынях старых асін, якія гаем раслі адразу ля аўтастанцыі і дугой падступалі да пасёлка.

Было гразка, месцамі чарнелі калюжыны, учора цэлы дзень дажджыла, а сёння з раніцы сонца паказалася ўсяго на нейкую гадзіну, і, напэўна, пакуль ён ездзіў у раён, тут зноў церуссіў дожджык.

Недалёка ад аўтастанцыі знаходзіўся машынны двор лесаўчастка. Там пад адкрытым небам стаялі МАЗы з доўгімі прычэпамі. Машыны гулі, вярталіся з рэйсаў, было чутна, як нехта стукае ў рэйку — Васіль ведаў, гэта азначае, што рабочы дзень скончыўся і праз некалькі мінут людзі пойдуць дадому.

На машынным двары, дакладней, у рамонтнай майстэрні, цяпер працавалі яго аднакласнікі Іван Шапаткевіч і Пятро Гардзейчык. Васілю не хацелася з імі сустракацца. Пачнуцца роспыты пра яго справы, а што яму казаць, калі ён нібыта ў чымсці вінаваты перад хлопцамі, ну хаця б у тым, што яны прыходзяць з работы запэцканыя, у майстэрні нават няма дзе памыцца, а ён будзе сядзець, як кажа маці, у чыстым, у добрым.

Таму Васіль адразу не накіраваўся дахаты — трэба было мінаць двор лесаўчастка, — а, перайшоўшы шашу, заспяшаўся ў асіннік, а там — на школьны стадыён.

Лісцё, якое паспела апасці з дрэў, пажухла-карычневае, ліпкае, спыніла яго ўвагу, і ён падумаў, калі б раптам выйшаў сюды намаляваць акварэллю, то не знайшоў бы адпаведных фарбаў для гэтай пары восені —

быццам наўкола ёсць святло, а калі прыгледзецца, дык яно цяжкое і яго трэба перш-наперш адчуць не зрокава, а душой, а потым ужо думаць, якія фарбы браць.

Да стадыёна сёння ён ішоў як ніколі доўга, абмінуў кусты, на якіх холадна блішчэла раса — зачапі апраткаіі, вымакнеш. Калі ж выйшаў на стадыён, то здзівіўся халаднавата-зялёнаму бляску травы.

З аднаго боку стадыён апяразваў асіннік, з другога — пасляваеннай пасадкі сасоннік.

Сасоннік рос на Яўменавай гары — так у Мастках называлі грудок, ля якога некалі была ладная паляна. Калі ў Мастках адкрылі сярэднюю школу, вакол паляны выкарчавалі добры лапік хмызняку, зрабілі футбольнае поле, адсюль да школы рукой падаць.

Гару ён добра ведаў. Яшчэ хлапчуком, калі хадзіў у пачатковую школу, Васіль разам з сябрамі летам гуляў тут у вайну, з тымі ж Пятром і Іванам. Зімой коўзаўся з гары на саначках. Калі яму трэба было ісці ў пяты клас, падэшву гары прыраўняў бульдозер, і рабочыя лесаўчастка зрабілі тут стадыён.

У той год лесаўчасткаўскае кіраўніцтва аддало пад школу вялізны драўляны будынак інтэрната, які пуставаў, бо да таго часу ўсе рабочыя ўжо мелі свае дамы.

Будынак стаяў якраз ля сасонніку, таму, калі настаўнікі думалі-гадалі, дзе зрабіць стадыён, начальнік лесаўчастка выдзеліў бульдозер і загадаў трактарысту расчысціць паляну.

Паляна пасля таго шырэла кожны год — на ўроках фізкультуры вучні старэйшых класаў ссякалі кусты, зразалі рыдлёўкамі купіны, засыпалі пяском ямкі, пакуль аднойчы ў школу не прыбег ляснік і дужа сварыўся ў настаўніцкай, пагражаў усіх аддаць пад суд.

У той жа дзень, а было гэта перад выпускнымі экзаменамі, ля школы спынілася пажарная машына, з яе выйшаў начальнік лесаўчастка і доўга гаварыў з дзесяцікласнікамі.

Дзесяцікласнікі тады засталіся пасля ўрокаў. У клас прыйшоў дырэктар школы Карней Іванавіч. Уладзімір Мікалаевіч, начальнік лесаўчастка, пачаў здалёк. Ён расказаў гісторыю пасёлка, якую ўсе добра ведалі. У сорак пятым сюды, у лес, прыехала група былых франтавікоў, якія будавалі лесаўчастак. Усе яны былі бацькамі гэтых хлопцаў і дзяўчат, якія цяпер сядзелі перад дырэктарам і Уладзімірам Мікалаевічам. Цяпер аказалася,

што праз колькі год іх бацькі пойдуць «на заслужаны адпачынак», а як жа справа?

Гэта ўзрушыла ўсіх, Васіля таксама. Ён ніколі не думаў, што справы бацькоў зачахнуць, калі тыя пойдуць на пенсію, таму, не чакаючы, пакуль Уладзімір Мікалаевіч скончыць, падаў голас з месца:

— Дык што нам рабіць? Хто ў гэтым вінаваты, мы?

Вакол зашумелі, загаварылі, не слухаючы адзін аднаго. Уладзімір Мікалаевіч уладна паляпаў пяцярнёй па стале, сказаў працяжна, калі пацішэла:

— Усяму вашаму класу застацца працаваць на лесаўчастку, бацькоў замяніць.

Гэта было нечакана — колькі разоў з класа ў клас, з году ў год той-сёй з настаўнікаў, калі хто дрэнна вучыўся, распякаў вучня, што з такімі ведамі яму жыцця сапраўднага не бачыць, прарочыў сякеру, працу лесаруба, у лепшым выпадку рычагі трактара або руль лесавоза. Гэта ўчэпіста заставалася ў іх свядомасці, занятак лесаруба станавіўся нібы абразлівым, а тут на табе!

— Навошта тады мы вучыліся дзесяць гадоў, — узняўся з месца Валера Іваноўскі, — каб ссякаць з хлыстоў голле, хадзіць у камбінезоне ці круціць гайкі?

Валера быў выдатнікам. Гаварыў заўсёды, што думаў, не баяўся спрачацца з настаўнікамі.

— Чаму ж так? — здзівіўся Уладзімір Мікалаевіч. — Усякая работа патрэбна. І ты дарэмна так кажаш. Твой бацька разам са мной прыйшоў сюды, у лес, жыў у зямлянцы, недаядаў і недасыпаў, але не патрабаваў за свае ваенныя заслугі высокую пасаду, лесаруб ён.

— Тады быў такі час, тады не да вучобы было. Чаму, скажыце, Уладзімір Мікалаевіч, я павінен ісці ў лесарубы, калі я хачу далей вучыцца?

— На каго?

— На ляснічага, напрыклад.

— Вось бачыш, на ляснічага. Калі ты пойдзеш на лесаўчастак, то праз два гады мы цябе накіруем на вучобу. Скажу табе, што і выдатнікі не ўсе пасля школы паступаюць.

— Дзякуй, праз два гады будзе позна, — працягваў Валера.

— Чаму?

— Настане час выканаць свой салдацкі абавязак. Гэта яшчэ два гады. А раптам я пасля службы ажанюся?

Апошняе ён сказаў жартуючы. Усе засмяяліся.

— Ціха, ціха! — стараўся суняць вучняў дырэктар. — Ну, хіба не дзеці? Хіба з вамі можна гаварыць сур'ёзна?

— Можна, — уставіў слова Пятро. Ён сядзеў на апошняй парце, на год быў старэйшы за таварышаў, два гады «вывучаў» праграму сёмага класа, з ім лічыліся.

— Дык вось, — зноў узняўся з месца Уладзімір Мікалаевіч, — калі ажэнішся, дык мы цябе не кінем, хату табе паставім, жонку ўладкуем на працу.

— Куды, у лесарубы? Яна ж сякеру не пацягне.

— Не, навошта ёй у лесарубы? Ты будзеш добра зарабляць, знойдзем ёй месца ў канторы, напрыклад.

— Дзіўна...

— Зразумейце, хлопцы і дзяўчаты, мы нецікава жывём. У газетах пішуць, што ў многіх вёсках выпускнікі застаюцца працаваць у родных калгасах, а вы на родным прадпрыемстве будзеце. Гэта ж здорава!

— Прабачце, а чаму абавязкова ўсім трэба заставацца? — не стрымаўся Васіль. — А можа, хто не хоча?

Уладзімір Мікалаевіч выцер узмакрэлы лоб, спытаў:

— Падыміце рукі, хто не хоча?

Вучні паглядзелі адзін на аднаго, быццам чакалі, хто гэта зробіць першы, але ніхто так і не ўзняў, хаця Васіль разумеў, што амаль ніхто не згадзіўся з начальнікам лесаўчастка.

— Ніхто, — з палёгкай уздыхнуў Уладзімір Мікалаевіч, — ну і добра. Клас — гэта калектыў.

— Дык, можа, закрыць школу? — здзекліва спытаў Васіль.

— Навошта? Мы не для гэтага яе адкрывалі, а адкрывалі за кошт леспрамгаса, думалі, вы аддзячыце, а вы вось якія...

— Якія? — Васіль усхапіўся з месца. — Няўдзячныя? Дарэмна вы нас гэтым папракаеце. Мы будзем вучыцца або працаваць, пачнём прыносіць карысць Радзіме не меншую, чым гэта рабілі б тут, а можа, нават і большую.

— Ты не маеш рацыі, Васіль, — перабіў яго Уладзімір Мікалаевіч, — я лічу, што найбольшую карысць вы прынясеце тут. Вы ведаеце лес, тут працуюць вашы бацькі. Яны пачыналі, як кажуць, з голага месца. Хутка яны пойдуць на пенсію. Няўжо вам усё роўна, што будзе з пасёлкам?

— Не, — сказаў Васіль, — але што нас тут чакае?

Уладзімір Мікалаевіч павесялеў, пачаў пералічваць на пальцах:

— Зарплата амаль утрая большая, чым вы будзеце атрымліваць пасля інстытута — раз, жыць дома, калі так сказаць, на ўсім гатовым — два, кватэра таму, хто ажэніцца — тры, уласная машына без усялякай чаргі — чатыры... Мала?

— Хопіць, Уладзімір Мікалаевіч, — Васіль усё больш пратэставаў, — нас у школе вучылі другому. Вы ж нас схіляеце да дабрабыту, абяцаеце залатыя горы. А мы не хочам чужых залатых гор, асабіста я хачу да ўсяго сам дайсці.

— А я, скажыце, кім тут буду? — спытаў Іваноўскі. — Лесарубам?

— Вядома, прастойвае новая тэхніка. А яна складаная, калі хочаш ведаць, тут адукацыі і дзесяці класаў не хопіць.

— Зразумейце, — Валера пастукаў сябе ў грудзі, — я даглядаць лес хачу, а не знішчаць яго.

— Чаму знішчаць?

— Таму што знішчаць. Яшчэ тры-чатыры гады назад вакол Масткоў якія лясы шумелі, а цяпер зеўраюць чорныя лысіны. І хоць бы дзе пасадку зрабілі, усё рэжам, рэжам. А я Леаніда Лявонава чытаў. Ён піша, што ў прыродзе павінна быць гармонія — лесу можна нарыхтоўваць не больш не менш, чым яго вырастае за год.

— Ну вось і табе справа знойдзецца, нас розуму навучыш, а то мы нічога не ведаем, — скептычна ўсміхнуўся Уладзімір Мікалаевіч.

Іваноўскі гэтага не прыкмеціў.

— Пераканалі, я згодзен, — сказаў ён. — Хто яшчэ? Ён павярнуўся да аднакласнікаў.

— Чакай, — сказаў Васіль, — мне здаецца, што гэта неразумна — увесь клас агітаваць у лесарубы. А калі вось Віталь, напрыклад, — ён паглядзеў на сябра Віталя Судзілоўскага, з якім сядзеў за адной партай, — лётчыкам хоча быць, дык яму што, на гэта махнуць рукой? Ды я ўпэўнены, што ён там больш патрэбен будзе.

Віталь піхнуў Васіля ў бок, маўляў, хто цябе пытае.

— Васіль, — сказаў дырэктар, — ты быццам разумны хлопец, у газету пішаш. Зразумей простую ісціну, такіх, як Віталь, у вучылішча на адно месца дзесяткі, яшчэ невядома, ці паступіць менавіта ён. А тут ужо яго чакае справа.

— Не, — усхапіўся з месца Віталь, — я буду лятаць, нават калі адразу не паступлю. Паглядзіце колькі кас-

манаўтаў, напрыклад, не адразу свайго дабіваліся. Я паважаю ўсіх, хто працуе, але я хачу быць лётчыкам. Ці вазьміце Васіля, — ён паглядзеў на сябра, — раней ён быў гонарам нашай школы. Вучыўся добра, у газету піша, а як малюе. А можа, з яго атрымаецца пісьменнік ці мастак, і мы будзем ганарыцца, што ён нарадзіўся сярод лясоў нашых...

— Ды кінь ты! — зазлаваў Васіль.

— Чаму кінь, чаму? У цябе здольнасці, і менавіта іх ты павінен развіваць.

— Ну вось, — сказаў незадаволены дырэктар, — тут жа размова не пра асабіста кожнага з вас, а пра далейшы лёс пасёлка. А пасёлак — гэта гісторыя.

— Вы хочаце сказаць, што мы эгаісты? — спытаўся Васіль.

— А лічы, што так, — дырэктар адвярнуўся ад яго да акна.

— Васіль, ну скажы ты! — Віталь, мабыць, вычарпаўшы ўсё, што думаў, сеў на месца, грукнуўшы партай.

— Ды што казаць, — сказаў Васіль, — я сёння ж напішу пра гэта ў газету.

Васіль і сапраўды пра ўсё напісаў. Але потым хадзіў, як подмазку з'еўшы. Яго матэрыял зусім не быў падобны на тое, пра што ён пісаў. І назва чужая: «Крокі да мары». І пісалася там пра тое, што больш паловы дзесятага класа Масткоўскай сярэдняй школы вырашыла застацца працаваць на родным прадпрыемстве. Тады чамусьці Васілю здалося, што ў газеце памыліліся, пад чужым матэрыялам паставілі яго прозвішча.

Але на наступны дзень ён сустрэў Уладзіміра Мікалаевіча ля клуба. Уладзімір Мікалаевіч паляпаў яго па плячы.

— А ты, Васіль, аказваецца, разумны хлопец, дзякуй. Ты так дапамог сваім матэрыялам! Цяпер увесь раён ведае пра нашых хлопцаў. І я табе кажу, ужо ніхто з іх не адступіцца ад свайго рашэння.

— Чаму?

— Сорамна будзе... А ты яшчэ не рашыўся?

— Рашыўся, — сказаў Васіль.

— Дык прыходзь хоць заўтра, пішы заяву.

— Дзякуй, я еду вучыцца.

— Куды?

— Куды-небудзь.

Васіль павярнуўся і пасунуўся ў роспачы прэч.

## 4

Рашэннеісці вучыцца «куды-небудзь» з'явілася ў Васіля нечакана, калі размаўляў з Уладзімірам Мікалаевічам, пасля таго як у раённай газеце надрукавалі матэрыял «Крокі да мары» за яго подпісам.

За гады вучобы ў школе Васіль, нягледзечы на тое, што яго часта друкавалі ў газеце, так і не вызначыў для сябе, кім быць. Пісалася яму лёгка, бацька да гэтага занятку сур'ёзна не ставіўся. Паспрабаваць паступіць ва універсітэт на журфак? Але хлопцы з раёнкі казалі, што там прыхільна ставяцца да тых, хто мае стаж работы па спецыяльнасці. Паступаць жа на філфак не хацелася, хоць, сочачы за часопісамі, Васіль прыкмеціў, што ў асноўным літаратурная моладзь — філфакаўцы. А раптам ён не здольны пісаць па-сапраўднаму, пісьменнікам не стане, тады давядзецца ўсё жыццё карпець над сшыткамі. Заставацца працаваць на лесаўчастку было няёмка: сам спрачаўся з Уладзімірам Мікалаевічам, казаў, што не трэба, каб увесь клас заставаўся ў Мастках, а трэба, каб выпускнікі шукалі справу па душы. Не. Што б там ні было, а ён паедзе з Масткоў. Ды і хлопцы, якія пайшлі на лесаўчастак, пасля заметкі «Крокі да мары» цяпер не зважалі на Васіля. Таму ён, не раздумваючы, назаўтра адправіў дакументы ў абласны педінстытут. Чамусьці яму вельмі хацелася, каб дакументы спазніліся, каб іх вярнулі. Але з інстытута прыйшла позва.

І ён паехаў у горад. У спісе абітурыентаў, якія паступалі на гістарычны факультэт, ён знайшоў і сваё прозвішча. «Трэба здаваць, — вырашыў ён, — а там будзе бачна».

Ён адмовіўся ад месца ў інтэрнаце, — у Магілёве, на ўскраіне, жыла цётка, родная сястра яго бацькі, і Васіль пасяліўся ў яе. Да цёткі прыехаў у адпачынак яе адзіны сын Хведар, які толькі што скончыў марское вучылішча і хадзіў у новенькай форме афіцэра.

— Ну і прафесію ты сабе выбраў, — смяяўся Хведар, — гісторык... Хлопцы цяпер імкнуцца ці ў неба, ці на ваду, а ты будзеш варушыць пыл егіпецкіх пірамід.

— Ды не хацеў я, разумееш, не хацеў, — казаў роспачна Васіль, — атрымалася так.

Ён расказаў Хведару пра ўсё.

— Дзівак, тады плюнь на ўсё і не ідзі здаваць экзамены.

— А што скажуць у Мастках? Вучыўся-вучыўся, паехаў на экзамены і не здаў.

— Думаеш, што лепш будзе, калі ты паступіш у педінстытут, супакоіш бацькоў, сябры пазайздросцяць, а потым усё жыццё будзеш кусаць локці. Няма нічога горш, чым займацца нелюбімай справай. Ты ж пішаш?

— Але.

— Дык і пішы.

— Пра што пісаць, калі я ўжо не ў Мастках? Тут жа для мяне ўсё чужое.

— Вось і едзь дадому. Ты ж сам пісаў мне яшчэ зімой, што ў газету хочуць цябе забраць.

Хведар, гаворачы так, усміхаўся:

— На флот бы цябе, там бы зразумеў, што такое жыццё. Зялёны ты нейкі, і целам і душой.

Васіль не крыўдаваў. Ён і сам разумеў гэта.

— Хутчэй бы хоць і на флот.

— Але ж да службы два гады, — сказаў Хведар. — Трэба мець нейкі занятак.

— Ды кінь ты, Хведар... А можа, усё-такі мне паспрабаваць, разумееш, для сябе, здаць экзамены?

Хведар згадзіўся, і Васіль пайшоў на экзамены. Тры экзамены ён здаў паспяхова, а перад чацвёртым забраў дакументы. Чацвёртым было сачыненне.

— Ёлуп! — крычаў на яго Хведар. — Быць на парозе інстытута і такое калена выкінуць!

Васіль быў упэўнены, што сачыненне ён напісаў бы калі не на «выдатна», то на «добра», але каб Хведар больш не сварыўся, сказаў:

— У тым і загваздка, што не напісаў бы. Памылкі раблю. Ведаеш, як у газеце правяць?

— Невук, — сказаў Хведар, — але нешта ў пісьмах тваіх памылак няма.

— Гэта ж мне хлопцы іх правяралі, — паспрабаваў схлусіць Васіль, але Хведар гэта зразумеў, глянуў на яго, позіркі іх сустрэліся. Яны зарагаталі.

— Ат, — сказаў Хведар, — яно так, можа, і лепш...

І вось цяпер ён быў на школьным стадыёне. Хлопцы, мабыць, пайшлі ўжо з гаража. У іх ёсць занятак, працуюць на лесаўчастку некалькі месяцаў. А ён увесь гэты час бадзяўся, як непрыкаяны, то ў Магілёве з Хведарам, то сядзеў на гарышчы дома, чытаў кнігі, пакуль учора не прыйшоў ліст з рэдакцыі.

## 5

Васіль першы дзень прыехаў на работу на гадзіну раней. Ён ведаў, што будзе працаваць у аддзеле пісьмаў, і гэта яго не палохала. Але ён хваляваўся, адчуваючы адказнасць. Адна справа пісаць матэрыялы ў газету, другая — працаваць там.

У холе ён убачыў Гайдука. Той сядзеў за столікам, курыў, разглядаючы кіпу фотаздымкаў.

— Прывітанне! — узняўся насустрач Васілю Гайдук. — На работу неабавязкова хадзіць так рана.

— Другім аўтобусам я спазнюся, — адказаў Васіль, паціскаючы яму руку, — а вы таксама рана, як бачу. Не спіцца?

— Чаму ж? Паспаць я люблю. Толькі гэта невясёлая гісторыя. Я жыву на кватэры, і мая гаспадыня ў пяць гадзін раніцы пачынае гатаваць свайму Лёвачку снядана́к. Яна так дубасіць малатком, адбіваючы катлету, што мёртвага разбудзіць. Які ж сон пад грукат? Я прыходжу заўсёды рана. Ды пакуль нікога няма, можна ў лабараторыі здымкі зрабіць, бо, як усе збяруцца, адрываюць ад справы.

— Чаму?

— А хіба ты ўчора не зразумеў? У нас на дні па тры лятучкі, я іх называю «ранішнікамі».

— Відаць, клопаты.

— Каб жа, а то на «ранішніках» вучаць, як сябе паводзіць. Учора мяне вучылі.

— Няўжо без прычыны? — шчыра здзівіўся Васіль. — Усё-ткі пасведчанне — дакумент.

— Ды не вінаваты я, разумееш?.. Гэта ўсё хлопцы падрабілі, Кудлацін з Назарэвічам. Я ж не адмаўляўся, што заходзіў у піўную.

— А хіба гэта забаронена?

— Рэдактара не пераспрэчыш. Ён лічыць, што газетчыка ўсе ведаюць, калі табе захочацца выпіць куфаль піва, дык хавайся дома пад коўдрай.

— Глупства. Чаму так?

— Я ж кажу, каб ніхто не бачыў. А ў мяне няма сваёй кватэры і нават коўдры... Ну, зайшлі мы з Кудлаціным смагу прагнаць, не піва выпіць, мінералкі. А ў піўной гвалт. Што здарылася? — пытаю. Аказваецца, нейкі дзядзька з вёскі сустрэўся з сябрам, таксама вяскоўцам. Некалі разам партызанілі. Слова за словам, узя-

лі яны пляшку каньяку. А як разлічыцца, дык вачамі лыпаюць. Адзін кажа, думаў, што частуе другі, а другі, што першы. Ні ў таго, ні ў другога ў кішэні ні рубля. А тут прадаўшчыца лямантуе, міліцыю выклікаць збіраецца. Я па кішэнях ляп — і ў мяне капейкі. Кажу Кудлаціну, пазыч. А ён: «Грошай няма». Ведаю ж, ёсць, раніцою ганарар са сталіцы атрымаў. Ён мне параіў пакінуць сваё пасведчанне, а потым прынесці грошы. Пакінуў, ледзь паспеў прыйсці ў рэдакцыю, як Ігнат Сяргеевіч выклікае. Астатняе ты ведаеш.

— Трэба было растлумачыць, як усё атрымалася, — параіў Гайдуку Васіль.

— Спрабаваў, ніхто слухаць не хоча.

— А Кудлацін што?

— Смяецца. Я табе чэсна кажу, яго работа. Ну, можа, не зусім яго, а Назарэвіча. Яны — сябры. Адзін з іх данёс рэдактару. Ведаеш, сапсаваны тэлефон гэта называецца.

— Не разумею, няўжо іншага занятку ім няма? — здзівіўся Васіль. Яму хацелася верыць Віктару.

— Выходзіць, што няма. Дарэчы, ты будзеш працаваць у Кудлаціна, — нібы між іншым сказаў Гайдук, — трымай вуха востра. Ведаеш, я неяк затрымаўся ў камандзіроўцы, дык яны недзе знайшлі мой партрэт і павесілі яго ў чорнай рамцы ў калідоры.

— Ну гэта зусім... Ва ўсякім выпадку, я пастараюся трымацца ад такога далей... А можа, гэта жарты?

— А што яшчэ.

Гайдук дастаў з кішэні пачак цыгарэт, спрытна пстрыкнуў пальцам.

— Куры.

Васіль не курыў. Закурваў два-тры разы, калі здаваў экзамены ў педінстытут.

Цяпер ён украдне паглядаў на Гайдука. Той не жартаваў. Відаць Віктар перажываў — яму ж не паверылі. Хацелася хоць як дапамагчы Віктару, узяць сабе хоць кроплю яго пакуты.

Закурылі: Віктар — глыбока зацягваючыся і пускаючы ў паветра кольцы дыму, Васіль — асцярожна, быццам хаваўся ад каго.

Гайдук згроб фотакарткі, паклаў іх у мяшэчак з чорнай паперы.

— Ведаеш, ты, напэўна, сёння занятку мець не будзеш. Пасноўдаешся з пакоя ў пакой, пазнаёмішся з ра-

ботай, пакуль прыгледзішся — дзень праміне. Паедзеш са мной на раён?

— Калі Ігнат Сяргеевіч пусціць.

— Пусціць. Я папрашу. Ды і пачынаць аднаму, па сабе ведаю, няёмка. Мы зробім рэпартаж — гадзіна ў дарозе. Ёсць такая ў мяне думка. Людзі скардзяцца, што аўтобусы дрэнна ходзяць, а той-сёй з вадзіцеляў білеты не адрывае. Гэта ж па вашым аддзеле. Я б адзін узяўся за гэту справу, ды не напішу, як ты. Мая справа — фота.

— Я што, — пацікнуў плячамі Васіль, — хоць цяпер.

## 6

Васіль быў задаволены, што ў сваю першую паездку па раёне накіраваўся разам з Гайдуком. Гайдук паводзіў сябе ў дарозе звыкла і проста. У яго было шмат знаёмых у гарадку. Пакуль яны ішлі ад рэдакцыі да аўтастанцыі, Гайдук з кім-небудзь вітаўся, распытваў пра жыццё-быццё. Амаль з усімі ён быў на «вы», і тым не менш Васіль зразумеў, што Віктара тут добра ведаюць. Хто запрашаў яго сфатаграфаваць сям'ю, хто ў госці, а нейкая пажылая жанчына, паглядзеўшы на Васіля, папрасіла прабачэння, адвяла Гайдука ўбок і хацела неўзаметку торкнуць Віктару грошы.

— Не трэба — што вы! — саромеючыся, аднекваўся Гайдук.

— Як жа, за работу, — разгубілася жанчына, — цяпер за так ніхто на руку не ўсплюне. Вы ж траціліся.

— Не, не, — пачырванеў Гайдук.

Калі жанчына пайшла, Віктар сказаў:

— Мне здаецца, што Кудлацін і Назарэвіч мяне недалюбліваюць. Яны лічаць, што я бяру грошы з людзей, якіх фатаграфую.

— Дык вы б сказалі ім, што гэта не так.

— Яны гэта з зайздрасці. Ты яшчэ ўбачыш, як у канцы месяца яны пералічваюць радкі пад будучы ганарар.

Гайдук, смуглы, загарэлы, у капелюшы і белых штанах, збоку выглядаў дзіваком. Ішоў ён шпарка, размахваючы рукамі, на плячы ў яго матляліся тры фотаапараты — навошта столькі? Ён раптам пачынаў гаварыць, часам па два разы паўтараў адно і тое, быццам Васіль не разумеў, тады яшчэ больш размахваў рукамі, то надоўга замаўкаў, твар яго рабіўся сур'ёзны. Васіль

час ад часу заглядваў яму ў вочы, стараючыся зразумець, шчыра кажа Віктар ці не, і не мог яго зразумець. Вочы ў Гайдука былі гуллівыя, нават тады, калі ён расказваў пра свае непрыемнасці, якраз як у чалавека, якога ўвесь час крыўдзяць, але ён не паказвае, што яму балюча. Калі ж ён маўчаў, то здавалася, што нічога ўперадзе не бачыць. Ён мяняўся, як надвор'е на пачатку восені.

Урэшце, калі яны прыйшлі на аўтастанцыю, Віктар зняў фотаапарат і сфатаграфаваў будынак, жоўтыя бярозавыя прысады, Васіля, дзяўчат, што стаялі тут, не пытаў дазволу.

Дзяўчаты заўважылі, заўсміхаліся, і Васіль не зразумеў, нашто Віктар гэта робіць. Ён падумаў, што так Гайдук, мабыць, знаёміцца з людзьмі. Сам жа Васіль на першым часе саромеўся людзей, цяжка пакутаваў ад гэтага.

І сапраўды, праз пяць мінут Віктар стаяў ля дзяўчат і пытаў, куды яны едуць.

— У Зарэчча. І вы з намі? — весела засмяяліся дзяўчаты. Гайдук не сумеўся:

— У Зарэчча дык у Зарэчча, толькі вы аўтобусам, а мы — спадарожнай.

— А што вы там робіце? — спыталі дзяўчаты. — Мы вас там не бачылі. Мо хлусіце?

— Паглядзім, хто хлусіць. Вы ці мы, — смяяўся Віктар. — А што будзем рабіць — сакрэт.

— А можа, да дзяўчат едзеце? — не сунімаліся спадарожніцы. — Дык іх там няма.

— Шмат будзеце ведаць — замуж ніхто не возьме.

Дзяўчаты былі Васілёвага ўзросту, напэўна, пра замужжа яшчэ не думалі. Толькі адна, невысокага росту, тоненькая, з белымі доўгімі валасамі, якія варушыў вецер, смяялася.

— Што нам у Зарэччы рабіць? — насцярожыўся Васіль. — Кудлацін раіў ехаць у Чырвоны Бераг, ды і рэдактар казаў пра гэта.

— Дзівак, там ужо нас чакаюць. Павер мне, як толькі мы выйшлі з кабінета, Кудлацін пазваніў на вакзал, папярэдзіў. У яго там сусед працуе. А ў Зарэччы пра наш прыезд не ведаюць. Ды праз Зарэчча праходзяць некалькі аўтобусаў у другія вёскі.

Яны выйшлі на шашу. Па шашы безупынку праносіліся машыны з цэглай, з мяшкамі, паражняком.

Чакалі нядоўга. Першая ж машына, як толькі Гайдук «прагаласаваў», зарыпела тармазамі, спынілася.

— Вось што значыць фотаапараты, — усміхнуўся Гайдук.

Яны выйшлі з машыны на разгалінаванні дарогі, не даязджаючы да Зарэчча. Адсюль добра бачны вясковыя хаты, жоўтыя кроны дрэў, воданапорная вежа, было чутно, як недзе вуркоча трактар і ахрыпла крычаць пеўні.

— Гэта Зарэчча, — сказаў Гайдук, — а там — Рудня.

Васіль паглядзеў у той бок, куды паказваў Гайдук, але вёскі не ўбачыў, яна хавалася за пагоркам.

— А гэта знак супынку, — сказаў Васіль, разумеючы, да чаго хіліць гаворку Гайдук, і паказаў на белы слупок на ўзбочыне.

— А гэта — аўтобус, — сказаў Віктар, — хаваючыся ў кусты. — Паспрабуй супыніць. Табе, напрыклад, трэба ў Нямкі, а трапіць з Рудні туды ты можаш толькі гэтым аўтобусам і з гэтага прыпынку, зразумеў?

Васіль узняў руку. Аўтобус, пакідаючы за сабой лёгкі пылок, праехаў міма.

— Вось так, — выскачыў з алешніку Гайдук, размахваючы фотаапаратам, — чалавек не трапіў на працу ў Рудню, а можа, і ў медпункт. Яго проста не ўзялі. А тут жа прыпынак.

— Тады чаму не ўзялі? — здзівіўся Васіль.

— Таму што быў адзін. А хто супыніцца, калі ты заплаціш пяць капеек, нават калі вадзіцель забудзецца адарваць білет?

— Думаю, што многія. Ва ўсякім разе, павінны.

— Многія, але не Крывец. Ён не спыняецца.

— Гэта хто?

— Шафёр, які гэтым маршрутам ездзіць і часта, як нам скардзяцца людзі, блытае дзяржаўную кішэню і сваю... Ты нумар помніш?

— Не паспеў, ды неяк і не падумаў. Я ж не з міліцыі.

— Трэба памятаць. 22—19, рэйс на 15. 30, а ўвогуле — усё тут.

Гайдук паляпаў рукой па фотаапараце.

— А можа, не трэба? — засумняваўся Васіль. — Ну не заўважыў, праехаў міма.

— Ні ў якім разе! — не згадзіўся Гайдук. — Колькі твой бацька зарабляе?

— Многа. А што?

— У яго ёсць машына?

— У бацькі? Адкуль?

— А вось у Крыўца ёсць. Ды і не ў машыне справа. Хаў купляе. Але чэсна, за свае грошы, а не за тыя, што павінны ісці ў дзяржаўную кішэню.

— Тады, мне здаецца, мы павінны былі пачаць не з яго, Крыўца, а з аўтабазы, з кантролю.

— Так цяжэй. Кантралёры працуюць. Іх не ўпікнеш у нядобрасумленнасці. Але звычайна яны на маршрутах, дзе вялікія аўтобусы, дзе людна. Сюды ж ім нават заехаць цяжка, ды і шафёру лягчэй выкруціцца, білеты ж у яго.

— Дык што вы прапаноўваеце, Віктар?

— Ісці ў Зарэчча, паспрабаваць сесці, вядома, табе аднаму ў гэты аўтобус да райцэнтра і паглядзець, з якога супынку табе дадуць білет. А потым напісаць матэрыял. Разумееш, колькі ў аўтобусе пасажыраў за дзень бывае. А памнож на тыдзень, месяц, год. І стане зразумела, адкуль машына, дача, а галоўнае, адкуль хціўства і чэрствасць у асобных людзей.

— Але гэта прыватны факт...

— А ты што, хочаш, каб ён, як пухліна, разрастаўся, каб заражаў другіх?

— Не, я, безумоўна, супраць гэтага. А раптам нашы доказы можна будзе лёгка абвергнуць?

— Вядома, калі мы адступімся. Але ж мы ўдвух і клапоцімся не пра сваё ўласнае. Мы выкрываем факт, дакладней, мы называем яго. Павер, усё гэта зацікавіць адпаведныя арганізацыі, грамадскасць. Табе толькі здаецца, што ўсё дробязь. Калі вось на такія дробязі не зважаць, яны могуць стаць з'явай. Вось тады змагацца будзе цяжэй.

Васіля здзіўляла Гайдукова непрымірымасць, яго ўзрушанасць, ён разумеў, што Віктар разважае лагічна. Урэшце, яны абодва сёння выехалі з рэдакцыі, не працуюць. Калі іх паездка атрымаецца марнай, то яны самі будуць падобны на людзей, пра якіх казаў Гайдук. Ды колькі разоў Васіль на свае вушы чуў, як юнак або дзяўчына, уладкаваўшыся ў горадзе, хвалілася, што зарабляюць добра, а работа тая не бі ляжачага. І многія ім зайздросцяць.

Васіль сказаў гэта Гайдуку.

— Я таксама не разумею, чаму так іншы раз бывае ў жыцці, — прызнаўся Гайдук. — Атрымліваецца, што та-

кія юнакі і дзяўчаты абыякавыя да ўсяго, што дарага бацькам. Можа, бацькі ў гэтым вінаваты?

— Сумняваюся. Калі меркаваць па масткоўцах, якіх я ведаю, дык не, — сказаў Васіль. — Мой бацька лесарубам працуе. Ён кажа, што ў брыгадзе не палайдачыш. Цябе проста вытураць, з табой ніхто не будзе лічыцца. Там чалавек павінен паказаць другім, чаго ён варты. Тады цябе будуць паважаць. Тады і зарабляць будзеш добра.

— Яно так. Але ж не за заробкам твой бацька ды і астатнія твае землякі пасля вайны ехалі ў глыбіню лясоў. Яны ж тады маладыя былі, у зямлянках жылі. Цяпер, вядома, жывём мы ўсе як людзі. А чаму ж тады сярод нас сустракаюцца такія, як Крывец? Чаму тады дзеці тых жа лесарубаў хваляцца, што маюць лёгкі заробак?

— Скуль мне ведаць? Я не магу зразумець Уладзіміра Мікалаевіча нават. Ён жа столькі сіл аддаў, каб Масткі пабудаваць, каб людзі добра жылі, каб школа ў нас свая была. А на лесаўчастак нас запрашаў, нібы купляў, абяцанкамі. І многія мае таварышы пайшлі, бо выгаду для сябе ўбачылі.

— Але ж ёсць і такія, што не згадзіліся? — спытаў Гайдук.

— Ёсць. Вунь Віталь Судзілоўскі так і сказаў: «Я сваю мару за грошы не прадам». І я яму веру. Гэты, як кажуць, будзе самалётам хвасты заносіць усё жыццё, каб толькі бачыць, як яны ўзлятаюць... Ды і вы, Віктар, сёння нібы з дробязі пачалі дзень, а аказваецца, не дробязь гэта.

— Пра мяне не трэба, — паморшчыўся Гайдук, — пойдзем у Зарэчча?

— Пара, — адказаў Васіль.

## 7

Гайдук меў рацыю, калі казаў, каб Васіль з Зарэчча ў гарадок ехаў адзін.

У вёску яны прыйшлі апоўдні. Аўтобус, калі верыць раскладу, прымацаванаму на нахіленым слупку сярод вёскі, павінен вяртацца з Нямкоў праз гадзіну.

Зарэчча, невялікая вёска, патанала ў садах, ужо аголеных, але яшчэ з неабабранымі познімі яблыкамі, якія аж свяціліся на сонцы.

Яны ішлі каляіністай вуліцаю, абыходзілі паўз пахілыя платы лужыны і гразь. Васіля насцярожвала: праз дзве-тры хаты агароды зараслі палыном. Хаты ж, да якіх прылягалі такія агароды, стаялі з крыж-накрыж забітымі вокнамі.

Гайдук, вядома ж, Зарэчча наведаў не раз, і калі Васіль сказаў, што не шкодзіла б падсілкавацца, Віктар павёў яго да магазіна.

Калі яны ўвайшлі ў магазін, спачатку ад нечаканасці разгубіліся. За прылаўкамі ў белых халатах стаялі дзяўчаты, з якімі Васіль і Гайдук сустрэліся на аўтастанцыі.

— Вось дык сустрэча! — развёў рукамі Віктар. — Вы тут працуеце, аказваецца.

— Але, — заўсміхаліся дзяўчаты, — калі гэта можна назваць сапраўднай працай. Паглядзіце, акрамя вас, пакупнікоў няма. Цяпер зрэдку хто заходзіць, клопатаў на палетках хапае.

— Дык жа, напэўна, нязручна кожны дзень з гарадка ездзіць сюды, — сказаў Васіль.

— Што зробіш, трэба ж недзе працаваць, — усміхнулася дзяўчына, на якую ён на аўтастанцыі звярнуў увагу, паправіла рукамі белыя валасы. — Вучыліся на прадаўцоў, а ў горадзе не ўладкавацца з-за вясковых. Яны ў горад — мы ў вёску.

— А хіба тут нельга наняць кватэру? — працягваў Васіль. — Вунь колькі хат пустуе.

— Чаму ж, можна, — дзяўчына ўздыхнула, пазіраючы ў акно на вёску, — ды толькі тут закукуеш. Няма моладзі, таму і пустуюць хаты.

— Але ж нехта ездзіць на аўтобусах з вёскі ў горад і наадварот, — сказаў Гайдук.

— Мы ж і кажам, у асноўным у горад на работу ездзяць ды пенсіянеры на рынак, — растлумачыла тая ж дзяўчына. — З-за іх раніцою ў аўтобус не ўшыцца. Ды яшчэ сварацца пенсіянеры, калі што скажаш. Мала таго, што зранку едуць, дык і ў абед, пад вечар.

Гайдук і Васіль купілі ў магазіне кансерваў і хлеба, выйшлі з магазіна.

Потым яны спусціліся ў яр, аблюбавалі месца пад бярозкамі, падсілкаваліся.

Прыемна было пад бярозкамі, з якіх злятала жоўтае лісце. Падхопленае лёгкім павевам ветру, яно доўга кружыла ў паветры, потым мякка асядала на рыжы ка-

ляны сівец і доўга трапятала на ім. Здавалася, тысячы мятлушак збіраюцца ўзляцець, але не асмельваюцца.

Пахла грыбамі, напэўна, у яры раслі абабкі, чутно было, як у вёсцы ў брэху заходзіцца сабака, парыпваюць ля магазіна калёсы і гучна гамоняць недзе ў гушчары мужчыны.

Па небе плылі аблачынкі, далёка адна ад адной, быццам нехта высока рассыпаў пух і ён цяпер ападаў за далягляд. Сонца, жоўтае, велікаватае, ужо не так слязіла вочы, як летам, калі раптам захочацца на яго зірнуць. Васіль падумаў, гэта таму, што яго святло і цяпло перадалося лісцю дрэў, траве, садам, зямлі.

У яго было такое пачуццё, нібы кроплі гэтага цяпла і святла ўліліся і ў яго, і ўсё, што ён цяпер робіць, не можа быць асуджана другімі, і ён ведае, як жыць далей, як паводзіць сябе між людзей.

— Добра тут, Віктар, — сказаў ён.

Гайдук думаў пра нешта сваё. Ён доўга маўчаў, потым пільна паглядзеў на Васіля, прамовіў:

— Думаю, што нам з табой паспрабуюць сапсаваць настрой. Але не трэба баяцца... Час ісці. Ты — на аўтобус, я — на спадарожную.

Што гэтым хацеў сказаць Гайдук, Васіль не зразумеў.

— Спадарожныя ж рэдка ходзяць, — сказаў ён.

— Не прывыкаць, дачакаюся.

Яны ўзняліся з месца, атрэсваючы з апраткі лісце, пачалі ўзбірацца наверх па схіле яра.

Аўтобус прыйшоў па раскладу. Ля прыпынку тоўпіліся бабулькі і дзядкі. Кожны трымаў у руках кошык, абвязаны ці марляй, ці хусткай. Па грудках можна было здагадацца, што ў кашах яблыкі.

Зарэчанцы, калі спыніўся аўтобус і адчыніліся дзверы, заспяшаліся ў салон, піхаючы адзін аднаго.

Васіль зайшоў апошні.

Праход быў застаўлены кашамі і клункамі, і Васіль застаўся стаяць ля дзвярэй, трымаючыся за парэнчу.

Перад шафёрам ляжала шапка, і пасажыры кідалі туды капейкі, якія пазвоньвалі.

Шафёр кожнаму адрываў білет, але не за трыццаць капеек, колькі каштаваў праезд ад Зарэчча да райцэнтра, а за дзесяць.

Васіль падаў грошы шафёру. Той бліснуў вачамі на яго, памарудзіў, адарваў білет, як і належыць.

Васілю хацелася сказаць Крыўцу, каб ён усім даў такія ж білеты, але падумаў, што тады яны з Віктарам нічога не напішуць. У іх не будзе фактаў, таму ён адвярнуўся, стаў глядзець у акно.

Ён так і даехаў да райцэнтра, не пазіраючы на Крыўца, нават не разгледзеўшы яго твару.

У той жа вечар у рэдакцыі яны ўдвух з Гайдуком напісалі заметку, у якой расказвалі пра парушэнні шафёраў на маршруце, сведкамі якіх былі.

8

Матэрыял быў надрукаваны ў наступным нумары. Ён называўся «Гадзіна ў дарозе». Гэты загаловак «падарыў» ім адказны сакратар Паўлючэнка.

Раніцаю Кудлацін прынёс з друкарні стос газет з тым матэрыялам, хадзіў па пакоі, трымаючы перад сабой раёнку, безупынку паўтараў:

— Цяпер растлумач людзям, гáдзіна ў дарозе ці гадзіна.

Васіль сядзеў за сталом, яму ад слоў загадчыка было няёмка.

Кудлацін сеў за свой стол, адкінуўся на спінку крэсла. Цяжка было зразумець, што ён думае: яго маленькія чорныя вочы глядзелі з-пад густых чорных броў, пальцы выстуквалі па карычневым паліраваным стале нейкі марш.

Кудлацін быў ненамнога старэйшы за Васіля. Яго запрасілі ў газету пасля заканчэння сельскагаспадарчага тэхнікума, але чамусьці паставілі загадчыкам аддзела пісьмаў, хаця загадчык сельгасаддзела па адукацыі быў гісторык і, як зразумеў з першага дня Васіль, не вельмі разбіраўся ў газетнай справе.

— Урэшце, — запярэчыў Васіль, — хто з чытачоў дадумаецца ставіць націск на слове так, каб змяніўся сэнс?

— Дадумаецца, чакай, — усміхнуўся Кудлацін, — не кожнаму ж растлумачыш...

На стале загадчыка зазваніў тэлефон.

— Алё? — Кудлацін узяў трубку. — Не, не... Так, я загадчык аддзела. А нічога пра гэта не ведаю. І не маю да матэрыялу ніякага дачынення.

«Ну вось, пачалося, — падумаў Васіль, — напэўна сам Крывец звоніць, інакш чаму аднекваецца Кудлацін?»

Васіль адчуў, што ў яго дрыжыць рука, нібы ён у нечым вінаваты, перамог сябе, не чакаючы, пакуль загадчык перадасць трубку, выхапіў яе з яго рук:

— Алё, слухаю, так, Федаровіч.

Мужчынскі грубы голас казаў:

— Добры дзень вам. Гэта турбуюць з народнага кантролю. Мы толькі што прачыталі матэрыял «Гадзіна ў дарозе», таму вырашылі вам пазваніць...

Чалавек, з якім Васіль гаварыў па тэлефоне, правільна паставіў націск на слове, з-за якога дапякаў Кудлацін.

— Нам паведамлялі ўжо, што асобныя вадзіцелі аўтобусаў махлююць з білетамі, — сказаў мужчына. — Таму нам хацелася б, каб вы разам з намі правялі рэйд па аўтобусных маршрутах, паглядзелі, што там і як... Прабачце, маё прозвішча Хроль. Я вам яшчэ пазваню, згода?

— Згодзен, — сказаў Васіль.

— Да сустрэчы.

— Да сустрэчы.

Васіль з палёгкай уздыхнуў, паклаў трубку, заўсміхаўся.

— Ну што? — спытаў асцярожна Кудлацін.

— Нічога, усё добра.

— Гэта ён званіў?

Васілю захацелася пажартаваць.

— Ён.

— А на што ты згадзіўся? Даць абвяржэнне?

— Не, сустрэцца.

— З Крыўцом? Дзе? — аж падскочыў Кудлацін.

— Дзе-небудзь, хаця б ля рэстарана... Народны кантроль там!

— Там... Але ты мне — гэтыя жартачкі, глядзі. Хроль званіў?

— Хроль.

— Ну, браце, завязаў ты вузел, — нібы пашкадаваў яго загадчык, — прызнайся, цябе Гайдук на гэта падбухторыў?

— Чаму?

— Гэта ён у нас усё праўду шукае. Глядзі, сам закапаецца і цябе за сабой пацягне.

— Я гэтага не баюся. Усё на свае вочы бачыў, — сказаў Васіль, — ды і народны кантроль нас падтрымлівае.

Васіль хацеў сказаць, што яго нават запрасілі ў рэйд,

але прамаўчаў, яшчэ падумае, што выхваляецца, ганарыцца.

Зноў зазваніў тэлефон.

На гэты раз трубку зняў Васіль. Званілі з аўтакалоны. Нейкая жанчына паведаміла, што іх начальства таксама прачытала артыкул і не верыць, бо Крывец — добры работнік. Ён, як другія, не «рвецца» на выгадныя маршруты, а ездзіць ахвотна па прасёлках, куды не кожны згаджаецца. І яшчэ, Крыўца трэба запрасіць у рэдакцыю, бо кіраўніцтва хоча, каб ён пагаварыў з аўтарамі, тым больш што Гайдука шафёр не бачыў.

— Калі так, хай прыходзіць, — сказаў Васіль, — а Гайдук ужо даўно ведае Крыўца. Асабіста мне з Крыўцом гаварыць няма пра што.

Васіль развітаўся, паклаў трубку, сеў на сваё месца.

— Не разумею цябе, Васіль, — сказаў Кудлацін, — навошта ўсё ж ты ўвязаўся ў гэтую гісторыю? Не абярэшся клопатаў, як ваўчкоў. І наогул, ты працуеш толькі першыя дні. Я ўжо — год, нешта разумею ў нашай справе. Калі далей так будзеш старацца, апячэшся.

У пакой зайшоў Назарэвіч, карэспандэнт аддзела сельскай гаспадаркі.

— А, выкрывацель хціўцаў, — засмяяўся ён, падаючы руку, — чытаў, чытаў. Цікава напісана, толькі ў «Вожык». — Ён узяў газету, працытаваў: «Калі вам трэба трапіць на работу, напрыклад, з пункта «А» у пункт «Б», то не трацьце марна часу. Мы раім не чакаць аўтобуса нумар 22—11, за рулём якога вадзіцель Крывец М. К. Не, не таму, што аўтобус у пункт «А» не прыедзе. Ён будзе, толькі не спыніцца, калі гэта не выгадна Крыўцу...»

— Хопіць, — Васіль зазлаваў, выхапіў з яго рук газету, — мы напісалі праўду! Дарэчы, — звярнуўся ён да Кудлаціна, — хто перапісаў маю заметку пра дзесяцікласнікаў Масткоўскай школы, якія нібыта вырашылі застацца працаваць на лесаўчастку, і назваць яе «Крокі да мары»?

Назарэвіч стаяў разгублены, пачырванелы.

— Я, — сказаў Кудлацін, — я.

— Але ж я не пра гэта пісаў. Я парады пытаў, ці можна такім макарам, як пасула грошай, стварэнне цяплічных умоў, заманьваць моладзь?

— А чаму ж не? — здзівіўся Кудлацін. — Дужыя рукі нам патрэбны ўсюды, моладзь патрэбна. Ты супраць?

— Так, патрэбны. Але мы не павінны, як мне здаец-

ца, дзеля таго каб прыкрыць грахі нечай работы, выхаваўчай, не лічыцца з жаданнямі кожнага асобнага чалавека. Мара ж адна, як жыццё...

— Ты няправільна кажаш, — сказаў Назарэвіч, — жыць не проста. Жыццё вельмі і вельмі складанае. Яно аднаму дарогу спраміць, другому скрывіць. Зразумей, жаданні жаданнямі, а з абставінамі трэба лічыцца. Ты вось, можа, у нас таму і працуеш, што так абставіны ў тваім жыцці склаліся. Ты не паступіў у інстытут. Але ж ты і не пайшоў з аднакласнікамі на лесаўчастак. Табе пашанцавала. Ты крыху пісаў у газету, а ў нас было незанятае месца.

—Я пра сябе маўчу, — абараняўся Васіль, — мне яшчэ не было часу разабрацца ва ўсім, што са мной здарылася. Але калі я зразумею вось так проста, як вы, сэнс усяго таго, што вы называеце абставінамі, пастараюся разарваць гэтыя путы. Толькі не ўсе пайшлі на лесаўчастак па сваім перакананні. Таго-сяго зацікавілі абяцанкамі. А калі заўтра тым жа маім аднакласнікам кіраўнік суседняга прадпрыемства паабяцае больш?

— Гэта не нам вырашаць, — запярэчыў Кудлацін, — у кожнага свой падыход да чалавека. Што ж датычыць заметкі, то яе, павер, можна было надрукаваць толькі так, як я перапісаў. Цяпер ад яе — карысць, а так была б толькі шкода. Калі кожны пачне рабіць на свой капыл, то нічога людскага не будзе. Няўжо цябе ў школе не навучылі гэтым простым, як свет, ісцінам?

— Толькі што гаварылі, што свет няпросты, — узбурыўся Васіль. — І я хацеў, каб мне дапамаглі разабрацца ў яго складанасцях.

— Людзі ўжо даўно ва ўсім разабраліся, — сказаў Назарэвіч, — і дзіўна, раптам з'яўляецца нехта, хто не прымае ісцін, якія даўно вядомы.

Назарэвіч памаўчаў, потым на яго твары з'явілася здзіўленне:

— Слухайце, хлопцы, а можа, гэта і добра?

Васіль адразу не паверыў. Няўжо жартуе? Так вось проста адмовіцца ад сваіх слоў...

— Я лічу, што добра. Добра, калі нечага не ведаеш, а потым сам дойдзеш да сутнасці, — сказаў Васіль.

— Сам ты ніколі ні да чаго людскага не дойдзеш, — катэгарычна сказаў Кудлацін і дадаў: — Без людзей.

— Вось-вось, — злавіў яго на слове Васіль, — без людзей. Толькі людзі павінны дапамагаць адзін аднаму, а

не вілюжыць, як ты, Кастусь, калі мне пазванілі з народнага кантролю.

— А чым я мог табе дапамагчы? Прозвішча сваё пад матэрыялам падставіць? Не, памянеш маё слова, на гэтым усё не скончыцца.

— Ды не трэба мне тваё прозвішча, мне ўпэўненасць твая патрэбна, — сказаў Васіль і выйшаў з пакоя, грымнуўшы дзвярыма.

9

Мінула восень. З дажджамі і сонечнымі днямі. З самотнымі жураўлінымі ключамі і журботным трапятаннем залацістых бярозак.

Прыйшла зіма са снягамі, якія амаль штодзень ухуталі зямлю, дамы, дрэвы мяккай белай коўдрай, якая іскрылася, аж да болю ў вачах у сонечныя дні, рабілася сіняй, калі па небе плылі шызыя хмары.

Восенню ў Васіля на рабоце было больш непрыемнасцей, чым радасці. І зіма, асабліва першы снег, змены ў прыродзе нібы лагодзілі душу. Так бывае, калі звыкнешся з пякучымі маразамі, з бухматым інеем на дрэвах, калі доўга чакаў змены пары года і яна наступіла.

Васіль цяпер працаваў ахвотней. Яму падабалася ездзіць па раёне, сустракацца з людзьмі, ён па-дзіцячаму радаваўся, калі трымаў у руках свежы нумар газеты, у якой друкавалі яго матэрыял.

Заметку, якую ён пісаў з Гайдуком, абмяркоўвалі ў камітэце народнага кантролю. Гайдука і Васіля хвалілі там. Хваліў і рэдактар, нават ставіў у прыклад. Гайдук прапанаваў на лятучцы, каб у рэдакцыі ў канцы месяца не падлічвалі, хто колькі за гэты час напісаў радкоў, а лічылі галоўным вартасць напісанага.

Кудлацін і Пасюкевіч не згаджаліся з гэтым. Але Ігнат Сяргеевіч прапанову прыняў.

Калі раней Кудлацін і Пасюкевіч адседжваліся ў рэдакцыі, перапісваючы допісы рабселькораў і іх радкі залічвалі сабе або, пагутарыўшы па тэлефоне з механізатарамі, даяркамі ці брыгадзірамі, як казаў Гайдук, «левай нагой пісалі за іх выступленні», то цяпер яны былі вымушаны часта ездзіць па раёне.

Артыкулы і карэспандэнцыі сталі намнога карацейшыя і цікавейшыя. Непрыкметна пасля таго як газета надрукавала матэрыял Васіля і Гайдука пра непаладкі

на аўтобусных маршрутах, паштарка пачала прыносіць у рэдакцыю больш пісьмаў.

Ігнат Сяргеевіч казаў, што калі раней крытычныя пісьмы былі без подпісаў і іх даводзілася перасылаць у арганізацыі, каб там разабраліся, то цяпер амаль пад кожным стаяла прозвішча. Праверыўшы такія допісы, стараліся друкаваць.

Васіль пісаў шмат і з натхненнем. Рэдактар іншы раз правіў яго матэрыялы, выкрэсліваючы апісанні прыроды, надвор'я, характараў людзей.

— Вы павінны больш пісаць, — казаў рэдактар, — і не крыўдуйце, калі нешта я выкідваю.

Васіль часта заставаўся пасля работы, зноў і зноў перапісваў матэрыял, выходзіў з рэдакцыі позна вечарам, спяшаўся на аўтастанцыю, каб не спазніцца на апошні аўтобус у Масткі. Калі ж, здаралася, пазніўся, тады бег на шашу, чакаў з лесакамбіната парожні мастакоўскі лесавоз.

Усе шафёры з Мастакоў Васіля ведалі, нават калі ён не ўзнімаў рукі, спынялі машыны.

Хлопцы з рэдакцыі раілі Васілю пайсці ў гарадку на кватэру, спачувалі, што цяжка кожны дзень праязджаць у адзін і другі бок па трыццаць кіламетраў, асабліва цяпер, зімой, але Васіль не прыслухоўваўся да іх парад. Ён па-ранейшаму жыў з бацькамі ў Мастках і думаў, як пагаварыць з аднакласнікамі, якія працавалі на лесаўчастку, бо адчуваў сябе ў нечым вінаватым перад імі.

## 10

Неяк ён ледзь паспеў на апошні аўтобус. Ускочыўшы ў яго, Васіль пачуў з апошняга сядзення:

— Васька, сябар, вось не чакаў, што сустрэнемся з табой у дарозе!

Ну вядома ж, гэта Віталь!

У паўзмроку, пераступаючы сумкі, клункі, што былі згрувашчаны ў пераходзе, трымаючыся за парэнчы, Васіль праціснуўся да сябра. Яны абняліся, нібы не бачыліся многа гадоў.

Апошні раз яны былі разам перад Віталевым ад'ездам на экзамены ў лётнае вучылішча. Васіль з лістоў сябра ведаў, што той не паступіў, у яго знайшлі нейкае захворванне, якое нібыта пры працяглых трэніроўках можна вылечыць.

Віталь уладкаваўся на завод у тым горадзе і, як пісаў Васілю, вяртацца ў Масткі не думаў: што ён там не бачыў?..

— Ты што, так хутка атрымаў адпачынак? — здзівіўся Васіль, вырваўшыся з яго абдымкаў.

— Не, — уздыхнуў Віталь, — звольніўся я... Разумееш, там горад, завод. Там усё ёсць, спортзал, стадыён. Але там не такое, як у нас, паветра. Я вырашыў, што буду трэніравацца на школьным стадыёне. Цяпер зіма, можна заліць каток.

— Адзін ты гэта не зробіш.

— Чаму адзін? — здзівіўся Віталь. — Колькі нашых жыве ў Мастках. Пятро, Іван, дзяўчаты... Няўжо не дапамогуць? Уяўляеш, правядзём на стадыён электрычнасць, павесім лямпачкі. Вечарам пасля работы выйдзеш на лёд... Ён блішчыць, іскрыцца снег на галінках, і цёмнае неба... Ды і ты ж дома, хіба не паможаш нашых зацікавіць?

Эх, Віталь! Наіўны летуценнік. Да чаго дадумаўся, каток ля Яўменавай гары, быццам высакагорны каток «Медэа»... Нябось нагледзеўся ўсяго ў вялікім горадзе, часу хапала. Адрабіў восем гадзін, і ніякага клопату. Гэта не тое што ў яго, Васіля, кожны вечар заняты, трэба ж пісаць не толькі для газеты, але яшчэ і для рэдактарскага кошыка. А паездкі па раёне? Ці адзін раз затрымліваўся да паўночы? То дарогі перамецены снегам, то патрэбнага чалавека шукаеш па ўсіх брыгадах. Гэта яшчэ нічога. З гэтым можна мірыцца. Можна, вядома, выкраіць суботу, нядзелю. Але як быць з хлопцамі? Яны ж, здаецца, усё яшчэ на яго крыўдуюць. За колькі месяцаў ніхто ў хату не паказаў вачэй...

— Віталь, — сказаў Васіль, — ты ж ведаеш, што зрабілі ў газеце з маім матэрыялам пра нашы спрэчкі з Уладзімірам Мікалаевічам. Мне здаецца, што пасля гэтага між мной і ўсімі нашымі — сцяна. Сказаць табе шчыра, я ніяк не магу яе праламаць, бо атрымліваецца, што я здраднік. Яны на лесаўчастку, а я ў газеце. Яны там, а я — тут. А самі хлопцы не ідуць да мяне.

— І правільна робяць, — сказаў Віталь, — калі б я не ведаў праўды, калі б ты не напісаў мне пра ўсё, я таксама, на іх месцы, да цябе не пайшоў бы. Таксама мне, цаца. Тут ужо так: калі настойваў на сваім, то як хлопцы лічаць, напэўна, трэба да канца быць цвёрдым. А так атрымліваецца, што ты пакрывіў душой.

— Я гэта разумею. Таму і пакутую.

— Чаму тады не сказаў ім праўду? Няўжо думаеш, што цябе не зразумелі б? Сорамна было прызнацца, што цябе, чалавека, які друкуецца ў газеце, перайначылі?

Не, ніхто ніколі не разумеў так Васіля, як Віталь. Дзесяць гадоў за адной партай. І біліся, і мірыліся, і марылі разам, і нават разам на веласіпедах ездзілі нейкі час да адной дзяўчыны, аднакласніцы Нэлі, прастойвалі з ёю ля гаю на хутары да поўначы.

— Так, Віталь, мне лягчэй перажыць іх крыўду, чым прызнацца, што ў газеце са мной не палічыліся.

— Дзівак, перад кім сорамна? Перад хлопцамі... Памятаеш, на выпускным вечары гаварылі, што ніколі адзін аднаго не падвядзём, дзе б мы ні былі, чым ні займаліся б. Ты першы так казаў... Ганна Кузьмінічна, ты ж яе любімчык, бо яна за літаратуру душу аддасць, наперад ведала, што раз'едземся і, як гэта бывае заўжды, забудзем адзін аднаго, яе таксама. Памятаеш, яна тады сумна ўсміхалася з тваіх слоў?

— Памятаю... Я ўсё памятаю, Віталь. Я нічога не забыўся...

— Гэта словы. Забыць чалавека, сяброў можна памятаючы іх, зразумей...

— Што тут незразумела?

— Вось чаго бойся: сам казаў адно, а робіш па-другому... Мы разам пойдзем да хлопцаў.

— Дзякуй за падтрымку. Але я падумаю...

Згушчалася цемра. Удалечыні за аўтобусам беглі залатыя ланцужкі ледзь улоўных агнёў вёсачак, фермаў, два лязы святла разразалі перад аўтобусам цемру.

Васіль быў бязмежна рады, што сустрэў Віталя. Ён і разважлівы, нібы многа пражыў, і летуценнік, наіўны, часам аж да смешнага. Усё ў адным чалавеку. Як так можна? Ну хто, як не Віталь, у сёмым класе зрабіў з брызенту парашут, прывязаў яго вяроўкамі да тазіка, а потым скокнуў з вільчыка хлява? І таму ж Віталю першаму прыйшла думка ў дажджлівае лета пасля дзевятага класа пайсці працаваць у дарожнікі — засыпаць пяском яміны, каляіны, каб МАЗы без затрымкі вывозілі з дзялянак лес. Уладзімір Мікалаевіч тады і слухаць не хацеў пра іх, казаў, што не мае права браць непаўналетніх на работу, што яму за такую самадзейнасць галаву здымуць, а яна яму во як патрэбна. І ніхто не мог яго ўлагодзіць, акрамя Віталя. Ён тады ска-

заў простае і цяпер зразумелае яму, Васілю: «Добра, Уладзімір Мікалаевіч, вы не хочаце, каб мы крыху папрацавалі, дапамаглі бацькам. Наступіць час, вы нас прасіць будзеце, каб прыйшлі на лесаўчастак. А як ісці, калі нашы рукі мазалёў не ведаюць, калі бацькавы мазалі нас пужаюць?»

«Ты мне глядзі, — паківаў тады пальцам Уладзімір Мікалаевіч, — калі ўздумаеце на рабоце жартаваць з інструментам, паадрываю рукі з коранем», — і засмяяўся...

— Васіль, ведаеш, што я надумаў? — спытаўся Віталь.

— Цікава, што ты надумаў, мабыць, зноў скакаць у тазе са страхі? — напомніў ён сябру пра грэх дзяцінства.

— Навошта? Гэта глупства. Усё вось тут... — Віталь паляпаў рукой па партфелі, які трымаў на каленях. — Тут разлікі. Я змайструю дэльтаплан і палячу на ім з Яўменавай гары.

— Не ўзляціш. Яна ж маленькая. Ты бачыў, ну хаця б па тэлевізары, з якіх гор лятаюць? Не роўня нашай.

— Не толькі бачыў, я лятаў. І пасля гэтага дарогі мне назад ужо няма. Разумееш? Я сам лятаў. Як працаваў на заводзе.

— Глядзі, нос расквасіш, — усміхнуўся Васіль, — тады цябе і сапраўды не возьмуць у авіяцыю.

— А цябе ў вялікую газету, калі не можаш адказваць за свае паводзіны. Чалавек павінен быць па-чалавечы мужным. А ты — сцяна, сцяна... вінаваты, дык знайдзі сілы, — зноў вярнуў Віталь да пачатку размовы, — прызнайся.

— Пастараюся, — сказаў Васіль няпэўна.

## 11

Масткі мелі сваю гісторыю.

Да вайны на месцы цяперашняга пасёлка было урочышча, дзе жыў з сынамі ляснік Яўмен. Яго хата стаяла на гары, якую людзі потым назвалі Яўменавай. Хто ж першы ахрысціў урочышча Масткамі, невядома. Ды і масткоў тут ніякіх не было. Адно гравійная дарога, якая злучала два гарады, і лес, векавы, непралазны, густы.

Па лесе ў дваццатыя гады бадзяліся бандыты. Ля гары яны супынялі пешага і коннага, рабавалі.

Па навакольных вёсках ішла дрэнная слава пра ўро-

чышча. Нехта назваў яго чортавымі масткамі між жыццём і смерцю. З таго часу і пайшло: Масткі, Масткі.

У Яўмена былі два сыны, ужо дарослыя. І людзі кажуць, што былі яны неймавернай моцы. Даніла, старэйшы, дык таму ці каня паваліць, ці ўскінуць на плечы два мяшкі зерня — адно і тое, а Ігнат, калі некальькі мужчын, як абернецца воз, не маглі падняць камель сасны, адзін паднімаў яго. Хадзілі чуткі, што бандыты якшаліся з Яўменам, бралі ў яго хлеб, скварку. Ці так гэта было, ці не, людзі не ведаюць. Толькі аднойчы, калі доўга ніхто нідзе не сустракаў лесніка і яго сыноў, людзі зайшлі да яго ў хату. Дзверы былі расчынены, павыбіваны вокны, а ў хаце, хто за сталом, хто на падлозе ля парога, ляжала пяцёра бандытаў, Яўмен з прастрэленай галавой, Даніла з ранай у грудзях і сцёкшы крывёю, лёдзь жывы Ігнат.

Пакуль вяскоўцы ратавалі яго, пыталіся, што тут адбылося, Ігнат, ледзь вымавіўшы: «Жывіце цяпер смела», сканаў.

Бандытаў закапалі недзе ля гары, а лесніка і яго сыноў завезлі на могілкі ў бліжэйшую вёску і пахавалі, справіўшы па іх жалобны абед. З таго часу пра бандытаў ніхто не чуў, людзі нават забыліся, што некалі ля Яўменавай гары іх падсцерагала небяспека.

Ляснічоўка ў вайну згарэла. Немцы тут натрапілі на партызанаў. Багата палегла і нашых, і немцаў.

Наогул вакол Масткоў па лясах нямала пасля вайны было магілак партызанаў, і ўжо ў сорак пятым, калі будаваўся лесаўчастак, людзі надумалі звесці астанкі байцоў у адно месца, паставіць абеліск.

Тады, у сорак пятым, сюды прыехалі былыя франтавікі, у асноўным людзі за трыццаць год, жанатыя і нежанатыя, пачалі адразу і будаўніцтва і лесанарыхтоўку.

Жылі яны ў зямлянках, у зямлянках і зімавалі, пакуль, збудаваўшы прадпрыемства, узяліся ставіць сабе хаты. У зямлянках і нараджаліся першыя дзеці мастмаўцаў, і ўвесь дзесяты клас першага выпуску мясцовай школы быў з тых дзяцей.

Спачатку масткоўскія лесарубы трэлявалі дзерава на конях, вывозілі яго з дзялянак да шашы, тут ужо грузілі на старэнькія палутаркі і ЗІСы. Пазней на лесаўчастак прыгналі некалькі «студэбекераў» і газагенератарных машын. Гэта тэхніка была больш моцная. Яна ўжо заязджала на дзялянкі.

Васіль памятаў, як з мацерaю хадзіў на лесаўчасткаўскі двор і разам з дзецьмі будаваў домікі з бярозавых калодачак. Калодачкі секлі жанчыны. Цэлыя горы калодачак ляжалі пад павеццю. Іх засыпалі ў бункеры газагенератарных машын, і калі хто з шафёраў катаў дзяцей па двары, у кабіне было горача, не прадыхнуць. Пазней ужо, як у Мастках здарылася няшчасце, — зімой, забуксаваўшы ў лесе на газагенератарнай машыне, атруціўся газам Іван Пехцяроўскі, масткоўскі шафёр, — дзяцей браць у кабіну забаранілі.

Пехцяроўскі прайшоў усю вайну шафёрам, як казалі пра яго на пахаванні франтавікі, быў сапраўдным байцом, мужным чалавекам. Пахавалі яго побач з брацкай магілай, з партызанамі, рэшткі якіх масткоўцы перавезлі з лясоў у цэнтр пасёлка.

Масткоўскія школьнікі даглядалі брацкую магілу, а рабочыя лесаўчастка кожны год у Дзень Перамогі праводзілі тут мітынг. Трактарысты, шафёры, вальшчыкі лесу, абрубшчыкі, рамонтнікі начэплівалі медалі і ўспаміналі суровы час вайны, баявых сяброў, партызанаў, а потым ішлі ў школу і расказвалі дзецям пра былое.

Так з году ў год выраслі дзеці, шырыўся пасёлак, мацнела прадпрыемства.

Цяпер яно мела магутную тэхніку, клуб, медыцынскі пункт, магазін, бібліятэку, грамадскую лазню і кожны лесаруб жыў у сваім доме. Праз многа год з аднаго боку Масткі паступова старэлі — лесарубы ішлі на пенсію, адзін за адным, з другога — маладзелі, выраслі іх дзеці першага пакалення, падрасталі малодшыя.

Прадпрыемства лічылі магутным. За мінулы час тут нарыхтавалі больш мільёна кубаметраў драўніны, і разам з тым на машынным двары прастойвалі МАЗы, новая тэхніка — не хапала людзей.

Васілёвым аднакласнікам, што цяпер працавалі на лесаўчастку, вядома, тэхніку яшчэ не давяралі, бо мелі хлопцы па семнаццаць гадоў. У такім узросце яшчэ нельга працаваць на цяжкіх лесанарыхтоўчых работах.

Дзяўчаты ж ездзілі з лесарубамі ў лес, кухарылі там. Хлопцы хадзілі пакуль у вучнях рамонтнікаў і адначасова вывучалі вечарамі ў клубе аўтасправу, чакалі таго часу, калі атрымаюць правы вадзіцеляў, каб сесці за руль лесавозаў. Бо на прадпрыемстве цяпер найбольш не хапала іх. На дзялянках скоплівалася багата драў-

ніны. Лес рэзалі цяпер усё далей і далей ад Масткоў, за некалькі дзесяткаў кіламетраў, кожная дзялянка — новыя дарогі, а яны ў лесе вядома якія: праз балоты, нізіны, праз рачулкі. Вось і атрымлівалася, што шафёры тут былі, як кажуць, на кошт золата. І мясцовае кіраўніцтва, запрашаючы дзесяцікласнікаў пайсці на працу на лесаўчастак, найбольш спадзявалася на хлопцаў, чым на дзяўчат. Але, вядома, калі не застануцца дзяўчаты, то хлопцаў тут таксама не ўтрымаеш. Таму тут стараліся знайсці дзяўчатам хоць які занятак.

Усе, хто застаўся ў Мастках пасля школы, знайшлі сабе работу на лесаўчастку, апрача Васіля, які працаваў у раённай газеце, і Віталя, які, не паступіўшы ў лётнае вучылішча, крыху пажыў у горадзе і вярнуўся ў пасёлак.

## 12

Раніцай у нядзелю рыпнула брамка ў двары Васілёвых бацькоў. Прыйшоў Віталь.

— Уставай, соня, — сказаў ён, грукаючы ў Васілёў пакой, — жыццё праспіш... Ці ты працуеш ужо?

— Ад жыцця не схаваешся, — адказаў разважліва Васіль.

Ён сядзеў за сталом і чытаў кнігу.

Маці заглянула да іх, сказала, што згатавала снядanak, і дадала нязлосна:

— Адзін на той бок начы ўстаў, а другі прыйшоў ні свет ні зара. І сну на вас няма. Васіль вунь аж схуднеў.

— Нічога, цётка Марыя, — сказаў Віталь, — хопіць яшчэ часу адпачыць, ці ж век маладымі будзем?

— Але, як вы выраслі, — нібы здзівілася маці, — такімі, як цяпер, ці будзеце, а старымі — ужо ж. Ды толькі не ўсякая старасць супакойвае. Вунь бацька ці не проці начы ўсхапіўся, на дзялянку паехаў.

— А хто яго выпраўляў? — сказаў Васіль. — Хай бы сядзеў дома.

— Ён Лазару Печаню набіўся дровы грузіць. У Лазара ж адны дзеўкі, няма ад каго чакаць дапамогі, хоць і нявесты ўжо.

— Малыя яшчэ, — хмыкнуў Віталь, — якія ж дзеўкі? Адна ў сёмы, другая ў восьмы ходзіць.

Паўгода самастойнага жыцця, як лічылі хлопцы, давала ім права так думаць пра малодшых. Яны нават

здзіўляліся, што нейкі год-два назад былі такімі ж. Але тады яны прыглядаліся ўжо да дзяўчат. Ды мала хто з іх класа не сябраваў з дзяўчынай. Віталю падабалася Нэля з хутара, і Васіль часта пасля ўрокаў разам з сябрам праводзіў яе дадому.

Звычайна яны ўтраіх ехалі на веласіпедах: Васіль наперадзе, за ім Нэля, Віталь апошні.

Хутар быў кіламетраў за сем ад пасёлка. Сцежка, якой ехалі, бегла сярод рудога арэшніку, шамацела пад коламі сухое лісце, шпокалі ў траву арэхі-лузанчыкі, і недзе крычалі журавы.

Васіль не чуў, пра што гаварылі між сабой Нэля і Віталь, ён у гэты час думаў пра Насцю, якая цяпер сядзіць дома і вучыць урокі. Насця вучылася выдатна, падабалася Васілю.

Калі даязджалі да хутара, Васіль казаў, каб яны пачакалі яго дзе-небудзь на ўзлессі, а ён паездзіць яшчэ, паглядзіць, ці ёсць ужо на старых карчах апенькі, або нагледзіць гаёк нечапанага арэшніку.

Нэля і Віталь згаджаліся, рабілі выгляд, што і сапраўды яны яму верацъ, і Васіль мацней націскаў на педалі.

Звычайна ён нікуды далёка не ехаў. Ад'язджаў крокаў за трыста ў кляновы гай — то быў цуд з цудаў, чырвоныя, нібы толькі што з полымя медзь кружыла ў паветры, іскры, тысячы залатых іскраў на вяршынях дрэў, лёгкі пах позніх кветак і сярод усяго гэтага ён, Васіль.

Ён ляжаў на цёплым, нагрэтым за дзень лісці, глядзеў у блакітнае, месцамі як падрапанае белым, у рэдкіх воблачках неба і думаў пра Насцю. У яго думках не было яснасці, больш яму ўяўляўся яе твар, нібы яна была тут, побач з ім, побач з гэтай чырвонай меддзю кляновага лісця, між пахаў зямлі.

Ён ніколі не прызнаваўся ёй у сваіх пачуццях. Насця, здавалася, чамусьці на яго заўсёды злавала, калі ён з ёй загаворыць. Але яна ахвотна спісвала ў яго кантрольныя па матэматыцы — яны рашалі адзін варыянт, і ўсё-ткі Васіль разумеў, што ў Насціным сэрцы ёсць месца для яго.

—...Малыя дужа-такі, — сказала маці, — ці даўно вашы сяброўкі Нэля і Насця былі такія? —І адкуль мацяркі ўсё ведаюць? — А цяпер ужо глядзі, нявесты, —усміхалася яна хітра.

— Толькі не для нас, — адказаў за сябе і за Ва-

сіля Віталь, — гэта ўсё юнацкае, — дадаў ён паважна.

— Чаму ж, дзеткі?

— Мама, ты можаш нас так не называць? — спытаў Васіль.

— Не буду, не буду, — усміхнулася яна, зразумеўшы, што такімі словамі крыўдзіць хлопцаў, — але чаму?

— У нас розныя дарогі, — растлумачыў Васіль, — нам не пашанцавала. Але гэта пакуль... Пакуль мы будзем ісці да свайго, многа вады сцячэ. Мы можам чакаць свайго многа год. А дзяўчаты — не!

— Чаго гэта свайго? — спытала маці.

— Не дзяўчат жа, — адказаў Васіль, — таго, што непакоіць, пра што думаем. Віталь, напрыклад, неба...

— А Васіль — імя, — дадаў за сябра Віталь.

— А хіба ж імя ў яго няма? Што гэта значыць? — насцярожылася маці.

— Ёсць, але разумееце, цётка Марыя, як вам сказаць?.. — стаў падбіраць Віталь словы. — Імя — гэта калі ён журналістам стане або пісьменнікам, калі зробіць багата добрага для людзей, калі шмат напіша.

— Не зусім разумею вас, дзеткі. Можна ж багата добрага зрабіць для людзей і нічога не напісаўшы. А што імя?

— Што ж тут разумець? Ну, напрыклад, для нашага былога дзесятага класа, — сказаў Віталь, — імя ўжо ёсць, у тых жа Нэлі і Насці. Яны толькі ўдзвюх з дзяўчат паступілі вучыцца. І не абы-куды, а ў машынабудаўнічы інстытут. Цяпер пра іх увесь пасёлак гаворыць. Вось яно што.

— Праўда, — згадзілася маці, — кажуць, добра яны вучыліся.

— Добра-то добра, — сказаў Віталь, — але яны ў тэхніцы ні бельмэ, ім усё адно было, куды паступаць, абы паступіць.

— Віталь, не кажы так, — супыніў яго Васіль, — ты нічога не ведаеш.

— Ведаю. Пакуль ты ўчора вечарам карпеў над сваёй будучыняй, пісаў, дык я з імі шпацыраваў па шашы. Не пазнаць іх, так заварочваюць на гарадскі капыл, усяму здзіўляюцца ў Мастках, як бы першы раз сюды прыехалі. Брыдка.

Віталь паморшчыўся, нібы праглынуў лімон.

— А чаго было ісці? — Васіль асуджальна паглядзеў на сябра. — Пад месяцам з дзяўчатамі гуляў я... Так?

Ён артыстычна развёў рукі, схіляючыся перад Віталем, нібы выпрошваў апладысменты.

— Таксама артыст, — сказаў Віталь, — чаго ты надзьмуўся, што бурбалка? І ты пойдзеш. А не — завалаку да іх! Я таму і прыцёгся рана. Мы надумалі сёння схадзіць на лыжах да рэчкі. Ну што ты пазіраеш на мяне, як баран на новыя вароты? Апранайся.

— «Апранайся», — перадражніў яго Васіль. — Ужо ж, калі прыйшоў... І вечна ты калена выкінеш.

Васіль нехаця пачаў апранацца: ён не ведаў, радавацца яму ці не, ён не чакаў, што так хутка прыйдзецца глядзець у вочы сваім былым аднакласнікам.

## 13

Трымаючы пад пахамі лыжы, подбегам спусціліся з гары на стадыён, дзе сабраліся ўжо хлопцы і дзяўчаты. Убачыўшы іх, Віталь замест прывітання сказаў сваім былым аднакласнікам:

— Калі гара не ідзе да Магамета, то Магамет ідзе да гары!

— Мяне дагары не вучылі хадзіць, я не ў цырку, — зазлаваў Васіль.

— О, з'яўленне Хрыста народу! — сказаў Пятро.

Ён глядзеў на Васіля звысака, прыўзняўшы галаву. Яго вочы пасміхаліся, а верхняя губа, над якой чарнеў лёгкі пушок, грэбліва скрывілася. Відаць, ён не вельмі радаваўся, што Віталь прыйшоў з Васілём, і, мабыць, не чакаў, што так будзе.

Сказаўшы, Пятро саступіў убок, чамусьці пачаў мясіць ботам сыпкі сінявaты снег, быццам шукаў сабе занятак.

— Дык хто я, Магамет ці Хрыстос? — спытаў Васіль, пазіраючы на гурт. Ён нават быў памкнуўся да Пятра, зняў пальчатку, хацеў яму першаму падаць руку, працягнуў яе, але той, нібы не заўважыўшы, адвярнуўся.

Васіль нейкі час так і стаяў, трымаючы перад сабой сагнутую ў локці, працягнутую да Пятра руку, адчуваючы, як чырвань залівае твар.

— І не Магамет, і не Хрыстос, — адказаў, не пазіраючы на яго, Пятро, — а чалавек без сумлення.

Пятро, апрануты ў цёплую лесарубаўскую куртачку, павярнуўся раптам, бліскаў на яго вачамі з-пад шэ-

рай заячай шапкі, даючы зразумець, што ён не пашкадуе, калі Васіль пойдзе туды, адкуль прыйшоў.

На іх глядзелі.

Васіль разумеў, што яго асуджаюць, таму адчуваў сябе чалавекам, які павінен нешта некаму даказаць, нават абражаючы.

— Я супраць свайго сумлення нічога не рабіў, як нехта! — сказаў ён, робячы крок да Пятра.

— Сышліся, пеўні! — гэта Насцін голас. У ім — не то асуджэнне, не то абыякавасць да ўсяго. І як ён не заўважыў, калі спускаўся з гары? Цяпер яна стала між ім і Пятром, пазірала то на аднаго, то на другога. Хаця б смяшынка прабегла па яе халодным белым твары.

Апранутая ў сіні тоўсты караткаваты світэр, Насця раз-пораз абцягвала яго, быццам ён адкрываў яе гнуткі стан. На галаве ў яе была беленькая, таксама самавязаная шапачка, з-пад якой выбіваліся і ледзь варушыліся на ветрыку завіткі каштанавых валасоў. Вейкі ў Насці былі пафарбаваны ў чорны колер, занадта ж доўгія, аж закручваліся.

Васіль, гледзячы на яе, сціснуў вусны, яго даймала крыўда на сябе і Віталя, ён шкадаваў, што прыйшоў сюды, хацеў павярнуцца і пайсці, але раптам у цёмнасініх, як вір, Насціных вачах праяснілася, яны памякчэлі, лёгкая ўсмешка кранула яе вусны:

— Узірайся, узірайся, калі не пазнаеш.

Ён забыўся на крыўду, сэрца гулка затахкала, цела налілося млявасцю, ён адчуў, што перасохлі вусны, як праз сілу вымавіў:

— Можа, каб дзе сустрэў, то і не пазнаў бы... Змянілася ты.

Яна паволі, быццам раздумваючы, ці варта так рабіць, падышла да яго, нібы саромячыся, падала маленькую, вузенькую, як лодачка, руку.

Ён паспешна дакрануўся да яе рукі сваёй, адчуваючы халадок яе тонкіх пальцаў, лёгенька паціснуў.

Цяпер ужо Насця не стрымалася, заўсміхалася, потым адышла далей, пачапіла на нос двухкаляровыя акуляры.

Нэля, якая стаяла воддаль і пазірала на іх, таксама заўсміхалася, і калі Васіль знайшоў яе паглядам, паспешліва начапіла такія ж акуляры.

Снег вакол быў прытаптаны, на цаліку ляжалі лыжы, блішчалі на сонцы алюмініевыя палкі.

Васіль зразумеў, што цяпер яму нельга ісці адсюль. Аднакласнікі, нібы змовіўшыся, маўчалі. Было чуваць, як недзе на сасне гулка стукае дзяцел.

— А вось і Іван сунецца, — парушыў маўчанне Пятро, паказваючы на гару.

Усе паглядзелі туды.

Іван, трымаючы пад пахаю калматую барановую шапку, і сапраўды сунуўся з гары. Ён сядзеў на кавалку фанеры, мусіць, знойдзеным па дарозе, і з'язджаў з гары, узнімаючы іскрысты снежны пылок, які клубіўся за ім. На каленях Іван трымаў ёмісты, напакаваны нечым мяшок, галёкаў ад задавальнення, вецер шкуматаў яго доўгія белыя валасы. На выбоінах фанера падскоквала, падкідаючы Івана, тады чуўся шкляны звон з мяшка.

Ужо ля самага нізу фанера ўрэзалася ў грудок, Іван перакуліўся і пад смех і гоман хлопцаў і дзяўчат паляцеў у снег.

На яго расчырванелым твары раставаў снег, сцякаў да куточкаў вуснаў тоненькімі раўчукамі.

— Ты як на колькі дзён сабраўся, — сказаў Віталь, — напакаваў торбу як падняць.

Віталь падняў са снегу мяшок, узважыў.

— Я не хачу, каб хто сканаў у дарозе з голаду, — сказаў Іван. — Гэта называецца — клопат пра людзей... У нас жа не ўсе пра іх клапоцяцца, — дадаў ён.

— З глузду з'ехаў, — сказала Насця, — трэба было нам сказаць, мы б таксама ўзялі б нешта з дому.

— Дзе ты чула, каб рабочы чалавек разлічваў на беднае студэнцтва? — усміхнуўся Іван. — Паглядзі, колькі нас тут, рабочых, на дзвюх студэнтак.

— Ты кажаш так, нібы мы вінаватыя, што больш ніхто не паступіў? — сказала Насця.

— Дакладней, — усміхнуўся Іван і падміргнуў Васілю, — было б сказаць, што больш ніхто не паступаў, акрамя вас і Федаровіча. Толькі ён вярнуўся з інстытута як мыла з'еўшы. Не атрымалася ў яго...

— А ты скуль ведаеш? — не ўцярпеў Васіль. — Атрымалася! Ты ж у мяне экзамены не прымаў. Не схацеў я сачыненне пісаць.

— Цяпер можна сказаць што хочаш, — не супімаўся Іван.

— Я не збіраюся апраўдвацца перад табой. Думай як хочаш. І ты, і Пятро, ды і ўсе дарэмна на мяне злуяце... Так, я быў супраць таго, каб увесь клас ішоў на

лесаўчастак, бо ведаў, што з нашымі жаданнямі там лічацца, як з леташнім снегам. І яшчэ, кожны павінен займацца той справай, якая яго цікавіць, развіваць тыя здольнасці, якія ў яго ёсць... Не ведаю, можа, цяпер што змянілася на лесаўчастку?

— Калі цябе гэта вельмі цікавіць, можаш даведацца, як карэспандэнт, табе проста, — сказаў Іван. Ён прыклаў рукавіцу да вуха. — Алё? Гэта лесаўчастак? Так-так... З вамі гаворыць Федаровіч. Што?.. Але, з газеты. Не ведаеце? Ды той, што напісаў «Крокі да мары». Як там мае героі працуюць?

Іван кпіў. Напэўна, ён думаў, што ўсе пачнуць смяяцца. Але ніхто не смяяўся, наадварот, хлопцы і дзяўчаты насцярожыліся, чакаючы, што будзе далей паміж імі.

— Я табе зараз як трэсну па чэрапе, аж маланкі заскачуць у вачах! — ледзь стрымліваючы сябе, пагрозліва сказаў Васіль, ступаючы наперад.

— Не трэснеш!

— Чаму?

— Права не маеш. І наогул да крытыкі разумныя людзі раяць прыслухоўвацца... Ды хто ты такі, хто цябе сюды зваў?

Убачыўшы, што Васіль разгубіўся, Іван наступаў, ён нават увабраў галаву ў плечы, сціснуў кулакі.

Гэта было задужа. Але чаму ўсім верхаводзяць Пятро і Іван? Няўжо, калі Васіль не працуе на лесаўчастку, яны маюць права з яго здзекавацца? Не да іх жа асабіста ішоў сюды Васіль. Ён ішоў, каб убачыць тых, з кім дзесяць год вучыўся, з кім сустракаў світанне на рэчцы пасля выпускнога вечара. Вось яны перад ім, Насця, Нэля, Мікола, Валік, Грыша Трацэўскі, Анатоль... Як ставяцца да яго Насця і Нэля, ён ужо ведае. Глядзяць звысака праз акуляры, быццам пасміхаюцца, а можа, шкадуюць. Паспрабуй зразумей іх.

Мікола, дык той чыркае запалкай, усё ніяк не можа закурыць, вачэй на яго, Васіля, не ўзнімае, напэўна, чакае, пакуль Пятро і Іван вырашаць нешта. Наогул з Міколам Васіль не асабліва сябраваў. Ціхмяны, у малодшых класах яго нават дзяўчаты крыўдзілі, тузалі за віхорысты чуб. Ува ўсіх чубы як чубы, а ў яго — віхрам. Цяпер, мабыць, Мікола ганарыцца гэтым, прыйшоў без шапкі, валасы на галаве як дрэнна скіданы стог, вушы вялікія, як расціснутыя, аж прасвечваюцца, такія чыр-

воныя. Відаць, прыхапіла іх марозам, убірае галаву ў плечы, усё лучыць затуліць вушы шалікам.

А Валік? Яму таксама, здаецца, не да Васіля. Стаіць, абапёршыся на палкі, толькі бровы на пераноссі то сыходзяцца, то разыходзяцца, густыя, як шчоткі. Незразумела, слухае, пра што тут гавораць, ці не.

Толькі Грыша Трацэўскі зіркае то на Васіля, то на хлопцаў, прыадкрыўшы рот. Вейкі ў Грышы ўздрыгваюць. Але ён таксама маўчыць.

— Ты чаго, нібы бык, шыю напружыў? — раптам падскочыў да Івана Віталь. — Я запрасіў Васіля, і калі ты з Пятром не хочаш яго бачыць, то завяжыце сабе вочы або ідзіце адсюль прэч. І не гаварыце за ўсіх. Можа, хто мае на гэты конт сваю думку... Мы ўсе Васіля паважалі, ты ж гэта ведаеш...

— А як жа, разумны! — сказаў Іван. — Не тое што мы. Замурзаны не ходзіць. Усё з партфелікам.

— Але, разумны. І, мабыць, разумнейшы, па-чалавечы, за многіх.

— Ты не дужа!

— Але ж вы інакш не разумееце... Не пісаў Васіль так пра наш клас, як надрукавалі ў газеце, не пісаў!

— А чыё прозвішча пад артыкулам?

— Так, яго. Але няма Васілёвай віны. Вінаваты той, хто ў рэдакцыі перапісаў яго допіс.

Не, пасля таго што адбылося, Віталь не павінен быў гаварыць так. Гэта прыніжала Васіля. За яго просяць літасці!

— Бывайце, — сказаў Васіль, беручы лыжы.

— Пачакай! — уладна спыніў яго Насцін голас. — Цяпер ты не маеш права ісці... Зразумей, яны толькі і чакаюць гэтага, каб пераканацца, што ты здраднік.

— Васіль, гэта праўда? — адначасова пачуліся галасы.

— Цяпер гэта не мае ніякага значэння...

— Мае, — сказаў Пятро.

— Праўда. Я пісаў тое, што казаў, калі Уладзімір Мікалаевіч запрашаў на лесаўчастак. Пісаў, што так нельга рабіць, агулам. І яшчэ, што той-сёй пужаў нас цяжкой лесарубаўскай работай, і раптам... Вось што турбавала мяне і турбуе... А мой ліст перапісалі. Ніякага канфлікту, ура! ура! Выпускнікі школы засталіся на лесаўчастку! Бярыце прыклад!

— Але не з цябе, — сказаў Пятро. — Ты ж — эгаіст!

Паставіў сябе асобна, у цябе язык не павярнуўся сказаць нам праўду.

— Чакай, Пятро, — перабіў яго Іван, — ты, здаецца, гаворыш за ўсіх. А ты спытаў нас?

— Не трэба пытаць, — абудзіўся Мікола. — Цяпер нам усім нялёгка. Мы павінны быць разам, падтрымліваць адзін аднаго. Ды ніхто з нас цяжкасцей не баіцца. Але крыўдна, што нас ніхто не ўспрымае ўсур'ёз, той жа Уладзімір Мікалаевіч... Васілю я дарую. Ён памыліўся...

— Так, Мікола, я памыліўся, — згадзіўся Васіль, — але не толькі ў гэтым. Я памыліўся, паступаючы ў інстытут, у спрэчках памыліўся, многа ў чым... На рабоце ў мяне не ўсё добра, больш пішу для рэдактарскага кошыка, чым для газеты. Мне здаецца, што я не ведаю жыцця, ды наогул цяперашняе маё жыццё, як і ваша, абмежавана.

— А нам лёгка кожны дзень гайкі круціць? — сказаў Пятро. — За дзень напрацуешся, што вечарам на занятках па аўтаспраўе засынаеш.

— Каб жа толькі гэта, — сказаў Іван. — Побач з табой працуе які дзядзька, кпіць: «Ці ў мяне чатыры зімы школы, ці ў цябе дзесяць — а робім адно». А маці, як прыпляцешся дахаты, грэючы ваду, дзяўбе: «Глядзі вучыся, а то будзеш, як старэйшы, гайкі круціць. А дзяўчаты, Нэля і Насця, разумнейшыя, далей вучацца».

— Мацеру можна зразумець, — зноў ажывілася Насця. — Хто не хоча бачыць сваіх дзяцей уладкаванымі? А вось настаўнікі... Успомніце, што нам казалі Альбіна Пятроўна і Кузьма Васільевіч. Ледзь што — лесаўчасткам палохалі. Ажно і цяпер страх бярэ.

— Мне здаецца, — сказаў Васіль, — яны не любілі сваю прафесію і, магчыма, трапілі ў педагагічны так, як я мог трапіць...

— Ці дзяўчаты ў машынабудаўнічы, — дадаў Віталь. — Не крыўдуйце, Нэля і Насця. Што вы разумееце ў тэхніцы?

Дзяўчаты пакрыўдзіліся, скрывілі вусны.

— Віталь, так не трэба, — заступіўся за іх Пятро, — а раптам яны стануць добрымі інжынерамі?

— Не, Пятро, — сказала Насця, — мы тут усе свае. Я ведаю, што добрага інжынера з мяне не атрымаецца. Там ва ўсім разбірацца патрэбна, а не зубрыць, ды і не цікавіць мяне гэта работа.

— А я, хлопцы, — сказаў Віталь, — папрашуся на

лесаўчастак, цяпер мне няма куды падзецца. У вучылішча не залічылі, трэба мускулатуру накачаць. Працаваў у горадзе, там шафёрскае пасведчанне атрымаў, я ж старэйшы за вас.

Апошняе ён сказаў з гонарам. Ён і сапраўды быў на год старэйшы за хлопцаў і ганарыўся, што раней іх сядзе за руль машыны.

— Ніхто нам не паможа, — раптам сказаў Васіль, звяртаючыся да тых, хто працаваў на лесаўчастку, — вы, ды і я, як тыя абымшэлыя камяні. А пад ляжачы камень вада не цячэ. Дзейнічаць трэба. Вось Віталь два дні назад мне кораб усяго нагаварыў. Каток, электрычнасць, музыка...

— І будзе, — перабіў яго Віталь.

— Ой, хлопчыкі, страшна ўсё гэта, — пахітала галавой Нэля. — Не ведаю, ці змагла б я цяпер жыць у Мастках. Сумна тут. А ў горадзе другое жыццё. Яно і чужое быццам, і разам з тым так цягне да сябе, як вір.

— Глядзі, не захлыніся, — падкалоў яе Пятро.

— Не захлынуся. Там танцы, тэатр, там усё-ўсё. А вы тут нейкія праблемы вырашаеце. І ніколі не вырашыце. За сцяной вы...

— Ты яе бачыш праз свае каляровыя акуляры? — не супакойваўся Пятро.

— Хіба справа ў акулярах? — не пакрыўдзілася яна.

— Вядома, не, — кажа Васіль, — толькі як я разумею, ніхто з нас дакладна не ведае, у чым справа.

— А можа, мы нікому не патрэбны?

Пятро сказаў так, разгублена паціснуў плячыма.

— Патрэбны, Пятро, патрэбны. Калі не Урублеўскаму, які надзіва хутка забыўся пра нас, то Масткам, зямлі нашай, — сказаў Іван.

Яны яшчэ доўга спрачаліся. І чым далей, тым больш было незразумелага, бо ўсё глыбей і глыбей у жыццё, не зведанае імі, скіроўваліся іх думкі. Няўжо наступіць час, калі ўсё будзе зразумела і проста? У трыццаць, сорак, пяцьдзесят гадоў? А калі ён не наступіць ніколі, ды і наогул, ці наступае такі час для чалавека, ніхто не ведаў...

— Лыжні няма, — сказаў Пятро, калі ўсе выказаліся і зразумелі, што час ісці.

— Пойдзем адзін за адным, — прапанаваў Віталь, — будзем па дарозе мяняцца.

— Пачнём з мяне? — спытаўся Васіль.

Глыбокі і пульхны снег укрываў зямлю. Ён блішчаў на сонцы і сляпіў вочы.

Ідучы па цаліку, наперадзе ўсіх, Васіль правальваўся па забарсні чаравікаў. Сябры, якія ішлі па пракладзенай ім лыжні, наступалі на пяткі, падганялі. Ім было лягчэй.

Васіль трымаў кірунак да рачулкі. Ён беспамылкова арыентаваўся па соснах, узгорках і нізінах, мінаў узбалоткі, якія хоць і замерзлі, стваралі перашкоду. Часта трапляліся купіны, прыцярушаныя снегам яміны, што застаюцца пасля ўзрыву карчоў аманалам.

Ідучы раніцою на сустрэчу з былымі аднакласнікамі да Яўменавай гары, Васіль адчуваў сябе няёмка. Ён стараўся не думаць пра тое, што хлопцы не хочуць з ім сустракацца. І тое, што ўрэшце яны даравалі яму «грэх», з якім ён не пагаджаўся, цяпер не вельмі заспакойвала Васіля. Ён не ведаў, ці ўсе пра яго гаварылі шчыра. Можа, яго хто ўсё ж не разумеў? Можа, хто крывіў душой?..

Пасля выпускнога вечара яны таксама ішлі да рачулкі, каб разам сустрэць усход сонца. Што так робяць выпускнікі школ, яго аднакласнікі ведалі з газет, з кінафільмаў, у кнігах чыталі. Як тады здавалася, гэта рытуал павінен шмат чаго кожнаму праясніць у жыцці: яны адны, побач ні бацькоў, ні настаўнікаў, спрачайся, гавары, што думаеш, цябе ніхто не супыніць.

Лета тады было. Сосны ў ранішняй смузе здаваліся велічнымі. Іх нібы адлітыя з пачарнелай медзі ствалы чакалі абуджэння. І яно з'явілася, калі на ўсходзе загулялі першыя промні. Птушыныя галасы, раса, нібы з бурштыну на верасе і на галінках маладых сасонак, у лодачках чаромхавых лісточкаў, што пачала трапляцца бліжэй да рачулкі, — усё гэта ўзбадзёрвала.

Амаль усе аднакласнікі разбіліся на пары, побач з цёмнымі хлапечымі гарнітурамі між дрэў бялелі святочныя сукенкі дзяўчат. Васіль, Насця і Віталь з Нэляй ішлі апошнія. Яны прыслухоўваліся да гукаў, прыглядаліся да фарбаў, якія ўвачавідкі мяняліся навокал, і здавалася, што прыгажосць лесу ўпершыню адкрывалася ім у невядомай дасюль яснасці.

Васіль параўноўваў навакольны свет са светам вялікага жыцця, якому яго вучылі кнігі. Чытаючы іх за-

поем, ён часта па некалькі разоў, нібы ўзважваючы кожнае слова, перачытваў месцы, дзе апісвалася прырода, блізкая героям і аўтарам. Яго здзіўляла, нават калі пісьменнікі выпісвалі раніцу ў беларускім лесе, у кожнага было сваё бачанне і разуменне. І разам з тым, ён адчуваў, што яны вельмі любілі і добра ведалі тое, пра што пісалі. Напэўна, думаў ён, яны адчуваюць роднасць з сваёй зямлёй, як роднасць з мацераю, бацькоўскім домам.

Ён яшчэ такой роднасці не адчуваў. Ён не ведаў, якое месца прызначана яму ў жыцці, але гэта ўжо хвалявала яго, хоць ён і разумеў — пакуль не нясе перад людзьмі сапраўднай адказнасці за сваё існаванне.

Тады яны спыніліся на беразе рачулкі ля старога вадзянога млына, абрысы якога, адбіўшыся ў вадзе, павольна пакалыхваліся, нібы растваралiся.

На беразе панавала ўжо бязладная гамана, патрэскваў агеньчык.

Анатоль Тарашкевіч, угледзеўшы Васіля і Віталя з дзяўчатамі поручкі, заглушаючы салаўіны пошчак, заспяваў па тым часе модную песеньку, дзе гаварылася, што любоў кальцо, у якога няма пачатку і няма канца...

Салавей, напэўна, яго спужнулі, змоўк. І Віталь, сумеўшыся, сказаў хрэстаматыйнымі словамі: «Дурак, песню испортил...»

— Я гэтаму драчу пакажу! — сумелася Насця і заспяшалася да Анатоля, каб надаваць кухталёў.

Сонца выплыла неяк хутка. На спавольнай плыні густа, як хто насыпаў, залацілася луска хваль. Кусты чаромхі і ракіт серабрыліся, здавалася, у іх голлі заблытаўся вецер, яно варушылася.

А потым яны гаварылі, спрачаліся. Там, ля рэчкі, хлопцы і дзяўчаты адчувалі сябе дарослымі, і можна было думаць, што ніхто з іх ніколі не саступіць з дарогі, якая вядзе да мары. А марыў кожны.

Дык чаму цяпер, пасля школы, так сталася, што яны нібы не думаюць пра будучыню? Чаму цяпер у іх столькі расчараванняў? Чаму многія глядзяць на жыццё не так, як раней? Што іх палоніць?

Паступова, ідучы наперадзе, Васіль стаміўся. Здавалася, ён адчуваў на сваім карку гарачае дыханне Віталя, які ўвесь час лыжамі наступаў на яго лыжы.

Віталь маўчаў, не патрабаваў, каб Васіль саступіў

яму дарогу, прызнацца самому, што цяжка ісці па цалі-ку, у яго не хапала смеласці.

І калі яны прайшлі амаль палову шляху, Віталь, нібы ў яго адкрылася другое дыханне, крыкнуў: «Лыжню!» Васіль саступіў убок.

Ля яго, узнімаючы лёгкі снежны пылок, прабягалі хлопцы і дзяўчаты, а ён стаяў, цяжка дыхаў, пазіраў ім услед, лучыў момант, каб стаць на лыжню апошнім.

## 15

У панядзелак, пасля лыжнага паходу да рэчкі, Васіль амаль на гадзіну спазніўся на працу — не патрапіў на першы аўтобус у райцэнтр.

У рэдакцыі, здаецца, яго спазненне не заўважылі. Калі ён закахканы ўбег у пакой, Кудлацін нават не ўзняў на Васіля вачэй, ён сядзеў за сталом і размашыста распісваўся на лістках паперы, якая ляжала перад ім. Была такая завядзёнка ў загадчыка — у вольны час удасканальваць свой подпіс.

Васіль павітаўся, хуценька распрануўся і цёпнуў у крэсла. Ён пісаў нарыс пра дзяўчыну, якая пасля школы пайшла да бацькоў працаваць на ферму свінаркай.

Не паспеў Васіль напісаць абзац, як у пакой зайшла сакратарка.

— Федаровіч, да рэдактара, — сказала яна і развяла рукамі, маўляў, не ведаю чаго.

Васіль дапытліва паглядзеў на Кудлаціна.

— Чаго глядзіш? — адарваўся той ад занятку. — Я нікому не казаў, што ты спазніўся.

Васіль перавярнуў напісанае, накрыў чыстым аркушам паперы. Яму не хацелася, каб Кудлацін, пакуль ён будзе ў рэдактара, усунуў нос у напісанае. Такая звычка у загадчыка аддзела наглядалася: варта было Васілю на хвіліну выйсці з пакоя, потым прыйсці, як Кудлацін, папыхваючы цыгарэтай, пачынаў цытаваць асобныя яго радкі. І рабіў ён гэта чамусьці ўсякі раз, калі ў пакой хто заходзіў з супрацоўнікаў.

— Які настрой у шэфа? — спытаў Васіль у сакратаркі.

—Не вельмі, — адказала яна.

Васілю не хацелася ісці да рэдактара, не ведаючы, які ў таго настрой. Рэдактар рэдка выклікаў да сябе паасобку супрацоўнікаў. Хіба што калі забракоўваў напі-

санае, павучыць розуму. Заданні ж ён звычайна даваў на лятучках, патрабаваў, каб на іх кожны прыходзіў з блакнотам і запісваў.

— Хопіць! — сказаў рэдактар, калі Васіль увайшоў у яго кабінет. — Час брацца за справу.

Перад гэтым рэдактар адхіліў яго карэспандэнцыю з ільнозавада пра эканомію энергарэсурсаў.

«Ну вось, пачынаецца», — падумаў Васіль.

— Паўгода вы пісалі амаль пароўну і для газеты, і для кошыка, — сказаў рэдактар, паклаўшы перад сабой рукі і гледзячы на Васіля, — і скажу вам, што гэта мяне задавальняла. Як казаў паэт: «Тысячы тон слоўнай руды дзеля аднаго слова...»

Рэдактар любіў цытаваць класікаў, але недакладна, па-свойму.

— Не атрымліваецца так, — сказаў Васіль, — пісаць і кожны раз думаць, што матэрыял трапіць у кошык, не вельмі прыемна.

— А я як пачынаў? — аж прыўзняўся рэдактар. — Мяне яшчэ больш крэслілі, і лічу, што так і трэба было рабіць... Я многіх здольных хлопцаў вывеў у людзі.

Васіль зразумеў, што сёння размова з рэдактарам не мае ніякага дачынення да яго карэспандэнцыі з ільнозавода і тым больш да спазнення.

— Так, але гэта былі здольныя хлопцы, — сказаў ён, думаючы, што рэдактар пачынае нейкую гульню і яе варта падтрымаць хаця б для таго, каб даведацца пра сапраўдныя адносіны Ігната Сяргеевіча да яго.

— Вось, вось, здольныя. Я таму і запрасіў вас на работу, бо лічыў і лічу, што ў вас ёсць здольнасці. Вы чытаеце часопісы?

— Чытаю.

— Звярніце ўвагу на біяграфіі маладых аўтараў. Цяпер больш друкуюць тых, каго называюць філалагічным пакаленнем. Чаму больш іх, тлумачу: яны маюць спецыяльныя веды, ведаюць жыццё. У вас пакуль нічога гэтага няма. У таго, хто піша, павінна быць біяграфія. Журналісты, пісьменнікі...

— Даруйце, я не лічу сябе ні першым, ні другім. Але я не вінаваты, што, акрамя школы, у мяне нічога няма за плячыма.

— Менавіта таму я вас і выклікаў, — усміхнуўся аднымі вуснамі рэдактар. — Вы зусім не думаеце, калі пішаце, для каго.

— Вядома для каго. Для чытача.
— А ён — розны. Увогуле, ён адзін, той, хто чытае газеты і кнігі. Вы пішаце для газеты, а атрымліваецца, што спрабуеце пісаць прозу. А яна ў вас не атрымліваецца, вы гэта не разумееце, і не атрымліваецца таму, што вы не ведаеце галоўнага.
— Як пісаць? Галоўнае, калі ў некага ёсць талент.
— Не, не як пісаць. Вы не ведаеце жыцця. Яно ў вас прыдуманае, прыгожае, правільнае... А вось, напрыклад, калі ішлі да мяне, пра што вы думалі?
— Ды так... Пра тое мы не гаворым.
— Кіньце. Вы думалі, што я буду вас лаяць за карэспандэнцыю або за спазненне.
— Скуль вы здагадаліся?
— Вопыт, веданне жыцця, — пахваліўся рэдактар. — Пра карэспандэнцыю я з вамі гаварыў?
— Гаварылі.
— Калі б я гаварыў яшчэ раз пра карэспандэнцыю, гэта вас, як чалавека, прынізіла б. Ці не так?
— Магчыма, Ігнат Сяргеевіч.
Васіль апусціў галаву.
— Вось вам і жыццё...
— Даруйце, я мала гаварыў з вамі адзін на адзін. На лятучках вы нейкі...
— Не такі?
— Не такі.
— Дзякуй за шчырасць. Перш за ўсё я — кіраўнік. А ўжо як буду гаварыць з кожным, гэта таксама залежыць ад мяне, ад маіх чалавечых якасцей...
— Зразумела.
— Дык вось, хопіць. Хопіць вам карпець над пісьмамі. З сённяшняга дня вы будзеце працаваць у аддзеле сельскай гаспадаркі. Вам трэба вывучаць жыццё, больш сустракацца з людзьмі.
Васіль узняўся з месца, разумеючы, што размова закончана.
— Чакайце, — спыніў яго рэдактар.
Васіль ужо ад дзвярэй павярнуўся:
— Як вам падабаецца калектыў?
— Вы ж ведаеце, гэта першы калектыў, у якім я працую. Напэўна, калектыў як калектыў, — паціснуў ён плячамі.
— А Кудлацін, Гайдук, астатнія?
— Пра Кудлаціна і астатніх я нічога не магу ска-

заць. А вось Гайдук мне падабаецца. Як чалавек і таварыш.

— Але, — пільна паглядзеў на яго рэдактар, — вы нічога не заўважалі ў ім такога... Ну, скажам, што ён у некага браў, пазычаў грошы?

— Ігнат Сяргеевіч, я вас не разумею...

— Гэта так... Скардзяцца на яго.

— На Гайдука? Хто?

— Гэтага я пакуль не магу сказаць. Толькі таксама не веру. Хаця мне многае не падабаецца ў яго паводзінах. Ведаеце, быць дзіцём у такім узросце. Тады з пасведчаннем, цяпер...

— Прабачце, я магу ісці?

Васілю было непрыемна, што рэдактар выпытваў у яго пра Гайдука.

Рэдактар кіўнуў галавой.

## 16

Так, Гайдук падабаўся Васілю як чалавек. Яны нават пасябравалі. Неаднойчы ўдвух ездзілі па раёне. Васіль часта бываў у яго на кватэры, некалькі разоў Віктар быў дома ў Васілёвых бацькоў. Гайдук падабаўся таксама бацькам. Ён умеў кожнага выслухаць, з бацькам пагаварыць пра лес, з мацераю пра ўсё: ад каровы, якая ў гэтым годзе рана запусцілася, да зёлак, якіх было многа назапашана.

Маці часта казала Васілю:

— Ты, сынок, такіх людзей трымайся. Ім чужога ні каліва не трэба, яны сваё да крошкі аддадуць, дарэмна чалавека не пакрыўдзяць.

— Скуль ты ведаеш? — пытаўся Васіль, радуючыся, што маці паважае яго старэйшага сябра. — Ці ты з ім працуеш? А можа, чалавек толькі на словах такі?

— А што ж, няпраўда? — падтрымліваў мацеру бацька. — Іншы тры кошыкі нагаворыць, і бачна, што няшчыра. Мякка сцеле, ды мулка спаць. А гэты і гаворыць багата, ды ўсё па-людску. Я табе кажу, сын, у яго душа па ўсім баліць. А ты не думаў, чаму ён з табой сябруе?

— Сябруе, і ўсё.

— Не, мне здаецца, што ён цябе ад некага асцерагае там у рэдакцыі, спачувае табе, не хоча, каб ты аступіўся.

— Ды яго самога трэба асцерагаць, — не згадзіўся Васіль.

— Яго ўжо не трэба, яго ўжо нішто не зменіць. Праўда, і яму хітрэйшым трэба быць, а то не знай не ведай чалавека, адкрываецца.

— Значыць, верыць людзям.

— Гэта добра, што верыць.

Васіль і сам неяк падсвядома разумеў, што верыць чалавеку трэба.

Аднойчы, калі яны пасля работы сядзелі ў фоталабараторыі і пры слаба-чырвоным святле праяўлялі фотакарткі — Васіль упершыню бачыў, як на чыстай паперы нібы самі па сабе вымалёўваюцца рысы, потым твары людзей, Віктар сказаў:

— Падабаецца мне, як ты пішаш. Малаток! Так і трэба... Нібы хочаш у душу зазірнуць.

— Дык жа крэсляць, — паскардзіўся Васіль.

— Хай, газеце, асабліва раённай, гэта непатрэбна. Але калі ты не адступішся і калі-небудзь паспрабуеш сур'ёзна, гэта спатрэбіцца. Толькі, як я разумею, лепш было б, каб цябе не ўзялі ў газету.

— Чаму? — пакрыўдзіўся Васіль.

— Газета — сушыць. Па сабе ведаю. Я некалі вершы пісаў, праўда, не друкаваў. У мяне аднакласнік пісьменнік, у Мінску жыве. Дык ён чытаў, казаў, каб я збіраў на зборнік.

— Пісьменнік? — здзівіўся Васіль. — Жывы пісьменнік аднакласнік!

— Але, — усміхнуўся Гайдук, — толькі я цяпер разумею, што не хацеў ён мяне крыўдзіць. Дрэнна я пішу... Ну выдаў бы кніжачку з яго дапамогай, а далей што? Шэранькі аўтар, шэранькія вершы. Ні ўзад ні ўперад... А ты пішы.

— Я ўжо гэта чуў ад рэдактара, Віктар. Пра што пісаць, калі я нічога не ведаю. Адкажы?

— Пра жыццё... А ты думаеш, я яго ведаю? Толькі знаю, седзячы ў рэдакцыі, жыццё не пазнаеш.

— Мяне больш за ўсё гэта і хвалюе. Кожны дзень адно і тое, кожны дзень думаеш: ухваляць матэрыял ці не. Іншы раз здаецца, што ты недзе за мяжой сапраўднага жыцця, глядзіш на яго, нібы праз акуляры. А вось дома я сустракаўся з аднакласнікамі, дык іх нешта турбуе, у іх свае праблемы, надзеі... Ведаеш, адзін дзівак нават марыць перайначыць жыццё ў пасёлку, каток

заліць сярод лесу, правесці электрычнасць і нават пабудаваць дэльтаплан.

— Дэльтаплан? — здзівіўся Віктар. — Гэта ж цудоўна. Толькі лятаць адкуль?

— Не ведаю.

— Калі пабудуе, павінен паляцець... А ты чаму пра гэта маўчыш, ты што — не з імі?

— Цяпер з імі. Але было, даўняя гісторыя...

—Тады не трэба, калі не хочаш. Толькі б я быў з імі, разумееш?

— Разумею. Хаця мне было раней зрабіць гэта вельмі цяжка, быць з імі.

— Гонар? — дапытліва паглядзеў на яго Гайдук.

Васіль не адказаў.

## 17

Такой бурнай лятучкі Васіль яшчэ не бачыў. Рэдактар стаяў за сталом, трымаў у руках два аркушы тэксту, аддрукаванага на машынцы, і трос ім перад супрацоўнікамі, тыя сядзелі ўздоўж доўгага стала.

— Гэта ананімка, — сказаў рэдактар, — яе мне пераслалі з райкома, прасілі разабрацца. Калі тое, пра што тут гаворыцца, праўда, то вы, таварыш Гайдук, павінны будзеце падаць заяву аб звальненні. Калі ж не, калі гэта паклёп, мы павінны ўсе разам падумаць пра прычыну яго з'яўлення. Нам важна не толькі выявіць факт, які б ён ні быў, а ўсебакова прааналізаваць яго.

Гайдук сядзеў моўчкі, пазіраў у акно і, здавалася, нічога не чуў. Кудлацін міргаў маленькімі вочкамі, пад Назарэвічам рыпела крэсла.

— Дык вось, — працягваў рэдактар, — тут пішуць, што Гайдук на рэдакцыйных фотаматэрыялах робіць здымкі і за гэта бярэ хабар. Калі ж падлічыць, колькі грошай ён паклаў у сваю кішэню за пяць гадоў такой дзейнасці, то атрымаецца значная, вельмі значная сума.

— Гэта вельмі проста праверыць, — сказаў Паўлючэнка, — трэба паглядзець паперкі, колькі кожны год ён атрымлівае фотаматэрыялу і колькі здымкаў было надрукавана ў газеце.

— Можна, — згадзіўся рэдактар, — сам факт праверкі пасля такога пісьма павінен быць. Асабіста мяне хвалюе другое. Будзем, напрыклад, лічыць, што факты пацвердзяцца, што Гайдук вінаваты, тады ён панясе па-

каранне. Я першы буду супраць яго, не буду шкадаваць яго як чалавека. Калі ж мы памылімся, калі Гайдук не такі, падумайце — мы яго як асобу абразім. Усе разам.

— Я не згодзен, — сказаў Кудлацін, — факт трэба праверыць, неадкладна.

— Я не супраць праверкі фактаў, — сказаў рэдактар, — але мяне здзіўляе, і, мабыць, я больш чым хто з вас, як кіраўнік, вінаваты, што мы Гайдука па-сапраўднаму не ведаем. Як чалавека. Ды і наогул, хто з вас можа сказаць, што Гайдук невінаваты? Вы, Паўлючэнка, вы, Назарэвіч, Кудлацін?

Паўлючэнка паціснуў плячамі:

— Такой адказнасці я на сябе не бяру.

— А чаму я? — спытаў Кудлацін. — Ён не ў маім аддзеле.

— Я б яшчэ падумаў, — сказаў Назарэвіч. — Але я падтрымліваю Кудлаціна, давярай, як кажуць, ды і правярай.

— Можна мне? — спытаў Васіль і, не чакаючы дазволу, пачаў: — Я мала ведаю Гайдука, усяго паўгода. Але я яму веру. Не мог Віктар браць хабар...

— А ты доказна, доказна! — супыніў яго Кудлацін.

— Як жа доказна, чым я магу даказаць? Гэта ж не тэарэма. Я яму веру... Дарэчы, Ігнат Сяргеевіч, — Васіль узняўся з месца, — памятаеце выпадак з пасведчаннем? І Кудлацін, і Назарэвіч ведалі, што Гайдук за людзей свае грошы заплаціў, заступіўся. І, як я разумею, пра гэта яны нікому не сказалі, а пасміхваліся з яго.

— Чакай! Ты варушыш старое, — сказаў Кудлацін. — А між іншым, тады ён заступіўся за п'яніц. Ты гэта ведаеш?

— Ды не п'яніцы яны, не абражай людзей! — амаль крыкнуў з месца Гайдук. — І я не буду цябе пераконваць у гэтым... Ваявалі яны разам, доўга не бачыліся.

Гайдук махнуў рукой, змоўк.

— Добра, — сказаў рэдактар, — давайце з другога боку паглядзім. А хто з вас можа сцвярджаць, што Гайдук бярэ хабар?

Ніхто ні слова, нібы не пачулі.

— Дазвольце? — Гайдук узняўся з месца. — У пісьме амаль усё праўда.

Васіль бачыў, як пачырванеў рэдактар, як заўсміхаўся Кудлацін, а Назарэвіч развёў рукамі.

— Праўда, што я раблю людзям здымкі. І заўважце,

не па адным, а па дзесятку. Праўда, што я праяўляю іх у нашай лабараторыі, бо сваёй асабістай у мяне няма, а гаспадыня шкадуе электрычнасць. І грошы мне прапаноўваюць. І я нават раблю канкурэнцыю мясцоваму быткамбінату.

«Віктар, навошта ты на сябе нагаворваеш?» — думаў Васіль.

— Але няпраўда, што я бяру грошы, няпраўда, што раблю за рэдакцыйныя сродкі. Я ўсё патрэбнае купляю сам, і гэта мае права, каго і як фатаграфаваць. Мне прыемна, калі людзі радуюцца. І прыемна перш за ўсё таму, што я здымаю іх такімі, як хачу, як бачу, як яны хочуць. Акрамя Васіля, мне ніхто не верыць...

— Чакайце! — перабіў яго рэдактар. — Вы гэта кіньце! Як больш ніхто? Можа быць, я першы вам паверыў і не веру таму, хто пісаў! Гэта не суд, наша размова. Я хачу, каб у нас у калектыве былі шчырыя адносіны між людзьмі. І вы не станавіцеся ў позу пакрыўджанага.

— Ды што казаць, — абурыўся Паўлючэнка, — замест таго каб працаваць, мы разбіраем паклёп. Ананімка, яна і ёсць ананімка!

— Тут ёсць подпіс, — сказаў рэдактар.

— Як? — амаль адначасова ўскрыкнулі Паўлючэнка і Васіль. — Чаму ж вы тады?..

— Подпіс тут застаўся выпадкова. На другім баку аркуша. Той, хто пісаў, напэўна, не прыкмеціў. І гэты чалавек тут...

Рэдактар змоўк, адвярнуўся да акна, здавалася, што яму сорамна глядзець у вочы супрацоўнікам. Тыя сядзелі і таксама пазіралі адзін на аднаго. Толькі Кудлацін хрыплым голасам сказаў:

— Подпіс можна падрабіць...

— Ігнат Сяргеевіч, — сказаў Гайдук, — я вельмі прашу вас, не называйце прозвішча. Хай ніхто яго не ведае. Як тады працаваць разам?

— Віктар, не даруй, — сказаў Васіль, — чуеш?

Гайдук сумна ўсміхнуўся, нічога на гэта не адказаў.

— Дык што, пісьмо парваць? — спытаў рэдактар.

— Парвіце, парвіце, — параіў Кудлацін, — Гайдук сам просіць... А подпіс можна падрабіць.

Рэдактар парваў пісьмо на дробненькія кавалачкі. Першы выйшаў з кабінета Гайдук.

Супрацоўнікі, выходзячы, стараліся не глядзець адзін на аднаго.

Звычайна, калі ў Васіля былі непрыемнасці на рабоце і дрэнны настрой, яму чамусьці ўспаміналася дзяцінства. Успаміны, нібы шырокая ціхая плынь, у якую ўваходзіш пастулова і якая як рукой здымае здарожанасць, авалодвае ім. Ён забываўся на ўсё. Лагоднае сэрца, нібы ўсё у яго жыцці было добра і проста.

Успаміналася лета, калі бацька паставіў хату і сям'я перабралася з хлеўчука ў прасторную, тады яшчэ без перагародак, будыніну. Ён ездзіў па хаце на трохколавым веласіпедзе, цягаў за сабой якую галіну — хлыст.

Ад колаў на падлозе заставаліся пісягі. Маці не сварылася, бо бацька збіраўся фарбаваць падлогу — хай дзіця цешыцца. І яно цешылася, думаючы, што гэта хата ніколі не стане для яго маленькай.

Потым падворак, на якім пахла смалой і трэскамі, якія грудкамі ляжалі ля сцяны хаты. Зялёная траўка і гусі. Вялікі шэры гусак выцягвае доўгую шыю, каб ушчыкнуць яго, Васіля. Васіль спуджана заве маці. Яна выходзіць з гародчыка нясе ў прыполе гуркі, бярэ ў рукі дубчык, гоніць гусей на лужок за шашу. Ён, трымаючыся за яе спадніцу, пляцецца побач. Нагрэты за дзень пясок прыемна казыча босыя ногі, у чыстым, дзе-нідзе аблачынка, небе вісіць сліпучае сонца.

Ужо загнаўшы гусей і вяртаючыся назад, яны з маці заўважаюць ля аўтобуснага прыпынку згорбленага дзядка з пустым мяшком у руках. Дзядок смокча скарыначку хлеба, бародка яго, рэдзенькая і сівая, трасецца, і ад гэтага на твары ламаюцца маршчынкі.

— Скуль вы будзеце, дзядзька? — супыняецца побач маці.

Дзядок доўга глядзіць на мацеру, потым узнімаецца з травы, гладзіць Васіля па галаве. Рука ў старога дрыжыць, маленькая, як высахлы падарожнік.

— Здалёку, мая таечка. Аж з Убалацця.

— Аж з Убалацця, — здзіўляецца маці. — Што ж вас, чалавеча, у такую дарогу вымусіла?

— Ат, не пытайся, маладзічка. Людзі наказалі, што ў гарадку гэтай парою прадаюць малочных недарагіх кабанчыкаў, дык я і паехаў. Во са старой крыху грошай сабралі. Чакаю, чакаю, ажно аўтобуса няма шака.

— Яго цяпер доўга не будзе, хіба што вечарам, дык жа куды вам, на ноч гледзячы?

— А што ж рабіць мне? Не ехаць жа назад.

Дзядок уздыхае.

— Назад не, — кажа маці, — хадземце, у нас пераначуеце, а заўтра раніцою паедзеце ў гарадок. Павячэраем, я гурочкаў выбрала...

Дзядок часта міргае вачамі.

— А мая ты таечка, хай табе, і тваім дзецям, і твайму чалавеку здароўе будзе! Няёмка, але свет не без добрых людзей...

Дзядок начаваў у іх, вячэраў разам з усімі ў новай хаце, і чамусьці бацька, які звычайна хутка еў, на гэты раз доўга сядзеў за сталом. А Васіль,пад'еўшы, глядзеў, як дзядок бяззубым ротам жуе хлеб, як у яго дрыжыць рука, калі нясе да рота лыжку.

Тады гэтае «свет не без добрых людзей» Васілю было незразумелым, але запала ў памяць, не сцерлася там, і ўжо цяпер, працуючы ў рэдакцыі, ён разумеў сэнс слоў старога. Не, не таму на свеце багата добрых людзей, што нехта з некім дзеліцца апошнім кавалкам хлеба, нехта некага падтрымлівае ў цяжкую хвіліну, а яшчэ, мабыць, і таму, што большасць людзей жыве сумленна, верыць людзям, можа распазнаць фальш і падман, як, напрыклад, у выпадку з Гайдуком рэдактар. А добры свет, мабыць, і складаецца з мільёнаў крупінак дабраты і чалавечнасці, і не трэба тут адбіраць зерне вялікай дабраты ад дабраты.

Дзядуля той назаўтра паехаў. Больш Васіль яго не бачыў. Але яму неяк падсвядома было добра і радасна за маці і бацьку, і на гусей ён больш не крыўдаваў.

Падросшы, Васіль хадзіў з маці ў лес варушыць і грэбці сена. Звычайна, як і ўсе лесаўчасткаўцы, бацька касіў ля балотцаў, між кустоў, і гэта пара засталася ў яго памяці як своеасаблівае свята, як нешта светлае і па-чалавечы вялікае.

Калі сонца ўзнімалася высока і яго звіркія промні прабіваліся праз густыя галінкі дрэў, ён з маці садзіўся пад кусцік адпачыць. Тады паступова забывалася вуліца, па якой таварышы коцяць абручы, уздымаючы клубы жоўтага пылу, маленькая рачулка, на беражку якой прыемна загараць, вайна ля Яўменавай гары — забываліся тыя дзіцячыя бесклапотнасць і весялосць, якія кожны перажывае ў дзяцінстве, і невядомы дасюль свет жыцця звяроў і птушак, людзей і дрэў уваходзіў у яго душу словамі маці.

Не, яна расказвала яму не казкі, яна расказвала аб жыцці рэальным, якое было вакол яго і аб якім ён нават не падазраваў: зорка падала ў траву таму, што яе каханы знайшоў над зямлёю вялікую зорку Венеру, лісце жаўцела таму, што сонца аддавала яму сваё цяпло і гэтае занадта шчодрае спагадлівае святло несла бяду дрэвам, а бусел — была птушка з душой чалавека, якая навечна павінна была несці свой цяжкі крыж за правіннасць перад людзьмі. Толькі ж ці была яе правіннасць у тым, што будучы чалавекам, яна развязала мех з гадамі, і тыя распаўзліся, ды наогул як сумясціць яе цікаўнасць і віну за гэта? Тысячы «чаму», якія ён павінен разгадаць, хвалявалі яго розум, і калі ён пачынаў шукаць адказы на гэтыя «чаму», іх станавілася ўсё больш і больш. Тады зараджалася неспатоленая прага некаму выказаць усё, што думаеш, можа, таму ён і пачаў пісаць у газету. Яго фантазіі было мала прасторы ў школьных сачыненнях...

Ганна Кузьмінічна... Яна чытае перад класам яго сачыненне, васьмікласнікі слухаюць уважліва і не вераць, што ён пісаў. Масткі нібы маюць сваю душу, сады ў пасёлку — таксама, хаты падобны на сваіх гаспадароў, пазіраючы ў свет іх вачамі... І раптам голас: «Няпраўда, так збрахаць!..»

Ганна Кузьмінічна нібы спатыкнулася, на мінуту змоўкла, ён паварочвае галаву — Насця! Ды як яна магла так сказаць пры ўсіх, што ён манюка! І глядзіць на яго, не адводзячы вачэй, у якіх скачуць гарэзныя агеньчыкі, хаця б міргнула!

Яму сорамна, ён адчувае сябе нейкім псялыжнікам, твар яго залівaецца чырванню, тахкае ў скроні, ён узнімаецца з месца, каб, пасаромлены, выбегчы з класа, але Ганна Кузьмінічна надзіва спакойна кажа:

— Праўда ўсё гэта... Вы зразумееце гэта, хто раней, хто пазней. Васіль — таксама.

Цяпер ён упэўнены, Насця так сказала знарок, каб увесці яго ў чырвань, пакрыўдзіць. А тады пасля ўрокаў ён перастрэў яе на вуліцы, схапіў за руку.

— Пачакай, яшчэ паглядзім, ці зманіў я. Я — дакажу...

— Што ты дакажаш? — яе гуллівыя вочы насміхаюцца. — Дакажы, толькі мне адной. Выскачка!

Яна паказала яму язык, ён адпусціў яе руку, адбеглася.

— Чаму толькі табе адной? — не зразумеў ён.

— Я так хачу, чуеш?!

Ён да поўначы пісаў нешта накшталт апавядання пра нешчаслівае каханне, а назаўтра паслаў напісанае ў часопіс.

Адказ прыйшоў неўзабаве, напісаны ад рукі пісьменнікам, чые кнігі Васіль чытаў. Пісьменнік пісаў, што яго работу надрукаваць нельга, тлумачыў чаму і ў канцы абнадзейваў: «пры пэўнай рабоце вы, спадзяюся, дасягнеце поспеху. Вывучайце жыццё...»

Ён, паклаўшы ў кішэню картовага пінжачка, доўга насіў ліст з сабой, пакуль на ўроку фізкультуры не ўлічыў момант, калі застаўся вока на вока з Насцяй — настаўнік усіх адпусціў збіраць сон-траву ў сасонніку за стадыёнам, — паказаў ёй.

— Гэта не доказ, — засмяялася яна, узіраючыся ў ліст, — там жа ўсё у будучым часе. А калі гэта будзе, яшчэ віламі па вадзе пісана!

Ён выхапіў з яе рук ліст, крутануўся на месцы, потым кінуўся прэч у лес.

Ён не адчуваў, што галінкі балюча сцябаюць па руках, твары, па грудзях. Яму хацелася праваліцца праз зямлю, памерці, толькі б не бачыць яе насмешлівага погляду, ён шкадаваў сябе і адчуваў, што няшчасны.

І разам з тым яму нясцерпна хацелася хутчэй вырасці, пражыць жыццё, сустрэцца з Насцяй, калі ў яе будуць унукі, падарыць ёй усё напісанае і сказаць: «Ну што, ці твая праўда?»

— Васіль, пачакай, во нейкі малахольны, — пачуў ён услед, — нічога яму не скажы, крывое кола, не крані ты яго!

Ён спыніўся.

— Даруй, — падбегла яна да яго, — я пажартавала! Веру, не крыўдуй, добра?

Хіба мог ён пасля гэтага крыўдаваць? Ён усміхнуўся, яму зрабілася добра.

Цяпер ён часта думаў: добра, што ў чалавека ёсць памяць. Іншы раз яна, як сонечны промень, саграває сэрца...

Ён не разумеў, чаму так думае, ён не разумеў яшчэ, што памяць нібы паходня, якая асвятляе чалавеку шлях наперад.

19

У Васіля на рабоце быццам усё было добра. Матэрыялы яго па-ранейшаму друкавалі часта, па-ранейшаму рэдактар іх правіў, але быццам не так прыдзірліва. Тым не менш сапраўднага задавальнення ад работы ў яго не было. Васіль разумеў, што трэба глыбей вывучаць жыццё, якога ён не ведаў, трэба вучыцца, не толькі чытаць кнігі, а, прыглядаючыся да ўсяго, што адбываецца вакол яго, аналізаваць, асэнсоўваць.

У яго было адчуванне нібы ў кватаранта, які жыве ў чужой кватэры, не ведаючы па-сапраўднаму яе гаспадароў.

Ён хоць па-ранейшаму жыў з бацькамі ў Мастках, але дрэнна ведаў, што адбываецца ў пасёлку, ён нібы абыходзіў клопаты пасялкоўцаў, не заўважаючы іх.

Пасля прымірэння з хлопцамі, якія працавалі на лесаўчастку, ён сустракаўся з імі то на стадыёне, ходзячы на лыжах, то вечарамі у клубе.

Яны казалі, што Віталь, Пятро, Іван і некалькі старшакласнікаў расчышчаюць стадыён ад снегу, каб заліць каток.

Гэта было нялёгка. Вечарамі пасля работы яны бралі фанерныя рыдлёўкі, спускаліся з Яўменавай гары, адкідвалі з пляцоўкі снег, а ноччу або раніцой яе зноў засыпала, прыходзілася пачынаць усё спачатку. Урэшце ўсталяваліся ясныя марозныя дні, нахапкамі хлопцы давялі пляцоўку да ладу, заставалася толькі заліць вадой.

— На лесаўчастку ёсць пажарная машына, — сказаў ім Васіль, — трэба папрасіць яе — і ўвесь клопат.

— Урублеўскі табе дазволіць? — дзівіўся Пятро. — Чакай Пятра, сыру з'ясі. Я неяк быў заікнуўся пра машыну, дык ён замахаў рукамі, як вятрак крыламі: а раптам у гэты час што загарыцца?

— Давайце нальём у бочкі вады ды прывязём, — сказаў Васіль.

— Ты як з месяца зваліўся, — сказаў Віталь, — хто ж так каток залівае? Трэба, каб усюды аднолькава роўна, шлангам трэба, як у горадзе. Я на свае вочы бачыў, як гэта робіцца. Толькі машына пажарная патрэбна.

— Заладзіў: машына, машына, — перадражніў яго Іван. — Кажуць табе, што не бачыць яе нам як сваіх вушэй! Шкада, што столькі сіл патрацілі...

Іван са злосцю шпурнуў рыдлёўку далей ад сябе, зняў рукавіцы, выцер рукой узмакрэлы лоб.

— Хіба што Васіль папросіць, — разважаў Пятро.

— Я? Ды ён касавурыцца, калі мяне бачыць, — адказаў Васіль. — Мы з Уладзімірам Мікалаевічам нібы што не падзялілі, ворагі.

— Не адгаворвайся, — не суцімаўся Пятро, — ты працуеш у газеце, растлумачыш: так і так, моладзь павінна адпачываць пасля работы, не ўсё ж хадзіць мурзатымі.

Хлопцы з надзеяй глядзелі на Васіля, ён разумеў: калі адмахнецца — не даруюць.

## 20

Васіль доўга гаварыў з Уладзімірам Мікалаевічам. Той стаяў на сваім.

— Не маю права, — казаў ён, уздыхаючы і пазіраючы міма Васіля, — а раптам што загарыцца ў пасёлку? Ты ж адказваць не будзеш, сеў на аўтобус ды ў горад.

Урэшце Васіль зразумеў, што воза яму не зрушыць. Уладзімір Мікалаевіч, здаецца, знарок не дазволіў узяць машыну. Да ўсяго ж, на ёй Урублеўскі ездзіў на дзялянкі, яна часта прастойвала ля яго хаты, выкарыстоўваў як сваю.

— Калі машына прымярзае да дарогі ля вашага дома, дык вы пра пажар не думаеце, — уеў яго Васіль, — а тут усяго на паўгадзіны работы.

— Яйка курыцу вучыць! — абураўся Урублеўскі. — Будзеш на маім месцы, тады загадвай!

— Мне ваша месца не трэба! Раней чаго толькі не абяцалі нам, каб у Мастках засталіся! А цяпер і вухам не вядуць. Хлопцам нават няма дзе адпачыць.

— Як няма? А клуб?

— А што там рабіць? Ён увесь час на замку, адчыняецца толькі, калі кіно прывязуць.

— Арганізуйце работу. Але, я перад вамі скакаць буду ці твой бацька? Рассыплемся, як порхаўкі. Арганізуйце самадзейнасць.

— Пацеха з пустога меха. Кіраўніка няма... Ды і як гэта толькі мы самі?.. Цяпер прафесійныя артысты ў раённы Дом культуры кожны тыдзень прыязджаюць. Лепш наведвацца туды.

— Вось што. Ты за сябе кажы. Хлопцаў не чапай! Ім працаваць трэба, гэта ў цябе ў галаве гулі.

— Уладзімір Мікалаевіч, — стрымліваючы сябе, каб не сарвацца і не сказаць што абразлівае, мовіў Васіль, — калі вы будзеце так, як цяпер, ставіцца да моладзі, пенсіі дачакаецеся адзін.

— Ну, ведаеш, дэзерціры былі і раней. Слабакі заўсёды ўцякалі ад цяжкасцей, але жыццё ішло наперад.

Уладзімір Мікалаевіч паправіў каўнер кажуха, паглядзеў у бок машыннага двара, даючы зразумець, што размова скончана. Яго кароткія сівыя вусы аб'інелі.

— Так, былі, — затрымаў яго Васіль, саступаючы з пратоптанай сцяжынкі, якая вяла ад канторы на машынны двор, у снег, — але тут не слабыя. І чаму адразу хапацца за гэта? Ёсць жа магчымасць, каб добра адпачываць. Усё рабіць ды рабіць — сумна так. Толькі скажу, і раней я быў перакананы, што да работы трэба рыхтаваць са школьнай парты людзей, вы гэта ведаеце. А не падманам браць сабе замену, як вы зрабілі... Прабачце, Пятро, Іван, хлопцы, Віталь, ды усе, пасля арміі да вас не прыйдуць. Мала таго, яны другім закажуць, каб вас абыходзілі... Хлопцам дапамога ваша патрэбна, а вы...

— Кажы, кажы... Нібы па пісаным. Ці я менш цябе разумею ў жыцці?

— Гэта я не кажу, толькі не трэба нас гэтым папракаць. Наша пакаленне сваё пакажа. Яно дарогі будуе, заводы, хопіць яму. Так і павінна быць. Але нам справа патрэбна і магчымасці для адпачынку.

— Справа, каток! — усміхнуўся Уладзімір Мікалаевіч. — Не дам я машыны, дос!

Ён павярнуўся, пад яго фетравымі, з закасанымі халявамі валёнкамі зарыпеў снег.

— Тады мы возьмем самі, — кінуў услед Васіль.

— Як гэта самі? — снег перастаў рыпець, Уладзімір Мікалаевіч спыніўся як укопаны. — Ды я вас, смаркачы, пад суд аддам!

«Ну вось, звязаўся», — падумаў Васіль і пасунуўся ў бок гары.

## 21

Калі Васіль расказаў хлопцам пра сваю гутарку з Уладзімірам Мікалаевічам, тыя яго не пахвалілі.

— Ты пераначаваў, партфелік у рукі ды паехаў, — сказаў Пятро, — а нам жа тут працаваць, падумае, што мы цябе падбухторылі. Ды і абяцаў мне і Івану даць накіраванне ў лесатэхнічны інстытут. Цяпер думай...

— А што думаць? — здзівіўся Віталь, — мы ж не на яго ўласным прадпрыемстве працуем. А калектыў?

— Калектыў, калектыў, — сказаў неахвотна Пятро, — ты, Віталь, без году тыдзень з намі, а мы ўжо даўно навучаныя. Ніхто з намі не лічыцца, за драпае лыка не вядзе...

— Будуць лічыцца, — нібы паабяцаў Віталь. І да Васіля: — Пад суд, кажаш? Хай паспрабуе. Толькі, хлопцы, нельга нам адступаць. Цяпер адступім — наступны раз нават размаўляць не стане.

—А што ты зробіш? — спытаў заклапочана Іван. Відаць, ён таксама не згаджаўся з Васілём і лічыў, што не трэба было злаваць Уладзіміра Мікалаевіча.

— Зраблю! — Вочы Віталя па-блазенску заблішчалі. — Сам вазьму машыну.

— Шыро-ока адчыніць табе вароты вартаўнік, — сказаў Пятро.

— Навошта? Уладзімір Мікалаевіч ездзіць на машыне на абед?

— Ну?

— Эх-ма! — узрадаваўся Віталь. — Заўтра пасля работы ўсе на каток з канькамі. Чуеце?!

— Бяжым, аж гай шуміць, — сказаў Пятро.

## 22

Васілю расказвалі, што такога шуму у Мастках яшчэ не было. Апоўдні на другі дзень ад свайго дому бег па вуліцы да Яўменавай гары Уладзімір Мікалаевіч. Быў ён без шапкі, у касцюме, твар чырвоны, злосны, рукі матляліся ўзад-уперад.

Жанчыны, Васілёва маці таксама, якія стаялі ля магазіна, чакаючы з горада машыну з прадуктамі, убачыўшы такім Урублеўскага, увязаліся следам.

Уладзімір Мікалаевіч выбег з пасёлка, скіраваўся па дарозе да школьнага стадыёна.

Жанчыны не адставалі. Выбеглі на стадыён, спыніліся, нічога не разумеючы. Тут стаяла пажарная машына, вакол яе, трымаючы ў руках доўгі рабрысты рукаў, круціўся Віталь, залíваючы каток.

Варта было толькі Уладзіміру Мікалаевічу наблізіцца да машыны, як шлейф вады пачынаў падаць у напрамку да яго.

Урублеўскі нешта крычаў, гразіўся, а Віталь рабіў сваю справу. Урэшце, крыху супакоіўшыся, Уладзімір Мікалаевіч крыкнуў:

— А каб жа цяпер што загарэлася ў пасёлку!..

Пачуўшы гэта, Віталь выключыў матор, кінуў шланг, падышоў да Урублеўскага, падаў ключы, моўчкі паківаў галавой.

— Божухна! — успляснулі рукамі жанчыны. — Пажылы чалавек, а так сябе паводзіць. І не сорамна?

— Яму не сорамна, — вымавіла Васілёва маці, пачуўшы пажаданне Уладзіміра Мікалаевіча...

— Цяпер ён табе жыцця не дасць, — сказаў Пятро. Гэту гісторыю мо дзесяты раз расказваў хлопцам Віталь, майструючы ў сваім хляве дэльтаплан. Хлопцы прыйшлі да Віталя вечарам, яны ўжо чулі, што той утварыў на Яўменавай гары.

— Пабаіцца, — упэўнена сказаў Віталь, мацуючы дроцікі на тонкае мацерчатае вялікае — яно ледзь умяшчалася ў хляве — крыло. — Я ж не ўзяў машыну з гаража без дазволу, а паехаў ад яго хаты. Ён жа выкарыстоўвае яе для асабістых патрэб.

Васіль усміхаўся, пазіраючы на Віталя. Хто б як не ён да такога дадумаўся? Але ж каток заліў, цяпер вось майструе апарат, ды так сур'ёзна, быццам верыць, што паляціць.

— І вада не замерзла, а такі мароз быў? — пытаў Іван.

— Не замерзла, — усміхнуўся Віталь. — Раніцой, калі ў радыятар залівалі гарачую ваду, я сказаў старому Няфёду, каб у цыстэрну наліў таксама гарачай. Няфёд яшчэ на мяне недаўменна зірнуў, але я спаслаўся, што так загадаў Урублеўскі.

— Ты ж чалавека падвёў, — сказаў Васіль.

— Не без гэтага. Але стары пасля здарэння, калі я прыйшоў павініцца, смяяўся. Ён жа загад выконваў, яму што.

— Не, Віталь, ты цяпер за руль не сядзеш, — паспачуваў Пятро.

— Чаму? Узрост дазваляе, машыны прастойваюць. Трэба ж некаму лес валіць, — сяду.

У хляве было холадна. Вецер намёў з-пад дзвярэй

снегу, ён ляжаў на доле сінімі купкамі. Цьмяна гарэла электрычнасць. У агароджаным катушку рохкаў вяпрук.

— Як ты тут майструеш? — здзівіўся Пятро.

— Так і майструю. Цесна, але нічога. Маці не сварыцца. А то быў распачаў у хаце, дык планкі для крылаў хацела на падпалку пасячы.

Васілю здавалася, што ён ніколі не змог бы зрабіць таго, што зрабіў сябра. Гэты, калі што ўзяў у галаву, не адступіцца, хоць ты яго рэж. Вось і дэльтаплан майструе, нібы няма ў яго якога другога занятку. Усё яму зразумела, што рабіць, як сябе паводзіць. Не, у Васіля, здаецца, усё няпэўна, неакрэслена.

## 23

Васіль ніяк не мог закончыць нарыс пра маладую свінарку. Загадчык сельгасаддзела Старавойтаў, мужчына трыццаці год, высокі, хваравіты з твару, двойчы планаваў Федаровічаў нарыс у нумар, але кожны раз Васіль казаў, што напэўна, трэба яшчэ падумаць над тым-сім.

Старавойтаў, хоць і патрабаваў, каб матэрыялы своечасова здавалі, але Васілю сказаў:

— Калі ты лічыш, што не зрабіў як след, то патрымай. Навошта спяшацца, не гарыць.

— Мне, Гарасім Сямёнавіч, здаецца, што я танцую, як кажуць, ад печы... Нешта хочацца знайсці такое... зразумець, чаму ўсё ж дзяўчына вярнулася з горада ў вёску. Вёска тая маленькая, брыгада, нават не цэнтр калгаса. Ферма старая, скасабочаная, клуба няма. аднагодкаў мала, у асноўным хлопцы-трактарысты, якія па восем класаў скончылі, вучыцца далей не дужа імкнуліся.

Гарасім Сямёнавіч здымаў акуляры, пазглядаў на Васіля, старанна праціраў шкло, нібы яно запацела.

— Складана ўсё гэта, Васіль. А калі складана, то цікава. Мне падабаецца, што ты стараешся паглыбіцца ў з'яву, разабрацца ў сітуацыі. Без гэтага нельга ў нашай справе.

Васілю было прыемна, што Гарасім разумее яго, адносіцца да яго, як старэйшы сябра, раіцца з ім, як з роўным. У сельгасаддзеле ён адчуваў сябе свабодна і проста, нібы многа гадоў ведаў Старавойтава. Гэта падбадзёрвала, і хацелася як ніколі працаваць. Да ўсяго Гарасім быў без хітрыкаў і ніколі не кпіў з Васіля, наогул

паводзіў ён сябе заўсёды тактоўна. Для яго не існавала аўтарытэтаў у залежнасці ад займаемай чалавекам пасады, што нельга было сказаць пра Кудлаціна.

Гарасім параіў яму яшчэ раз з'ездзіць у вёску, сустрэцца з дзяўчынай і нават пераканаў рэдактара дазволіць Федаровічу ехаць на рэдакцыйнай машыне.

Рэдактар прайшоўся па пакоі, шаркаючы вялікімі чаравікамі, паморшчыўся, нібы яму яны мулялі, але дазволіў. Ігнат Сяргеевіч патрабаваў, каб супрацоўнікі дабіраліся ў калгасы на аўтобусах або на спадарожных, пры гэтым падкрэсліваў, што сам у маладыя гады пехатою абышоў увесь раён. Калі ён цяпер пахваліўся гэтым, Гарасім сказаў, што дарэмна, бо ні Горкага, ні Салаухіна з Ігната Сяргеевіча не атрымалася. Ігнат Сяргеевіч заўвагу палічыў за жарт, доўга і гучна смяяўся, хаця Васіль смешнага тут нічога не бачыў. Рэдактар праз сакратарку выклікаў шафёра, той прыйшоў пакамечаны, заспаны, і Ігнат Сяргеевіч сказаў яму, каб ехаў з Федаровічам.

Шафёр здзівіўся — машына больш прастойвала ў гаражы, чым ездзіла. Зрэдку ў яе садзіўся Ігнат Сяргеевіч, калі яго выклікалі на якую нараду ў вобласць ці ў Мінск.

Дарога была няблізкая, патрэбная Васілю вёска знаходзілася амаль на мяжы двух раёнаў. «Газік» доўга ехаў, спачатку па перамеценых снегам палявых дарогах, часам машына буксавала, тады Васіль вылазіў з яе і штурхаў ззаду плячом. Калі машына выскоквала са снегу, ён бег следам, пакуль яна не спынялася на чыстым. Потым пайшла лясістая мясцовасць, снегу тут было менш, ды і дарогу расчысцілі бульдозерам.

Яны міналі вёскі, Васіль любаваўся аб'інелымі дрэвамі на вуліцах, старымі садамі, якія таксама ў інеі, і толькі дзе-нідзе бачыўся малады сад, дрэвы якога былі абвязаны яловымі лапкамі.

У кожнай вёсцы сярод новых цагляных дамоў чарнелі пахілыя старыя хаткі з забітымі вокнамі, звычайна ад такіх двароў не былі пратаптаны сцежкі на вуліцу.

— Няўжо ў гэтых хатках няма жывой душы? — спытаў Васіль у шафёра, пільнага пажылога мужчыну.

— Можа, і няма, — адказаў той, не адрываючы ад дарогі вачэй, — тут жа ў вайну багата людзей пабілі-папалілі. А хто ўцалеў, мабыць, памерлі, параз'ехаліся. Быў жа час, калі людзі пакідалі наседжаныя месцы.

Хаця, — уздыхнуў ён, — лёгкага хлеба нідзе не знойдзеш... Некалі ж у калгасе на працадзень выдавалі прыгаршчу зерня. А што ты зробіш, час такі быў. Пачыналі ўсё пасля вайны на голым месцы, я іншы раз падумаю: каб не вайна, жылі б мы намнога лепш, чым цяпер.

— Вядома.

— А ёсць жа яшчэ людзі, — шафёр глянуў на Васіля, ізноў утаропіўся на дарогу, — якія не хочуць разумець гэтага. Ім падавай усё на талерачцы, ім усяго мала. А вось спытай у такога чалавека, што ён даў людзям.

— Будзе маўчаць, як вады ў рот набраўшы.

— Не, — не згадзіўся шафёр, — такія людзі не маўчаць, у іх рот не закрываецца, яны ўсім незадаволены, усё патрабуюць, чужымі рукамі яны і жар заграбалі б... Вось ты, малады, працуеш. Ведаю, нялёгка табе. А паглядзіш на цябе, на другога, на трэцяга і радуешся, нездарма мы ваявалі, нездарма недаядалі, недасыпалі, нехта ж прадоўжыць нашу справу, таму і радасна. Вось цябе трывожыць, што хаты з забітымі вокнамі... Каб жа быў пустальга, то не трывожыла б.

Васіль ніяк не мог знайсці сувязь між тым, што казаў шафёр, але словы яго краналі, прымушалі задумацца. Напэўна, гэтыя амярцвелыя хаткі не толькі адгалоскі вайны. Напэўна, ёсць ці былі іншыя прычыны, чаму людзі пакідаюць зямлю. Яна ж без чалавека, без яго рук — нічога не значыць. Вось яго гераіня, яна, напэўна, разумее гэта. Людзі ствараюць вёскі, у вёсках нараджаюцца людзі, няўжо наступіць час, калі з вясковых камінoў не ўзаўецца дымок, не будуць гарлапаніць раніцою пеўні, адзічэюць сады? Можа, гэта больш за ўсё і хвалюе яе, а ён абышоў гэта ў сваім нарысе. І няўжо да гэтага ніхто не дадумаўся ў Мастках, ні яго сябры, ні бацькі, ні настаўнікі, ні той жа Уладзімір Мікалаевіч? Сярод лесу будавалі некалі Масткі, мінула не так багата гадоў, і калі задумацца, калі ў пасёлку ўсё будзе па-ранейшаму, як цяпер, перад ім востра стане праблема аднаўлення. Яна, мабыць, мае глыбокія карані: аднаўленне не толькі ў сэнсе адбудовы, аднаўленне працоўных рэсурсаў, замены аднаго пакалення другім. Бо ў Мастках яго, Васілёва, пакаленне, мяркуючы па ўсім, не затрымаецца. А магло б...

Ён разважаў так і раптам спыніўся на думцы, што раней яго гэта не турбавала: вучыўся як вучыўся, жыў

як жыў, працу паважаў, адносіўся да яе як да самага неабходнага, не баяўся набіць на руках мазалі і ніколі не думаў, што ў жыцці столькі супярэчнасцей, столькі незразумелага.

Машына выехала з лесу, выскачыла на вясковую вуліцу. Справа паказаўся абледзянелы, амаль урослы у снег калодзеж, доўгія жалабы ля яго — тут, напэўна, паілі коней, разгойдвалася на ветры разам з жураўлём цяжкое драўлянае вядро.

— Спыніцеся, калі ласка! — папрасіў Васіль шафёра, калі машына параўнялася з вялікім, з трыма вокнамі на вуліцу, домам.

## 24

Аня Міхейчык, пра якую Васіль пісаў нарыс, была дома. Яна нядаўна прыйшла з фермы, пераапранулася і цяпер адпачывала. Мабыць, яна заўважыла, што ля дома спынілася машына, бо калі Васіль увайшоў у двор то ўбачыў яе ў лёгкім, з кароткімі рукавамі халаціку на ганку. Дзяўчына, чакаючы яго, тупала пантоплікамі, склаўшы накрыж рукі.

— Бяжыце ў хату, — прывітаўшыся, сказаў Васіль, — такі холад, замерзнеце!

Аня не паслухалася, чакала яго, усміхнулася, крыху прыжмурваючы вочы, шчокі яе пунсавелі ад марозу.

— А я ўжо думала, што вас ніколі не ўбачу, — прызналася дзяўчына.

— Чаму?.. Раён жа вялікі, пакуль усюды пабудзеш... Нічога, яшчэ не раз, думаю, сустрэнемся... Я апошні час пра вас шмат думаю...

Аня павярнулася, паглядзела на яго з удзячнасцю, ён скеміў, што яго словы яна зразумела па-свойму, пашкадаваў, што так сказаў.

— Мне здаецца, што мы з вамі не пра ўсё пагаварылі, — паправіўся ён.

— Пра работу! Ат, не хочацца. Цяжка, нацягаешся за дзень вёдраў з вадой, з кормам, рукі адвальваюцца.

У хаце было цёпла, утульна. На вокнах віселі бялюткія фіранкі, стол быў накрыты квяцістым саматканым абрусам, на сценах у рамачках фотакарткі, пад імі красаваліся вокладкі з часопісаў, з якіх усміхаліся зоркі кінаэкрана.

— Работа і ёсць работа, — сказаў Васіль, — вядома,

на ферме, мабыць, цяжэй, чым дзе. Але ў жывёлагадоўлі хутка будзе цікава. Паўсюль будуюцца жывёлагадоўчыя комплексы, а ў іх шмат тэхнікі, аўтаматыка, таму, хто любіць гэтую справу, хопіць прасторы для творчасці. Думаю, што моладзь гэтую справу возьме ў свае рукі. На комплексах патрэбны веды, ды не абы-якія.

— Я ведаю. Старшыня нам расказваў пра гэта, — сказала яна. — У цэнтры нашага калгаса таксама будуюць комплекс. Кажуць, туды перасяляюць маленькія вёсачкі, нашу чапаць не будуць. Добра было б, каб і мы пераехалі. Там Дом культуры, багата маіх аднагодкаў, блізка да гарадка, тры разы ў дзень аўтобус ходзіць. У нас хоць вёска ладная, але жывём як наводшыбе.

— І ў вас нешта будзе, калі вёска перспектыўная... А вы не шкадуеце, што вярнуліся з горада? — Васіль паспрабаваў весці гаворку ў патрэбным для яго кірунку.

— Не, — прызналася яна. — Я пасля школы туды паехала, бо бацькавы сваякі запрашалі. Кажуць, чаго дзяўчыне гавець у вёсцы? У горадзе работа лягчэйшая, і адпачынак, і два выхадных. Яно праўда, работа там у мяне была б няцяжкая. Я ж за парыкмахера вучылася. Але ж заробак незайздросны. Праўда, добрыя майстры маюць грошы. У іх свае кліенты, пакуль ты яго стрыжэш, ён неўзаметку торкне ў кішэню якую капейчыну. Дык жа брыдка... А тут цябе ніхто не ўпікне, што чужы хлеб ясі, тут усё праз тваё рукі праходзіць.

— І вярнуліся?

— Вярнулася. Там за кватэру — плаці, а хочацца ж апрануцца добра, чаго лепшага купіць. Напісала маме, дык яна: кідай усё, вяртайся.

Аня гаварыла разважліва, мабыць, усё добра абдумаўшы, пераканаўшыся ў сваім, яе цікавіла многае з таго, на што Васіль не звяртаў увагі. Вось і пра заробак думае, клапоціцца пра будучыню, не хоча мець дармовых грошай.

— Дома лепш? — спытаў ён.

— Лепш. Ды і сцены тут свае. Смех смехам, — сказала яна сур'ёзна, — у горадзе пакуль кватэру атрымаеш, пацягаешся з клункамі па чужых кутках. А тут калгас маладым цагляныя домікі будуе, толькі жыві, працуй.

Слухаючы Аню, Васілю здавалася, што яна намнога старэйшая за яго, у яе ўсё раскладзена па палічках, і

з горада яна прыехала таму, што ён не даў адразу ўсяго таго, чаго чакала. Вядома, калі б у горадзе ў яе ўсё склалася па-другому, і нагі яе ў вёсцы не было б. Вось яны, вагі, на адной шалі якіх — горад, а на другой — вёска з усім, што можа даць ёй.

Яны памаўчалі, кожны думаючы аб сваім, Аня раптам сказала:

— Я ж са страхам цяпер кожны нумар газеты адкрываю.

— Чаму?

— Як чаму? Людзі гадамі сцяжынкі ад хат да фермы тапталі, столькі дабра зрабілі, а пра іх маўчаць. А я крыху папрацавала, і мной газеты зацікавіліся. Думаю, прачытаюць, што скажуць... А можа, не пішыце пра мяне?

Іх погляды сустрэліся. Васіль зразумеў яе, паціснуў няпэўна плячыма.

— Спрабаваў, прызнаюся, пакуль не атрымліваецца.

— Ды і не трэба, калі начальства на вас не будзе сварыцца.

— Не будзе.

«І ўсё ж добра, — думаў ён, — што я сёння паехаў сюды».

Першы раз калі гаварылі, думкі яго спатыкаліся на рамантыцы. Ён сам прыдумаў для Ані рамантыку, калі так можна сказаць, стараўся ўціснуць яе ў каляю. А ў яе свае меркаванні, ёй не да гэтага. І невядома, што горш: прыдуманая рамантыка ці вось такі яе закаранелы сялянскі практыцызм? Працуе ж яна добра, разважае пра сям'ю, спадзяецца атрымаць кватэру, калі ўсё так атрымаецца ў яе жыцці, як думае, не зрушыш Аню з месца. Народзяцца ў яе дзеці, на падворку з'явіцца хлеў, у якім раніцаю будзе рыкаць карова, пабудуе гараж, купіць машыну, вырасціць сад, голле якога будзе ўгінацца ад яблыкаў. Усё гэта добра, толькі б не стаў для яе кожны яблык капейкай, а глышачка масла ад свае каровы рублём, толькі б не забылася Аня дарогу на ферму, толькі б не стаў для яе галоўным у жыцці рынак. Разважае так... Хаця хто ведае.. Кожны жыве, як умее.

— Мне пара, — сказаў Васіль, — устаючы з канапы і камечачы ў руках шапку.

— Чакайце! — спахапілася яна, — паабедаем, бацькі хутка прыйдуць з работы.

— Дзякуй, няма калі. Вадзіцель чакае ў машыне, яго там холад даймае...

— Але, — згадзілася яна, — калі чакае...

## 25

У час зімовых канікулаў Васіль атрымаў паштоўку з Масткоўскай школы — яго запрашалі на сустрэчу вучняў з выпускнікамі. Паштоўка была адрасавана на рэдакцыю: настаўнікі і вучні ведалі, што ён жыве дома.

Віталя ж не запрасілі, і калі, сабраўшыся, Васіль зайшоў па яго, той паціснуў плячыма:

— Мяне там не чакаюць, чаго я папруся?

— Пакрыўдзіўся?

— Не чакаюць жа, кажу!

— Кінь, усе нашы будуць... Можа, у школе палічылі, калі ты ўвесь час на вачах, сам прыйдзеш.

— Ты ўпэўнены? А мне здаецца, што тут не абышлося без Уладзіміра Мікалаевіча. Яго і дырэктара не разальеш вадой, сябры. Не могуць дараваць, што я без дазволу каток заліў.

— Кінь глупства, — сказаў Васіль, — Уладзімір Мікалаевіч пасля таго слова табе не сказаў. Лесавоз жа даверыў.

— Даверыў. Не машына — развалюха. Дзень езджу, два пад рухавіком калею. Бурчыць, што дзяцей набралі, а яны ўсё робяць праз пень-калоду. Я заікнуўся, што хлопцы добра працуюць, дык ён сказаў, не пра іх гаворка.

Віталь падышоў да этажэркі з кнігамі, якая стаяла ў куце, прыўзняў некалькі кніг, дастаў з-за іх пачак «Беламору», чахнуў запалкай, закурыў.

Васіль недаўменна паглядзеў на сябра. Віталь не курыў, бярог здароўе для авіяцыі. З пярэдняй увайшла маці, паківала галавой.

— Куры, каб на табе шэрсць закурылася!

— Не забароніш, — агрызнуўся ён, — дарослы, васемнаццаць гадоў ужо. Вясной служыць пайду, можа.

— Дарослы, — сказала яна, — вецер у цябе ў галаве. На людзі хоць не паказвайся. Толькі і пытаюць пра твае жартачкі з начальнікам. Пачакай, гэта табе бокам вылезе... Чалавек па цябе зайшоў, ідзі ўжо, не натурся...

Калі яны выйшлі на вуліцу, апускаўся вечар. Неба на захадзе было яшчэ ў празрыстай ружовасці, дымы з

каміноў узнімаліся ўверх слупкамі, раставалі ў цяжкой сіняватасці. Снег пад нагамі рыпеў каляна, пабліскваў кавалачкамі тоўчанага шкла. Пакуль яшчэ рэдкія зоркі слаба мігцелі над галавой.

Яны скіраваліся да школы, чамусьці ішлі моўчкі, нібы злуючы адзін на аднаго.

Школа! Столькі ў іх жыцці было звязана з ёй. Першая самастойна прачытаная кніга, першае пачуццё адказнасці за справу, радасці і засмучэнні! І пачуцці, кволыя, як пялёсткі, да дзяўчат. І станаўленне, і разуменне пасля, што ты грамадзянін, а не сузіральнік жыцця.

І раптам быццам усё парушылася пасля вучобы. Настаўнікі быццам забыліся, што іх вучні жывуць побач, што ім яшчэ патрэбны парады, падтрымка, а вучні ў мітусні дзён забыліся пра настаўнікаў.

Толькі сувязь з вучнямі... Старшакласнікі вечарамі прыходзілі на каток, які слаба асвятляў адзінокі ліхтар, прымацаваны Віталем на сасне. Каток вабіў вучняў, але абураў настаўнікаў і некаторых бацькоў — дзеці часта забываліся, што трэба вучыць урокі, дапамагаць па гаспадарцы: рэзаць дровы, наскубці са стажка сена карове, ці мала клопатаў ля хаты... Аддаленасць былых выпускнікоў ад школы тлумачылася яшчэ і тым, што школьная камсамольская арганізацыя была сама па сабе, лесаўчасткаўская — таксама.

...У школе, калі туды прыйшлі Васіль і Віталь, было ўжо людна. Іх сябры тоўпіліся ў канцы калідора, старшакласнікі — у другім. Урэшце ўсіх запрасілі ў залу.

Васіль і Віталь селі ў апошнім радзе.

На сцэне актавай залы стаяў доўгі стол, вядома ж, з графінамі і алоўкам, і толькі керамічная ваза з яловымі шышкамі з краю стала сведчыла аб святочнасці вечара.

Шумна было, як на вялікім перапынку, калі забываеш, што наперадзе ўрок. І калі ў залу ўвайшлі дырэктар і настаўнікі, цішыня ўсталявалася не адразу, хаця ўсе ўзняліся з месцаў, вітаючы іх.

Дырэктар і настаўнікі занялі месцы за сталом, некалькі крэслаў пуставала. На сцэну выйшла выдатніца, вучаніца дзевятага класа, сакратар школьнай камсамольскай арганізацыі Марыся Урублеўская, дачка Уладзіміра Мікалаевіча, пачала з паперкі зачытваць прозвішчы тых, хто павінен заняць на сцэне пустыя месцы... Насця, Нэля, Пятро, Васіль... Васіль, пачуўшы сваё прозвішча, не зварухнуўся.

— Ідзі! — штурхнуў яго пад бок Віталь. — Чуеш?

Васілю зрабілася няёмка. Ён разумеў, што дзяўчат запрасілі таму, што яны вучацца ў інстытуце, Пятра з-за паслухмянасці, а яго — бо працуе ў газеце.

Ён паглядзеў на настаўнікаў, яго позірк сустрэўся з позіркам Ганны Кузьмінічны, яна кіўнула яму, Васіль узняўся з месца.

Спачатку гаварыў дырэктар. Гаварыў нядоўга... Школа вельмі рада вітаць сваіх былых вучняў, на якіх у будучым ускладвае вялікія надзеі, і не толькі на тых, хто вучыцца ў інстытуце, а і на тых, хто працуе.

Затым з месца ўзнялася Нэля. Яна доўга дзякавала ўсім настаўнікам, асабіста дырэктару, потым запрасіла ўсіх вучняў пасля школы паступаць у машынабудаўнічы інстытут.

«Хоча ўсіх прычасаць пад адзін грабянец, — падумаў Васіль. — І што за мода пайшла? Калі на лесаўчасток — усім класам, у калгас — таксама, у інстытут... У кожнага ж свае схільнасці...»

Васіль выступаў апошні. Ён таксама дзякаваў школе, настаўнікам, потым звярнуўся да вучняў. Ён бачыў, што яго слухаюць уважліва, таму хваляваўся.

— Што я магу параіць вам, амаль маім равеснікам, — казаў ён, — калі сам яшчэ не маю жыццёвага вопыту, калі ў многім сумняваюся, калі сам не знайшоў таго галоўнага, што павінна быць у кожнага?.. Ведаю, што трэба жыць між людзей чэсна, як жылі і жывуць нашы бацькі, якія не вучыліся ў інстытутах, бо была вайна, якія будавалі прадпрыемствы і цяпер на ім працуюць. Але мне здаецца, што ўсе яны знайшлі сваё месца.

Ён зрабіў паўзу, павярнуўся да Нэлі.

— А ты, Нэля, даруй, памыляешся, запрашаючы ўсіх ісці ў твой інстытут. Зразумей, наша школа, нашы Маёсткі павінны ў будучым ганарыцца не толькі аднымі інжынерамі, бо не ўсе імі змогуць быць, а лесарубамі, настаўнікамі, касманаўтамі.

— Касманаўтамі? — усчырванелася яна.

— А што, — крыкнуў з месца Віталь, — магчыма, і касманаўтамі.

Дырэктар пастукаў алоўкам па графіне.

— Я не ўсё сказаў, — Васіль ужо не хваляваўся, — я вось пра што... Хто працуе на лесаўчастку, жыве сам па сабе, школа — сама па сабе... Я не здзіўлюся, калі цяперашні дзесяты клас пасля выпускных экзаменаў

падасць заявы ў машынабудаўнічы, на лесаўчастак яго ніякімі пернікамі цяпер не заманіш. А як жа, з намі не лічацца, у прэзідыуме студэнткі, Пятро ды я. А хто працуе — той у апошнім радзе сядзіць, нашы павучанні слухае...

Яго словы заглушылі воплескі. Зноў патрабавальны звон шкла.

— Васіль сказаў праўду, — узнялася з месца Ганна Кузьмінічна. — Мы, настаўнікі, вучні, нашы госці самі вінаваты, што мы як чужыя. Але ён закрануў пытанне пра наша шанаванне студэнтаў, мы нібы не звяртаем увагі на тых, хто працуе. Гэта наша школьная справа, пра яе мы абавязкова пагаворым у настаўніцкай.. Мы рады, што да нас прыйшлі выпускнікі, дзеці ветэранаў, якія будавалі пасёлак, прадпрыемства, хто павінен, я паўтараю, павінен прадоўжыць справу бацькоў на лесаўчастку, у інстытутах, у газеце, як Васіль, можа быць, і ў космасе...

Пасля ўрачыстай часткі вучні пачалі выносіць у калідор крэслы, стаяў грукат, гамана.

Васіль, Віталь, Пятро і Іван падышлі да дзяўчат.

— Навошта, Васіль, ты мяне ўеў? — пытала пакрыўджана Нэля. — Хіба я перайшла табе дарогу? Што вучні падумаюць?

— Нічога асаблівага. Ты можаш памыляцца...

— У сваёй школе не хацелася б... Ды і запрашала я іх у інстытут дзеля прыліку.

— Проста словы, без перакanання?

— Але.

— Кажуць, слова не верабей, не спаймаеш, калі вылеціць... Словы таксама былі, калі нас на лесаўчастак пер-запрашалі. А цяпер сама бачыш... А я лічу, што з класа нас трэба было да працы ў Мастках рыхтаваць... А то атрымліваецца, вы ў інстытуце — вы гонар, а мы — няўдачнікі. Супярэчліва?

— Супярэчліва, — згадзілася Нэля.

— Ды вы горш за нас вучыліся, — сказаў ёй Віталь, — а ў інстытуце. А можа, хто і не сам паступіў?

Віталь намякаў на Насцю. Яе бацька працаваў ляснічым, і людзі казалі, што ён ездзіў з ёй на экзамены.

— Гэта лекцыя? — страпянулася Насця.

— Не да лекцый. Ёсць праўда і фальш, — сказаў Віталь, — і мы павінны іх распазнаць.

— Распазнаеш, а як жа? Я хачу ў людзі выйсці,

таму і ў інстытут трапіла, — сказала Насця, — а якім чынам — не твая справа.

— Я не супраць, вучыся. Толькі ты нечае месца займаеш, хаця і не маё.

Віталь змоўк. Васіль пашкадаваў, што Віталь успыліў. Але і яго можна зразумець. Марыў пра неба — і на табе! Ды Віталь, вядома ж, у любы інстытут паступіў бы. Галава! Ён перамагаў на матэматычных алімпіядах, для яго не існавала задач, якія ён не мог рашыць.

— А, жартаўнікі! — пачулі яны голас дырэктара і павярнуліся. Карней Іванавіч сціскаў па-сяброўску Віталева плячо. — Адмачыў ты дык адмачыў з Урублеўскім.

— Добры вечар, Карней Іванавіч, — сказаў Віталь. — Мне не сорамна, я не краў. Гэта маёй мары хацелі перашкодзіць.

— Якой жа?

— Неба... Лепш прыходзьце заўтра раніцою, калі пагодліва будзе, на гару. Палячу я!

— Выраслі вы ўжо, — задумліва сказаў дырэктар.

## 26

У той вечар Васіль і Насця ўвесь час былі разам. Яны не праміналі ні аднаго танца, у перапынках стаялі побач, нікога не саромеліся. Гаварылі яны пра нязначнае, жартавалі. Насця пасміхалася з яго вузкага гальштука. Аказваецца, ужо ўваходзілі ў моду шырокія, квяцістыя.

Не чакаючы, пакуль усё скончыцца, яны апрануліся і выйшлі на вуліцу.

Вочы іх доўга прывыкалі да цемры, густой і, здавалася, непрагляднай.

На небе ў расшкуматаных воблаках — і адкуль іх нагнала? — коўзаўся залаты палазок месяца, у рэдкай масткоўскай хаце гарэла святло — вокны кідалі на снег доўгія жоўтыя лапікі, ветрык ледзь чуўся.

— А я цябе адразу заўважыла, — ушчуваючы, сказала яна. — Такія святочныя з Віталем, далей няма куды! Паліто з каўнярамі, як у старшынь калгасаў.

— Падышла б, а то здоўжылася...

— Так і кінулася! Ты хочаш, каб пачалі пра нас гаварыць?

Ён не адказаў, бо пра гэта не думаў, рашуча ўзяў яе за рукавічку.

— Холадна?

— Не-а!..

— Тады здымі рукавіцу.

Яна зняла. Васіль адчуў у сваёй руцэ яе цёплыя тонкія пяшчотныя пальцы. Яго целу перадалася іх сарамлівая дрыгота.

Ён хуценька разам са сваёй засунуў яе руку ў кішэню паліто.

— Так будзе лепш.

Яны выйшлі з пасёлка на шашу, рушылі, нібы хто за імі цікаваў, да лесу.

Паабапал шашы стаялі заснежаныя сосны, прытоена шумелі. Калі спераду або ззаду ехала машына, сосны доўга дрыжалі ў нейкім дзіўным казачным свячэнні, па іх заснежаных лапах слізгалі сінія цені, мякка саскоквалі на шашу.

— Васіль, — парушыла яна маўчанне, — чаму ты вечна вытыркаешся, нешта стараешся некаму даказаць? Усё адно з табой не згаджаюцца.

— Даруй, не магу бачыць пыхі, фальшу. Крычаць хочацца, нібы хто па сэрцы — нажом, — запаволіў ён крок. — Не ў ладкі ж пляскаць пры гэтым.

— Навошта ў ладкі? Іншы раз і памаўчаць трэба.

— Не буду і табе не раю!

— Як сабе хочаш, свая галава на плячах.

Яны адыходзілі далей і далей ад пасёлка, агнёў ужо не было відаць. Іх ахутала цемра, і Васіль пры кожным сказе паварочваўся да Насці, але твару не бачыў. Каб не рука ў яго руцэ, можна б падумаць, што Насці няма побач.

— Як у цябе з вучобай? — спытаў ён.

— Цяжка... А жыву — як усе.

— Дадому не цягне?

— А што дом? Хто тут?

— Я, напрыклад...

— Ты? Ты яшчэ неразумнае дзіця, — уздыхнула яна. — У Мастках нічога не выседзіш. Чалавек павінен у людзі выходзіць. Што мне, паступіцца сваёй мэтай, каб быць ля цябе?

— Навошта? Я — сам па сабе, мэта — сама па сабе. Але я без цябе сумую. А ты?

Яна выхапіла руку.

— Глядзі, які месяц!

— Сумны, адзінокі...

— Месяц? Ці... Ты сам вінаваты ў гэтым. Чаму было не вучыцца ў педагагічным? Напісаў бы сачыненне... Пагнаўся невядома за чым.

— Вядома за чым. Гісторыя — не мая справа.

— Ну і сядзі ў райцэнтры.

— А можа, хутка я ў райцэнтры не буду?

— А хто цябе ў сталіцу возьме без адукацыі?

— Мне і дома месца хопіць.

— Дома? Трымайце мяне!.. Рабіць што будзеш, гайкі круціць?

— Хаця б, — сказаў ён спакойна. — Віталь вунь ужо руль круціць, заўтра паляціць на дэльтаплане.

— Гэта яшчэ пабачым, ці паляціць, Ікар! Нецікава вы жывяце, марна. У інстытуце якія хлопцы! Ведаеш, многія з іх ужо з першага курса пішуць навуковыя работы.

— Вельмі добра, што пішуць. Не сумняваюся, многія з іх прынясуць карысць. Гісторыя мае прыклады, калі людзі рана рабілі адкрыцці: фізікі, матэматыкі, вынаходнікі...

— А пісьменнікі?

— Пісьменнікі? Пісьменнікі таксама... Ёсць зоркі... Паглядзі першыя кнігі. Раней трыццаці год цяпер мала хто становіцца — як табе сказаць? — спелым. Мабыць, ідзе працэс паглыблення ў веды, пазнанне сябе, жыцця, — сказаў ён.

— А калі і ў трыццаць не атрымаецца? Столькі часу марна траціш, за другое будзе позна брацца.

— Значыць, не атрымаецца... Толькі чаму марна? Жыццё, людзі. Важна, што яны скажуць. Хто ты — чалавек для іх ці цень?

— Ты мяне не пераконвай. Хто будзе столькі чакаць цябе?

— Не трэба чакаць, калі так, — сказаў ён, праглынуўшы даўкі камяк. — Чаканне з-за нечага... Глупства, ідыятызм! Я ж не прашу цябе чакаць, не прашу! Сама вырашай.

— А што вырашаць? Ты і Віталь зразумееце свае памылкі. Потым, праз гады.

— А ты іх ведаеш? — спытаў ён, спыняючыся.

— Ведаю.

— Дык скажы.

— Навошта? Усё адно гэта нічога не зменіць, усё адно вы будзеце некаму даказваць сваё...

— Сабе, — перабіў ён яе.

— Магчыма... Паслухай сюды. Да нас прыязджалі выступаць маладыя. Адзін з іх, друкуецца ў абласной газеце, пра ўсё казаў проста... Ты нават не ведаеш, якім павінен быць герой...

— Ведаю. Чалавекам, такім, як мы з табою, напрыклад, які сумняваецца, радуецца, ён жыць павінен.

— Глупства. Станоўчы, роўны, як струна!

— Ты сур'ёзна? — здзівіўся ён яе ўпэўненасці.

— Гэта не я, гэта ён, між іншым... Калі ты зразумееш свае памылкі, будзе позна. Вось у чым загваздка. Трэба пачынаць з маладых гадоў у адным кірунку. Кропля камень дзяўбе.

— Так, з маладых гадоў, з маленства, — сказаў ён. — Я яшчэ не ведаю, кім буду. Толькі ў чалавека павінна быць нешта сваё... Слухай, а можа, адносіны: ты — людзі. Галоўнае, як я цяпер думаю, гэта як ты жывеш між іх... Напрыклад, нашы бацькі будавалі Масткі, Віталь заліў каток, нехта напісаў кнігу...

— А што ў цябе будзе, калі ты ўсё аддасі другім?

— Усё і будзе. Калі хочаш, чыстае сумленне, разуменне, што нездарма нарадзіўся, што не хціўца, не істота — чалавек!

— Начытаўся...

Уперадзе раптам у цемры засвяціліся маленькія, як кропачкі, агеньчыкі. Яны набліжаліся. Шаша ішла па пагорках — агеньчыкі то паказваліся, то ныралі ў цемру. Калі ўзнімаліся, нітачкі святла ўпарта цягнуліся да Васіля з Насцяй.

— Сыдзем, — нібы адмахнулася яна ад іх, — машына...

Яна выхапіла сваю руку, не чакаючы яго, сышла на ўзбочыну. А ён ішоў доўга сярод дарогі, каляна рыпеў пад нагамі свежы (няўжо сыпаў, пакуль яны сядзелі ў школе, неба ж было чыстае звечара) снег, думаў пра сваё.

— Дык ты вырашыў? — пачуў ён яе голас збоку.

—Ты ж ведаеш, — адказаў ён цвёрда...

## 27

Назаўтра на Яўменавай гары было людна. Тут сабраліся і малыя і старыя, ці не ўсе масткоўцы. Было няўцямна, адкуль столькі людзей даведалася за ноч, што

Віталь збіраецца паляцець на нейкім апараце, якога тут раней ніхто не бачыў.

Калі Віталь з хлопцамі прынеслі на гару дэльтаплан, узмацніўся вецер. З соснаў серабрыстым пылком лёгка віхурыў снег. У асінніку за гарой крычалі вароны.

— Адумайся, хлопец, калі яшчэ не скруціў галаву, дык скруціш! — сказаў стары Няфёд, асцярожна кранаючы вялізныя лёгкія крылы апарата.

— А божухна, і мой стары тут! — убачыўшы Няфёда, сказала яго жонка, цётка Сынклета, трымаючы ў руках сетачку з хлебам. Мусіць, яна хадзіла ў краму і там, пачуўшы навіну, не ўтрымалася, каб не прыйсці, не паглядзець. У Сынклеты быў язык, што мянташка, без яе як сведкі не абыходзілася ні адна падзея ў пасёлку.

— Ён яшчэ нешта гандзюрыць! Ану шкрэгай дахаты! Свінні ў гнаі тонуць, а яго на гулі цягне.

Няфёд упяў галаву ў плечы, нешта прабурчэў сабе пад нос і пасунуўся выкідваць гной з хлеўчука. Сынклета пакратала лёгкія крылы.

— Няўжо паляціць?

— Паляціць, цётка, — адказаў Віталь. — Можаце ісці дахаты, усім казаць, паляціць!

Віталя, здаецца, небывалая ўвага пасялкоўцаў пачала выводзіць з сябе. Але ён не паказваў гэтага, хадзіў вакол дэльтаплана, нешта насвістваў сабе пад нос, кратаў крылы, пазіраваў перад фотаапаратам Гайдука.

Яму Васіль казаў, што Віталь збіраецца паляцець. Фотакарэспандэнт прыехаў у Масткі першым аўтобусам.

— Чаго ж ты гарцуеш? — зноў зачапіла Віталя Сынклета. — Ляцеў бы ўжо, ці што?

— Я нікога не трымаю...

Дзятва кружыла вакол Віталя роем.

Неўзабаве прыйшлі расчырванелыя дырэктар школы і начальнік лесаўчастка.

Уладзімір Мікалаевіч скураной пальчаткай недаверліва пакратаў крылы, скоса зірнуў на Віталя.

— Ты гэтыя жартачкі кінь! Клопатаў з-за цябе не абяромся.

— Клопат — не ваўчкі, ён да вас не прыстане, — сказаў Віталь.

— Глядзі ты, калючы! — адышоў Уладзімір Мікалаевіч.

— Віталь, адумайся, паслухай, што старэйшыя кажуць! — заступіўся за Урублеўскага Карней Іванавіч.

Віталь не зважаў на пасялкоўцаў. Людзям, напэўна, надакучыла, яны купкамі пацягнуліся з гары, і толькі дзятва чакала, падкідваючы ў цяпло галінкі.

...Яго, Васілёў, сябар Віталь ляцеў над стадыёнам вышэй старых, абсыпаных белым іскрыстым снегам сосnaў, якія падступалі да гары справа. Ляцеў ён свабодна, выцягнуўшыся, нібы бусел, пагойдваючы доўгімі крыламі дэльтаплана, пазіраючы з вышыні на зямлю, якая яго нарадзіла.

На гэтай зямлі некалі жыў Яўмен і яго сыны-асілкі. Гэтая зямля была паліта крывёю тых, хто абараняў яе са зброяй, потам бацькоў, якія ў цяжкія пасляваенныя гады будавалі пасёлак. Яна сваім цяплом грэла босыя ногі іх дзяцінства...

Робячы круг, Віталь узнімаўся ўсё вышэй, і цяпер з зямлі Васілю, Гайдуку, усім, хто верыў, што Віталь узляціць, і не пайшоў дахаты, здаваўся маленькім, але моцным і смелым.

Яны каціліся з гары ўніз, потым беглі па стадыёне, падкідваючы ўгару шапкі, крычалі «ўра», фотаапарат Гайдука спыняў дзівосныя імгненні палёту Віталя над зямлёй, яго перамогі.

— Ляціш! Ляціш! — крычаў Васіль. — Віталь, ляціш!

Тысячы людзей да гэтага часу ўзнімаліся ў неба не толькі на такіх апаратах, але Васілю Віталеў палёт над зямлёй здаваўся сімвалам сяброўскага і свайго імкнення ў вялікае жыццё, імкнення да яшчэ не зусім акрэсленай мары, яе прадвеснем, як прадвеснем раніцы бывае песня.

...І раптам гэтая песня абарвалася. Вецер шпурнуў апарат рэзка ўбок, і ён, нібы птушка з перабітым крылом, пачаў падаць за стадыён на малады вострый асіннік.

Васіль абмёр, прадчуваючы нядобрае. Наступіла, як напятая струна, цішыня. Васіль куляй паляцеў да асінніку, ламаў яго голле, абдзіраў рукі, твар... Яму здавалася, што ён уздыме рукі і падтрымае сябра.

Ён не паспеў. Пачуўся сухі трэск, дэльтаплан з праколатымі, нібы бараной, крыламі, павіс між асін.

## 28

Дзень добры, Васіль!

Атрымаў твой ліст. Я рады, што табе падабаецца на новым месцы. Толькі вось не ўяўляю цябе сярод людзей, якіх не ведаю. Ты пішаш, што амаль самы малады ў

брыгадзе лесарубаў. Няўжо і там, як у нас у Мастках, працуюць больш пажылыя?

У вас там яшчэ ляжыць снег і маразы трашчаць? А у нас у Мастках пахне бэзам, усё купаецца ў сонейку, малыя бегаюць басанож, як некалі мы з табой.

Ліст твой рамантычны і разам з тым самакрытычны. Прызнаешся, што ў Мастках ты быў сузіральнікам. Магчыма, толькі я з гэтым не зусім згодзен. Успамінаю, што адбылося за год. Ты ж стараўся нешта змяніць у нашым жыцці, імкнуўся да сутнасці жыцця. Толькі мне здаецца, што не хапіла ў цябе волі, адступіўся ты. А гэта, браце, нягожа. Мне здаецца, калі б ты пайшоў працаваць на лесаўчастак, было б лепей. Па-першае, можна думаць, што ты з усім змірыўся, калі на ўсё махнуў рукой, па-другое, чаго паехаў? Лепшага шукаць? І яшчэ невядома, дзе ад цябе будзе больш карысці.

Я разумею, што ты «вывучаеш» жыццё. Разумею, што гонар не дазволіў табе падысці да Урублеўскага, заяву напісаць на яго імя. А што звольніўся з газеты, можа, і добра. Сапраўды, як можна павучаць людзей, калі сам яшчэ нічога ў жыцці не ведаеш? Працуй, «паглыбляйся ў сябе» (во, ужо цябе цытую). Такі цяжар, як кажа маці, насіць бы давеку!

Я ўжо акрыяў. Рана і драпіны зажылі. Дактары кажуць, што гэта не пашкодзіць мне стаць лётчыкам, нібыта я здаровы, як Яўменавы сыны.

А дэльтаплан я адрамантаваў, разабраў і схаваў ў дрывотні. Яшчэ спатрэбіцца. На канікулы, калі паступлю, буду прыязджаць у Маскі, палятаю яшчэ з Яўменавай гары і мо, калі не будуць сварыцца бацькі, навучу хлопцаў-старшакласнікаў. Ёсць у мяне на прыкмеце такія, усё на ляту ловяць.

Сёння хадзіў да Урублеўскага па характарыстыку. Напісаў такую, нібы я анёл. Руку пацісуў, пагразіў пальцам і кажа: «Памянеш маё слова, будуць з цябе людзі». Вось табе і Урублеўскі. Але думаю, што ён быў бы вельмі рады, каб я хутчэй пакінуў Маскі. Мой канфлікт з ім пасля таго, як я заліў каток, узяўшы без дазволу машыну, а тым больш пасля маёй спробы ўзляцець на дэльтаплане з Яўменавай гары, на тым не скончыўся.

Я пастаянна адчуваю сябе лішнім на лесаўчастку, хоць раблю не горш за іншых, а можа, і лепш. Мне не раз намякалі, каб я кінуў шалы і не муціў у калектыве

вады. Што я магу ім сказаць у адказ? Адмовіцца ад задуманага, змірыцца з тым жыццём, якім жывуць Масткі? Дык хіба я буду пасля гэтага паважаць сябе? Перш ыя няўладкі — і я адразу ў кусты? Не, браце, не з маім характарам. І дэльтаплан я пабудую да ад'езду, і нікому не дам спуску, калі буду бачыць знявагу.

Мяне па-ранейшаму хвалююць, скажу так, дваістыя адносіны да нас, былых вучняў, настаўнікаў і асабіста дырэктара. Памятаеш, як зімою пры сустрэчы ў школе гаварылі, што мы адарваныя ад яе, яна ад нас? Я думаю, што, мабыць, многае ў нашых адносінах з настаўнікамі ў час вучобы было няшчырым, фальшывым, надуманым. Нас вучылі аднаму, казалі прыгожыя словы, заклікалі быць чэснымі, праўдзівымі. А вось выйшлі за парог школы, дык усе ружовыя мары лопнулі, як пухір. Бо нікому да нас далей няма клопату, а як жа, мы ўжо не вучні, за нас ужо ніхто не нясе адказнасці. Крыўдна. Словы словамі, а справы справамі. Перад кожным з нас — рэальнае жыццё. Перакананы, што многія з нас не падрыхтаваны да яго. Каго ў гэтым вініць? Школу, бацькоў, сябе? Напэўна, больш за ўсё сябе. Не маленькія ж. Многае бачылі на свае вочы, многае павінны былі зразумець. А то ўсё ад некага чакалі дапамогі. Сорамна.

Пра гэта мы часта гаворым з Гайдуком. Ён часта прыязджае да мяне ў Масткі, мы доўга размаўляем аб жыцці, аб табе. Здаецца, Гайдук адзіны, хто ад мяне не адвярнуўся. Ён кажа, што шэлег будзе нам цана, калі ад свайго адступімся.

Ты пытаеш пра нашых. Пятро і Іван рыхтуюцца ў будаўнічы, астатнія таксама збіраюцца паступаць, кажуць, на лесаўчастку нікому не патрэбны. Нейкі парадокс! Учора зноў ля школы стаяла пажарная машына.

Але, ледзь не забыўся! Насцю вытурылі з інстытута. Яна дрэнна вучылася. Ды не бядуе, замуж за нейкага гарадскога дзядзьку, а мо і дзядка, выйшла. На мінулым тыдні прыязджалі на яго «Волзе». А Нэля вучыцца...

Што табе яшчэ напісаць? Сяджу ля расчыненага акна, пахне, асыпаецца бэз. І сосны за агародам бачу. Нашы сосны. Шумяць яны. Так што падумай.

Бывай! Твой сябар Віталь.

## Цяпло чужога сэрца

### 1

Хуткаплынная і ранняя выдалася вясна.

Зіма была снежная. У лесе без лыжаў не прайсці. Ступіш на цалік, праваліўшся па калена, а дзе і па пояс. На машыне тым больш не праедзеш, калі на дарозе не прабіта каляя, не расчышчаны сумёты. Забуксуеш, закапаешся, без трактара не выбрацца.

Ходзячы па лесе, Міцька бачыў, што лесавозныя дарогі, якіх тут было шмат і па якіх цяпер вывозілі з дзялянак хлысты, пасля снегападаў пастаянна чысцілі бульдозеры. Паабапал дарог у рост чалавека былі навалены гурбы. Схопленыя пасля адліг маразамі, яны нібы акамянелі, цьмяна паблісквалі лёдам на зломах. Бачыў Міцька, што гэтыя ледзяныя гурбы абмінаў нават звер. Дайшоўшы да іх, паварочваў, шукаў іншы шлях, каб перайсці дарогу.

Калі ж па некалькі дзён запар мяло, з лесаўчастка на дарогі выязджалі бульдозеры. Бачыў Міцька, як яны снавалі ўзад-уперад, рассоўвалі сумёты. Здаралася, і даволі часта, бульдозеры паволі паўзлі паперадзе лесавозаў, праводзілі іх да дзялянак. Было, калі мяцеліца не сціхала колькі дзён, бульдозеры чакалі, пакуль на дзялянках нагрузяць МАЗы, затым калонаю вялі машыны да шашы.

У тых месцах, дзе дарогі выходзілі з лесу на поле або пралягалі праз колішнія, яшчэ не парослыя маладняком дзялянкі, бульдозеры пастаянна дзяжурылі. У лесе хоць і перамятае дарогі, але не так, як на адкрытым...

Ведаў Міцька, што і такою парою сасноўскія лесарубы стараліся рабіць, але чуў ад людзей, што з планам

усё адно не маглі саўладаць. Па-першае, як пісалі ў штодзённых зводках, у леспрамгасе «з-за дрэнных умоў надвор'я знізіліся ў параўнанні з летнім перыядам у два разы тэмпы вывазкі і нарыхтоўкі дзелавой драўніны». Па-другое, увесь лес, які назапасілі з лета і на пачатку восені, паспелі да зімы вывезці на ніжні склад у Барkоўск. Па-трэцяе, такой зімой рабіць на дзялянцы цяжка. Вальшчыкі, перш чым спілаваць дрэва, адкідалі снег вакол яго, каб можна было падысці з пілой. Затым ужо вакол паваленага дрэва адкідвалі снег сучкарубы, бо нельга было падступіцца. Трактарысты мерзлі ў халодных кабінах. Мала ў якім трактары ацалелі шыбкі: як ні сцеражыся, голле ўсё адно выбівае. Ды і колькі на дзялянцы можна ў змену зрабіць? Дзень кароткі, як заяцаў хвост. Пакуль закіпіць вада, пакуль разагрэеш матор, пакуль падступішся да работы, гадзіна мінула.

Міцька спачуваў лесарубам, нялёгка ім цяпер. Ён ведаў, што для староннягa чалавека снежная зіма — замілаванне, забава. У нечапаным лесе, дзе дарогі не расчышчаны бульдозерамі, снег быў роўны, чысты. Там у ціхі дзень спакой, сцішанасць, халодная знямеласць. Іншы раз, калі не прыглядацца, халодная знямеласць нібы сведчыць, што наогул тут няма ніякага жыцця.

Так часам здавалася і Міцьку.

Кіруючыся ў лес, Міцька апранаў зляжчаны пад пахамі і парэпаны на плячах кажух. Насоўваў на галаву аблавушку, ногі хаваў у катанкі. Ён здымаў са сцяны старое, яшчэ да вайны прыдбанае ружжо, клаў у кішэню патрон — раптам сутыкнецца з ваўком, тады пужне. Людзі казалі, што апошнім часам бачылі ваўчыныя сляды ля самай Сасноўкі, але не чутна было, каб яны да гэтага дня дзе нарабілі шкоды.

Апрануўшыся, Міцька выносіў з халодных сянец саматробныя, шырокія, але лёгкія лыжы. Імі ён даражыў. Зрабіў лыжы з ясеневай плашкі гадоў дваццаць назад па заказе Карнея Карнеевіча, які тады тут быў участковым міліцыянерам і лічыўся добрым паляўнічым, але неўзабаве Карнеевіча перавялі ў раён, лыжы так і засталіся ў Міцькі.

На лыжы Міцька станавіўся ўжо ля ганка. Ён тарапка мінаў падворак, праз нізенькія варотцы выходзіў на агарод, дзе глыбока ў снезе стаялі некалькі старых, з парэпанымі ствaламі яблынь. Адсюль да бору крокаў дзвесце.

Можна было і вуліцай ісці, але Міцька не хацеў ні з кім сустракацца. Сустрэнеш каго, абавязкова зачэпіць. Палезе распытваць, ці будзе Міцька зноў гэтай вясной наймацца пасвіць сасноўскі статак; чаму не ходзіць у амбулаторыю на ўколы, — мінулай зімой не вылазіў адтуль. Кожнаму трэба будзе тлумачыць, чаму не будзе наймацца, чаму яго нідзе не відаць, чаму не ходзіць. А ён не меў звычкі каму скардзіцца пра сваё, не любіў наогул мянціць языком. Каму якая справа да таго, што яму баліць? Апошнім часам баліць паясніца, ногі круціць, як вяроўкі, кружыцца галава, пераціскае дыханне. І ўколы не ратуюць. А вось паходзіць па лесе, намерзнецца, нацешыцца прыгажосцю і спіць добра, і нібы нічога не баліць.

І цяпер, бадзяючыся па лесе, Міцька, стамляўся. Тады ён прысланяўся да якога дрэва, каб перадыхнуць, і нібы адчуваў, што сам становіцца часткай лесу. Халодны сняжок, як дыхне ветрык, сыпаўся з галінак за каўнер, апякаў цела. Міцька слухаў лес, чуў, як дзесьці чэкала сарока або стукаў дзяцел аб сухадрэвіну, і разумеў, што лес жыве. У такія часы было хараша на душы і прасторна думкам. Думалася, што гэты лес вечны. Яго жыццё саткана з незлічонай колькасці травінак, птушак, звяроў, рачулак, балацін, дарог, дрэў. Ніхто і ніхто не зможа вынішчыць, выкарчаваць, супыніць гэта жыццё.

Але Міцька чакаў вясны...

І вось аднойчы, прыйшоўшы ў лес, Міцька адчуў, што яна наступае. Да гэтага ён тыдзень прасядзеў у хаце (вельмі балела паясніца) і не заўважыў змен у прыродзе.

А цяпер убачыў: ужо не з-за такіх нізкіх, як раней, але ўсё яшчэ злямчаных, нібы старая воўна, хмар выціснулася сонца. Наўкола загуляў волкі вецярок. Міцька адчуў яго добра. Лягчэй стала дыхаць.

Міцька быў вельмі ўражаны. Сонца спачатку было вялікае, ружовае і расплясканае, нібы яго выхапілі з горна і доўга пляшчылі на кавадле. Ды так расплюскалі, што, выкінутае ў шорсткія хмары, яно раскрышыцца, разляціцца наўкола сляпучымі іскрамі. І іскры гэтыя зашыпяць, астываючы ў снезе. Але сонца нібы абцерлася апоўдні аб рудыя, шорсткія хмары, набыло форму кола, на якое надзелі вобад. Яно паменшала, яшчэ больш патанела. Пасля, на наступны дзень, раскалмацілася. Потым неба стала чыстым. У крохкім блакіце хутка расталі

змылкі хмарак, надвечар неба налілося зелянкавасцю крыштальнай крохкасці, выдавала бяздонным.

І зноў Міцька, як і кожную вясну, затрывожыўся: як жа сказаць пасялкоўцам, што сёлета наймацца пастухом не будзе. Ды і хадзіў ён у лес цяпер падсвядома, ён нібы развітваўся з ім.

Міцька ведаў, што ўжо ніщто не зможа ўтрымаць зіму...

А ў лесе хутка ўжо загаманілі, пабеглі, слепа тыркаючыся між кустоў, пнёў і вываратняў, ручаі. Міцька ведаў, што яны шукалі шляху да ракі.

Дарогі хутка падсохлі. Праз тыдзень у наезджаных з восені калдобістых каляінах, паўз бакі, дзе сушэй, лёгка зазелянела трава. І вось да пераляску шуганула сіняе полымя пралесак. Яго з кожным днём усё больш раздзімаў вецер. Навокал усё зашугала ад гэтага полымя. Калі ж Міцька звыкся з гэтым сінім агнём, вясна нібы спахапілася. Яна пачала заліваць полымя пеністай беллю кураслепу. Ён кіпеў, паступова патушыў блакітны агонь, і белую кіпень увабрала зямля, як увабрала вільгаць.

І тады на галінках дрэў пачалі набухаць пупышкі.

Пазней на берагах рачулкі, якая шырока разлілася і затапіла навокал лес, дарогі, лініі, палянкі, засвяціліся жоўтыя паходні вербаў. Трапяткое святло вербаў адбівалася ў блакітнай вадзе. Часам, у надта ясны дзень, здавалася, агонь грэе паветра, здавалася, усе змены ў прыродзе адбыліся ў адзін міг.

І Міцька па-ранейшаму радаваўся ўсяму, што бачыў у лесе. Але разам з тым яго зноў агортвала туга: з гэтае вясны ён кіне пасвіць жывёлу. Яму ўжо гэта было не пад сілу. Але і сядзець дома без справы няёмка. Мала хто з дарабіўшых да пенсіі лесарубаў сядзеў дома склаўшы рукі. Лесарубы ідуць на пенсію не раўня яму, маладыя, бо іх праца лічыцца цяжкай. Але варта толькі некаму засесці дома, адцурацца справы, год-два — і адышоў чалавек... А тыя, хто і на пенсіі мае такі-сякі занятак: вартаўніка, качагара, хлебавоза, пажарніка... нічога, жывуць... Значыць, разважаў Міцька, трэба і яму мець нейкі занятак. Але дзе і які?

І вось такія думкі цяпер зусім гнялі яго, хоць ты завяжыся ў мех. Цяпер, можа, не так, як зімою, усё ж вясна... А тады, калі сядзеў у настылай хаце, дык надта. Сядзіш бяздумна, за сцяной страляе мароз або завывае

ў коміне, і навокал цябе такая пустэча, хоць плач. І Міцька ўрэшце зразумеў, чаму хадзіў у лес: там знікала яго туга.

## 2

Туга палоніла Міцьку яшчэ з восені... Тады, перад пакровам, выпаў першы лёгкі сухі сняжок і не растаў. Жывёла стала. Такою парою Міцька меўся збіраць па дварах сена, якое яму павінны былі пасялкоўцы. З кожнага двара, дзе трымалі карову, — два пуды. Так дамаўляліся кожную вясну, калі Кавалёк наймаўся пасвіць статак. Міцька трымаў таксама карову, але дзе і калі ён мог ёй накасіць, ходзячы за статкам?

Вось і хадзіў Кавалёк ад двара да двара. Жанчыны яго паважалі, лепшага пастуха не ведалі. Цяпер яны бедавалі, што рана стала жывёла. Ёй бы яшчэ хадзіць на пашу. Ну і што, калі трава спруцянела, зжаўцела, палегла? У лесе — не ў хляве. Тут скубане, там скубане, усё ж не карміць дома. Міцька згаджаўся з жанчынамі, ведаў, у сасноўцы сена не лёгкае. Косяць па кустах, па балацінах, лічы, усё лета клопат толькі пра сена...

Цяпер жанчыны саскубалі са стажкоў на агародах сена, вязалі Міцьку посцілкі, ніхто не важыў, жменя сюды, жменя туды, ці будзеш цыркацца? Жанчыны падавалі яму ношкі на спіну, дапамагалі аднесці двору. Мала ў якім двары Міцьку не клікалі ў хату снедаць ці абедаць. Калі ён аднекваўся, пярэчылі: «Адзін пяклуешся. Хто табе згатуе? Аднаму і ў рот нічога не лезе. А тут — з дзецьмі. Ім жа надта смачна з чужым чалавекам есці».

І Міцька згаджаўся. Сапраўды, гатаваў ён сабе непераборліва. Бульба свая, капуста, агуркі, малако. Што яшчэ яму трэба? Ну, калі зварыць якой поліўкі...

Яго, як ніколі раней, цяпер чамусьці ўражваў дух чалавечага жытла, вабіла людская абжытасць. Асабліва ў тых хатах, дзе былі дзеці. Там адначасова і смяяліся, і румзалі, і сварыліся, і мірыліся, і крыўдзіліся адно на адно маці, і за ўсім гэтым Кавалёк бачыў ласку, клопатнасць і звычайнае чалавечае цяпло, якім быў абдзелены.

Кавалёк, наогул не зайздросны, зайздросціў цяпер звычайнаму чалавечаму шчасцю. Ён бачыў, што людзі, якія маюць сем'і, жывуць хоць і клопатна, але шчаслі-

ва. Часам яны нават не разумелі свайго шчасця. Ён не разумеў, як можна сварыцца на дзяцей, нават калі яны і неслухі, сцябаць іх анучамі, скардзіцца на мужа, які не зрабіў тое, гэта... Як можна наракаць на абцяжаранасць жыццём, неўладкаванасць, калі жыццё ў людзей не падобнае на яго жыццё адзінокага пажылога чалавека.

Пасля кожнага наведвання чужой хаты ў яго пачынала нясцерпна шчымець сэрца. Яму хацелася такіх жа клопатаў, такога ж цяпла, шуму, ласкі, усяго, чым жылі людзі.

І начамі, натаптаўшыся за дзень па вуліцы, натаміўшыся, зносячы сена ў двор, лежачы ў мулкім ложку, Міцька часам трызніў тым жыццём, якое бачыў. Дух чалавечага жытла і цяпла нібы вітаў перад ім. Здавалася іншы раз, што ўсё гэта таксама некалі было і ў яго жыцці, але ён страціў, не змог утрымаць ля сябе. У такія імгненні ён нібы жыў мінулым, якога ў яго ніколі не было. Часам яму мроіўся вобраз жанчыны. Якой? Здаецца, ён яе некалі недзе бачыў. Магчыма, нават быў знаёмы з ёй... Якой яна была? Здаецца, вельмі гаротнай, прыніжанай, пакрыўджанай жыццём, як і ён. І ён шкадаваў яе, гаротную, мяккую характарам, добрую. І як ён ні сіліўся, не мог уявіць рысаў яе твару, наогул яе вобраз заставаўся для яго за нейкай наміткай туману, нібы пакалыхваўся, паступова знікаў. Часам здавалася, што ён нават побач з сабой адчувае яе дыханне, адчувае ўсёй істотай, як да яго набліжаецца цяпло чужога сэрца, каб стаць яго цяплом, — працягні руку, дакранаешся да яе, жанчыны, пляча, і калі ён, як у няпамяці, працягваў, у той жа міг усё знікала. І тады ён вяртаўся да свайго рэальнага жыцця. Гэта было як крушэнне ўсіх надзей і спадзяванняў...

І вырашыў Міцька, калі не зможа пасвіць жывёлу, то будзе прасіцца на лесаўчастак. Хоць кім, абы з людзьмі.

## 3

Аб тым, што сёлета не будзе пасвіць жывёлу, Міцька Кавалёк сказаў пасялкоўцам за два тыдні да ўздзвіжання, калі звычайна наймалі ў Сасноўцы пастуха.

У пасёлку пачаўся ледзь не пярэпалах: хто ж будзе пасвіць статак? Дзе выйсце? Пасвіць па радоўцы, з кож-

нага двара па чалавеку, хай нават на два, няма магчымасці. Мужчыны ж на працы, на вытворчасці. Жанчыны глядзяць дзяцей, заняты гаспадаркай. Ды, не ведаючы лесу, статак у шэсцьдзесят галоў не ўпасеш. Каго наймаць? З пенсіянераў на гэта ніхто не згаджаўся, маўляў, мне пенсіі хопіць, калі нікога не знойдзем, вяроўчыну карове на рогі ды на мясакамбінат.

Жанчыны такім пярэчылі:

— Вядома, вам добра, дзяцей выгадавалі. А як нам з малымі дзецьмі круціцца, калі ў краму нічога малочнага не возяць? У горад не наездзішся. Як быць?

Міцьку шкада было дзяцей, шкада было цурацца свайго занятку, але ён не меў намеру хлусіць ні людзям, ні сабе.

— Паверце, — казаў ён, — няма ў мяне ранейшай сілы. Летась ледзь дахадзіў. Ногі адвальваюцца, баюся дзе паваліцца пад кустом, што і ніхто не знойдзе.

— Верыць-то верым, — нібы спачувалі яму, — але як нам быць. Замену шукай.

Міцька чухаў патыліцу, плюскаў адзіным вокам, напружваў думкі, успамінаў знаёмых пастухоў з навакольных вёсак, прыкідваў, хто б гэта змог яго замяніць.

Вёскі былі далёка ад Сасноўкі, ляснога пасёлка, і вясковыя пастухі пасвілі па полі. Вядома, атрымлівалі яны менш, чым Міцька. Але Міцька іх ведаў. Бывала, сутыкаліся калі. Былі сярод іх людзі сквапныя да капейкі, асабліва Сямён Карамкевіч, таксама летнага веку чалавек, як і Міцька, але дужэйшы, чым ён, хаця пасля вайны адседзеў у турме за сувязь з паліцыянтамі.

Міцька праз ноч схадзіў на Сялібу, дзе жыў Сямён, расказаў таму пра сваё гора. Надзіва Сямён адразу згадзіўся, паставіўшы ўмову — сталавацца ён будзе па хатах, па чарзе. Пасялкоўцы згадзіліся, больш на Міцьку не крыўдавалі, наогул як забыліся на яго. І Міцька яшчэ больш адчуў адзіноту.

Вясною ён колькі разоў яшчэ выбіраўся ў лес. Яму пашчасціла, ён не прамінуў першае куванне зязюлі. Тужлівае, далёкае-далёкае, аж халодзіць усярэдзіне. Заспеў Міцька і прылёт жураўоў з выраю. Якраз у Лясках. У сваім любімым месцы ля рачулкі. Ён бачыў, як яны сваімі паабітымі ветрам крыламі ўпарта разразалі паветра над Ляскамі, і зноў нудзіўся: жураўоў было ці не ўдвая меней, чым восенню, як ляцелі ў вырай. Адна была ўцеха, што за лета, калі жураўоў ніхто не па-

трывожыць, яны адновяць свае ключы, не могуць жа гэтыя ключы абарвацца наогул.

Аднойчы з лесу ён вяртаўся надвечар, тым часам, калі ўжо прыгналі ў пасёлак статак. Яшчэ на вуліцы трымаўся цёплы пыл, у хатах не запальвалі цяпло, і мужчыны толькі вярнуліся з дзялянак, бразгалі ў дварах мыцельнікамі. На вуліцы яго прыпыніў Іван Сідорын. Іншым разам Міцька прайшоў бы міма, але Іван прыўзняўся з лавачкі, на якой сядзеў пры палісадніку, турзануў за рукаў:

— Сядзь са мною, суседзе. Чаго ета заганарыўся, не зважаеш?

Івану было пад пяцьдзесят. Высокі, паўнатвары, чырванашчокі, з шырокімі моцнымі рукамі, апрануты ўдарагі святочны касцюм, пры гальштуку з няўмела зазязаным вузлом, быў ён узбуджаны і, як зразумеў Міцька (дыхаў прама яму ў твар), на падпітку.

Міцька, пазглядаючы на Івана, нехаця, моўчкі прыткнуўся на край лаўкі і, каб нешта сказаць, спытаў ці то асуджальна, ці то з зайздрасцю:

— Я гляджу, Паўлавіч, ты ўжо прычасціўся. Дзе ета? Здаецца, у пасёлку цяпер, каб і паміраў, не знайшоў бы. Не возяць і, кажуць, за гэта зелле не на жарт узяліся.

— Во, знішчаюць, — зарагатаў Іван, — паказваючы роўныя белыя зубы. — І я ў гэтым таксама, як бачыш, прыняў удзел. Знішчыў колькі грамаў гэтага зелля... Ды няма такога загаду, каб чалавек не мог узяць чарку, калі трэба. Тут, брат культура павінна быць.

Іван зноў зарагатаў, аж закашляўся. Калі супакоіўся, Міцька шчыра спытаў:

— А што, ужо і да такой культуры дадумаліся, алкагольнай?

— Дзівак чалавек, — развёў рукамі Іван, не заўважыўшы, што Міцька яго падкалоў, — як для каго. Гэта значыць умець піць і не хмялець. Ды і нагода ў мяне. Калі б я ўзяў на рабоце, то там ты бяры мяне за каўнер і вядзі хоць у міліцыю. Там я не маю права. Але ж у добрых умовах, з добрымі людзьмі ды яшчэ пры добрай закусі, як некалі казаў поп, яшчэ за кошт раба божага — магу. Ну, пра папа я так, да слова. За сваё ўзяў. Сам мяркуй, чаму і не выпіць, калі ў мяне свята?

Іван тыркануў угору заскарузлы палец, паківаў ім, грэбліва паглядзеў на Міцьку, калі той спытаў, якое ў яго свята.

— Цёмны ты чалавек, Мітрый. Газет не чытаеш, — і тыцнуў пад нос раёнку. — Глядзі!

Міцька глянуў. На першай старонцы газеты быў здымак: стаіць Іван ля трактара на дзялянцы, глядзіць прама на цябе. І подпіс: «Іван Сідорын, перадавы трактарыст Сасноўскага лесаўчастка».

— Бачу, бачу. Тут, Паўлавіч, ні даць ні адняць. Газета брахаць не будзе.

— А што, Мітрый бацькавіч! Ведай, які ў цябе сусед. Мне ніхто не ўказ, мяне ніхто абысці не можа на дзялянцы. Кішкі тонкія, лопнуць! Я, Мітрый бацькавіч, ведаю, што да чаго, ведаю, каго цяпер шануюць. Мяне шануюць. Перадавік? Перадавік. Прэмію далі? Далі. Зарабіў, сваімі грашамі магу хоць сцены клеіць, і ніхто мне не ўказ! Магу выпіць з радасці? Магу. Але я адзін за стол не сяду, калі дзела такое. І не абы-дзе, а ў рэстаране. Ты хоць раз за сваё жыццё быў у рэстаране, хоць ведаеш, што гэта такое?

Іван утаропіўся ў Міцьку, схіліў да яго галаву, паківаў перад носам тым жа заскарузлым пальцам.

Міцька паціснуў плячамі.

— Чуць чуў, але не быў. Гэта карчма такая, дзе мужчыны сядзяць за сталом, ядуць, п'юць, а другія мужчыны падаюць ім ежу і чакаюць, бы сабакі косткі, капейкі на чай?

— Якая табе карчма? — аж падхапіўся Іван з лавачкі і нервова захадзіў узад-уперад перад Міцькам. — Ці ты смяешся, ці сапраўды такі дурны, як грак?.. Кажу, рэстаран. Ды каб ты ведаў, цяперашнім часам там не ўсякаму чарку паднясуць, хай у цябе і грошай поўная кішэня. Ну, нальюць сто грамаў, цыркнуў іх, перакусіў, і акыш табе!

— Чаму ета акыш?

Іван на хвіліну спыніўся, развёў рукамі, потым пляснуў імі.

— А таму, што хто ты такі? Ну хто? — Іван змяў на грудзях Міцькаву кашулю.

— Хто? — не зразумеў Міцька, спрабуючы вылузацца з моцнай Іванавай пяцярні.

— Ды не ты, — расціснуў Іван пальцы, — ведаю, што адстаўны пастух. Я так для прыкладу кажу. Ведаю, што грошай у цябе не менш, чым у мяне, перадавіка. Толькі грошы твае дармовыя, а мае мазалём пахнуць. Перадавік я, а значыць, мне ўсюды пашана.

— Выходзіць, ты хіліш да таго, што перадавікам налiваюць, хоць заліся.

— Э не! — Іван зноў паківаў пальцам, але ўжо перад сваім тварам. — Хіба будзеш казаць афіцыянту, што ты перадавік? Яму напляваць. Але ж мяне асабіста многія людзі ведаюць. Той жа Карней Карнеевіч. Ну той, што некалі ў нас участковым служыў. Вялікі чалавек, усю раённую шафярню да апошняга часу ў кулаку трымаў. Ён і цяпер начальнік. Сустрэліся ў раёне, разгаварыліся. Ён маю ласку памятае. Зайшлі ў рэстаран. Дык перад ім афіцыянты на цырлах круцяцца. Вось так, галава!

— Глядзі ты, — шчыра здзівіўся Міцька, — трэба ж.

— Ён і дадому давёз на службовай машыне, во!

— Мусіць, нечым заслужыў, — сказаў Міцька.

Ён ужо хацеў падняцца, пайсці двору, лічачы, што размова гэтая бессэнсоўная скончылася, што п'яны Іван выплеснуў усё, што было цяпер на душы, нахваліўся як хацеў, але Сідорын шкуматнуў яго за рукаў:

— Сядзі! Чуў я, суседзе, што ты без справы туляешся. Ты мне ўпоперак дарогі ніколі не стаяў.

— Але...

— То я табе дапамагу.

— Мне нічога не трэба.

— Брэшаш. Кожнаму чалавеку нешта трэба. Табе трэба недзе рабіць.

— Не бачу ў гэтым заганы.

— І я. Гэта ўжо гаворка. Ты хілы, Мітрый бацькавіч, ткні цябе пальцам — нагамі накрыешся. Лесарубам цябе ніхто не возьме — застар. У канторы на лічыльніках шчоўкаць — таксама не для тваёй грамаці. А вось ёсць у мяне на прыкмеце занятак па тваёй сіле.

— Ідзі ты?

— Вось табе і ідзі ты. У нашай брыгадзе. Вартаўнік трэба. Нібы не ведаеш, што Піліпа вытурылі і пад следства аддалі. Галавы не меў. А ты красці не будзеш. Тваё слова — я заўтра закіну за цябе, так скаць, пратажэ. Цяпер гэта модна, каб нехта за некага прасіў. Сам ты куды тыцнешся?

— Калі так, то замоў слова, вартаўніком дык вартаўніком. Усё ж лес, пры людзях.

— Дык прыходзь заўтра раніцай да канторы. Маё слова — камень!

Міцька пайшоў на падворак. Вечар быў цёплы, ветру

не было, адно даймала камарэча. Але ён сеў на ганак, ад размовы з Іванам непрыемна было на душы. Лезе сляпіцаю, выхваляецца чорт ведае чым, а ты павінен слухаць, што ён плявузгае, ды яшчэ падтакваць, каб не пакрыўдзіць. Ды і наогул, Івана Міцька недалюбліваў. Ён не хаўрусаваўся з ім, але і не сварыўся. Жылі па-суседску мірна. Іван быў дужа сквапны. Тое, што да работы ў лесе сквапны, дык гэта Міцька яму ў загану не ставіў. Але ў Івана наогул была нейкая нечалавечая сквапнасць. Усяго яму было мала. Хату паставіў ці не лепшую ў пасёлку — мала. Колькі год назад зрубіў другую, усё казаў для сына, які тады служыў у арміі. Але той адслужыў і застаўся ў горадзе, дык Іван хату прадаў, добра ўзяў, але зноў мала. Ці не кожны месяц ён прывозіў машыну бярозавых метровых дроў, скідаў іх на агародзе за хлявом, мусіць, каб ніхто не бачыў. Міцька-то бачыў, яму са свайго агарода бачна. Дзён колькі паляжаць тыя дровы, а потым ноччу падыдзе машына, і няма тых дроў. Мала Івану з яго Аленай было пятнаццаці сотак агарода, дык ён кожную вясну адорваў баразёнку ад Міцькавага. Міцька хоць сваё ўсё не засяваў, пакідаў пад лужок, але было ўсё ж шкада, ды і сорамна перад людзьмі: у цябе забіраюць, а ты маўчыш. Мала Івану было адной кароўкі, дык ён яшчэ трымаў у хляве быка, у статак не пускаў. Да быка сасноўцы вадзілі кароў, вадзіў і Міцька, вядома, не за так. Міцька па-чалавечы не разумеў, чаму Іванава Алена, сухая, як абадраная ліпка, апранутая заўсёды ў адну сукенку, лапік на лапіку, усё лета не вылазіла з лесу, збірала ягады. Казалі, у Бабруйску на базары з ёй не магла пораўнацца ні адна гандлярка. Ну ладна, зарабляла. Але навошта, калі гэтая капейка нікуды не трацілася? У панчоху? І Іван гроб усё пад сябе, як ашалелы.

А сасноўскія жанчыны лічылі Івана сапраўдным гаспадаром. Міцька неаднойчы чуў, як хто з жанчын, чымсьці незадаволеная, упікала мужа:

— Бязклёпіца! І што за гаспадар? Ні грошай, ні хаты добрай. У Івана б павучыўся, той умее жыць. І хата як звон, і хлеў, як лялька, і дрывотня ад дроў ломіцца. І хлеб ёсць і да хлеба.

Мужчына адбрэхваўся:

— Што ёсць, чаго няма, але сваё. У пазыкі ні да кога не іду. І не бяру тое, што дрэнна ляжыць.

Як гэта бывае ў вёсках, дзе кожны пра кожнага ве-

дае ўсё і не хоча псаваць адносіны, далей слоў не ішло.

Цяпер Міцька думаў, чаму гэта сёння Іван так перад ім вылянгаўся, выдаваў добрым. Можа, што выпіў, а можа, чаго так. Ні з таго ні з сяго прапанаваў уладкавацца на работу. Ну, за гэта трэба дзякаваць. Сам Міцька не асмеліўся б падысці да новага начальніка лесаўчастка Стрынадкі. Казалі, занадта строгі, але справядлівы. Як ты падыдзеш? Усё-ткі чалавек ён прышлы.

Міцька доўга сядзеў на ганку, не заўважыў, як змрок усё цяжэй апускаецца на зямлю, гусцее. У небе запальваліся зоркі, усё далей і далей, мігцелі халаднаватым святлом, і ветрык ужо куеўдзіў лісце яблыні за плотам, у двух кроках ад ганка. Цемра ўсё згушчалася, у ёй патаналі платы, дрэвы, хаты, паступова знікалі дзіцячыя галасы, бразгалі варотцы то тут, то там. І невядома, колькі б Міцька яшчэ сядзеў, каб не скалануўся ад уедлівага голасу Іванавай Алены:

— Ы-ы, бізула, намурзаўся з вялікай радасці, як кот валяр'янкі, манежыцца! А мне што з тваёй радасці? Хвіндос пад нос? Валачыся дахаты, не сараміі людзей!

Міцька ўстаў, яму было брыдка чуць такое, і, ужо, прычыняючы дзверы ў сенечкі, пачуў, як адбрэхваўся Іван:

— Не мянці, калі не ведаеш. Пачаставаў Карнеевіч. Напярод. Ведаю за што.

## 4

Назаўтра, прачнуўшыся раніцаю — сонца яшчэ гублялася недзе за борам, і яго промні ледзь спрабавалі слізгаць па вяршынях, было гэта бачна праз акно, што выходзіла на агарод, — успамінаючы гаворку з Іванам і яго абяцанні ўладкаваць на работу, Міцька ад агіды аж перасмыкнуў плячамі, нібы холад яго працяў. І падштурхнуў мяне чорт згадзіцца з ім, лаяў сябе Міцька ў душы. Чаго, каб хто спытаў? Стары ёлупень! Быццам сам не мог падысці да Стрынадкі. Бач, дэфіцытная пасада — вартаўнік! Міністра, няйнакш... Ну, калі і адмахнуўся б Стрынадка, дык што, у каршэнь натоўк?..

Але не пайсці да канторы Міцька не мог. Мала, што балбатаў п'яны Іван, можа, забыў сёння. Калі не забыў, дык не будзе ж ён адразу ні з таго ні з сяго весці размову з начальнікам пра нейкага там Міцьку. Значыць, Міцька павінен яго апярэдзіць, сам падысці да Стры-

надкі, пагаварыць. Возьме — дык возьме, не — дык не, і сказ увесь.

Трэба было ісці. Міцька старанна пагаліўся, апрануў чыстую кашулю, надзеў старога крою бастонавы касцюм, які не чапаў гадоў дваццаць, наваксаваў хромавікі, рушыў.

Вуліца была яшчэ пустая. Доўгая яна ў Сасноўцы, вузкая, будаваліся адразу пасля вайны, не думалі, што некалі будуць вялікія машыны, прымерваліся пад палутаркі, і яе, здавалася, сціскаюць хаты, вялікія, у рост чалавека, платы, бярвенні, зваленыя ці не перад кожным дваром. Але пасёлак ужо ажываў. У хлявах, чуючы блізкі час волі, рыкалі каровы. У дварах бразгалі пустыя вёдры, сакаталі куры, грымелі ланцугамі сабакі. На машынным двары чулася трэсканне, нібы з кулямёта.

Міцька спяшаўся. Хада такая была ў яго: подбегам, нават калі не меў ніякага клопату. Рухаўся ён не прама, як усе людзі, — колькі крокаў наперад у адзін бок, затым колькі крокаў у другі, быццам даганяў статак, які так і цаляе адбіцца ў шкоду.

На свае гады Міцька абліччам не выдаваў. Ён быў з тых нямногіх людзей, узрост якіх у сталыя гады адразу па твары вызначыць цяжка, а можа, і немагчыма. Такія людзі гадоў да сарака пяці, пяцідзесяці выдаюць намнога маладзей свайго ўзросту, і раптам на нейкай мяжы нібы застываюць у сваім сталенні на многа гадоў: ну, сорак чалавеку дык сорак — дзесяць год запар. А яму ж даўно за пяцьдзесят. І толькі потым, калі сам па сабе зношваецца арганізм, наступае пара, што старэе чалавек, чахне, як перастаялы грыб, здзіўляючы гэтым знаёмых.

Міцька якраз падступаў да той мяжы, калі павінна адразу пачацца яго згасанне. Твар яго, як і пяць, дзесяць гадоў назад, быў кашчавы, шчокі праваленыя, скура на іх як высахлае лісце, прасвечваюцца жылкі накол вачэй, больш на скулах. Нос прамы, даўгаваты, губы не па-мужчынску тонкія, востры падбародак, А вочы... Вока... Міцька быў аднавокі. Выцвілае азярцо ў глыбокай вачніцы. У другой — чырвоная яміна. Яшчэ ў дзяцінстве Міцька страціў вока. Парабкам. У бацькі Сямёна Карамкевіча пасвіў жывёлу, бег аднойчы па лесе за каровай, напароўся на сук.

Міцька хваляваўся. Стрынадку ён не тое што асабіста не ведаў, але нават не бачыў. Ён не ўяўляў, які ён,

новы начальнік лесаўчастка, САМ, або гаспадар, як звалі лесарубы Стрынадку за вочы, укладваючы ў гэтыя словы адпаведны сэнс.

А Канстанцін Кузьміч Стрынадка быў моцны, каржакаваты, як штангіст, крыху крываногі трыццацігадовы мужчына, які лічыў сябе, і ніхто гэта не ведаў, на лесаўчастку чалавекам часовым. Спадчына Канстанціну Кузьмічу дасталася — не пазайздросціш. Яго папярэднік «гнаў план» і «выганяў» так, што цяпер сядзеў у міністэрстве і адтуль кіраваў леспрамгасамі вобласці. Стрынадка лічыў, што лёс яго незайздросны. Пасля інстытута колькі гадоў працаваў у райцэнтры дырэктарам агароднінасушыльнага камбіната. Ва ўраджайныя гады засыпаў магазіны гароднінавымі кансервамі. Усё нібы ладзілася. На сходах вялікіх хвалілі, ставілі ў прыклад, у прэзідыумы выбіралі. І раптам адна за адной праверкі. Выявілі недастачу, аказалася, што эканаміст і галоўны тэхнолаг хімічылі, прыпісвалі, завышалі гатунковасць, атрымалі сваё і цяпер недзе ў Сібіры валілі лес. Ну хто паверыць, што дырэктар нічога не ведаў? А яму паверылі, тэхнолаг і эканаміст даводзілі на судзе, што рабілі ўсё без ведама Стрынадкі. І сапраўды так было. Ён план глядзеў, а план выконвалі. Разабраліся, высветлілі, выклікалі Стрынадку куды трэба, наківалі пальцам, паставілі ў віну, што як кіраўнік выпусціў з-пад кантролю вытворчы працэс, а гэта і прывяло да злачынства. Прапясочылі, палаялі, заляпілі вымову, вызвалілі ад пасады, але ўлічылі нявопытнасць, без хлеба не пакінулі. Віну сваю Стрынадка ўсвядоміў, каяўся, прыніжаўся, прасіўся, каб накіравалі на любы, самы цяжкі ўчастак народнай гаспадаркі. Вядома, не простым рабочым, а кіраўніком, каб змог рэабілітаваць сябе. Яго прызначылі начальнікам лесаўчастка ў Саспоўку. Ну і што, калі па адукацыі Стрынадка харчавік? Лес валіць — не хлеб вырошчваць. Тут лінія адна: давай, давай! План выконвай. Выконваеш, значыць, можаш кіраваць. Не выконваеш — значыць, ты ніхто. А якім коштам — гэта твая справа, на тое цябе і прызначылі кіраўніком.

У першыя дні, як прымаў лесаўчастак, знаёміўся з людзьмі, зразумеў: дай ім магчымасць зарабіць, не крыўдзі, не зважай, калі хто куб-другі возьме дроў, дык і табе аддзячаць. Калі ж ты да чалавека спіною, дык і ён да цябе так.

Так і сказаў на сходзе: будзем рабіць як след, бу-

дзем і зарабляць, закон такі ёсць, чым больш зробіш, тым больш заробіш, гэта раней падразалі нормы, цяпер — не.

Паверылі. Лесарубам новы начальнік спадабаўся. Бывае, круты. Патрабавальны. Але пры ўсім гэтым не ў сваё не лезе, калі што не ведае, не пасаромеецца спытаць-перапытаць, параіцца з кожным.

...Пачатак восені быў пагодлівы. Лісце доўга не жаўцела, трымалася, дажджы не пракідаліся, і калі пераехалі на Убалацце, гэта векавы бор за сорак кіламетраў ад Сасноўкі, думалася, што і тут развернуцца ого як. Але хутка задажджыла, дождж не сціхаў два тыдні, дарогі разлезліся, іх і масцілі голлем, і пяском засыпалі, усё адно — гразь. Вось тады Стрынадка не на жарт спалохаўся. Ён днямі не вылазіў са свайго старога, абдрапанага «козліка», ездзіў на дзялянкі, з кожным вітаўся за руку, раіўся, прасіў, абяцаў прэміі, тое-сёе з свайго фонду падкінуць толькі б не падвялі. І лесарубы стараліся. Трактарамі буксіравалі лесавозы да добрай дарогі, самазвалы вазілі гравій, засыпалі калдобіны, два экскаватары, пазычаныя ў перасоўнай механізаванай раённай калоне, днямі капалі пясок ля дарог, усё сыпалі, сыпалі, сыпалі...

Ізноў, казалі, Стрынадка быў на кані, выканаў план такой парой, калі астатнія лесаўчасткі з планам не спраўляліся. І нікому не было справы да таго, што ў какляю на многія кіламетры леглі тут дзесяткі кубаметраў хлыстоў, што вакол дарогі быў знявечаны лес, нібы прайшоў буран, што людзі ледзь не рвалі жылы. Усё гэта нішто ў параўнанні з лічбамі плана. І гэтае, — любым коштам, — стала для Стрынадкі галоўным у рабоце. І яшчэ ён зразумеў, што для сасноўцаў няма нічога вышэйшага, чым рубель, што зарабляць яны прывыклі яго таксама любым коштам.

Міцька, ідучы да канторы, нічога гэтага не ведаў. І як рана ён туды ні прыйшоў, там ужо было людна.

Кантора, невялікі драўляны будынак, самая звычайная хата, толькі бёрны пафарбаваны ў зялёны колер, знаходзілася сярод старых парэпаных ліп, якія пасадзілі замест некалі спілаваных соснаў недалёка ад клуба, таксама звычайнай хаты, у якой час ад часу круцілі кіно.

Яшчэ здалёк, паварочваючы з вуліцы на сцежку ўздоўж шашы, яна аддзяляла кантору ад машыннага двара, Міцька падумаў, што ў яго сёння нічога не выгарыць: круг мужчын, а ўсярэдзіне размахвае рукамі малады

чалавек у блішчастай скуранцы. Капялюш на патыліцы, выгляд заклапочаны. І па тым, як яго ўважліва слухалі, Міцька зразумеў — САМ.

Не даходзячы крокаў пяць да мужчын, Міцька прысланіўся спіной да шурпатага ствала старой разгатай ліпы. Чакаў. Адсюль за шашой быў добра бачны машынны двор. МАЗы, бартавыя машыны, напаўразабраныя трактары, цыстэрны, пакурочаныя парэмы, кузня, старая драўляная майстэрня — усё нібы бязладна рассыпана, чужое. Далей — лес. Вяршыні пасохлі, востра тырчалі абламаным, балюча глядзець.

Стаяў Міцька хвілін дзесяць, ужо думаючы, што трэба шкрэгаць дахаты, неназаляць людзям, якія маюць свой клопат, і, магчыма, патрусіў бы назад, але пачуў:

— Усё, таварышы, па машынах!..

Глядзі-тка ты, як у войску, падумаў Міцька пра Стрынадку, дакладна і строга, гаспадар! І тут яго прыкмеціў Іван, гукнуў:

— Мітрый, нягожа так, пазнішся, быццам з дзеўкамі да пеўняў стаяў. Я табе ўчора сказаў, што дамоўлюся. А ты?

Міцька зніякавеў, зграб з галавы шапку, павітаўся.

Стрынадка блiснуў на яго, спытаў Івана:

— Гэта той чалавек, Паўлыч?

— Ды той, той, Кузьміч. Сусед мой. Мая думка такая, Кузьміч, хай робіць.

— Калі ты ручаешся, то хай. Няма калі анцімонію разводзіць, бяры яго ў машыну.

Стрынадка пайшоў у кантору, глуха стукнулі за ім дзверы, а Іван:

— А што я табе казаў учора? Думаў, што Іван языком, як падмазкай па патэльні? Не, Мітрый бацькавіч, Іван словы на вецер не кідае. Стрынадка мяне слухае, заўсёды першы руку падае. Мне падае, не ўсякаму падасць. Уцям гэта, спатрэбіцца.

— Ды ўжо ж... Толькі, Паўлавіч, няёмка мне. І як мне табе аддзячыць, — шчыра сказаў Міцька, не ўкладваючы ў словы нейкі іншы сэнс, чым сказаць: дзякуй, браце.

— Ну, Мітрый, справа суседняя, аддзячыш, калі так. Не спяшайся, будзе час, будзе і ласка.

Вось табе і на, падумаў Міцька, адзін ляпнуў, а другі ўхапіўся, аказваецца, адной падзякі слоўнай Івану мала. Што ж рабіць?..

З лесаўчастаўскага двара выехала машына. Крытая брызентам. На шашы насупраць канторы спынілася. Забібікала, з кузава пачуліся галасы:

— Хутчэй, Паўлавіч! Час не конь, не стрыножыш!

Міцька заспяшаўся ўслед за Іванам.

5

Кавалёк не чакаў, што з першага дня яму давядзецца рабіць на дзялянцы. Думалася, калі возьмуць, дык дадуць дзень які, каб асвоіўся. А тут адразу пасадзілі ў машыну — і ў лес. Значыць, разважаў ён, нявыкрутка, нават мяне, нічога не расказаўшы, не паказаўшы, запрэглі.

І на дзялянцы, куды прыехалі, майстар Мікола Гаўрыленка, якога Міцька, як і ўсіх сасноўцаў, добра ведаў, размяркоўваючы пры пераездзе абавязкі кожнаму, сказаў, каб Кавалёк падчапіў парэм да МАЗа Васіля Чубацюка, маладога хлопца, які летась адслужыў армію.

Міцька кінуўся да Васіля, але той ужо машыну падагнаў задам да парэма, сам падчапіў яго, убачыўшы Міцьку, падміргнуў:

— Ты, дзядзька, не перажывай. Я падчапіў, я і давязу, хочаш, са мной едзь, хочаш — аўтобусам.

Міцька з Васілём ехаць не збіраўся, як гэта так, першы дзень у лесе — і яму асобная машына, нібы падпанку. Што людзі падумаюць, сказаў, паедзе разам з усімі.

Грузілі ўсё хутка. На трайлеры загналі тралёвачныя трактары, да цягачоў падчапілі дызелі, цыстэрны з бензінам, будкі на колах, дзе хавалі запчасткі і інструмент, праз паўгадзіны, няйнакш, выстраілі доўгую калону. Стрынадка хадзіў ад машыны да машыны, загадваў:

— Дыстанцыя дваццаць—трыццаць метраў. Трымаемся на віду адно ў аднаго. Калону не расцягваць. Я — у галаве. Дыстанцыя...

Лесарубы садзіліся ў кабіны лесавозаў, Міцьку ж знайшлося месца ў старым аўтобусе Ляксея Сакадынца, пенсіянера, які некалі рабіў на лесавозе, а цяпер на «газіку» вазіў на дзялянку лесарубаў.

Месцячыся ля акна, Кавалёк з аўтобуса, як з грудка, акінуў паглядам дзялянку. Была яна бясконцая, той далёкі край патанаў у блакітнаватай смузе, як сціраў-

ся, мабыць, там была лагчына і над ёй вісеў туман. Бліжэй, дзе ўжо вока магло ўсё бачыць выразна, малюнак быў страшэнны: ні аднаго жывога дрэўца, нічога зялёнага — шэрань, чарната, карычневасць. Зямля здратавана гусеніцамі, галавешкі, вялізныя лаўжы...

— Во спляжылі дык спляжылі! — ускрыкнуў Кавалёк, хутчэй сам сабе, чым Ляксею.

— А што ж ты хацеў, Змітрок, — сказаў Ляксей, і ўсмешка тарганулася на яго шчацiністым худым твары, — дзялянка ж. Тут што ні кажы, як ні варажы, па-другому не будзе. Палігон. Мы спілавалі, каму трэба — пасадзіць. Пуставаць не будзе.

Міцька паглядзеў на Ляксея і па тым, як ён ненатуральна ўсміхаўся, зразумеў, што Ляксей сам у гэта не верыць, сказаў так, дзеля адчэпнага.

Спераду калоны пачуўся доўгі прарэзлівы сігнал, затым яшчэ і яшчэ, і вось ужо ўсё наўкола аглушыў доўгі, працяжны сігнал, калона рушыла з месца. Яна пакалыхвалася, расцягвалася, зноў сціскалася, як спружына, упарта караскалася з нізіны на грудок, за якім зноў спусцілася ў нізіну. Але ўжо на добра вымашчаную, падсыпаную пяском і гравіем дарогу, на якую, здавалася, можна было класці асфальт.

Міцька разумеў, што гэтай дарогай колькі гадоў ніхто ездзіць не будзе, што тут паблізу лес не будуць валіць гадоў дваццаць — трыццаць, наўкола ён дробны, малады, і дарога размыецца дажджамі, распаўзецца, як нікому не патрэбная.

Праз нейкі час закалыханы шляхам, стомлены ад убачанага Кавалёк знясілена драмаў, галава яго, нібы прывязаная тонкай шыяй да тулава, матлялася з боку на бок, часам ён уздрыгваў, нібы абуджаўся, і зноў правальваўся ў дрымоту.

А Сакадынец (яны былі ўдвух у аўтобусе), кідаючы час ад часу позірк у люстэрка і бачачы зморанага Кавалька, думаў, якой немачы гэты пастух пацёгся на дзялянку, сядзеў бы сабе дома, корпаўся ў агародзе і не меў бы ніякага клопату.

Ехалі гадзіны дзве да Ляскоў, спыніліся там, у месцы, дзе ад наезджанай дарогі адыходзіць атожылак, звычайная сцежка, па якой можна было праехаць, і адразу ж Стрынадка махнуў рукой трактарысту, які чакаў іх тут, — наперад.

Той ускочыў у трактар, ірвануў рычагі, трактар, пад-

мінаючы гусеніцамі траву, маладняк, пайшоў наперад.

Міцька абудзіўся ад моцнага штуршка, па інерцыі ўціснуўся ўсім целам у мулкую спінку сядзення, глянуў у акно, пазнаў мясцовасць.

Пад'езд да Ляскоў. Надта грыбное і ягаднае месца; калі паглыбіцца ў лес, старыну — бярозы, асіны, елкі, грабы, арэшнік уперамешку. Сярод яго былі балаціны, на якіх у добры год як насыпана было чарніц і буякоў, далей, у балотах, — журавіны, як вераб'інае яйка велічынёй, — не было ім вынасу.

Дрэвы, нібы супраціўляючыся гэтай жорсткай жалезнай сіле, якая рухалася тут, чапляліся голлем за кабіны машын, барты, прычэпы, трактары на трайлерах. Голле ламалася, яго таптал і коламі, гусеніцамі. Здавалася, ужо нішто не зможа спыніць гэту калону, і жах апякаў Міцькава сэрца, яно сціскалася, хацелася крычаць у бяссіллі, прасіць людзей, каб злітаваліся над лесам, у рэшце рэшт над ім, Міцькам Кавальком. Але нешта перашкаджала Міцьку зрабіць гэта, ён сціскаў рукамі галаву, стагнаў, нібы гэта катавалі яго. Яму хацелася таксама выскачыць на хаду з аўтобуса, кінуцца наперарэз калоне, спыніць... Але Міцька ведаў, што гэта зрабіць не зможа, што ён нічога не зможа змяніць у тым жыцці, якім жывуць і жылі лесарубы, што яго не тое што ніхто не зразумее, а не стане нават слухаць, у лепшым выпадку адштурхнуць з дарогі, каб не замінаў. І ён стагнаў, скрыгатаў зубамі, уціскаўся ў сядзенне, пакуль калона не спынілася ў Ляcках.

Ён доўга сядзеў утрапёны, пакуль Ляксей не кінуў:

— Выспаўся, прыехалі, выходзь, Змітро.

Міцька падняўся, гупнуў на траву, адышоўся ўбок. Малюнак быў такі. З трайлераў з'язджалі трактары. Іх гусеніцы трушчылі маладняк, уціскалі ў зямлю ўсё, што замінала. А вальшчыкі тым часам, пабраўшы пілы, пачалі тузаць стартэры. Лес аглушыўся трэскам. Нізка, над самай зямлёй, паплыў горкі даўкі дымок. Пах гары, мазуты, бензіну задавіў пах сунічніку, лясной прэлі, медуніц. Здавалася, лес ніколі не меў іншага паху, чым цяпер, не чуў іншых гукаў, шолаху лісця і траў, не бачыў сонечнага святла.

З крыкамі «Бойся!» вальшчыкі спускалі з пня векавыя сосны. Пасля падыходзілі да новых дрэў, згіналіся ад цяжару бензапіл, уціскалі ў кару, нібы ў пластылін, вострыя зубы ланцугоў. Пілы трашчалі мацней, зласлі-

ва, уедліва, з-пад шчыткоў, якія прыкрывалі маторы, ручаямі лілося на зямлю пілавінне. Яно, нібы снежныя крупы, усцілала вакол дрэў леташняе счарнелае лісце. І дрэвы, яшчэ не спілаваныя да канца, нібы супраціўляючыся, дрыжэлі, потым паволі пахіляліся, трашчалі і, нібы хапаючы паветра голлем, як рукамі, чапляючыся за маладняк, які абступаў іх, з шумам падалі, цяжка гупаючы на зямлю... Хруст... Гупанне... і крыкі «Бойся!».

## 6

Міцька, які амаль кожны дзень бачыў, ганяючы статак у лес, пакінутыя пасля сябе лесарубамі дзялянкі, вынішчаныя, выгаралыя, засмечаныя лаўжамі, тады не так жахаўся, як цяпер. Ён па-ранейшаму стаяў воддаль, ля дарогі, ужо глыбока каляіністай, цяпер нібы забыў на свае пакуты, як ехалі сюды, нібы перастаў што разумець наогул. Нібы перад ім круцілі недзе ў далёкім свеце знятую плёнку, якая не кранае з каторай пары сэрца, не абуджае свядомасць — ну, недзе было, а можа, і не было такога, прыдумалі людзі, і быць не можа. Усё гэта чужое, не яго, далёкае. Відаць, настолькі вялікае было патрасенне, што яно раптам выбіла Міцьку з рэальнасці. І гэты трэск бензапіл, лязгат гусеніц, стук сякер — гэта ўсё не тут, не побач.

Тут побач з Міцькам другое жыццё, другі клопат. Душа разрываецца ад пачутага.

Гаўрыленка:

— Так, так, так, Кузьміч, ты нічога не думай, не падвядзём.

Стрынадка:

— Глядзі, Хведаравіч, уся надзея на цябе, як майстра. Я сёння павінен даць у леспрамгас тэлефанаграму, што лес з новай дзялянкі пайшоў.

Гаўрыленка:

— Так, так, так, Кузьміч, едзь, можаш смела даваць. Калі хлопцы запрэгліся, дык ты іх не супыніш.

Стрынадка:

— Я гэта ведаю і бачу, але іншы раз напомніць хлопцам трэба, каб не расслабляліся. Цяпер жа ўсюды патрабуюць, каб лепш рабілі. На гэта розныя ўстаноўкі ёсць, мабыць, чуў.

Гаўрыленка:

— Чаму ж не чуў? Кожны дзень па радыё трубяць,

у газетах пішуць, напрыклад, там-та і там-та брыгада ці змена працуе як у адзін кацёл, ну, словам, на вынік. Гэта і ёсць тое новае, Кузьміч?

Стрынадка:

— Але.

Гаўрыленка:

— Яно, можа, гэта і добра для гультаёў, толькі нам не падыходзіць. Мяркуй сам, Кузьміч. Адзін робіць, аж жылы лопаюцца, другі палец аб палец не ўдарыць, і ўсё ў адзін кацёл? Не, нашы хлопцы нізашто на такое не пойдуць. Ды хто ета згодзіцца ад свайго куска адарваць і некаму даць? Ды той жа Іван, якім мы не нахвалімся вышэйшаму начальству. Ён сваё зарабіў, яму яго аддай. Не, мы лепш будзем рабіць, як рабілі. А то напляцеш кашоў, не разбярэшся. Чуў яшчэ, моду займелі, адзін прапітрафіцца, а адказнасць нясуць усе. За што, спрашваецца, Кузьміч!

Стрынадка:

— Ну, Хведаравіч, калі казаць, што нехта будзе адрываць ад свайго кавалка, дык гэта не так. Тут улічваецца, які зрабіў уклад у агульнае. Колькі зарабіў, столькі і атрымлівай. Але ж ужо адказнасць за работу калектыўная, гэта лічыцца, што калектыў выхоўвае. Але я табе скажу, у гэтай справе яшчэ не ўсё ясна. Можа, адпадзе яно, не пакажа сябе. Я з табой згодзен, спяшацца не трэба. Але, калі нам навяжуць адтуль (падняў угору палец) сваю волю, дык не адкаснешся, змірышся. Таму пакуль і я думаю, што не трэба хлопцам забіваць галаву рознымі думкамі, не трэба іх бударажыць. І нават калі змусяць нешта мяняць, дык мы ў лесе. Ці бачыў ты, каб хто з вялікага начальства наведваў дзялянкі? Не бачыў. Прыедзе, знойдзем дзе і як прывеціць, што сказаць. Тут галоўнае, як я заўсёды кажу, — план. Ёсць план — усё ёсць.

Гаўрыленка:

— Слухаю я цябе, Кузьміч, і радуюся, што ты ў нас кіруеш, а не хто іншы. Падабаецца мне, скажу шчыра, што ты думаеш, каб лепш рабочаму чалавеку было. А гэта, ведаеш, многае значыць. Скажам, ты дай мне добра зарабіць, добра жыць, хіба я цябе падвяду? Ніколі. Галоўнае, каб між намі паразуменне было. А хлопцам і сапраўды няма чаго галаву дурыць рознай непатрэбшчынай. Вось толькі прыехалі і адразу, як пішуць у газетах, уключыліся ў вялікую бітву.

Стрынадка:

— Ну?

Гаўрыленка:

— А што ты думаеш, Кузьміч? Доўга ўмеючы. Думаеш, пагрузчыкі яшчэ не прыйшлі, дык будзем сядзець склаўшы рукі? Не, Кузьміч, як кажуць, не першы год замужам. Вучаныя. Сёе-тое кумекаем. Раней, калі не было пагрузчыкаў, як грузілі? Было, рукамі каталі бёрны на прычэпы. Ну, тады хлыстамі не вазілі. Потым, як на хлысты перайшлі, як МАЗы ў нас з'явіліся, з чаго пачалі? З эстакад. Натралюеш лесу да эстакады, падгоніш упрытык машыну, насупраць паставіш трактар, спусціш панцыр, тросам падчэпіш ладнае бярэмя, круці лябёдку. Два-тры ахапкі — МАЗ. Пагрузчык што, цыркае па два-тры хлысты, адно час марнуеш. Але ж лічыцца, што пагрузчыкам дзешавей, прагрэсіўней. Дзешавей-то дзешавей, толькі марудна. Час губляем. Ды і каму дзешавей? Нам менш. Мы і ўхітраемся пісаць на пагрузчык, а грузім з эстакад. Але пікні каму, адразу норму завысяць.

Стрынадка:

— Ну, Хведаравіч, мне гэта няважна, як вы грузіце і чым. Ты мне хоць па хлысту грузі ўсе васемнаццаць кубоў, хоць трактарам, хоць пагрузчыкам, калі справа ідзёць, я гэта не бачыў. Мне трэба, каб гэты хлыст не гніў на дзялянцы, а ў той жа дзень, як спілуюць, быў на ніжнім складзе, каб яго там апрыходавалі. І твая справа, што тут робіцца. Вынік канчатковы мне патрэбен, з-за яго з мяне могуць скуру садраць. Ну, а калі мне дадуць прачуханца, дык і табе не здабраваць, пакуль не зразумееш, што ад цябе патрэбна.

Гаўрыленка:

— Гэта можаш, Кузьміч, мне не гаварыць, ведаю. Таму і кажу, не хвалюйся.

Усё гэта, незнарок пачутае Міцькам, цяпер круцілася ў яго галаве. Многае яму было незразумела, і здавалася, што між начальнікам лесаўчастка і майстрам вялася нейкая гульня, але яны ведалі якая, і скончылася яна поўнай згодай. І яшчэ незразумела, ці мае гэта якія адносіны да яго, Міцькі Кавалька. Яму ж таксама працаваць тут, з гэтымі людзьмі, і, відаць, падпарадкоўвацца ўсяму таму, чаму падпарадкоўваюцца яны.

Як і абяцаў Гаўрыленка Стрынадку, надвечар нагрузілі спачатку адну, затым другую і трэцюю машыны.

Міцька бачыў, што першы МАЗ вёў Васіль Чубацюк. Машына, натужна равучы, кідалася з боку ў бок, віхляў яе доўгі прычэп між пнёў, месцамі наогул рэбры пратэктараў грызлі паваленыя дрэвы, пакідаючы на слізкай асінавай кары пісягі, і Чубацюк нібы не сядзеў за рулём, а стаяў у кабіне, нахіліўшыся да ветравога шкла, на руль, яму як не выкручвала рукі.

Па ўсім было відаць, што весці машыну ад эстакады да дарогі няпроста, бо пад'езда яшчэ няма, тут трэба шафёру быць пільным.

Міцька ніколі не думаў, што шафёру можа быць так цяжка. На лесаўчастку заўжды лічылася, што вадзіцелі — гэта ўжо людзі на парадак вышэй, чым проста лесарубы, трактарысты, вальшчыкі, чыкіроўшчыкі, бо і рабілі яны лягчэй, і лепш апраналіся. І павага да іх большая.

Урэшце Чубацюк выехаў з дзялянкі на дарогу, спыніў машыну. Не выключаючы рухавік, падышоў да Стрынадкі і Гаўрыленкі.

— Не заснеш за баранкай? — гледзячы яму ў вочы, нібы жартуючы, сказаў Стрынадка. — Да месца піліць гадзіны дзве, пакуль разгрузішся, ноч на дварэ. А назад?

— Хазяін, — сказаў Чубацюк, — глядзі, каб ты сам не заснуў за рулём, як будзеш ехаць у Сасноўку. Я не засну. І што за пытанне? Нібы ты мяне наняў на цябе рабіць?..

Міцька бачыў, як Гаўрыленка пры гэтых словах ледзь не ўрос у зямлю, сцяўся, залыпаў вачамі, ледзь не прастагнаў:

— Ды як ты з кіраўніком гаворыш? Адумайся, Васіль!

Васіль глянуў на Гаўрыленку, потым на Стрынадку, цвыркнуў слінай пад ногі:

— Ну, Хведаравіч, можа, для цябе Стрынадка нешта і значыць як кіраўнік. А мне ён — чалавек, які недзе нашкодзіў, а цяпер вызгаляецца. Якое пытанне, такі даю адказ... — І, звяртаючыся ўжо да разгубленага Стрынадкі: — Ты старых можаш купіць. Яны свой рубель о як у руках трымаюць, за яго пойдуць куды хочаш, але, павер, да мяжы, калі ж за ёй рызыка — не. Але спадарства кінь. У справе ніхто з нас, маладзейшых, цябе не бачыў. Мы іх дзеці, яны нам сваё тыркалі: грошы, грошы, а аказваецца, ёсць іншы свет, іншыя паняцці, дзе гэтым нічога не вымяраецца. Не дзеля цябе робім, Кузь-

міч, маніпуляцыі свае кінь. Незразумела, дапаможам зразумець. А за мяне не бойся, там, на ніжнім складзе, пераначую. Не першы раз. Ды ці толькі мне. Вы ж — насарогі, вас не прабіць... Ды што казаць. А ты, дзядзька, як прыедзеш у пасёлак, скажы маёй Фені, што магу заначаваць у горадзе. Не забудзь, трывожыцца будзе.

Васіль павярнуўся, заспяшаўся да машыны, і калі крануўся, Гаўрыленка, ходзячы вакол Стрынадкі, зазіраючы таму ў твар, сказаў:

— Во, смаркач! Узамніў сябе, уперад бацькі лезе ў пекла. Слова яму не скажы! Бач, ён бы кіраваў! Ды бачылі мы такіх ранніх ды бясплодных. Яго ж, Кузьміч, сцерці ў парашок, раз нам плюнуць!

— Не чапай, Хведаравіч, менш паху будзе, — сказаў Стрынадка, думаючы пра нешта сваё. — Яны цяпер паймелі моду ісці ў наступ, усё ім здаецца не тое, усё ім не так.

## 7

Васіль Чубацюк яшчэ раніцою, выязджаючы на Убалацце, ведаў, што сёння дадому начаваць не прыедзе. Жонцы, Фені, ён не сказаў пра гэта, нагадаў толькі, што пераязджаюць з дзялянкі на дзялянку, і калі трэба будзе, то ён, вядома ж, затрымаецца.

— Сам глядзі, — сказала жонка, — няволіць цябе ніхто не зможа. Як трэба, так і трэба.

І цяпер, пад'язджаючы вечарам да ніжняга склада, адчуваючы стомленасць, Васіль разумеў, што не зможа весці машыну ноччу ў Сасноўку. Ён то можа ехаць, але мала што бывае ў дарозе. Лепш, канечне, адпачыць у Панкратаўны.

Ніна Панкратаўна Акулік, вартаўніца ніжняга склада, некалі вясковая жанчына, цяпер гараджанка, добра ведала сасноўскіх шафёраў. Яны паважалі яе, яна паважала іх. Наогул цёпла да іх ставілася. Можа, таму, што былі яны з яе краёў. Яе ж вёска Падрэчча ўсяго ў нейкіх трыццаці вярстах ад Сасноўкі. Падрэчча яна пакінула гадоў пятнаццаць таму і шкадавала і не шкадавала пра гэта.

Ніна Панкратаўна гарнулася да тых сасноўцаў, каго ведала не адзін год, з пачатку сваёй работы тут, а таксама да маладых, хто пачаў працаваць значна пазней,

ужо адслужыўшы армію ці вярнуўшыся з горада ў пасёлак, дзе праблем з жыллём не было.

Часта здаралася, разгрузіўшы лесавозы позна вечарам, паставіўшы іх на пляцоўку далей ад берага, каб не заміналі іншым, сасноўскія шафёры кіраваліся да Ніны Панкратаўны ў невялікую драўляную хатку, якая стаяла на беразе Бярэзіны, крыху воддаль ад эстакад і вузкакалейкі.

Хатка з двума вузкімі акенцамі, што ўглядаліся ў шырокую і ціхую ў гэтым месцы раку, масцілася сярод штабялёў, з нечае ласкі была абнесена калючым іржавым дротам.

Там, калі дзяжурыла Панкратаўна, шафёра заўсёды чакаў гарачы чайнік на пліце, чыстая, аж боязна лажыцца пасля кабіны, пасцель.

Чалавеку, які дзень пасядзіць за рулём цяжкой машыны, гул матора, як бы ты ні любіў дарогу і сваю працу, надакучае, стамляе, іншы раз так, што хочацца ўсё кінуць. Але адпачынак здымае стому, налівае цела бадзёрасцю, асабліва калі ён бесклапотны.

Ніна Панкратаўна таксама рабіла ўчотчыцай на ўчастку, куды прывозілі лес сасноўцы. Яна мела абавязак запісваць хто колькі прывёз кубоў, якой пароды была драўніна, перш чым хлысты раскрыжоўвалі.

Сасноўцаў яна не толькі паважала, але ставілася да іх з той жаночай павагай, з якой можа ставіцца жанчына да людзей, што сваім мазалём зарабляюць свой хлеб.

Ніне Панкратаўне таксама падабалася, што сасноўцы працуюць жадліва, быццам навыперадкі, як некалі пасля вайны сама працавала ў калгасе: усё хутчэй, хутчэй, ці не да бяспамяці. Розніца толькі ў тым, што тады ў калгасе, як бы ты ні рабіў, нічога не зарабляў, адно палачку ў брыгадзірскі сшытак, як тады казалі, колік. Цяпер жа іншае, усе пры грашах.

Яна бачыла, што гэтыя людзі глядзяць тэхніку, як добры гаспадар карову. Крый божа каму з сасноўцаў на разгрузцы кранам памнуць кабіну ці сарвуць крыло, гвалту не абрацца. Таму кранаўшчыкі іх пабойваліся і не любілі. Той-сёй нават адмаўляўся ноччу разгружаць машыны сасноўцаў, прымушаў чакаць светлае гадзіны.

Мужчыны, прыйшоўшы да Панкратаўны, адчувалі сябе як дома. Яны адразу кіраваліся да пліты, бралі чайнік, выкладвалі на стол пры акенцы няхітры харч, які везлі з дому, запрашалі Панкратаўну. Запрашалі шчы-

ра, не для прыліку, маўляў, мая справа запрасіць, твая — падзякаваць ды адмовіцца. Крыўдзіліся, калі Ніна Панкратаўна адмаўлялася, казала, што ўжо вячэрала. Тады шафёры пыталі, ці не грэбуе, і ёй, хочаш не хочаш, даводзілася прытыкацца да стала, пакаштаваць хоць чаго.

Так было, калі дзяжурыла Панкратаўна. Калі ж на пост, як сам казаў, заступаў Карней Карнеевіч, тады да хаткі няма чаго ісці, не пусціць пераначаваць, каратай ноч у кабіне на мулкім сядзенні або вяртайся ў Сасноўку, калі сілы хопіць.

Карней Карнеевіч з «вадзіламі», як ён называў наогул вадзіцеляў, паводзіў сябе строга. Ён усяляк падкрэсліваў, што між імі вялікая розніца: яны — рабсіла, ён — кіраўнік, адзіны тут гаспадар на змене, а астатнія — збоку прыпёку.

Прыходзячы на змену, Карней Карнеевіч мацаваў на слупе ля пляцоўкі, на якой самавольна ставілі машыны сасноўцы, знак, які забараняў стаянку, хаця гэты знак потым прыходзілася шукаць дзе на сметніку ці сярод хлыстоў. Гэта злавала Карнея Карнеевіча, былога сасноўскага ўчастковага міліцыянера, затым работніка дзяржаўтаінспекцыі, цяпер учотчыка ніжняга склада. Яму не было справы да таго, што трэба адпачыць чалавеку, ці вячэраў ён, мае ў чым патрэбу ці не. Іншы раз здавалася, што Карнея Карнеевіча аднойчы завялі на ўсё жыццё, як заводзяць дзіцячую ляльку, на адны словы: «Не паложана, забараняю...»

Васіль Чубацюк не раз казаў Карнею Карнеевічу:

— Калі ты такі разумны, дзядзька, дык чаму шкандыбаеш са сшытачкам у кішэні, а не саступіш месца якой жанчыне?

Карней Карнеевіч хмурыўся, яго густыя чорныя бровы сходзіліся на пераноссі, твар налліваўся чырванню, ніжняя губа пачынала дрыжаць, як адсякаў:

— Зялёны ты мяне яшчэ вучыць жыццю, ясна! Калі я сюды пастаўлены, дык не табой, а людзьмі табе не роўня. Іш, моду займелі, усюды сунуць нос, глядзі, каб не прышчамілі. Ведаю твае шалы на дарогах. Глядзі, сколешся, не забывайся, што я грамадскі аўтаінспектар.

Ён коўзаў руку ў нагрудную кішэню фрэнча, вынімаў адтуль загорнутае ў цэлафан пасведчанне і тыцкаў ім пад нос Васілю.

— Бачу, важная персона, няйнакш, — адступаўся Ва-

сіль, — толькі не пужай мяне гэтым, ты яшчэ схапі мяне за руку, калі правіла парушу, тады ты — закон. А так — пудзіла агароднае...

— Чакай, я табе пакажу пудзіла, — казаў праз зубы Карнеевіч і хаваў пасведчанне.

З аўтаінспекцыяй, вядома, ніхто не хацеў мець справу. Яно, калі захацець, дык, як у анекдоце, можна прычапіцца і да тэлеграфнага слупа. Тут жа тэхніка як ні глядзіш яе, усяго не прадбачыш: то на хлыстах, якія вязеш, сукі абсечаны не так, як трэба, то машына выпацканая ў гразь пасля лесу, то яшчэ якая халера, словам, кожны стараўся трымацца далей ад Карнея Карнеевіча.

Панкратаўна, заўсёды спакойная, ціхмяная, з мяккімі рысамі твару, абрысы якога выдавалі, што некалі яна была пекнай жанчынай, іншы раз пярэчыла Карнею Карнеевічу. Аднойчы заспетыя ноччу сасноўскія шафёры Трафім Лук'янаў, Ігнат Печань і Васіль Чубацюк начавалі ў хатцы. А раніцою чамусьці раней тэрміну на змену прыйшоў Карней Карнеевіч. Убачыўшы мужчын, якія спалі ўпокат на падлозе, пачаў крычаць.

— Чаго вы будзіце хлопцаў? — сказала Панкратаўна. — Дзе ім было дзецца? Стаміліся ж...

Васіль Чубацюк, калі да яго падышоў Карней Карнеевіч і пачаў шморгаць за рог коўдры, спрасоння слаба адмахнуўся ад яго, як ад назолы. Тады Карней Карнеевіч наогул здзёр з яго коўдру і кінуў у кут. Дзе і падзеўся сон! Васіль падхапіўся, схапіў Карнея Карнеевіча за каўнер, выштурхнуў за дзверы.

Пасля гэтага ніхто ўжо не спаў, Карней Карнеевіч ускочыў у хатку, зароў:

— Вон!..

— Суніміцеся, Карнеевіч, — слаба папрасіла Панкратаўна, — вы ж не сабак выганяеце...

Мужчыны таксама такога не сцярпелі.

— Нехарошы ты чалавек, Карнеевіч, — сказаў Трафім, мужчына прыкладна Карнеевічавага ўзросту, заўсёды спакойны, разважлівы. — Лезеш да людзей сляпіцаю, нібы хто табе дарогу перайшоў ці не аддае доўг. Гэта ты на былой пасадзе мог намі круціць, як хацеў, дзе трэба і дзе не трэба дзіркі ў талонах прабіваў, калі не тыцнеш табе ў лапу рубель-другі. Няўжо не разумееш, што ўсё гэта мінулася, што ты такі ж, як і мы?

Пачуўшы такое, Карнеевіч збялеў, быццам яму пэц-

нулі па твары квачом, памочаным у меле. Ён аж затросся, падскочыў да Трафіма і, гледзячы паўз яго ў акно, завішчэў:

— Вось яно што!.. Ты чаго напрасліну вярзеш, а?.. За паклёп я цябе ў суд павалаку!.. Ты мне даваў?

— Не павалачэш, — спакойна сказаў Трафім, — даваў, ты хіба забыўся? І не адзін раз. Памятаеш, адзін раз, калі хуткасць перавысіў, бо як у каршэнь таўхалі: давай, давай, давай... Другі раз...

Карнеевіч не даў яму дагаварыць:

— Паклёпнік! Дакажы! Хто бачыў? Не браў я ў цябе, ды наогул ні ў кога не браў!

— Браў, браў, дзядзька! — умяшаўся Васіль. — Аднойчы, памятаеш, хацеў на маім горы рукі нагрэць?.. Ну прыпомні, калі я перакуліўся ў Баравіцы? Ты тады яшчэ страшыў мяне, што мне за разбітую машыну з турмы не вылезці... Вось я не даў. На цяперашні розум я б табе даў! Ладна, справа мінулая, і ты вінаваты, і тыя, хто даваў, таксама. Але ж ты сябе так паставіў, што хачу, тое раблю, няма на мяне ўправы. Бач, падпанак, аброк збіраў...

— Ну, вы ў мяне яшчэ папомніце! — Карнеевіч пагразіў кулаком і вышмыгнуў з хаткі.

Панкратаўна, моўчкі слухаючы гэта, азвалася:

— Дарэмна вы так, хлопцы. Яй-бо, адпомсціць. Ну, пакрычаў бы, сышла б пара, на тым і скончылася б. Цяпер і мне жыткі ад яго не будзе.

— Ды махні, Панкратаўна, на ўсё рукой, — паспрабаваў супакоіць яе Васіль. — Хай паспрабуе цябе зачапіць, начальству паскардзімся.

— Баронь бог! — замахала яна рукамі. — Скажуць, што я пляткарка, наогул са свету зжыве. Я ж неяк на сходзе сказала, што трэба нейкі домік зляпіць спецыяльна для адпачынку шафёрам, дык мне рот заткнулі, маўляў, без цябе ведаем, што трэба, што не трэба. Ніжні склад тут, а не дом адпачынку, і калі кожны пачне назаляць, то парадку не будзе.

— Ну, калі так, — Васіль пачухаў патыліцу, — трэба нешта думаць... Чакай, табе, цётка, пенсію нейкую даюць?

— Нейкую. Пражыць можна.

— Дык звальняйся адсюль, думаю, за свой век нарабілася, адпачні.

— Але, Васілёк, лёгка сказаць звальняйся, — заківа-

ла галавой Панкратаўна, — сам мяркуй, ці лёгка аднаму сядзець у чатырох сценах дзень пры дні? Каб жа я ў сваёй вёсцы жыла, дык занятак знайшла б. А тут я і такім месцам даражу, хто мяне куды возьме?.. Тут я з людзьмі. Прыйду на змену, таго сустрэну, гэтага, вас прывечу, і радасна мне, і добра, здаецца, больш нічога не трэба. Я ж прывыкла, во, едзе хто, стаю на беразе і здалёк пазнаю, чыя машына, хоць яны ў вас аднолькавыя, як блізняты.

Сасноўцы ведалі, што ў горадзе Панкратаўна жыве адна. Але ў яе асабістае жыццё ніхто не ўнікаў: ці былі ў яе дзеці, муж, сям'я? Навошта лезці ў душу чалавеку, калі ён сам гэтага не хоча, пра гэта гаворкі не заводзіць? Але тое, што яна нямала перажыла, можна было пазнаць па твары, знешне спакойным і баязліва-трывожным, калі чынілася несправядлівасць ці абраза над кім у яе прысутнасці. Калі пры ёй сварыліся, Панкратаўна старалася адысці далей, не ўмешвалася.

— Ну, калі так, дык трэба цябе адсюль забраць наогул, — сказаў Васіль. — Што ты тут пяклуешся, прыніжаешся?

— Аксціся, Васілёк, куды ты мяне забярэш? У велькі свет?

— А хоць бы і ў свет! Да нас ў Сасноўку. А што? Хутка мая Феня ў дэкрэт ідзе. Так? Так...

Васілёва жонка Феня кухарыла на дзялянцы, пра гэта Панкратаўна чула. Чула, што з-за яе, адслужыўшы армію, Васіль застаўся ў пасёлку, з-за яе біўся з хлопцамі на танцах і нават аднойчы ледзь не скруціў галаву, перакуліўшыся з машынай. Сасноўскія шафёры іншы раз, адпачываючы ў хатцы, казалі, што Феня накінула на Васіля аброць, так зацугляла, што яго як падмянілі, а Фені той — кнапулька, на адной Васілёвай руцэ спаць можа.

— Дык ты хочаш, каб я пайшла на яе месца, каб варыла ў лесе? — спыталася Панкратаўна.

— Чаму не?

— Айт! — адмахнулася яна. — Знойдзецца на гэта якая пасялковая жанчына.

— Не дужа знойдзецца. Ты, цётка, не ведаеш нашых жанчын. Яны табе рабіць у лес не пойдуць. Яны хаты пільнуюцца. А што? Сама мяркуй. Мужык дзень, з раніцы да вечара, на дзялянцы, а то і тыднямі ў камандзіроўцы дзе. Яму жончыны капейкі, што яна заробіць, ра-

дасці не даюць. Яму трэба, каб дома парадак быў, каб дзеці былі дагледжаны. А ў каторага іх як насыпана, расадзіка няма ў нас. Распанелі нашы жанчыны. Гэта раней было, жанчыны рабілі нараўне з мужчынамі ў лесе. І валілі яго, і сучча абсякалі, і бёрны на прычэпы каталі. Яно, зразумела, бедна жылі тады, будаваліся, трэба ж было неяк круціцца. А цяпер, гадоў дзесяць, як пабагацелі, няма патрэбы, каб жанчына ў лесе пеклавалася. Так што дарогу, цётка, ты нікому не пяройдзеш. І ездзіць табе з горада не трэба будзе, у нас ёсць інтэрнат, калі хочаш. Калі не, у мяне жыць будзеш. Хата вялікая, хоць у футбол гуляй. Ну, вядома, лета парабіла б, зімой у горадзе сядзела б, у сваёй кватэры. У нас жа — курорт.

І хаця Панкратаўна нічога наконт гэтага пэўнага не сказала, Васіль палічыў, што яна згодна. А яна пасля таго пачала баяцца, што ён і сапраўды некалі прыедзе сюды, уварвецца ў хатку, гэты ўзвей-вецер, і забярэ ў Сасноўку, дзе яна, акрамя шафёра, нікога не ведае. Баялася, нібы цяпер яе лёс залежыў толькі ад Васіля. Ёй хацелася, каб ён забыў іх гаворку, цешыла сябе надзеяй, што Карнеевіч паступова перастане да яе чапіцца, забудзе ўсё. А можа, нават ён хутка звольніцца, казаў жа неяк, што вызваляецца пасада ў выцвярэзніку, нібы таварышы абяцалі зноў уладкаваць у міліцыю.

Але Карнеевіч не на жарт на яе ўз'еўся, да ўсяго прыдзіраўся, рабіць тут далей стала немагчыма.

## 8

Правёўшы поглядам першую машыну, якая пайшла з хлыстамі на ніжні склад, Міцька пацёгся да парэма. Ішоў ён цяжка, нібы яму ўзвалілі на плечы неймаверны груз, з якім не пабяжыш, які згінае цябе, стараецца паваліць.

Ён яшчэ не ўсвядоміў, адкуль і чаму такая цяжкасць на душы, не ведаў, ад каго чакаць дапамогі.

Парэм стаяў на той бок дарогі, на невялікай палянцы сярод арэшніку, бліжэй да лугу. Дарога, па якой сюды прыехалі, з гэтага боку, дзе стаяў парэм, была парослая абапал крапівой і старым маліннікам. Яна падзяляла лес на дзве часткі. З правага боку, дзе цяпер распачалі дзялянку, быў стары, нерастаялы лес, парослы густа маладняком. Стары лес, на добры лад, даўно трэба было

паваліць, каб захаваць маладняк. З левага боку, дзе цяпер кусціўся арэшнік, была нізіна, лес тут спілавалі гадоў дваццаць назад, знішчылі маладняк. Драўніну вывезлі, але дзялянку не падчысцілі, пакінулі лаўжы, пні не выкарчавалі, пасадку не зрабілі. Лес не знайшоў сілы, каб аднавіцца, лаўжы пагнілі, пні струхнелі, усё спачатку зарасло малліннікам, крапівой, потым тут на грудках закусціўся арэшнік, які таксама да гэтага часу састарэў. Відаць, лесу сапраўднаму тут ніколі не адрадзіцца, у каго дойдуць рукі, каб высекчы арэшнік, хто цяпер будзе рабіць тут пасадку, калі лясніцтва не паспявае за лесарубамі і па некалькі гадоў не садзіць маладняк на былых дзялянках? Валяць жа цяпер вунь якой сілай, якой тэхнікай, а садзяць некалькі леснікоў, у якіх адзін трактар, ды і той спісаны. Ён не столькі цягае плуг, каб нарабіць баразёнак, у якія можна садзіць расаду сасны ці елкі, колькі прастойвае. Ды цяпер і карчы ніхто не рве аманалам. Гэта раней ірвалі, збіралі карчы, везлі на смалакурню, засыпалі яміны, садзілі лес на чыстым. Адышло, можа, няма ад гэтага выгады.

Летась Міцька бачыў ля Чорнага бору, з якога раней не было вынасу баравікоў, як на вялізнай, бы аэрадром, дзялянцы школьнікі мечыкамі дзяўблі зямлю, усаджвалі ў лункі маленькія, па пальчыку, сасонкі. Здавалася, зялёны дыванчык пакрывае шэрую зямлю. Але за лета так і не пакрыў поўнасцю, не хапіла ў дзяцей сілы. І сёлета бачыў, баразёначкі пачарнелі, распоўзся пясок ад снегу і дажджу, сасонкі не прыжыліся, пасохлі. Мабыць, так ёй і зарастаць травой, гэтай дзялянцы.

Тут, на лесапавале, столькі розных машын, што яны ўмэнт могуць спляжыць невядома колькі лесу.

Думкі думкамі, але ж ёсць у Міцькі цяпер абавязак, ён мае афіцыйнае дачыненне да ўсяго, што робіцца на дзялянцы, яму загадана ўпарадчыць «увераную гаспадарку», запомніць, дзе што ляжыць, як захоўваецца.

Так даводзіў яму Стрынадка яшчэ на старой дзялянцы, і Міцька зразумеў, што нясе вялікую адказнасць, можа быць, не меншую, чым за статак, як быў пастухом. Там жа што можа быць? Ну адаб'ецца ад статка карова, заначуе ў лесе, дык назаўтра па ўчарашніх слядах пагоніш статак, сама выйдзе да яго, знойдзецца, не было выпадку, каб загінула, калі не лічыць яго Рагулю. Дык жа то было пасля вайны, яна ўшчаміла нагу ў корч, як у пастку, а так бы... А тут жа матэрыяльныя каштоў-

насці, усё дзяржаўнае, калі што, як зразумеў Міцька, ніхто з ім цыркацца не будзе.

Ён мусіў сёння застацца начаваць у лесе, хоць і не рыхтаваўся да гэтага. Лесу ён не баяўся і ноччу. Бывала, не раз начаваў пад якой елкай або ў капе і ніякага страху не адчуваў. А тут, у парэме, лацвей начаваць: хай дождж ідзе, хай холадна на дварэ — сцены ёсць і страха над галавой. Ды і хто сюды пойдзе? А калі і пойдзе, толькі гэтай дарогай, абавязкова ля парэма, бо далей рэчка, навокал балоты, гэта ўжо трэба вельмі добра ведаць лес, як ведае яго Міцька, каб падступіцца да дзялянкі якім іншым шляхам.

Разважаючы так, Міцька прыняўся агледаць сваю гаспадарку.

## 9

Змітро Кавалёк, Міцька, як яго звалі ў пасёлку, заступаў на дзяжурства звечара. Днём ён адпачываў дома, корпаўся на двары, работа заўсёды знаходзілася: то плот падладзіць, то грады папалоць, то яшчэ што, і калі не было клопату па гаспадарцы і ён не мог знайсці сабе хоць які занятак, пачынаў думаць пра лес, тады сэрца агортвала неўладкаванасць і няўпэўненасць. Ён не прывык летам днём сядзець склаўшы рукі, яму трэба было пра нешта клапаціцца. Лічы, усё свядомае жыццё летам хадзіў за статкам, ні табе выхадных, ні прахадных, як кажуць.

Цяпер летнім днём тут, у Сасноўцы, яму паступова нібы адкрывалася другое, невядомае людское жыццё. Вуліцы гулі ад дзіцячых галасоў, чулася часам сварка жанчын, трэск матацыклаў, на якіх па вуліцы гойсалі падлеткі, заганяючы пад платы сабак і курэй, стукі тапароў ля якога падворка, музыка з магнітафонаў.

І ён паступова нібы прывыкаў да гэтага жыцця пасёлка, яго гукаў, усё, што ён бачыў, радавала, цешыла і замілоўвала, але разам з тым ён не вельмі шкадаваў, што столькі гадоў быў як аддалены ад усяго гэтага, і як бы добра пра ўсё ні думаў, лес вабіў па-ранейшаму.

Ужо ў другой палове дня, бліжэй к вечару, ён пачынаў трывожыцца, не знаходзіў сабе месца. Раней, ганяючы статак, ён ніколі не браў з сабой у лес вады. У лесе былі крынічкі, ручаіны, з якіх заўсёды натоліш смагу. Цяпер жа, як пачалі лесапавал у Лясках, вада ў ра-

чулцы заплыла бензінавымі тлустымі плямамі, яе нельга было піць. Міцька ўжо колькі дзён мусіў браць ваду з калодзежа, які быў ля Іванавага двара, але ніяк не мог уцяміць, чаму яна раптам стала патыхаць тванню, калодзеж з кожным днём мялеў, і сёння чарэпнуў вядром, выцягнуў рыжы пясок і не больш як карэц вады. Дні стаялі парныя, і ён, яшчэ нічога не разумеючы, падумаў, што вада высыхае, бо дужа горача. Вады ён так і не набраў, прыхапіў зрэбную торбачку, паклаўшы ў яе шматок сала, хлеб, гуркі, заспяшаўся на лесаўчастак.

У такі час мала каго сустрэнеш, адно слесараў ды канторшчыкаў, на якіх Міцька не зважаў, яны на яго таксама. Ён садзіўся на лавачку ля варот машыннага двара, чакаў, пакуль з'явіцца Ляксей Сакадынец.

Ляксей звычайна выязджаў на дзялянку а шостай гадзіне, калі яшчэ, здавалася, вечар і не гарнуўся, высока стаяла сонца над борам, які з захаду браў пасёлак у паўкруг.

Але ў такі час Міцька ўжо адчуваў вечар: пыл, як праедзе па двары машына, асядаў хутка, доўжыліся цені ад ліп, штораслі вакол канторы, у зеляніну бору ўпляталіся тонкія жаўтаватыя стужкі, ды і неба спакваля там, на захадзе, бралася лёгкай чырванню.

Хоць, здаецца, летні дзень бясконцы, але спяшацца трэба.

Міцька, дачакаўшыся Ляксея, сказаў:

— Ты, Ляксей, пра мяне не рупся. Едзь сабе адзін, а я напрасткі, праз лес пайду. Ат, прывык во хадзіць, мне так зручней. Толькі, калі прыпазнюся, скажы, каб хлопцы пілы паставілі ля парэма, я мігам.

— Дзівак ты, Змітро, — казаў Ляксей, — за свой век не нахадзіўся... Скажу ўжо, тэпай, тэпай...

І Міцька спяшаўся на дзялянку вядомымі яму сцежкамі, праз лес, балаціны, рачулкі. Бывала, апераджаў Ляксея, які ехаў дарогаю, даваў нават круг кіламетраў у пятнаццаць, а Міцька напрасткі, вёрст пяць.

Тады мужчыны смяяліся:

— Адна чалавечая сіла абагнала паўсотні конскіх. Лёша яшчэ едзе недзе, а гэты ўжо тут.

Міцька прымаў пілы, тапары, каскі, усё зносіў у парэм, потым ішоў глядзець, дзе хто пакінуў трактар. Звычайна трактары пакідалі там, дзе рабілі, па ўсёй дзялянцы, каб назаўтра, не марнуючы час, чалавек мог адразу працягваць рабіць, дзе рабіў учора.

Ходзячы па дзялянцы, Міцька прыкмячаў, што то ў адным, то ў другім месцы, далей ад каляін і эстакад, ляжаць скіданыя ў штабялі метроўкі бярэзніку, грабу, дубовыя слупкі, былі яны нібы прыхаваныя: то голлем прыкіданы, то ў кустах.

Пра гэта яму ніхто нічога не казаў, ні самі лесарубы, ні Гаўрыленка, і Міцька разумеў, што ўсе гэта ведаюць, бачаць. Хаця б той Гаўрыленка. Ён жа за дзень дзялянку і так і сяк сходзіць, начальнік жа, а маўчыць. Значыць, меркаваў Міцька, ёсць дазвол. Ды і праз дзень-два ўсё гэта знікала, вывозілі днём, а без дазволу Гаўрыленкі гэта не зробіш. Ноччу ж ніхто не прыязджаў, а калі б і прыехаў, то Кавалёк павінен быў праглядзець паперкі: што выпісана, калі ласка, бяры, не — павароч-вай, гані назад.

Здаралася, што Міцька пазніўся, прыходзіў на дзялянку, калі Ляксей ужо забраў лесарубаў. Тады Міцька глядзеў інструмент, які лесарубы пакідалі ля парэма, зносіў яго куды трэба, заўсёды ўсё было на месцы.

Неяк Міцька прыкмеціў, што бліжэй да рэчкі, да бабрынай плаціны, на невялікім астраўку — вакол яго вада па калена — у траве ляжаць спілаваныя, абсечаныя ладныя дубкі, акурат на ніжнія вянцы зруба. Крыху воддаль якраз рабіў Іван Сідорын і яго памочнікі — вальшчык Валодзя Згібень і Юрка Шыкун. Дубкі ляжалі некалькі дзён, Міцька думаў, што вось зваліліх хлопцы, пакінулі на астраўку ды і забыліся. Міцька падышоў да Івана, які, заглушыўшы трактар, корпаўся ў маторы, сказаў:

— Ці ета, Іван, вы будзеце браць тыя дубкі, ці гнісці ім там?

— Якія? — выпрастаўся Іван і ўставіўся на Міцьку.

— Ды вунь тыя, на астраўку.

— А... — нібы абудзіўся Іван, — а што? Хай ляжаць, можа, хто сабе спілаваў, ды нявыкрутка з машынай, каб забраць. Што табе ці мне да гэтага? Не ля эстакады ж.

І чамусьці зарагатаў, без прычыны, неяк прымусова, доўга тручы брудным кулаком правае вока.

— Паўлавіч, я так думаю, — сказаў Міцька, калі той супакоіўся, — трэба ж майстру сказаць. Дубкі добрыя. Калі пакінуць іх гнісці, то навошта было зразаць? Хай бы раслі. Каму заміналі?

— Кажу табе, мусіць, некаму патрэбны. Можа, хто выпісаў лясніцкі, а можа, наш. А ты ідзі, ляпні майстру.

Калі хто выпісаў, атрымаецца, нажывеш сабе ворага сваімі падазрэннямі, падумай, што пра цябе скажуць. Калі хто так зрэзаў, дык, не бойся, без мяне забіраць не будзе, я ўбачу. Самі разбярэмся. Што ж, па-твойму, чалавека за нейкія дубкі за краты кінуць? А калі ў яго дзеці, калі ён будуецца і няма за што выпісаць?.. Тут, Мітрый, секчы з пляча не трэба, тут справа тонкая. А ты ўжо адразу ў капыл. А не забярэ, будзем канчаць дзялянку, зацягну на эстакаду...

— Як хочаш, — згадзіўся Міцька, разважаючы, што без Гаўрыленкі днём іх ніхто не забярэ, а ноччу ўжо, калі што, дык Міцька не дасць. Ды іх яшчэ трэба вытраляваць адтуль, перш чым пагрузіць.

Нешта, ідучы да парэма, Іван сёння дужа добры быў. Хто яго ведае, разважаў Кавалёк, можа, ён заўсёды так да мяне ставіўся, а я проста напрасліну думаў, бо недалюбліваю яго. Вунь уладкаваў жа на працу... Тут як сказаць.

Лесарубы паехалі, Міцька пра дубкі хутка забыўся, хапала яму клопату.

## 10

Праз тыдзень між Міцькам Кавальком і Іванам Сідорыным выйшла няўладка. Ніхто з лесарубаў не зразумеў чаму, і яны, занятыя сваёй справай, не заўважылі, з чаго пачалося.

Агледзеліся, як пачулі ля парэма лаянку і ўбачылі валтузню. Сухі, як таранка, нізенькі Кавалёк трымаў загрудкі намнога маладзейшага, моцнага Івана, той круціўся вакол яго, стараючыся пацэліць кулаком Міцьку ў твар.

Пакуль, пакідаўшы пілы, тапары, мужчыны беглі да іх, Міцька крутнуў Сідорына так, што той ад нечаканасці асеў на мокрую ліпкую зямлю і, як рыба, выкінутая з вады, хапаў паветра.

Міцька, адчапіўшыся ад Івана, не ўцякаў, стаяў побач, цяжка лыпаў вокам, нешта хрыпеў, але слоў нельга было разабраць.

Пакуль мужчыны да іх дабеглі, Іван ачомаўся, цяжка ўзняўся з зямлі, нервова абтрос з зашмальцаванага, закарэлага камбінезона ліпкае леташняе лісце, павёў галавой, потым, нібы ад чаго адштурхнуўся, застагнаў і наляцеў на Міцьку.

Кавалёк не ўхіляўся, стаяў як і стаяў, а Іван добра-такі садануў яму пад дых. Міцька ўпаў, высока задраўшы ногі, знерухомеў на стаптанай ботамі траве.

Сярод лесарубаў здаралася ўсякае. Было, сварыліся між сабой з-за чаго, лаяліся, абражалі адзін аднаго, але рукам волі не давалі. Неяк самі ўціхамірваліся, мірыліся.

Міцька яшчэ не паспеў з зямлі падняцца, а Іван ужо зноў набычыўся.

Мужчыны павіслі на Іванавых руках, стараючыся адцягнуць яго далей ад Міцькі, але той ці сапраўды слаба вылузваўся з іх моцных абдымкаў, ці яго нешта ўтрымлівала, пацішэў быццам.

Кавалёк жа, калі памкнуліся яму дапамагчы, бліснуў на мужчын вокам, адмахнуўся рукой, узняўся сам.

Выгляд у яго быў такі — толькі шкадаваць, нават не разбіраючыся, хто тут вінаваты. Рэдкія Міцькавы сівыя валасы растрапаны, на яго левай, высахлай шчацэ, зрэзанай жылкамі, дрыжала сляза.

— Я вас, туды вашу качаргу, — закрычаў, убачыўшы бойку, Гаўрыленка, — сійчас жа разніму! Як шалёныя сабакі! Надумалі на праізводстві адносіны высвятляць. На сваіх межах разбірайцеся. Тут жа калекціў, людзі!

Ні Міцька, ні Іван на гэта не адказалі, яны цяпер стаялі воддаль, Івана ўсё яшчэ трымалі мужчыны, а Міцька стаяў адзін, зняважаны.

— Яшчэ раз пытаю, што не падзялілі? Маўчыцё? Хочаце, каб Стрынадка даведаўся?

— Хведаравіч, кінь гэта! — сказаў Ляксей Сакадынец. — Адразу ўжо і Стрынадка! Можа, дурэлі, самі разбяруцца.

— Ага, дурэлі, — прахрыпеў Іван. — Я, панімаеш, па твайму загаду падчапіў бабрыную гляюху, каб вада сышла, каб дубы аслабаніла, іх жа па вадзе не возьмеш, а ён прама пад нож прыг з кустоў, як заяц. Я ледзь паспеў спыніць трактар, а так што, турма мне была б. Я з кабіны і да яго, а ён вылупіў бязік і давай, акурат вятрак, махаць рукамі. Панімаеш, я да яго па-чалавечы, а ён мне ўпоперак дарогі. Бабра, панімаеш, яму шкода. Цэл будзе твоі бабёр, пакуль каму на шапку ці на каўнер не трапіць. Знойдзе ён сабе месца, лес вялікі, гнілаводу хапае, панімаеш, развялося гэтай крысы, ні спілаваць лёс з-за яе, ні вытраляваць... Ды хто ён такі?

Іван зноў тузануўся да Міцькі, але слаба, мужчыны зноў падхапілі яго пад пахі. Ён раз'юшана абураўся:

— Ды я столькі парабіў на дзялянках, што яму, вірле, і не снілася... Во насаветаваў на сваю галаву яго ў брыгаду дык насаветаваў.

Апошняе Іван сказаў з робленай роспаччу, нібы адчуваючы сваю віну, што гэта ён уладзіў на работу Міцьку, а той замест падзякі такое вытварае.

Гаўрыленка дапытлівым позіркам акінуў мужчын, нібы пытаўся, што яму рабіць, але тыя маўчалі, мала што разумеючы, сказаў:

— Ты, Кавалёк, не ў сваё не лезь. Гэта я загадаў спусціць ваду. Нам там прыйдзецца лес валіць, а ён затоплены. Ты што — з таго свету зваліўся, не ведаеш, што ёсць такое паняцце, як меліярацыя?.. І запомні, пакуль смецце з хаты выносіць я не буду. Скажу яшчэ, што Сідорын — гэта Сідорын, чалавек вядомы і ў леспрамгасе, а Кавалёк — Кавалёк. Ідзі працуй, а там пабачым...

Кавалёк стаяў моўчкі, насупіўшыся, прыніжаны, пасаромлены, словы майстра як не далятаці да яго, а калі і далятаці, то ён іх, мабыць, не ўспрымаў, не разумеў. Ім валодала пачуццё крыўды. Не за сябе. За гэтых людзей, якія стаяць перад ім і асуджаюць. Ды і сапраўды, хто ён тут такі?.. Можа, не варта было кідацца пад трактар, гэтым рэчку не выратуеш, а шукаць дзе падтрымкі? Толькі дзе? Той жа Стрынадка не стане яго слухаць, калі гэта пярэчыць плану. А дзе ты далей будзеш шукаць праўду?

Цяпер яму здавалася, што ўсе лесарубы заадно з Стрынадкам, Гаўрыленкам, Іванам, для іх усё навокал — мёртвае, лес — драўніна, рака — гнілавод, бабры — каўняры і шапкі... Такая абязлічанасць прыроды пужала Міцьку. Яго аж перасмыкнула ад такой думкі. Абражаны і прыгнечаны, ён павярнуўся і моўчкі пасунуўся прэч, далей ад парэма, ад гэтых людзей, туды, у Ляскі, гіганцкі забалочаны луг, дзе яму нібы пачулася трывожнае, як перад канцом, курлыканне жураvoў.

## 11

Ляскі былі спрадвечным жураўлiным царствам. Гэта — вялізны забалочаны луг сярод лесу, амаль непраходны для чалавека.

З вышыні ён нагадваў гіганцкі чалавечы след, нібы хто ступіў тут, сярод векавога лесу, глыбока ўціснуў яго ў зямлю. Дрэвы тут не раслі, адно адзічэлая трава, пруткая, якую не касілі, ды рэдкія кусты лазняку.

Ніхто не памятае, калі журавы аблюбавалі гэтае месца, але Міцька Кавалёк, які нямала на сваім вяку пабачыў у лесе, ведаў, што больш прыдатнага месца гэтай птушцы не знайсці.

На тым баку лугу, ля яго краю, пятляла рачулка, адзін, процілеглы, бераг якой парос дубняком і бярэзнікам — там было вышэй. Сярод таго лесу было шмат палянак. Там людзі касілі, сушылі сена, ставілі стажкі, бо летам туды праз шматлікія балаціны і ручаі нельга было дабрацца ні канём, ні машынай.

Сена тут было клопатнае, але пахучае, едкае. Трава ўперамежку з сунічнікам, бяссмертнікам і зверабоем, не трава — чай. Цанілася гэта сена вельмі, і не толькі таму, што давалася мазалямі. Пот і мазалі не ўсякі выстаўляць напаказ. Для памяркоўнага чалавека, думаў Міцька, яны заўсёды мера яго працы, як нешта галоўнае, дадзенае ад нараджэння. А вось мазалі хціўца, такога, як Іван, — нешта іншае.

Мінулай восенню Міцька ганяў сюды паіць статак, бо бліжэйшыя да пасёлка ручаіны былі агалены лесапаваламі, перасохлі. Іх рэчышчы і цяпер чарнелі патрэсканым глеем, шчэрыліся карэннем прыбярэжных дрэў, жаўцелі да часу апалым лісцем, ад іх патыхала прэллю і перагноем.

Калі Міцька тады прыходзіў сюды, то здалёк чуў журавлінае курлыканне. Тады яно не здавалася самотным, не заглушала шчэбету дробных птушак, бабрынага цяжкага плёскату ля плаціны, што перагароджвала рэчку, шолаху лісця і шэпту траў. Яно было неад'емным ад таго жыцця, якім наогул жыў тады гэты лес.

Мінулай восенню адсюль у вырай цягнуліся бясконца журавуліныя ключы, ляцелі нізка над лесам, над пасёлкам, усё далей, далей...

У сваім лёце яны, нібы разрываючы ланцуг, мяняліся месцамі, іх цяжка было злічыць. Па паданні — каб і сапраўды чалавек не мог палічыць птушку, сурочыць. А раз не хочуць, каб чалавек ведаў, колькі іх, значыць, баяцца яго, няма ў іх з ім згоды.

Цяпер, калі ён выйшаў да лугу, стаў на яго ўскрайку ў высокай, у рост, пруткай траве і на дзялянцы было

ціха — лесарубы паехалі, — як ён ні прыслухоўваўся, а курлыкання не чуў.

Сонца нізка вісела над краем лесу, і ён быў зверху заліты цяжкаватай, пазелянелай ужо меддзю. Небакрай яшчэ не выдаваў крохкім, толькі спакваля халаднеў, прыціскаўся да лугу. І гэты халадок, здавалася, пакалыхваўся над зямлёй, яго варушыў горкі даўкі дым, што цягнуўся сюды з дзялянкі, асядаў у нізінах, на рачной гладзі, лізаў яе, паступова знікаў.

Міцька глядзеў на лес, рэчку, неба і разумеў, што праз тыдзень-два гэтай прыгажосці тут не будзе. Ён не ведаў па-ранейшаму, як за яе заступіцца, доўга думаў, нарэшце ўхапіўся за першае, што яму прыйшло ў галаву, — знакі!

Так, ля парэма былі скіданы знакі, якія папярэджвалі, што тут нябяспечная зона, валяць лес, заклікалі берагчы прыроду, быць асцярожным з агнём і г. д.

Ён, чалавек малаадукаваны, без сумненняў верыў любому друкаванаму слову. Верыў ён без ваганняў і ў сілу розных лозунгаў і заклікаў, якія аблеплівалі кантору, клуб, грамадскія пабудовы ў Сасноўцы, асабліва спадзяваўся, што найважнейшыя знакі — забараняльныя. Гэта ўжо закон, як сабе хочаш, а яго трэба выконваць.

Меркаваў Міцька так: вось, напрыклад, зважаюць шафёры на дарогах на розныя знакі, убачыўшы іх, робяць так, як знакі падказваюць, значыць, знак — закон. Ну, вось хаця б пры выездзе з лесу на шашу стаіць знак «стоп». Ён сам, Міцька, аднойчы памагаў Васілю Чубацюку грузіць дровы. Назад ехаў з ім у кабіне і быў здзіўлены, што той, выязджаючы на шашу, паглядзеўшы па баках і пераканаўшыся, што на шашы няма машын, усё адно на хвіліну спыніўся.

Міцька тады спытаў, чаго Васіль спыніўся.

Васіль вельмі сур'ёзна ўспрыняў пытанне, доўга тлумачыў, што гэта не мае значэння, ёсць ці няма перашкоды, раз знак патрабуе, трэба спыніцца. Міцька не разумеў, тады Васіль нібы зазлаваў, стрымліваючы сябе, сказаў:

— Калі я шафёр і даражу гэтым, то не павінен закрываць вочы на ўсё, што дапамагае мне зарабляць хлеб. Сёння я не звярну ўвагі на знак, заўтра махну на яго рукой, паслязаўтра, дык увойдзе ў звычку і некалі траплю ў бяду.

Тады Кавалёк у думках пахваліў Васіля за абачлівасць, за сур'ёзныя адносіны да сваёй работы. Праўда, карцела спытаць, ці не навучыла гэтаму Васіля аварыя, у якую ён трапіў ля Баравіцы, але пасаромеўся, палічыў, што пакрыўдзіць.

Ля парэма Міцька ў грудзе знакаў адшукаў той, які заклікаў берагчы прыроду. Гэта хутчэй быў не знак, а плакат, напісаны на бляшанцы: лось пераходзіць дарогу, а ў кустах стаіць чалавек з ружжом. Міцька старанна абцёр рукавом гразь, панёс да дарогі і ўторкнуў плакат на відным, якраз там, дзе звычайна спыняўся аўтобус, калі прывозіў на дзялянку лесарубаў. Затым Міцька адышоўся колькі крокаў назад, нейкі час глядзеў на плакат, аж пацяплела ў душы, падумаў, што гэтым самым ён зрабіў вельмі важнае, што нарэшце прымусіць лесарубаў зразумець: з лесам трэба абыходзіцца асцярожна. А як жа інакш не зразумець, калі той плакат не самаробны, а друкаваны, вядома, гэта ўзгоднена з вялікім начальствам.

12

На наступны дзень пасля сутычкі паміж Міцькам і Сідорыным Васіль Чубацюк меўся забраць Панкратаўну ў Сасноўку. Вечарам яго машыну грузіў Іван і нібы мімаходзь сказаў, што Міцька, яго сусед, якога ўладкаваў на працу, выкінуў на дзялянцы калена, выставіў Івана псялыжнікам. Васіль у падрабязнасці не ўдаваўся, але, ведаючы Міцьку і Івана, быў на Міцькавым баку, сказаў, калі да такога дайшло, мусіць, у Кавалька нешта прарвала, не сцярпеў ён, папрасіў, каб мужчыны на гэта забыліся, бо хутка на дзялянцы будзе чужы чалавек — жанчына, якая дужа чулліва ставіцца да ўсялякіх канфліктаў.

Вечарам Васіль не паехаў на ніжні склад, паставіў машыну на машынным двары, а раніцою выбраўся ў дарогу, ведаў, што Панкратаўна будзе здаваць змену.

Панкратаўна заўважыла яго машыну здалёк, яшчэ ля павароткі, дзе дарога збягае да Бярэзіны і ідзе берагам да склада, убачыла цяжка гружаны лесавоз, які, прыбуксоўваючы, упарта ўгрызаўся коламі ў разлезлую пасля дажджу каляіну, валюхаючыся з боку на бок, кіраваўся да разгрузачнай пляцоўкі. Бачыла Панкратаўна, што машына спынілася пад кранам і Васіль, нават не

заглушыўшы матор, высунуўся з кабіны на падножку, прыкмеціўшы яе, памахаў.

У Панкратаўны ў гэты міг нібы нешта абарвалася ўсярэдзіне, халадок працяў цела, яна хутчэй адчула, чым зразумела, што менавіта сёння ён забярэ яе, бо мужчыны дзён колькі назад казалі, што Феня яго пайшла ў дэкрэтны адпачынак. Так і здарылася. Разгрузіўшы машыну, Васіль падагнаў яе да хаткі. Нічога не кажучы, пачаў рашуча зграбаць бялізну з ложка, вязаць посцілку. Жанчына стаяла разгубленая, не зварухнулася нават тады, калі ён зняў са сцяны невялікае, у самаробнай рамачцы люстэрка, адной рукой падхапіў вузел, другой люстэрка, сказаў:

— Усё, цётка, скончыліся твае пакуты, хадзем!

І яна, падпарадкоўваючыся яго волі, пакорліва пайшла следам, не пярэчыла, толькі ўжо ля машыны нібы абудзілася, спынілася, хацела нешта сказаць, але ён лёгенька падштурхнуў яе ў кабіну.

З такімі людзьмі, як Васіль, Панкратаўна сыходзілася хутка, варта было колькі мінут пагаманіць, хаця была яна сціплая, нібы прыніжаная жыццём. З тымі, хто па сваім службовым становішчы стаяў вышэй за яе, або з грубымі рэдка кантактавала, колькі б іх ні ведала. Панкратаўна тонка адчувала шчырасць чалавечай душы, нават калі яна праяўлялася знешне грубавата.

Яна ведала, што бывае і наадварот: чалавек засыпае цябе лагоднымі словамі, а твар халодны, няма святла ў вачах, і словы ў яго душу не пранікаюць — бо па натуры сваёй такі чалавек няшчыры.

Знешне грубаватым і самаўпэўненым, па-маладому гарачым, бяздумным на першы погляд здаваўся Васіль, але яму яна верыла. Часам ёй здавалася, што яму наогул цесна ў тых абставінах, у тым асяроддзі, дзе ён працуе, ён нібы вырастаў з іх, як дзіця вырастае з кашулі. Васіль, яна адчувала гэта, усё некуды імкнуўся, яму нібы не хапала прасторы.

І ў кабіне яе раптам пакінуў страх. Цяпер яна пераконвала сябе, што пераезд у Сасноўку — адзіна правільнае рашэнне, якое яна прыняла, каб пазбавіцца прыдзірак Карнеевіча. У гэтым, мабыць, і праяўлялася яе слабасць — не чапаць таго, хто табе не прыяе.

Размаўляючы з ёю, Васіль не паварочваў галаву, усё глядзеў на шэры, патрэсканы асфальт, хоць у такі ранні час машыны сустракаліся рэдка. Ды і шаша спачатку,

як выехалі з горада, бегла сярод невялікага хвойніку, пасаджанага гадоў дваццаць назад на пясчаніку. Па вяршынях дрэўцаў слаўся рэдкі шызы туман, па якім, здавалася, побач з машынай, нібы навыперадкі з яе ценем, слізгала сонца. Потым рэзка, нібы пераламаўшыся праз ужо гусцейшую прызму туману, пабеглі векавыя сосны. Цёмныя, падрэзаныя туманам, здаваліся нерэальнымі, як міражы. І сонца ўжо было цяжка ўбачыць за імі. Нейкая трывожная невядомасць перадалася Панкратаўне. Лес сціскаў дарогу, звужаў яе там, далёка наперадзе.

Напэўна, Васіль заўважыў, што ў Панкратаўны змяніўся настрой, заўважыў у люстэрка, якое вісела перад ім: спачатку па твары жанчыны слізгануў лёгкі цень, застыў, імгненна ацяжэў. Вочы Панкратаўны звузіліся, яна працяжна ўздыхнула, рукі на каленях таргануліся.

— Ты чаго, цётка, раскісла? — спытаў ён, не адрываючы вачэй ад дарогі. — Не бойся, у крыўду не дамо. Мы ж цябе добра ведаем, ты ведаеш нас... У лясгасе раздолле, прыгожа. Людзі ў сваёй большасці спагадлівыя. Зладзіш... А жыць усё ж будзеш у мяне. І Феня так кажа. Яна іншы раз стрыкучая, што крапіва, але толькі са мною. Кажуць, крапівой лечацца?

Ён засмяяўся свайму жарту.

— Цябе, абэлтуха гэтакага, не тое што крапівой, а папругай іншы раз не шкодзіла б лячыць, — падтрымала яна яго жарт.

— Мяне? — выцягнуўся ён угору. — Ды калі са мной па-харошаму, дык ты мяне хоць да апёку прыкладай.

Панкратаўна не разлічвала, што ў Сасноўцы ёй давядзецца жыць у некага, нават у Васіля. Навошта каму замінаць?

Але, падумаўшы так, зноў вярнулася да ранейшага:

— Цябе, Васіль, голымі рукамі не возьмеш. Хочаш, каб да цябе добра ставіліся, хочаш, каб Феня не зважала на тваё выбрыкі, а сам, мабыць, не ўступаеш ёй. Дзе ж ты хацеў, каб жонцы гэта падабалася? Жанчыне аднае ласкі мала. Жанчына ёсць жанчына. Ёй іншы раз трэба падпарадкавацца, прамаўчаць, калі і не вінаваты. Гэта ж проста, тады між вамі лад будзе. Якая жанчына хоча бязладдзя ў сям'і?

— Я, цётка, магу і маўчаць, не такі я ўжо нягеглы. Што яна супраць мяне? Бывае, уступаю.

— Вось і будзь хітрэйшы, маўчы.

— А я і маўчу, — зноў засмяяўся ён, — хай цешыцца. Хай лічыць, што яна бярэ верх. Тут, цётка, у мяне свая навука. Яе слухай, а рабі па-свойму.

— Так, кажаш, з характарам твая маладзічка. Дык па-другому з табой нельга. Малады. Жыццём яшчэ як след не біты.

— А я не хачу, каб жыццё мяне біла. Такое жыццё мне не патрэбна. Жыццё, каб жыць, каб не быць бітым... Што добрага, калі маю Феню жыццё біла? Яна да мяне нагаравалася. Яна — дзетдомаўка. Ласкі бацькоўскай не чула.

— Што ты кажаш? — пляснула рукамі Панкратаўна. — Колькі ёй гадочкаў?.. Гэта пасля вайны бязбацькавічаў было багата, ды, дзіва, і цяпер. Колькасць сіроцкіх дамоў не змяншаецца, а расце.

— Так, яна не з ваенных дзяцей, дзевятнаццаць ёй, — Васілёвы бровы зламаліся на пераноссі. — Зязюля ў яе маці, у раддоме пакінула. Адна яна, былінка ў полі... Хаця гадавалася, расла сярод людзей... На лесаўчастак прыехала ў адной сукенцы, птушаня замаранае. Калючая была, не падступіцца. А паспрабуй зачапі, ого! А вочы вялікія, блакітныя, як пралескі.

— І чым ты яе, такі ўзвей-вецер, прывабіў? — засмяялася шчыра Панкратаўна.

— А тым і прывабіў, што настырны я, во! Бывала, ежу гатуе ля парэма. Падкрадуся, ушчыкну. А яна коршакам на мяне, дручок заўсёды ля сябе трымала. Я знарок спіну падстаўлю, сцябай, сцябай! Сцебане раз, другі, а потым пытае, ці не балюча. Балюча, крычу. Тады яна мірг, мірг вачамі...

Панкратаўна разумела, што такі ўспамін замілоўвае Васіля, яму прыемна, зразумела, што Феню сваю ён любіць, што ён шчаслівы з ёю. Мабыць, і Феня шчаслівая. Яна за іх радавалася.

— Хто каго любіць, той таго чубіць, — сказала яна. — Толькі не трэба ёй нервы псаваць... Каб хто спытаў, ці была ў цябе галава на плячах, як машыну кульнуў? Што ты хацеў гэтым даказаць?.. Хочаш любі мяне, хочаш не, а за тое ты вісус, Васіль. Ты б хоць пра яе падумаў тады. Крый бог, што здарылася б з табой, як ёй тады жыць сярод людзей? Не дручком цябе трэба было б.

Панкратаўне стала не тое што крыўдна, а балюча да слёз за Васіля і Феню. Казалі, што ён знарок кульнуўся, калі Феня нібы адмовілася выходзіць за яго замуж.

Ёй хацелася вось такімі хоць і крыўднымі для яго словамі надалей аберагчы яго ад глупства, недарэчнасці.

## 13

Васіль Чубацюк быў не з першага пасляваеннага пакалення сасноўскіх дзяцей, якія нараджаліся ў зямлянках, палатках, часовых хацінах тады яшчэ ва ўрочышчы Сасноўка. Тыя дзеці спазналі холад, голад, нястачу. Яны радаваліся таму, што Васілёвым аднагодкам здавалася звычайным, абавязковым, на што яны нават не звярталі ўвагі. Першае пакаленне калі і ела ўволю хлеб, то па святах, яно не ведала смаку цукерак, новая кашуля для іх была як дзіва.

Тое першае пасляваеннае пакаленне недавучылася. Многія хлопцы пасля сямі класаў ішлі працаваць дарожнікамі, падсобнымі рабочымі на пілараму, станавіліся вучнямі слесараў. Кожны як мог зарабляў, і тут не лічылася заганай рабіць змалку, гэта цанілася.

Тыя пасляваенныя хлопцы з часам на лесаўчастку набывалі спецыяльнасці, хто больш адукаваны, вучыўся на трактарыста або шафёра, менш здатныя да вучобы станавіліся вальшчыкамі, сучкарубамі. Там веды не патрабаваліся, адно — спрыт, сіла, цягавітасць.

Франтавікі і былыя партызаны, якія будавалі прадпрыемства і пасёлак, паступова старыліся, выходзілі на пенсію, як у цяжкой прамысловасці, на пяць гадоў раней, чым іншыя. Моладзь замяняла бацькоў.

Дзяўчаты найбольш цягнуліся ў горад. Хто вучыцца далей, хто на працу, бо ў пасёлку ім занятку знайсці было цяжка. У магазіне, сталоўцы, на хлебапякарні (здаўна было заведзена так) загадчыцамі працавалі жонкі мясцовага кіраўніцтва, і толькі тыя, каго называлі няўдаліцамі, рабілі прыбіральшчыцамі, хлебапёкамі і г. д.

Мацяркі гэтых дзяўчат раней рабілі на дзялянках, дзяцей сваіх, дзяўчат, цяпер туды не пускалі, нават кухаркамі. Але дзяўчаты, якія не маглі паступіць на вучобу або па нейкіх прычынах уладкавацца ў горадзе і жылі дома, хутка выходзілі замуж, бо хлопцаў тут хапала ў тыя часы. Яны станавіліся хатнімі гаспадынямі, гадавалі дзяцей, корпаліся ў агародах, збіралі ў лесе ягады і грыбы. Схільныя да гандлю, прадавалі на базары, а астатнія здавалі за капейкі на нарыхтоўчы пункт.

Людзі спакваля абжываліся. Хутка кожная сям'я мела хату. І хоць першыя гадоў дзесяць рабочых рук не хапала, пазней, як пайшлі адзін за адным на пенсію лесарубы, ці так супала, ці што, нагналі на лесаўчастак столькі рознай тэхнікі, што нястачы работнікаў не адчувалася. І хлопцаў ужо ніхто асабліва тут не трымаў, наадварот, бацькі выпраўлялі ў горад, будавалі там дзецям кааператыўныя кватэры, давалі грошы на легкавікі, куплялі мэблю. У горадзе лічыліся лесарубаўскія дзеці самыя багатыя, як дзеці гандляроў.

Тым не менш гараджане-сасноўцы, прыязджаючы на выхадныя ці ў адпачынак да бацькоў, зайздросцілі сваім колішнім таварышам: глядзіш, у таго ж Пятра ці Міколы свой дом, за які аседлыя цыганы з Цітаўкі, прыгарада Сасноўкі, давалі грошы, за якія можна было купіць машыну, а то і дзве. І прадавалі. А праз колькі год будавалі новыя дамы. І абжываліся зноў. Кожная сям'я трымала два, а то і тры кабаны, карову, мела агарод, сад, карацей, усё, калі ў цябе ёсць рукі, каб жыць без клопату.

Лесаўчастак, хоць і лічыўся прадпрыемствам, дзе, вядома, у рабочых павінна быць рабочая свядомасць, на самай справе не быў ім. Лесарубы — праслойка між рабочымі і сялянамі. Гэтую праслойку хваля мяшчанства, маецца на ўвазе тых, хто сапраўды рабіў у лесе, не кранула. Калі кранула, то не дужа. Гэтая хваля перш за ўсё захліснула саміх кіраўнікоў, іх сем'і. Жонкі кіраўнікоў рабілі на «кіруючых» пасадах у магазіне, сталоўцы, сельпо, а значыць, мелі доступ, ды не тое што доступ, а маглі распараджацца тымі каштоўнасцямі, за якімі гады чатыры-пяць назад ганяліся паўсюдна людзі. Яны маглі назапасіць рознымі шляхамі шмат грошай, скуплялі золата, крышталь, дываны — усё, што мела каштоўнасць.

І многія, хто рабіў па-сапраўднаму, здзіўляліся, што людзі, якія займаюць пасады, атрымліваюць менш, чым лесарубы, маюць больш, чым яны. Ды і кіраўнікоў, іх жонак, якія загадвалі магазінам, сталоўкай, пякарняй, ніхто не лічыў роўняй сабе. Звярталіся да іх па бацьку, хаця не паважалі, бо ведалі — жывуць не сваім мазалём. Але так павялося, калі маеш пасаду, то маеш усё, лічылі, што так і трэба.

Той жа Стрынадка, як толькі прыехаў у пасёлак, адразу пабудаваў дом. Сапраўдны дом. Так і ранейшае на-

чальства будавала. Калі ж начальніка лесаўчастка забіралі на іншую работу, дом ён прадаваў, як свой уласны.

Увогуле ж лес, які лесарубы валілі, тапталі гусеніцамі трактараў, праразалі новымі дарогамі, які без уліку бралі на хаты, дровы, быў для іх невычэрпнай чашай. І гэта страшная фраза: «На наш век хопіць» нікому не рэзала слых.

## 14

Панкратаўна пасля вайны засталася адна з пяцігадовым сынам. Яе Парфен, як было напісана ў казённай паперцы, «прапаў без вестак» пад канец вайны недзе на чужых землях. І ёй тады, адзінокай жанчыне, якая працавала ў калгасе, жылося цяжка. Голад пазнала, галечу. Хадзіла і ў будзень і ў свята ў адным і тым: у спадніцы з зацёртай мешкавіны, у паношаным афіцэрскім кіцелі, які ёй ахвяравалі вайскоўцы.

Але не нястача і голад гнялі — так тады большасць людзей жылі, — а тое, што наперадзе не бачылася ніякага прасвету. Не бачылася выйсця з таго жыцця, якім яна жыла. Здавалася, што ёй, удаве, век гараваць. Яна баялася, што такі лёс будзе і ў сына.

З аднаго боку, можна было думаць, што ёй неяк пашчасціла. Хата, якую перад вайной ставіў Парфен, ацалела, агонь, які выкаціў вёску ў сорак трэцім, яе хату не крануў. Ды і кароўку змагла захаваць, усю вайну летам трымала ў лесе, далей ад паліцэйскага вока.

Хата яе ацалела, мабыць, што была канцавая, нібы адарваная ад ланцужка хатак, што ляпіліся на беразе Пятлянкі. Хата стаяла на крутым, парослым старым вербалоззем беразе.

Пятлянка, казалі, пачынаецца недзе далёка ў Лясках, нібыта ёсць такое месца ля Сасноўкі. Яна доўга пятляла сярод балот і старыны, нібы ставіла на чалавека петлі, агінала баравіны, блудзіла па лесе, і нарэшце, нібы знясілеўшы, паволі выходзіла ля Падрэчча з гушчару. Тут рэчка прыкметна шырэла, замірала, нібы здзіўленая практорай, якая адкрывалася, воляй палёў і лугоў.

Калісьці мясцовыя мужыкі адсюль па рэчцы ганялі плыты ў горад, рэчка тут выпроствалася. Але ўжо ў перадваенныя гады, як арганізаваўся калгас, плыты ніхто не вязаў, ды і вады паменела.

Але вясной Пятлянка, асабліва калі была снежная зіма, нібы шалела. Яна затапляла дарогі, лугі, несла ў сваёй бурапеністай плыні карчы, вываратні, падмывала бераг, на якім стаяла хата. Бераг глуха абвальваўся, падступаючы з кожнай вясной усё бліжэй да вербалоззя.

Здаралася, вада змывала агароджу, нават прызбу лізала, у каторы год хлюпала пад падлогай.

Вада прыходзіла і адыходзіла, а вось як жыць, калі няма каму за цябе заступіцца, калі ў хаце хоць шаром пакаці, калі твае дзіця і галоднае, і голае?

У галодную пару, пакуль што вырасце на агародзе, ратаваў лес. Ягад і грыбоў у ім хапала ўсім, варта толькі выкраіць часіну між работай у калгасе, прыхапіць кош, перабегчы цераз масток на другі бераг рэчкі, увайсці ў лес — вось табе і стол. Ды толькі такіх часін было мала. Яна рабіла ў полі, а сына, Косціка, разам з другімі дзецьмі ў лес не пусціш, малы. Але ён швэндаўся дзень пры дні без догляду па вуліцы, на рэчцы, дзе хацеў, а ў маці, вядома, сэрца не на месцы: што там з ім?

А Сасноўка нібы клікала. Там і крама ёсць, калі маеш грошы, тое-сёе купіш. Ну, а што работа там цяжкая, дык дзе яна лёгкая, работа? Галоўнае, каб ведаць, за што робіш. Мабыць, толькі ў Яўгена Дабрынеўскага, іхняга брыгадзіра, работа лёгкая: цэлы дзень не злазіць з каня, грукаць пугаўём па вокнах, выганяць на работу ды страшыць турмой, калі ты не можаш выйсці. Сам жа палец аб палец не ўдарыць нідзе.

Яна часта думала, як вырвацца ў Сасноўку. Паспрабаваць прадаць хату, карову, ды ў свет? Страшна, а раптам там не возьмуць? Усё ж жанчына, ды дзіцё малое. Калі падумаць, дык тут, дома, якое ні гора, а тваё. А там, на людзях?..

Але, зноў-такі, ніхто з тых, хто пераехаў у Сасноўку, аб гэтым не шкадаваў. У выхадны дзень, аказваецца, там ёсць выхадныя, прыязджаючы ў Падрэчча, хваліліся, што жывуць па-людску. Вунь яе суседка, Вольга Беляг, падалася з дзіцём у Сасноўку. Нічога не пабаялася. Робіць у сталоўцы, знайшла сабе чалавека, жыве з ім. І хату пабудавалі. Прыязджала неяк раздабрэлая, чыста апранутая, і гаворка ў яе ўжо іншая, на гарадскі манер, хаця Сасноўка — не горад, а вялікая, кажуць, вёска сярод лесу.

Не, не нявесціцца яна збіралася ў Сасноўцы, прыйдзе не прыйдзе яе Парфен, гэта свой мужык, свой бацька, а чужое цяпло, якое яно ні ёсць, чужое, ля яго нядоўга і апячыся. Чужая ласка для дзіцяці — яна і ёсць чужая.

Можа, разважаючы так, яна не асмелілася б падацца ў пасёлак, але вымусіла гора. Занятая работай у калгасе, недагледзела Косціка. Ён прастудзіўся на рэчцы, уюноў таптаў кошыкам. Кінула хлопчыка ў жар, няма рады. І стагнаў, і варочаўся на печы, трызніў. Ноч яна не адыходзіла ад яго, а раніцою не пайшла ў калгас. Дабрынеўскі тут як тут. Прыскакаў на кані на падворак, пачаў барабаніць пугаўём у шыбу.

— Не пайду я сёння, — сказала яна, — мне дзіця даражэй.

— Я це не пайду! — закрычаў той. — За такое, ведаеш, што можа быць? Я це прышыю палітыку, іш, распусціліся!..

Ведала, што за гэта можа быць. Упала перад ім на калені, заламала рукі:

— Не сіраці дзіцёнка, Іванавіч!..

— Ты сама яго асіраціш!..

Дабрынеўскі паскакаў далей, грукаў у іншыя хаты. А яна як ні баялася, не пайшла.

Дзень сяк-так перакідалася з дзіцём, надвечар Косціку нібы палепшала. Ён нават малака папрасіў. А як сцямнела, пачаў кідацца на печы ў гарачцы. І тады яна сама, нібы не ў памяці, рашылася. Згрэбла Косціка ў ахапку, ухутала ў дзяружкі, паклала на калёсікі, упрэглася і пацягнула іх, абмацваючы дарогу нагамі ў густой цемры, да шашы, а гэта вёрст дзесяць.

Дарогай яна не раз спынялася, мацала Косцікаў лоб, папраўляла дзяружкі, каб не мулка яму было на няструганых дошках, нямела ад страху, калі недзе вылі ваўкі, садзілася на яшчэ цёплы пясок, галасіла, ламала рукі, баялася, што не давязе. Тады ёй адзін ратунак — з берага ў прорву...

Ці не апоўначы вышкраблася на шашу. Ці сапраўды ёсць лёс, ці выпадковасць гэта, але прасядзела там нядоўга, хоць ёй здалося — вечнасць. Не заўважыла, калі яе асляпіла святло аўтамабільных фар. Яна нават не паспела захінуцца ад святла, што рэзала вочы, як пачула побач грукат ботаў, востры пах гару. Не паспела нічога толкам уцяміць, як яе і Косціка ўціснулі

ў душную, гарачую ад бункера кабіну. У яе мову тады адняло ад нейкай забытай чалавечай спагады і цяпла. Яна, здаецца, не ведала, куды і чаму едзе. Яна цалкам падпарадкоўвалася лёсу і мацней прыціскала да сябе сына, яго гарачае, кволае цельца, што слаба торгалася ў яе на руках. І толькі часам аднекуль як з іншага свету да яе даносіліся мужчынская лаянка на яе, маці, і людзей: гэта ж да чаго давялі хлопчыка, што згарае...

І гэта лаянка, заклапочаная, нібы вяртала яе ў рэальнасць, нібы падказвала: людзям трэба верыць.

Тая машына прывезла яе ў Сасноўку. Спынілася ля нейкай будкі. Чалавек, які іх вёз, моцна пагрукаў у дзверы, адтуль выскачыла соннае напаўголае дзяўчо. Тое дзяўчо аказалася фельчаркай. Памерала тэмпературу, зрабіла ўкол, загадала неадкладна везці ў бальніцу.

І тады зноў, у дарозе, яна ціха загаласіла. Яе не супакойвалі, мабыць, разумеючы, што жанчыне трэба выплакацца.

І потым ужо, як суцішылася, здаецца, выплакаўшы ўсе слёзы, мужчына, які сядзеў за рулём, спытаў:

— Удава?

— Удава, — адказала яна, — пайшоў мой чалавек на вайну, там і застаўся.

— Што табе, жанчынка, сказаць на гэта? — уздыхнуў мужчына. — не адна ты такая. І я быў у калатнечы. Усё прайшоў, хаця б дзе шкрабанула мяне. А прыйшоў з вайны, дык гора мяне дома чакае: сям'ю фашысты вынішчылі — жонку, дачку.

Калі прыехалі, яна нават не спытала, хто яе суцешыў, паспагадаў ёй, не запомніла твару мужчыны, бо ў кабіне было цёмна, і пасля не магла аддзячыць чалавека за дабрату.

У бальніцы яна не адыходзілася ад сына ні днём ні ноччу. Яна даглядала дзяцей, якіх было багата ў палаце. Худых, змарнелых, хворых пасляваенных дзяцей. Косцік папраўляўся марудна. Дактары, здаецца, вярталі яго з небыцця.

Ёй на ўсё жыццё запомніўся стары доктар, які заходзіў у палату і нібы прыносіў дзецям святло, прымушаў іх усміхацца, смяяцца, жартаваць. І калі Косціка выпісалі, вясёлага і здаровага, яна памкнулася пацалаваць руку доктару, але той, зразумеўшы яе намер, паціснуў на развітанне руку, параіў берагчы сына ад прастуды.

Тады яна цвёрда рашыла прасіцца на лесаўчастак.

## 15

Васіль Чубацюк пасля школы крыху папрацаваў дарожнікам, нікуды не паступіў вучыцца, бо асаблівымі здольнасцямі не вызначаўся, затым скончыў курсы шафёраў, пайшоў на службу спецыялістам, як казаў бацька.

Да таго часу бацька, вадзіцель, быў на пенсіі, адмовіўся ад усялякага прыробку, займаўся толькі гаспадаркай, адпачываў. Ён спрабаваў развесці пчол, бо дактары яго шматлікія хваробы раілі лячыць мёдам. І бацька заняўся пчалярствам.

Вакол меданосаў хапала — лес пад бокам, луг, пасадкі ліпняку, пасевы грэчкі. Стары Чубацюк вуллі паставіў у садку пад яблынямі — хай раяцца пчолы.

І праўда, першыя гады былі бацькі з мёдам, частавалі ім суседзяў, хапіла ці не ўсяму пасёлку. І раптам як насланнё — у тое лета, як вярнуўся са службы Васіль, памерлі пчолы.

Старыя жанчыны казалі, што гэта нядобры знак, што хлопца чакае нейкая бяда. Але высветлілася, што адначасова памерлі пчолы амаль ва ўсіх пасялкоўцаў. І ніякага наслання не было, проста з самалёта для нейкай патрэбы апылілі лес: ці караеда труцілі, ці яшчэ што.

Васіль на гэта не зважаў, у яго былі другія думкі: пагуляць з месяц дома ды і падацца ў горад. Разважаў так: што тут рабіць? Аднакласнікі раз'ехаліся, а хто і застаўся тут, дык ажаніўся, мае сям'ю, ён ужо яму не таварыш, свае клопаты. Ну, а з падшыванцамі, якія горнуцца да цябе, стараюцца вечарам на гулянцы паднесці запалку, як дастанеш цыгарэты, важдацца не хацелася — зелянота!

Васіля вабіў горад яшчэ і таму, што служыць яму выпала ў глухой тайзе, у месцы, аддаленым на сотні кіламетраў ад гарадоў, у часці нават не было куды хадзіць у звальненне — з лесу трапіў у лес, ды яшчэ які. Гэта нібы крыўдзіла асабіста. Хлопцы, якія прыйшлі з арміі, у большасці служылі ў гарадах, выхваляліся, як было цікава хадзіць у звальненні, знаёміцца з дзяўчатамі і нават трапляць на дыскатэкі, словам, па іх расказах, не служба была, а маліна.

Бацькі не пярэчылі, што хочаш, тое і рабі, не маленькі, спецыяльнасць у кішэні, не прападзеш, калі не будзеш лепаваццa, дзе б ні быў.

Васілёвы намеры крута змяніліся адным днём, недзе праз тыдзень. Тады ён з бацькамі паехаў на матацыкле на дзялянку, каб нарэзаць дроў.

Везучы бацьку на дзялянку знаёмымі з дзяцінства сцежкамі, Васіль знарок ехаў паволі, любаваўся лесам. Напаўзабыты за гады службы лес цяпер адкрываўся яму нанова, як родны і дарагі, дзе прайшло яго дзяцінства. Ён палоніў свежымі ранішнімі пахамі, бязліччу фарбаў, якія былі ярчэйшыя і багацейшыя, здавалася, за фарбы тайгі, замілоўваў.

На дзялянцы Іван Сідорын адразу вызваўся дапамагчы, у яго ж у руках трактар, выцягнуць да дарогі хлысты, а там ужо пілуй, ды і пілу даў, бо ў Васілёвага бацькі яе не было. Вядома, не за дзякуй, бацька торкнуў таму чырвонец, маўляў, Івану добра і нам лацвей.

Дроў Васіль нарэзаў хутка, працаваў з асалодай, адчуваючы прыемную стому ў руках, па якой таксама сумаваў на службе, бо, насуперак сваёй прафесіі, служыў радыстам, а радыстам забаранялася фізічна рабіць, каб не сарваць, як казалі, руку, бо тады не зможаш працаваць на тэлеграфным ключы, рытмікі перадачы знакаў азбукі Морзе не будзе.

Калі напілавалі дроў, скідалі іх у штабель, чакаючы машыну, Васіль пашвэндаўся па дзялянцы, пабачыўся з усімі, каго яшчэ не бачыў. Нагаварыўся, паплёўся да парэма чакаць бацьку.

Вось тут ён і сустрэў яе, дзяўчо з вялікімі блакітнымі вачамі, якое, згінаючыся, цягнула два вядры вады ад ручая.

Дзяўчына была ў вялікіх, ці не сорак апошняга памеру, гумавіках, кароткай лёгкай сукенцы, валасы яе доўгімі залацістымі хвалямі калыхаліся на ветры.

Убачыўшы яе, Васіль спачатку зніякавеў. Яго ўразілі дзявочыя вочы. Ён нават не паспеў разгледзець рысы твару, і куды потым ні глядзеў: на лес, на неба, зямлю, — адусюль, здавалася, на яго глядзелі гэтыя яе блакітныя вочы. Але як чалавек, на яго думку, бывалы, якому не да сантыментаў, пажартаваў:

— Так... У нас дзіцячая праца забаронена. З эксплуатацыяй дзіцячай рабсілы пакончана даўно. Скажы мне, малое, хто асмеліўся загнаць цябе сюды на глум камарам і прымусіў цягаць гэтыя вёдры, замест таго каб даць у рукі лялькі?

Сказаў і як накалоўся. Яна блiснула на яго з-пад

тонкіх, як ластаўчына крыло, броваў, рэзка паставіла вёдры на зямлю:

— Ай, вось дык разумнік! Абаронца знайшоўся! Калі так шкадуеш малое, дык бяры вёдры і нясі да парэма. Я пагляджу, ці хопіць смеласці развітацца з гонарам.

Васіль атарапеў. З ім яшчэ ні адна дзяўчына так не размаўляла. Ды на танцах кожная лічыла за гонар пайсці з ім у круг! А тут на табе!

Ён адчуваў, што ў яго гарацЬ вушы, нібы за іх добра пацягалі, сэрца моцна затахкала. Васіль лёгка падхапіў вёдры і моўчкі пайшоў да парэма. Вось табе і маеш! Першы хлопец у Сасноўцы, а ідзе як цяля.

А тут яшчэ кпіны лесарубаў:

— Так, так яго, Фенька!

У другі час Васіль такой абразы не сцярпеў бы. Цяпер жа быў проста ашаломлены. Маўчаў як мыла з'еўшы. Вёдры паставіў, пераміналася з нагі на нагу, на яе не глядзеў, скрозь зямлю праваліўся б ад сораму, ды выручыла яна.

— А ты гэтых пустазвонаў не слухай, — сказала яна, каб усе чулі, — дапамажы яшчэ вады прынесці, мне ж посуд мыць трэба.

— Атрымалі? — знайшоўся Васіль і заспяшаўся да ручая.

Ужо там, чэрпаючы ваду і адчуваючы на сабе яе позірк, загадаў:

— Каб сёння была на танцах!

— І не падумаю' — засмяялася яна. — Захочаш — сам знойдзеш...

Машыну нагрузілі надвечар, бацька паехаў у кабіне, і Васіль спытаўся:

— Не баішся на матацыкле?

— Ой страх! — гулліва павяла яна плячамі. — Скажы-ка, з ім на матацыкле... Давай!

Ён увесь час адчуваў на сваіх плячах чэпкія, гарачыя яе далоні, ужо нічога не заўважаў, акрамя шэрай сцежкі. Ні словам не перамовіліся дарогай. Ля інтэрната яна махнула на развітанне:

— Пакуль, памочнічак...

З таго дня Васіль страціў спакой. Што б ні рабіў, дзе б ні быў, у галаве — яна, яе пагляд свідруе.

Ён і на танцах яе чакаў, не ішла. Ён і вакол інтэрната, дзе жыла, круціўся — гарыць святло, а акно завешана.

І зачасціў Васіль на матацыкле на дзялянку. Аднойчы падлавіў ля ручая, як ваду брала, вываліўся з кустоў. Хоць бы што, ніякай рэакцыі. Толькі пагляд бліскавічны.

— Будзеш са мной гуляць? — спытаў прама.

— А гэта як захачу!

І пайшла, пакінуўшы яму вёдры. Следам нёс, на кепікі лесарубаў ужо не зважаў. А праз дзень падаў заяву на лесаўчастак, дзе яго сустрэлі цёпла. Далі новую машыну, толькі працуй.

Прываражыла, казалі жанчыны, яго Феня.

Памятае, не забыўся ён той рэйс пасля нядаўняга знаёмства з Феняю. Ужо ля Баравіцы, невялікай вёскі, якая ляжала па абодва бакі шашы, праехаўшы добрую палову дарогі, Васіль скінуў хуткасць, адчуваючы, як прычэп піхае машыну наперад. Ну, гэта справа звычайная. У гэты міг з кустоў, нібы хто шпурнуў на дарогу, кроках у дзесяці ад машыны выскачыла шэрая плямка, камячок, застыла пасярод дарогі.

Ён не памятае, што здарылася, быццам яму імгненна выкруціла рукі... Ён ляцеў у кювет: трашчалі кусты, чуўся звон шкла, лязгат металу... Адчуваў, як усе дваццаць кубоў, што ляжалі на прычэпе, узняліся, зламалі ахоўную рашотку, затым лёгка, нібы бляшанку, расплюшчылі кабіну. Яго штурханула наперад, выкінула за капот, уціснула ў росную траву... У гэту хвіліну яму здалося, што з усіх бакоў наплывае бесклапотны дзіцячы смех і бразгат нейкай бляшанкі на асфальце. Потым бразганне як абарвалася, побач з ім шлёпнулася маленькае вядзерца з намаляваным чырвоным сабачкам.

І той бесклапотны дзіцячы смех чуўся ўжо недзе далей, у кустах, аддаляўся, нарэшце знік, як растаў сярод зялёнага лісця. Цішыня наўкола і гулкае тахканне сэрца...

Да яго беглі людзі...

І цяпер, калі Панкратаўна нагадала яму пра гэтую аварыю, ён зноў выразна пачуў той бесклапотны дзіцячы смех, пачуў каляны звон шкла, адчуў, як хлысты трушчаць кабіну, у нос патыхнула вострым пахам травы. І перад вачамі скакала вядзерца з намаляваным сабачкам...

Тады людзі падхапілі яго, трымалі пад пахі. Аднекуль з'явіўся Карней Карнеевіч, сунуў яму ў твар трубку, загадаў дыхаць. Ён адштурхнуў інспектара ДАІ, як

сухадрэвіну, што замінае, выскачыў на шашу, пралез пад перакуленай машынай, зазірнуў між рассыпанымі хлыстамі і нікога там не знайшоў.

Ён зразумеў, што машына не падмяла пад сябе дзіцячы смех, той смех сапраўды знік недзе ў зелянiне кустоў, і ён засмяяўся, але ўжо іншым смехам.

Дома ён быў надвечар, ужо як зрабілі ў раёне экспертызу, прыехаў аўтобусам. Бацька сядзеў на ганку, вязаў венікі, нічога не ведаў, а праз агарод з інтэрната бегла сюды Феня. Белая, як мел, толькі вочы нязгасныя. Яна коршакам наляцела на яго, не зважаючы на бацьку, які не паспеў апамятацца, пачала малаціць яго кулачкамі ў грудзі, потым знясілілася, села на зямлю, заплакала, выціраючы кулакамі вочы.

Ён сеў побач з ёй, яна абхапіла яго рукамі за шыю, ласкава шаптала:

— Родны мой, добра, што жывы застаўся.

З хаты выйшла маці, здзіўлена глядзела на дзяўчыну, нешта наважылася сказаць. Але бацька апярэдзіў:

— Не руш!.. Іх справа...

## 16

Яшчэ дзень назад з таго боку Ляскоў, скаваная бабрынай плацінай, стаяла вялікая вада. Яна нагадвала няроўна выразанае люстэрка, праз якое па краях прабіваўся асіннік, лазняк, чарот. Вакол іх, калі было ветрана, гладзь злёгку карабацілася, нібы трэскалася, але, як сціхаў вецер, зноў зацягвалася. І тады ў люстэрка вады глядзеліся зялёныя дрэвы, пакручастыя кусты, чарот, блакітнае, з белымі драпінкамі аблачын, неба, жоўтае, расплаўленае сонца. І іх адбіткі злёгку пакалыхваліся час ад часу, ажывалі.

Здаля, на сярэдзіне, наогул здавалася, што вада застыла, яе люстэрка цямнее, як старое срэбра, бліжэй да плаціны яно мякчэла, раставала пад бляклым сонцам, і вось ужо на самым грэбні плаціны з глею, галінак, наогул раставала, закіпала. Гэтая белапенная расплаўленая маса, нібы цераз край агромністай чашы, вырывалася на прастору, расцякалася па вілюжыстым жолабе, запаўняла яго, аддаляючыся, паступова сціхала, застываючы ў блакітна-зялёнай смузе халодных даляў.

Калі ж плаціну падчапіў нож трактара і яе край трэснуў, глей, дрэвы, галлё панесла кіпучая плынь, люс-

тэрка на сярэдзіне наогул трэснула, нібы тонкі лядок, на які неабачліва наступіш. Пеністы паток пачаў дзяўбці краі чашы, усё больш і больш крышыць яго — абвальваліся берагі. І вось ужо балюча стала ад трэшчын, якія агалілі камялі дрэў, карэнне, кусты; сагнуліся чараты. І, нібы ў палонцы, захвалявалася сонца, якое рвалі на часткі трэшчыны, і памкнуліся космы бляклай жаўцізны ў пеністую чорна-густую пашчу.

Баброў не было бачна, але можна было ўявіць, калі яны яшчэ не сышлі, як б'юцца яны супраць няўмольнага цячэння, імкнучыся да хатак...

І, убачыўшы бабрыную хатку, схаваную ля берага ў трысці, гледзячы, як вада стараецца раскідаць яе, не могучы нічым дапамагчы, Міцька чамусьці ўявіў іншую хатку, чалавечую, якую бачыў многа гадоў назад, такой яна здалася яму тады безабароннай, а жыццё двух людзей, якія жылі там, таксама безабаронным, як жыццё баброў...

У яго памяць урэзалася тая хатка, калі ён хадзіў у Падрэчча купляць цялушку замест сваёй Рагулі, якая прапала ў лесе, трапіўшы нагой у корч, як у пастку.

Міцька бедаваў. Пастухі з суседніх вёсак падказалі, што ёсць жанчына, якая хоча збыць леташнюю цялушку. Казалі, што цяля ад добрых кароў. Доўга не думаючы, Міцька наняў на дзень за сябе чалавека, а сам падаўся ў Падрэчча.

Жанчына, пра якую яму казалі пастухі, была гаротная. Гэта Міцька зразумеў, прыйшоўшы туды.

Была вясна, сама садзіць бульбу. Пад шчодрым сонцам добра-такі падсохла зямля, лёгка рассыпалася з камячкоў пад нагамі. Там, дзе вышэй, ветрык уздымаў лёгкі пылок, ён курэўся даўкім прысакам. Наўкола, паўз дарогу па якой ішоў Міцька, праз зрудзелую траву слаба вытыркалася яшчэ кволая зеляніна. Набірала яна сілу на пагорках і на голлі дрэў, лопаючыся з карычневых вугольчыкаў пупышак. Месцамі даволі прыкметна займалася зеленажоўтымі язычкамі лісцікаў, якія раздуваў блакітны, як неба, вецярок.

Хата той жанчыны была канцавая. Адразу за паўраскіданым, толькі калёсамі праехаць, мастком праз рачулку. Рачулка, яе берагі параслі старымі вербамі з парэпанымі ствaламі.

Хата стаяла на пагорку, па яго схіле да вады спускаўся пахілы жардзянік, месцамі трымаючыся за вербы.

Яшчэ здаля агарод, і шэры пясок-падзол, і маленькая хата, акурат ёвенька, з прылепленымі да яе хлеўчуком і дрывотняй былі відаць як на далоні. Падворак без агароджы, адкрыты вуліцы. Ля хаты два невысокіх стажары, унізе якіх не знайсці клока сена, адно драўляны насціл.

Вось тады і падумаў Міцька, што тут жыве ўдава, які з яе спрос за гаспадарку?

І сапраўды, што можна было спытаць з пасляваенных удоў?

Міцька мінуў масток праз хуткаплынную, мутную рачулку, дасягнуў вёскі. Стаяла яна адной вуліцай. Месцамі між вось такіх старых, як гэта, хат ужо красаваліся ладныя пасляваенныя домікі, пабудаваныя не нахапкам, а разважлівай чалавечай рукой, на доўгія гады.

На той бок вуліцы, вузкай і крывой, насупраць гэтай хаты красаваўся вялікі дом. Тры прасторныя, завешаныя крамнымі фіранкамі акны выходзілі на вуліцу, сцены з добрай сасны, між вянцамі шчацініўся ўжо сшарэлы мох, два коміны на высокай страсе, крытай гонтай, вакол будыніны — высокая, у рост чалавека, агароджа, шырокія, як уехаць машынай, акаваныя жалезам вароты, за якімі скавытаў сабака. Усё сведчыла, што там жыццё ўжо наладзілася.

Падворак хаты, да якой ён завярнуў, менш за ўсё нагадваў сапраўдны падворак. Гэта быў даўні, убіты, як ток, пляц, з аднаго краю якога, за вузенькай палоскай счарнелага мурагу, бачылася падгнілая сцяна хаты з двума акенцамі. Вузкімі надта. Два такія ж акенцы глядзелі чорнай пустатой на вуліцу. Страха з дошак прагнулася, парасла лапікамі зялёнага кучаравага моху, хата пахілая, здавалася, яе трымае прызба, высока насыпаная, і, адкінь яе, хата паваліцца.

Адзінае, што было тут новае, дык ганак. Злеплены няўмела, з неабструганых аполкаў. На прыступках грэліся на сонцы куры.

З другога боку пляца пачынаўся агародчык, аддзелены ад падворка жэрдкамі. Там — абрэзаная яблыня ў рост чалавека, на плоце панаторкнуты гладышы, паблісквалі на сонцы вышараванымі крутымі бакамі.

— Ці ёсць хто дома? — гукнуў Міцька ў акно.

У сенечках пачуўся тупат, потым працяжна рыпнулі дзверы, успаролася лёнае птаства. На ганак выйшла жанчына. Убачыўшы Міцьку, пільна паглядзела на яго.

Міцька паспеў за гэты час таксама яе разгледзець. Жанчына была ў самай сіле. Невысокая, моцная ў плячах, нечым паходзіла на мужчыну. Мабыць, падумаў ён, работа такой зрабіла. Апранутая ў самаробную ватовую безрукаўку паверх бумазеевай квяцістай сукенкі, велікаватай, відаць, з чужога пляча. На нагах жанчыны былі надзеты буркі з чырвонымі гумовымі бахіламі. Галаву пакрывала цяжкая самавязаная хустка, з-пад якой выбіваліся ледзь сіваватыя, але яшчэ густыя валасы.

Твар быў светлы і свежы, прыгожы.

— Ёсць, ёсць, — сказала яна... — Нешта я вас не памятаю. Да мяне ці абмыліліся?

— Калі вы прадаеце карову, то да вас.

— Мелася, хто ж вам параіў?

— Параілі мужчыны. Я сам з Сасноўкі, вось і трапіў да вас.

— Тады будзем гаманіць, — сказала жанчына, — ёсць у мяне пагуляная цёлка, ёсць і карова, восьмым целем. Карова нішто сабе, малаком не залівае, але хапае на сям'ю. Калі цёлка ў яе ўдасца, дык таксама без малака не будзем. Я вось толькі не ведаю, гэта старую мне збываць ці маладую. Старая корміць, а гэта невядома, калі будзе даіцца.

Прамата і шчырасць жанчыны Міцьку спадабаліся, толк у жывёле ён ведаў. Вядома, яму лепш было б узяць дойную, яшчэ сама каравёнка. Але ж, здаецца, у жанчыны сям'я. Ён то без малака не жыве, людзі даюць пакуль, ці багата яму трэба.

— У вас дзеці?

— Ага, сын, хлопчык яшчэ.

— То я раю вам цёлку збыць. Калі панараўлю, дык забяру. І мне лаўчэй з аплатай, і вам не шкада аддаваць. Дам, колькі скажаце. Цяпер яшчэ ў людзей з грашамі туга, чуў, што ў калгасе наогул... Я ж грашамі атрымліваю, пастухом я ў Сасноўцы, у пасёлку... Яно, вядома, каб цёлка пералетавала, вы б больш узялі, але, мабыць, нейкая ў вас нявыкрутка, што збываеце.

— Не з рукі мне трымаць дзве, — сказала жанчына, — без хадзяіна я, сярпом на дзве не нажнеш, ношкамі не наносішся.

— То дзе ж мне яе паглядзець?

— Вы з дарогі, мабыць, стаміліся, вечарам прыйдзе статак, пагледзіцё.

— І то праўда, — згадзіўся Міцька.

... І вось вечарам Міцька сядзеў у хаце Панкратаўны, так звалі жанчыну, чакаў, пакуль яна збярэ вячэру. Днём ён падладзіў ёй жардзянік, хляўчук. Цёлку ён у яе старгаваў, нават не прыдзіраючыся надта. Паглядзеў — гладкая выйшла з зімы, колькі сказала, столькі даў. Падабалася яму, што цёлка лесавая. Хоць тут былі лугі, але пасвілі ў лесе. Палявую ў лес не гані, цяжка ёй. А як прыкінуцца авадні, дык наогул з палявой у лесе ладу няма. Радаваўся, што жанчыну не пакрыўдзіў. Ды і каго было крыўдзіць? Адна, з хлопчыкам. Той, як прыйшоў са статкам, пасвіў па радоўцы, так і асунуўся на ганак, відаць, стаміўся. Цяпер вунь спіць на печы, з-пад лапленай-пералапленай дзяружкі тырчыць яго белая галоўка.

Міцька, пакуль Панкратаўна збірала на стол, паклаў на яго шматок сала, хлеб, цыбулю, вараныя яйкі, сказаў, каб хлопчык перакусіў, пакуль вячэра. Той паглядзеў на маці, яна дазволіла, узяў скрылік сала, акраец хлеба, разы са два ўкусіў ды так і звіўся за сталом. Міцька яго соннага занёс на печ.

Калі яны ўдваіх вячэралі, узяўшы чарку — яна толькі прыгубіла,— сказаў, можа, нядрэнна было б, каб ёй знайшоўся які мужчына, усё ж лягчэй было б.

— Не, чалавеча, — адказала яна, — можа, сабе мужчыну я і знайшла б, але дзе ж ты дзіцяці бацьку знойдзеш. Не скажу, падыходзілі да мяне мужчыны, і рабацяшчыя, і ціхія, добрыя, толькі навошта мне гэта?

Тады Міцька як ніколі, напэўна, пашкадаваў сябе, што ён з заганай. Яна яму адкрываецца шчыра, можа, пагаварылі б, зразумелі адно аднаго, можа, ён і застаўся б у яе. Мала што ўсім адмаўляла. І яна, мусіць, разумеючы яго, сказала:

— А вы, мусіць, таксама адзін, што без жонкі прыйшлі купляць карову.

Ён не адказаў, усё глядзеў у акно, за якім згушчалася цемра. Думаў, не яго гэта лёс, не яго.

А раніцой, накінуўшы цёлцы на рожкі вяроўку, паплёўся назад у Сасноўку, абцяжараны нейкімі незразумелымі думкамі, і на яе сказанае на развітанне: «Калі раптам давядзецца тут быць, то заходзьце» слаба, з удзячнасцю ўсміхнуўся.

Як ні ўгаворваў Васіль Панкратаўну, каб жыла ў яго, адмовілася. Разважала так: яны маладыя, яшчэ не нажыліся, не намілаваліся, грэх ім замінаць. У Фені ніколі не было свайго кутка, ёй жа цяпер сама адчуць сябе гаспадыняй у сваёй хаце. Хай жывуць самі па сабе, а калі што, дык яна яшчэ не зломак памагчы: ці агарод прапалоць, ці бялізну памыць, ці яшчэ што. Феня цяжарная, ёй трэба берагчыся. Цяпер жа свет кволы пайшоў. Гэта ў яе, Панкратаўны, маладыя гады жанчыны нараджалі часта там, дзе рабілі. І дзеці здаровыя былі. Цяпер жа і дактары сочаць за здароўем парадзіх, і ў бальніцах нараджаюць, а ўсё адно дзеці хварэюць часта. Так што дапамагчы яна дапаможа, а так, хай Васіль прабачае...

Васіль спачатку пакрыўдзіўся, маўляў, людзі скажуць, прывёз з горада жанчыну, пасяліў у інтэрнаце. Але потым, як яна памяркоўна выказала свае думкі, згадзіўся.

Панкратаўна пасялілася ў інтэрнаце, адчувала сябе тут добра. Займала яна адна вялікі пакой, вокны якога выходзілі ў бор. Пасля работы было прыемна глядзець на спакой лесу, і яна не шкадавала, што прыехала сюды, меркавала парабіць да зімы, а там будзе бачна.

Раніцой у шэсць гадзін яна спяшалася да лесаўчастакаўскай сталоўкі. Тут атрымлівала прадукты. Пакавала ў цэлафанавыя мяхі мяса, гародніну, крупы.

Спачатку ёй дапамагалі мужчыны ўсё гэта грузіць на машыну або аўтобус. Часта забіраў яе з сабой у машыну Васіль. Калі ў яго была пуцёўка на гэту дзялянку, падганяў МАЗ да сталоўкі, усцягваў мяхі ў машыну, садзіў Панкратаўну і вёз на дзялянку. Але аднойчы гэта ўбачыў Стрынадка, накрычаў, бо прыйшла паперка з леспрамгаса, якая забараняла перавозіць пасажыраў на грузавых машынах.

Раніцою Панкратаўна заўсёды пыталася ў мужчын, што ім гатаваць на абед — снедалі і вячэралі ўсе дома, — яны заказвалі няхітрыя стравы: боршч, кашу, кампот. Клопату ў яе з кухняй не было, яна гатавала, як умела, але мужчыны хвалілі, казалі, што смачна. Гэта радавала, аказваецца, яна яшчэ нечага варта.

Панкратаўна некалькі разоў цікавілася ў Васіля, ці патрэбна Фені яе дапамога, ён адказваў, што не, да-

памагае маці. Васіль запрашаў у госці. Панкратаўна дзякавала, абяцала зайсці, як надарыцца час, але ўсё не выпадала. Лесарубы працавалі кожную суботу, а ў нядзелю яна ездзіла ў горад, глядзела, як і што на кватэры. І разам з тым яна рыхтавалася, каб пайсці ў госці, думала, што купіць маладым у падарунак, першы раз у хату з пустымі рукамі ісці няёмка. Гэта даўней было дастаткова прынесці бохан хлеба, цяпер жа, мабыць, моладзь пра такую завядзёнку і не ведае. Значыць, трэба нешта купіць, каб спатрэбілася гаспадарам.

Спачатку Панкратаўна мелася купіць што будучаму дзіцяці, але потым спахапілася, успомніўшы, што раней не было завядзёнкі загадзя рабіць гэта. Купляць жа нешта Фені ці Васілю з адзення або абутку таксама было няёмка, пакрыўдзяцца яшчэ, маўляў, жывём у дастатку.

Выйсце са свайго становішча яна знайшла нечакана. Пайшла аднойчы пасля абеду па ваду да рэчкі, як звычайна хадзіла сцежкай, мінаючы лаўжы, каляіны, штабялі хлыстоў, задумалася, узяла правей і набрыла на малады сасоннік, здзівілася: на палянках было багата суніц, буйных, як вішні, сакаўных.

«Вось што я прынясу Фені», — падумала яна, паставіла вёдры і давай збіраць. Забавілася, не прыкмеціла, што дзень канчаецца. Прыслухалася, наўкола ціха. Яна заблудзіла, не ведала, што яе гукалі, сігналілі ёй, а яна, па ягадах, ладна адышлася ад дзялянкі і ад рэчкі.

Мужчыны хваляваліся: жанчына гарадская, яшчэ куды ў дрыгву залезе. Не хваляваліся толькі Сідорын і Гаўрыленка. Гаўрыленка абураўся: узялі на сваю галаву старую, калі што, давядзецца адказваць. Сідорын абураўся, што яго дома вечарам павінны чакаць людзі, а ён вымушаны з-за некага сядзець у лесе.

Міцька Кавалёк, які пасля спрэчкі з Іванам наогул не жадаў сустракацца з лесарубамі, прыйшоў на дзялянку ў той час, калі па яго разліку, яны павінны былі паехаць. Здзівіўся, убачыўшы, што яны затрымаліся, ды нечым устрывожаныя. Яму сказалі, што кухарка некуды знікла, і вось цяпер не могуць дагукацца, не ведаюць, што рабіць.

Міцька ведаў, што на дзялянцы новая кухарка, але з ёй не бачыўся, пачухаў патыліцу, сказаў, што тут чалавек знікнуць не можа. Ён выззаўся ісці шукаць.

Мужчыны пайшлі з ім, і толькі Гаўрыленка і Сідорын паехалі ў пасёлак з апошнім лесавозам.

Панкратаўну знайшлі хутка, Міцька адразу ішоў па яе следзе, нібы яны змовіліся, знайшлі яе зажураную ля поўнага вядра суніц.

Мужчыны жартавалі, смяяліся, казалі, ці не ўздумала яна з усяго лесу пазбіраць ягады, былі рады, што знайшлі, а Панкратаўна адчувала сябе вельмі няёмка, баялася падняць на мужчын вочы.

І калі прыйшлі да парэма, ля якога чакаў аўтобус, папрасіла, каб мужчыны ехалі без яе, сказала, што прыйдзе сама пехатою.

— Едзьце, едзьце, не вяжыцеся к чалавеку, — сказаў ім Міцька.

Мужчыны паехалі, спадзеючыся, што Міцька прывядзе Панкратаўну ў пасёлак, і сапраўды, можа, ёй трэба некуды зайсці. А ў Кавалька які клопат тут? Ды і яму весялей.

## 18

Калі лесарубы паехалі ў пасёлак, Міцька і Панкратаўна засталіся ўдваіх ля парэма. Міцька бачыў, разумеў, што жанчына адчувае сябе па-ранейшаму няёмка: столькі клопату прынесла людзям, цяжка перажывае здарэнне. Яму вельмі хацелася яе суцешыць, і ён не ведаў, як гэта зрабіць. Таму, гледзячы міма яе, у бок лугу, сказаў:

— Годзе ўжо вам так пакутаваць. З кім не здараецца. Заблудзілі, а яны падумалі бог ведае што, ніхто не сварыўся, ну, і добра. Так што...

— Дзякуй вам, Змітро, — сказала яна, — мабыць, каб не вы, начаваць бы мне там.

Пачуўшы сваё імя, Міцька скалануўся. Яму надзіва знаёмым здаўся гэты мяккі голас, здаецца, ён яго чуў не толькі ў сне, а і наяве, яму аж перахапіла дых на імгненне, саўладаўшы з сабой, спытаў, памкнуўшыся да яе:

— Скуль вы мяне ведаеце?

— Ды яшчэ там, у ягадах, як мяне знайшлі, адразу вас пазнала. Гэта ж вы некалі былі ў маёй хаце ў Падрэччы, карову купляць прыходзілі? Ці памыляюся?

Так, яна! Міцька ўважліва паглядзеў на Панкратаўну. Яму і там, на паляне, на імгненне падалося, што ён ужо бачыў гэтую жанчыну, але волі думкам там не даў, баяўся, што мужчыны будуць сварыцца. Ну, падалася тады знаёмай, ці мала людзей ён пабачыў на сваім вяку... А тут, як удваіх, дык яна. Тут іншае... Падрэчча...

Тады там нешта такое ўзварушыла яго душу, напоўніла пяшчотай і цяплом да той гаротнай жанчыны. І вось цяпер тое напаўзабытае цяпло зноў ускалыхнула яго душу, устрывожыла, нібы ў аголеную ранку тыцнулі гарачым вугельчыкам. І яму цяпер, як пазнаў яе, як успомніў час, праведзены некалі ў Падрэччы, закружылася галава, пахіснулася пад нагамі зямля, і ён прысланіўся да парэма.

— Вось не чакаў дык не чакаў, — прызнаўся ён. — Ды і казалі, што кухарка наша аднекуль з горада, хто б мог падумаць.

— Ага, апошнія гады я жыла ў горадзе.

— Значыць, з'ехалі з Падрэчча. Што так? Прычына нейкая была?

— Была. Хіба без прычыны пакінула б я свой кут, сваіх людзей?

— Яно так. І птушка, і звер без прычыны свайго не пакідае. Вунь колькі тут было птушкі і звера, пакуль не пачалі пляжыць дзялянку... Так, мабыць, і чалавек.

— Ну, можа, не так... А жылося мне нясоладка, самі бачылі. Удава. Рабіць я не баялася, рабіла, можа, не лепш, але і не горш за іншых. Але ж як насланнё адзін час на мяне пасыпалася. Сынок, было, цяжка захварэў, ледзь не страціла, дзякаваць, добрыя людзі выратавалі. Потым, вы ж, мабыць, ведаеце, як па старым часе было, гразіліся ці не пад суд аддаць, не было ў каго ўцехі шукаць. Ды і сыну пашпарт праўдамі і няпраўдамі вытрабавала, паехаў вучыцца, і мне без яго свет там стаў не міл.

— Косцік? Я памятаю, працавіты хлапчук. Дзе ён?

— Скончыў сямігодку, падаўся на марака вучыцца. Цяпер на моры плавае, капітан. Праўда, бывае, па году не бачу яго. А так усё добра. Гэта ён мяне з Падрэчча забраў, пабудаваў за свае грошы ў горадзе кватэру, кажа, жыві, мама, хоць на старасці не гаруй. Вось і жыла... На ніжнім складзе рабіла, аж уз'еўся там на мяне адзін чалавек, дзякаваць, Васіль Чубацюк надавуміў, сюды забраў.

— Але, дык гэта, чуў, была спрэчка з Карнеевічам? Ого, злы чалавек, я яго ведаю. Участковым некалі ў нас рабіў. Жыў, як пан. Але і на яго ўправа знайшлася. Вытурылі з органаў. Цяпер за такіх узяліся.

— Ну, можа, я сюды прыехала не толькі з-за той спрэчкі. Колькі гадоў у горадзе, там і пенсію атрымала,

а вот цягне бліжэй да людзей, да родных мясцін, да лесу. Не магу я там, у горадзе. Людзі як чужыя адно аднаму...

Міцька разумеў, што ў яго становішчы самае лепшае — падтрымліваць размову, але гаварыць ён быў не мастак, таму ў яго не клеілася, яму хацелася стаяць побач з ёй моўчкі, слухаць яе, адчуваць яе дыханне, бачыць яе. Ён быў удзячны лёсу, што на астачу дзён, можа быць, лёс падараваў яму сустрэчу з жанчынай, якая ўскалыхнула яго душу многа гадоў назад. Ён і цяпер шкадаваў гэтую жанчыну, можа, не менш, чым тады: стольні перажыла! — і разам з тым яму было добра, што яны працуюць разам.

Садзілася сонца за вершаліны яшчэ не спілаваных дрэў, змрок паволі апускаўся на вільготную зямлю, вецярок слаба шасцеў у кронах дрэў.

Міцька паглядзеў на неба, сказаў:

— Ведаеце, я вас у пасёлак не адпушчу і не павяду. Заўтра выхадны дзень, вам не трэба турбавацца, днём і пойдзем.

— А ягады? — спытала яна. — Я ж іх набрала, каб прынесці Васілёвай Фені.

— Нічога, не скіснуць за ноч. А раніцой яшчэ вядро набяром, хай і ад мяне будзе... Я вам пасцялю ў парэме, а сам пасяджу ля кастра. Мне не прывыкаць...

— Няёмка, — паціснула яна плячамі.

Міцька доўга маўчаў. Маўчала і яна. Потым ён абудзіўся і, перасільваючы сябе, сказаў:

— А ведаеце, дзела прошлае... Тады, у Падрэччы, я хацеў, каб вы дазволілі застацца ў вас... Назаўжды.

Змрок згушчаўся, асядаў ніжэй да зямлі. Яна доўга маўчала. І Міцька не шкадаваў, што прызнаўся ёй, думаў, хай хоць цяпер, на старасці, калі няма ніякай надзеі, ведае, што ўвайшла некалі ў яго сэрца. І яму будзе лягчэй...

— Я гэта ведала, — сказала яна ціха, узнімаючыся па прыступках у парэм.

А Міцька пайшоў на дзялянку, вобмацкам назбіраў у цемры ламачча, прынёс яго бліжэй да дарогі, расклаў касцёр. Ён сядзеў ля яго, адчуваючы нейкі спакой на душы і цяпло, яе цяпло, цяпло жанчыны, якая мроілася яму неаднойчы, якую кахаў употай безнадзейна ўвесь гэты час.

Ну што ж, думаў ён, не згасла яе цяпло, з'явілася...

А Панкратаўна, лежачы ў парэме на раскладушцы, таксама не спала. Праз вузенькае акенца яна глядзела ў неба. Яна бачыла, як сярод чарнаты недзе далёка-далёка свяцілася, міргала адзінокая слабая зорачка... Яна шкадавала гэтага чалавека, які ёй таксама некалі запаў у душу, шкадавала, як можа шкадаваць жанчына дарагое, незабыўнае.

А зорачка ўпарта ліла на зямлю сваё слабое святло, якое паступова ярчэла і ярчэла, нібы саграваючы ўсё наўкола: неба, лес, зямлю, яе, Панкратаўну, запалоніла сваім цяплом і святлом, і яна правалілася ў сон...

## 19

Тым вечарам, бліжэй да поўначы, калі Панкратаўна спала, а Міцька драмаў ля кастра, да дзялянкі пад'ехала машына.

Міцька адкрыў вока, яго асляпіла тонкае, як лязо, святло фар. Яно нібы падрэзала дрэвы, слізганула па колах парэма, пабегла па дзялянцы да эстакады Івана Сідорына.

Па гуле матора, Міцька адзначыў, што гэта не МАЗ, гук больш слабы і тонкі, такіх машын на лесаўчастку няма.

Ён падхапіўся і кінуўся наперарэз.

Не даязджаючы да яго крокаў пяць, машына спынілася. З кабіны выскачыў мужчына.

— Гэта я, Мітрый бацькавіч, — сказаў ён. — Вось і добра, што ты тут... А мне казалі, што ты павёў кухарку ў пасёлак. Думаў, як жа без цябе забіраць?.. Але падвярнулася машына, раней напытаў, думаў, пасля табе скажу... Лясіна ў мяне там, дубок.

— Ну што ж, калі маеш паперку, то грузі. Толькі днём лаўчэй было б. А так цёмна.

— Нічога, пагрузім, днём не выпадае, рабіць трэба.

— Ну, тады давай паперку.

Чалавек палэпаў па кішэнях, здзівіўся:

— Ат, садовая мая галава! Дома забыўся. Спяшаўся. Ну, нічога, потым, потым. — І махнуў шафёру: — Давай!

Машына паволі кранулася з месца, але Міцька не сышоў, таўханула яго буферам, спынілася.

— Што яшчэ? — пачулася з кабіны.

— Без паперкі не дам! Няможна, забаронена!

— Мітрый, — папрасіў мужчына, — кінь жартаваць.

Як гэта не дам? Я, панімаеш, за машыну заплаціў, людзі з горада гналі, не ехаць паражняком назад. Ты што, мяне не ведаеш?

— Ведаю, але нельга. Паперка трэба.

Мужчына маўчаў. З кабіны гупнуў на зямлю другі мужчына, раздражнёна сказаў:

— Ты чаго, Іван, з ім цацкаешся? Нібы ён тут гаспадар. Сказана, выпісана, дай дарогу!

— Чакай, Карнеевіч, — сказаў мужчына, — самі разбяромся. — І да Міцькі: — Мабыць, помслівы ты, злуеш за тое... Дык і ты дурань, і я не лепшы. Ты мне пад нож, а я на цябе. Спужаўся ж. Ну, будзе, будзе злаваць.

— Я не злую, але не пушчу. Няма ў мяне такога права.

— Ды якое ў цябе наогул сабачае права? — не ўцярпеў Карнеевіч. — Хіба не пазнаеш, не ведаеш нас?

Міцька пазнаў, вядома, і таго і другога.

— Карнеевіч, я сваё права ведаю. Няма права чужое браць. А калі тваё, пакажы дакумент!

— Счас пакажу! — Карнеевіч падскочыў да Міцькі, з усяе сілы штурхнуў яго ў грудзі.

Міцька адляцеў назад, выцяўся галавой аб буфер, абмяк, асунуўся ў каляіну.

Пры святле фар было бачна, як са скроні цурчыць кроў, заліваючы твар, сцякаючы на апратку.

— Ты што, Карнеевіч! — прашаптаў Іван, схіляючыся над Міцькам. — І тут жа выпрастаўся: — Оечкі, дух вон...

— Не можа быць?.. — ускрыкнуў Карнеевіч, таксама схіляючыся над Міцькам, які нерухома ляжаў у каляіне. — Так, капут... Не разлічыў...

— Не разлічыў, не разлічыў, — стагнаў Іван. Усё цяпер, амбец...

— Ды не скуголь! — выціснуў праз зубы Карнеевіч. — Рабіць што?

— Што, што, у міліцыю!

— Ты што? З глузду з'ехаў?.. Хто бачыў... Гы... Ага, у лоўж яго.

— Як?!

— Проста. Ты за галаву, я за ногі... У лоўж, і слядоў няма. Бензіну пырснуць.

— Не... Я не буду! Я не забіваў!

— Дурань!.. Каму дакажаш, што не ты? Я законы ведаю.

Яны падхапілі Міцьку, адзін за ногі, другі пад пахі, завалаклі да лаўжа, укінулі ў яго, як палку.

Міцька не варушыўся.

— Бензін, бензін, хутчэй!

З кабіны выскачыў трэці, пагрымеў вядром ля бака, падбег да лаўжа.

— Хто?

— Давай, давай! — Карнеевіч выхапіў вядро, лінуў у лоўж. — Запалку! Ну?

— Ты сам.

— Не куру! Ты!

У Івана ламаліся запалкі, урэшце адна успыхнула, засланяючы твар рукой, кінуў у лоўж.

Гухнула полымя.

— У машыну!

Яны ўскочылі ў машыну, матор узвыў, машына рванула з месца, хутка ўжо была на дарозе.

Гул матора, святло, якое скакала па сценах парэма, скінулі Панкратаўну з раскладушкі, разбудзілі. Яна, яшчэ нічога не разумеючы, адкінула з усяе сілы ад сябе дзверы. У яе абарвалася сэрца: яна ўбачыла, як ад лаўжа, ахопленага полымем, матнулася ёй насустрач чалавечая постаць, ахопленая агнём.

— Міцька!!! — немы крык вырваўся з яе грудзей.

Яна кінулася туды, да постаці, якая ўжо ўпала на зямлю і качалася па ёй. Спатыкалася, падала, абдзірала рукі, збівала калені аб ламачча. Пот і слёзы засцілалі ёй вочы, а яна ўсё бегла. І здавалася, бег яе быў запаволены, як у сне, і гэтая адлегласць ад яе да постаці, якая ўжо замерла на зямлі, толькі языкі агню звіваліся над ёй, здавалася, самай доўгай дарогай у яе жыцці. І немы крык ужо не вырываўся з яе грудзей, яна сіпела, усё бегла туды, туды, туды...

І вось ужо чуе хрып: «Ніна, Ніна...»

І яна, нарэшце дабегшы да яго, упала перад ім на калені, пачала ліхаманкава збіваць агонь з апраткі, не зважаючы, што на руках успыхваюць і лопаюцца пухіры. Яна разумела, што яе Міцька жывы...

# апавяданні





## Пад грабеньчыкам

### I

На агульным сходзе Мінькоўскага лесаўчастка вырашылі пабудаваць маладзёжны пасёлак. Не адразу вырашылі. Усё было ў перапоўненай зале старога, пастаўленага адразу пасля вайны, невялікага, аблепленага лозунгамі і заклікамі клуба. І рэплікі з месцаў накшталт: «Але, маладым дык ужо ў бацькоў цесна! Адлучайце ад нас дзяцей, адлучайце...», і бязладная гамана, і напружаная цішыня.

Гаману пачынаў Васька Чмых, трактарыст і абэлтух. Ён крычаў: «Лацвей будавацца таму, у каго грошай мех! А калі я канцы з канцамі не магу звесці, дык што, у пазыку лезці?..» Былі і пагрозы Чмыху, каб не муціў ваду, вытурыць са сходу, і недаўменне: за што? Гразіўся былы цяслярр, цяпер пенсіянер і нязменны мясцовы грамадскі дзеяч Мацей Пятровіч Ветрамін.

Як бы там ні было, але ў рэшце рэшт ці не на той бок ночы, калі ўсе стаміліся, аднагалосна ўскінулі рукі: пасёлак будаваць!

Вырашылі дык вырашылі...

Стары пасёлак, у дзвесце дамоў, ставілі адразу пасля вайны. Сярод старыны — змешанага лесу. Ставілі на паляне, рассоўвалі яе, карчавалі пні, пляжылі, засыпалі нізіны. Дамы ставілі не абы-якія, а вялікія, з добрай, не з'едзенай падсочкай сасны. Здаецца, ставілі навечна. Але што зробіш? Чалавек жыве, колькі яму наканавана, столькі жыве і старэе хата. Вятры, дажджы, завеі сціраюць паступова першароднасць сцен, стрэх, дрэва чарнее, трэскаецца, хата нібы ўрастае ў зямлю, трухлее. Фарбуй не фарбуй, аббівай сцены вагонкай, перакрывай

страху бляхаю ці шыферам — старое яно і ёсць старое, добра маладзіцца маладому. Дык што шкадаваць? Сваё адстаяла, можа, старым у ім і старасць зручна каратаць, а маладым...

Так разважалі пасля таго, як начальнік лесаўчастка Сцяпан Міканоравіч Крушына, маленькі, кругленькі, перадпенсійнага ўзросту чалавек, казаў, што новы пасёлак трэба будаваць побач з машынным дваром, канторай, клубам, медпунктам, магазінам, школай, якія стаялі наводшыбе, — каб чалавеку тут жыць зручна было.

Ізноў загаманілі, перабіваючы адно аднаго, — далекавата ад старога пасёлка!

І тады ўзняўся Ветрамін. Ён правёў перад сабой рукой, быццам хацеў уціснуць у крэслы тых, хто быў не згодны, сказаў:

— Таварышыкі, ціха! Трэба разумець бягучы момант. Маладыя хочуць жыць асобна, ды і ўстаноўка такая ёсць!

Лысы, нізенькі, ён пабліскваў круглымі шкельцамі акуляраў, глядзеў у залу.

Ёсць ці няма такой устаноўкі, не ведалі. Але прыціхлі. Ветрамін — галава! І як на пенсію пайшоў, дык па-ранейшаму з раёна не вылазіць, усё ездзіць на нейкія нарады, а значыць, ведае, што да чаго, ну, можа, калі па якой дробязі зброша. А тут жа справа — дзяржаўная. Тут ён маніць не будзе. За гэта, як ён сам любіў паўтараць, можна, заплюснуўшы вочы, прыцягнуць да адказнасці за скажэнне лініі.

Як ні мяркуй, Ветрамін — аўтарытэт. Без яго не абыходзіўся ні адзін сход на лесаўчастку. Яго заўсёды выбіралі ў прэзідыум. Пастаяннае яго месца было — сядзець за сталом на сцэне, а абавязак — час ад часу пастукваць алоўкам па графіне. Але трэба аддаць яму належнае, умеў Ветрамін, калі людзі не згаджаліся з думкай начальства, уставіць сваё важкае слова, пасля чаго ніхто ўжо не сумняваўся, што трэба аднагалосна галасаваць «за».

У Ветраміна было столькі ўсялякіх грамадскіх пасад, што іх хапіла б на цэлую лесарубаўскую брыгаду. І не дзіўна, што яго кароценькае выступленне, як потым казаў Чмых, сустрэлі «бурнымі працяглымі апладысментамі». Той жа Чмых на сходзе тады ўзняўся з месца і гаркнуў што было сілы: «Даруй, Пятровіч, мне, невуку!

Калі ёсць такая ўстаноўка, то я першы «за». Толькі каб усё было не на словах, як звычайна!»

Вось табе і Чмых. Бываюць і ў яго галаве пробліскі. Даўно б так. А то вясной вытурылі з дзялянкі: то ён трактар аберне на пнях, то падлезе куды не просяць, то ў самы разгар работы ўсё кіне-рыне ды пойдзе швэндацца па лесе.

Дык вось. Адвялі пад новы пасёлак ладную паляну за шашой, дзе некалі была першая лесаўчасткаўская дзялянка. Тут спілавалі першую сасну, адсюль лік «дзелавой драўніны» пайшоў на дзесяткі, сотні, тысячы кубоў. Паляна з часам парасла маліннікам і крапівой, маладняк тут не пасадзілі, не да гэтага было, трэба было лес валіць, пні струхнелі, і Чмых неяк даводзіў Ветраміну, які быў адказным на прадпрыемстве за ахову прыроды, што на паляне трэба паставіць помнік. Ну, можа, не помнік, а залаты пень, каб ведалі: адсюль пайшлі сотні, тысячы кубаметраў драўніны.

Ветрамін тады ўсур'ёз гэта ўспрыняў, але яго паднялі на смех, пасля чаго Чмыха ён недалюбліваў.

Калі падумаць, сапраўды месца зручнае, каб будавацца. Адразу за сажалкай, у якой дзеці ўлетку боўтаюцца, а зімой коўзаюцца на лёдзе. Між іншым, сажалка пры новым пасёлку будзе мець вялікае супрацьпажарнае значэнне, як казаў Ветрамін.

Хто сам некалі будаваўся, ведае, першая справа — давесці да ладу пляц. Каму гэта даручыш, калі ўсе працуюць у лесе! Ага, Чмых без справы.

Чмых назаўтра раніцаю прыгнаў бульдозер на паляну і рады старацца. Адкінуў дзверцы кабіны, адну нагу, як кавялу, вытыркнуў на гусеніцы, зубы сушыць:

— Пятровіч, гэта мы ўмэнт! Дай дарогу, ламаць — не будаваць!

Ветрамін аж прысеў:

— Ты ў мяне глядзі, ламаць! Ссаджу з тэхнікі, будзеш з лапатай у дарожніках швэндацца.

Чмых знайшоўся:

— Пятровіч, я што? Я выканаўца, так скаць, рабсіла. Ты — кіраўнік. Спрос з цябе. А дарожнікамі не страш. Па майму разуменню, гэта на мой розум пасада. У цябе пасада, дык гэта ўжо якая пасада!

Злагодзіў гэтым Ветраміна, той памякчэў:

— Ну мая пасада, Васілій, вядома, не для цябе. Яна, брат, розуму патрабуе.

Чмых узяўся рыхтаваць пляц, дарма, што зубы скаліў, здзёр дзірван, ямкі засыпаў, дрэўцы, дзе можна было, не крануў. Гэта было на другі дзень пасля сходу. А тады на сходзе, як пачалі разыходзіцца, зноў узняўся Чмых:

— Таварышы, чакайце! Будаваць-то будаваць, а хто ж кіраўніком будзе? Так скаць, прарабам?

І сапраўды, як гэта не падумалі, хто? Ізноў гамана.

— Мне слова! — праціснуўся да сцэны Ляксей Дыванец, былы шафёр, яшчэ зграбны пенсіянер, шыракаплечы, высокі.

Ляксею слова далі. Чалавек ён сур'ёзны, увесь час хадзіў у перадавіках, ён абы-чаго не скажа. Кажы!

— Чаго мы будзем шукаць іголку ў стозе? — паказаў пальцам Ляксей на Ветраміна. — Хто ж яшчэ, як не паважаны наш Пятровіч! Памятаеце, якім ён цеслем быў? Ён табе і нямецкі вугал складзе, ён табе і наш зладзіць, ён і вокны пасадзіць, і ганак змайструе як цацку. Дык што?

І сапраўды, што... Ветрамін.

Пачуўшы такое, Ветрамін рашуча ўзняўся з месца, узняў руку, патрабуючы цішыні, потым каўзануў яе ў нагрудную кішэню фрэнча, дастаў грабеньчык, старанна расчасаў на скронях рэдзенькія жоўтыя валасы, што азначала: калі без мяне нявыкрутка, згода.

## 2

Пасля таго як Ветраміна прызначылі кіраваць будоўляй, ён як падрос. Зноў, як некалі, на вуліцы яго бачылі пры саломенным капелюшы, зноў у дзевяць гадзін ён спяшаўся да канторы. Спяшаўся, можа, не вельмі дакладна сказана. Ён ішоў. Павольна. Як і раней. Ступаў так: спачатку выкідваў торс наперад, ногі на зямлю ставіў на насочкі, быццам абмацваў, потым нетаропка апускаўся на пяткі, на імгненне заміраў і зноў валюх наперад. Але цяпер ён не браў, як раней, старую цяслярскую скрынку з інструментам. Гэта раней было, выходзіць з хаты без чвэрткі дзевяць. Спыніцца на вуліцы. Пагледзіць у адзін канец, у другі. Як толькі каго ўбачыць, крычыць жонцы Сынклеце: «Давай!» Тая спяшаецца з двара, несучы яму скрынку. Мацей на вуліцы бярэ скрынку ў яе на сагнутую ў локці руку, крыху адстаўляе ад сябе і кіруецца на службу. Калі хто яго спыніць, каб

што спытаць ці так для прыліку, Ветрамін тлумачыць:

— Прабач, шаноўны грамадзянін, няма калі разводзіць тары-бары. Калі маеш справу, прыходзь да канторы, пагаворым. Сур'ёзныя пытанні вось так проста на вуліцы не вырашаюцца.

Тое, што няма калі, не надта верылі. Да гэтага часу той, хто спяшаўся, ужо на дзялянцы працаваў, ехаў рана і позна вяртаўся. Мацей жа, як і ўсе лесаўчасткаўскія служачыя, ішоў да дзевяці і вяртаўся ў шэсць вечара. Вечарам ён любіў пасядзець на лавачцы ля нізенькай, з двума (адзіная такая ў пасёлку) акенцамі хаты. Тут яго сустракала Сынклета. Высокая, Мацей ёй да пляча, на выгляд яшчэ маладжавая кабета. Калі хто ля іх спыняўся, Мацей казаў, што столькі меў клопату за дзень, ажно галава расколваецца — адно шкадуй яго за гэта!

— Хай бы цябе, Пятровіч, ужо назусім перавялі ў служачыя, — спачувала Сынклета, — усё пяклуешся, пяклуешся, ні ў чэсць ні ў ласку.

— Некаму ж трэба, — глыбакадумна казаў Ветрамін, — пасада такая, цесля. На гэтую пасаду, як ён казаў, Ветраміна прызначылі адразу пасля вайны, калі арганізоўвалі лесаўчастак. Тады Мацей з будаўнічай брыгадай узводзіў адміністрацыйныя будынкі, пазней ставіў людзям хаты. Калі пасёлак пабудавалі, Мацей меў абавязак вычэсваць дышлы для прычэпаў лесавозаў, рамантаваць кузавы, падлажваць ганкі канторы, клуба, медпункта, абгароджваць штыкетнікам машынны двор. З гэтым ён спраўляўся добра, яго не тузалі на іншыя работы, не пасылалі на дзялянку нават тады, калі з планам была нявыкрутка. Такім чынам Ветрамін дзень пры дні быў на вачах начальства, іншы раз нават абмяркоўваў з кіраўнікамі сякія-такія лесарубаўскія справы. Гэта, напэўна, і давала яму падставы лічыць сябе служачым.

Ён і апранаўся адпаведна, як служачы тых часоў. Летам — у дыяганалевую, ахоўнага колеру гімнасцёрку, падпяразаную афіцэрскім рэменем, у галіфэ, і хромавыя боты. Зімой абуваў белыя, з заламанымі халявамі фетравыя валёнкі, апранаў доўгую, пацёртую пад пахамі і патрэсканую на спіне скуранку, якую аздабляў сабачы каўнер. Але нязменна пры ім была цяслярская скрынка.

Увогуле Ветрамін лічыўся не тое што чалавекам бывалым сярод лесарубаўскага люду, але разумным і адукаваным. Да вайны ён паспеў скончыць нейкія курсы

рахункаводаў, на фронце быў старшыной роты, з якой дайшоў да гэтых мясцін. Тут яго параніла, тут у райцэнтры ляжаў у шпіталі, а калі камісавалі, прыстаў у прымы да Сынклеты, маладой жанчыны, муж якой загінуў на фронце.

Што Ветрамін адукаваны, прыстала да яго аднойчы і назаўсёды. Было гэта, калі на лесаўчастак з раёна прыехаў упаўнаважаны, па тым часе іх не тое што паважалі, а пабойваліся, даводзіў, што на лесаўчастку павінны стварыць нейкае таварыства (хто цяпер помніць якое?). Людзі няўцямна паціскалі плячамі, не разумелі, навошта яно. Аказалася, што «предприятие», як казаў упаўнаважаны, псуе раённыя паказчыкі. Калі так, тут свой інтарэс забудзь! Згадзіліся. Але трэба было абраць старшыню. Мясцовае начальства мелася на гэту пасаду вылучыць Ляксея Дыванца, ужо тады чалавека прыкметнага, але той, пачуўшы такое, пачаў прасіцца:

— А чаго менавіта мяне? Мне ж рабіць трэба!

Ляксею даводзілі, што пасада грамадская, але той нічога не хацеў разумець, адно «мне рабіць трэба, ды адукацыі мала».

Упаўнаважаны пачаў злавацць, тады Ляксей знайшоўся:

— Я так разумею, што старшыня і старшына адно і тое. І ў таго і ў другога ў падпарадкаванні людзі. І таму і другому трэба ўмець працаваць з людзьмі. Мы ўсе тут, акрамя начальніка і Ветраміна, радавыя. Калі начальніка нельга, то хай старшынёй будзе Ветрамін.

Напэўна, Ляксея выручыла менавіта гэта: «Мне рабіць трэба». Яно сапраўды так, пяцёра дзяцей адно за адным, трэба накарміць, апрануць, не проста сказаць... Старшынёй абралі Ветраміна.

Затым розныя пасады як з рога пасыпаліся на Мацея. Ён — старшыня паляўнічых і рыбакоў, ён і культасветнік, ён і таварыства выратавання на водах узначальвае (з-за гэтага Мацей настояў, каб выкапалі сажалку, бо ні возера, ні рэчкі ў пасёлку няма), ён і старшыня таварыскага суда...

Вядома, што пры сваіх пасадах цяпер скрынку Ветрамін насіў дзеля прыліку, поўнасцю заняўся грамадскімі справамі, хаця, як казаў Чмых, дакладна не ведаў іх. Але інтарэс Ветрамін меў да ўсяго. Бывала, пасварацца жанчыны, што куры выграблі грады, або дзеці абласцяшаць у каго яблыкі-зялепухі, ці прывяжа ўдава з дзя-

лянкі воз ламачча без дазволу, Мацей тут як тут. Ушчувае, страшыць, іншы раз пагражае аддаць пад таварыскі суд. Але на яго пагрозы не дужа зважалі: хай цешыцца чалавек, калі іншага клопату няма ў яго, бо асноўны свой клопат Мацей паступова забыў — ужо другія людзі цяслярылі на лесаўчастку.

Сваёй гаспадаркі Ветрамін не меў, хаця пасялкоўцы жылі як звычайныя вяскоўцы. Яны трымалі кароў, свіней, сеялі агароды, касілі сена. Праўда, у Мацея агарод быў, але ўтравеў, дзве-тры соткі бульбы ён садзіў, але тая не радзіла.

Шматлікія пасады, як казаў Чмых, грамадскага дзеяча мясцовага значэння Ветраміна давалі права раіць усім дзе трэба і не трэба. Бывала, ідзе Мацей на абед, надвор'е стаіць — хоць купляй, жанчыны сена на вуліцы варушаць. Вуліцы ў пасёлку цяністыя, скрозь паўз платы бярозы, ліпняк, рабіны, нават пры залатым часе за дзень сена на вышкі не ўскінеш, жанчыны тыя нібы мурашы шчыруюць. Ветрамін спыніцца побач. Памацае траву, прыжмурыць вочы, паглядзіць на чыстае, як акно перад святам, неба, потым:

— Ты, грамадзяначка, пасля паўдня скідай яго ў капёшкі ды завяршай добра. Надвечар задажджыць!

Грамадзяначка рукамі плясь:

— Чаму гэта, Пятровіч, задажджыць? Неба вунь якое, і не парыць.

— У тым і загваздка, што не парыць. Але паглядзі, якое жоўтае і касматае сонца. Жаўток расціснуты!.. Мая справа цябе папярэдзіць, а ты ўжо сама, калі не разумееш у прыродных з'явах, глядзі.

Сумняваючыся і божкаючы, раз-пораз з трывогай паглядаючы на неба, жанчына хапаецца, скідвае напаўсырую траву ў копы, а дажджу ні сёння, ні заўтра. Сяк-так высушыць сена, скідае на гарышча, не праміне, каб не ўпікнуць Мацея:

— А што, Пятровіч, твая праўда! Згнаіў дождж маё сена. Паглядзі, і вады на вуліцы скрозь па забарсні.

— Ты што, маладзічка, злуеш? — уступіцца за Мацея Сынклета. — Хіба ён табе дрэннае раіў? Радзіва і тое абмыляецца, а каб мой чалавек не абмыліўся?

— Ага, — падтрымае яе Чмых, — Пятровічу дык ужо і нельга памыліцца.

Жанчына паціскае плячамі: і сапраўды, шкоды ад Мацеевай парады няма. Ну, пахвалявалася, папеклава-

лася, але ж сена на месцы, а калі б і сапраўды пайшоў дождж? Сушы тады тое сена ды перасушвай.

Даваў ён парады і як бульбу садзіць, і як яблыню прышчапіць, і дзе калодзеж капаць. Памяркоўныя людзі пасміхаліся, не пярэчылі, рабілі па-свойму, а вось да цяслярскіх парад Ветраміна прыслухоўваліся, нічога не скажаш, там ён быў спец.

Але найбольш любіў Ветрамін сходы і ўсялякія пасяджанні. Тут ужо яго, як кажуць, хлебам не кармі, а пасадзі ў прэзідыум. Тады ён паважна ўзнімаўся з месца недзе з сярэдзіны залы (садзіўся так, каб усе бачылі), кашляў у кулак, праціснуўся між крэслаў да праходу, спыняўся там на хвіліну, акідваў усіх строгім позіркам, затым валюхаўся да сцэны.

Ідучы, даставаў з кішэні грабеньчык, старанна шморгаў ім па рэдзенькіх валасах на скронях, потым прыгладжваў іх далонямі, займаў месца за сталом ля графіна.

Як бы там ні было, але Ветрамін не раз выручаў лесаўчастак. Вось, скажам, стаіць для лесарубаў добрая пара, дарогі пасля дажджоў падсохлі, на дзялянках хлыстоў — толькі спраўляйся вывозіць, а на прадпрыемства прыходзіць тэлефанаграма, згодна якой трэба накіраваць у раён на нараду чалавека. Ды не абы-каго, а перадавіка. У такі час накіраваць каго з лесарубаў — тое самае, што ў жніво або сяўбу зняць з трактара механізатара, пасадзіць яго на дзень у залу ды вучыць, як яму жаць-сеяць.

Тады начальнік лесаўчастка выклікаў да сябе Ветраміна, маўляў, выручай, Пятровіч, гарым!

Спачатку Мацей казаў, што ў яго клопату багата, хоць у мех завяжыся, потым, прыкмеціўшы, што начальнік пахмурнее тварам, хуценька згаджаўся: «Ну што ж, трэба дык трэба».

Усе даўно разумелі, што клопат Мацееў не цяслярскі, ведалі, што мазалі даўно сышлі з яго рук, разумелі таксама, што і такі чалавек на прадпрыемстве патрэбны.

## 3

Але вернемся зноў да таго, што Ветрамін узначаліў будоўлю. Пакуль вазілі лес, цэглу, цэмент, Мацей даводзіў Чмыха да белага калення. Усё яму паказваў, загадваў, што той аж стагнаў, а потым ухітрыўся прыходзіць рана,

пакуль Ветрамін яшчэ быў дома. Прыйдзе Мацей, а Чмых ужо багата што без яго зробіць. Можа, яно і ладам, толькі Ветраміну не падабаецца. Прымушае перарабліваць. Чмых, як кажуць, у хамут, тады Мацей гразіцца за невыкананне зняць з тэхнікі або разабраць на сходзе.

Чмых спыняе бульдозер, высоўваецца з кабіны:

— Пятровіч, даражэнькі, прызнаю, ты галава! Але згінь з вачэй! Яй-бо, незнарок адшчыкну пяткі! Як ты тады хадзіць будзеш? На дыбачках — дыб-дыб...

Калі Мацей па-ранейшаму лез сляпіцаю, Чмых не вытрымліваў, даваў поўны газ і скіроўваў на яго трактар. Скіроўваў хітра, так каб не зачапіць, каб Ветрамін паспеў адскочыць убок, схавацца за бярэзіну ці сасонку.

— Ну я цябе, чакай, умэнт здыму з тэхнікі! Раўню знайшоў! — ківаў пальцам Мацей.

— Вось гэта, Пятровіч, не трэба, — ахалоньваў Чмых. Пачакай, пабудуем пасёлак, тады мяне кідай куды хочаш: ці ў салдаты, ці ў матросы, ці падмазваць калёсы. Хаця мне лес больш па душы. У лесніке падамся, узяць абяцаюць, пачакай.

— Вось яно што! — узрываўся Мацей. — Лёгка рабіць захацеў? А ці падумаў ты, што на гэта розум мець трэба?

Мацей пастукваў пальцамі сабе па лбе, што, мусіць, азначала: не з Чмыхавым розумам лёгка рабіць.

## 4

Праз некаторы час, калі Чмых падрыхтаваў пляц і ўсё было зроблена, каб пачынаць будаваць, са старога пасёлка а сёмай гадзіне сюды пацягнуліся мужчыны-пенсіянеры, якія і павінны былі, як вырашылі на сходзе, ставіць хаты.

Быў час, калі на машынным двары ўжо гулі МАЗы, а лесарубы паехалі на дзялянкі. Жанчыны выганялі кароў на пашу, пачынаўся працоўны дзень.

Васька Чмых ужо круціўся ля свайго трактара.

Мужчыны ішлі на будоўлю, як раней хадзілі на працу: па адным, па два, купкамі. Толькі цяпер замест сідараў з харчам трымалі ў руках хто сякеру, хто пілу, хто лапату.

Сонца жывіла наваколле ранішнімі, яшчэ па-летняму мяккімі промнямі, і хоць яшчэ халаднавата пабліскавала раса на траве, зялёных шатах дрэў, раніца пачы-

нала ўжо сціраць з зеляніны мяккую акварэльнасць лета. Вада ў сажалцы густа камечылася, у складках-хвалях варочаліся цені колеру расплаўленага свінцу, паталі. Адчувалася, што хутка восень.

Аглядаючы пляц, мужчыны хвалілі Ветраміна, на Чмыха пазіралі паблажліва, маўляў, каб не Пятровіч, гэты нарабіў бы шкоды.

Час ішоў, але Мацея ўсё не было, мужчыны сноўдаліся без справы, няўцямна пераглядаліся, што з ім такое.

— А вам толькі б не рабіць, — падкалоў іх Чмых, — начальства чакаеце. Людзі вунь на дзялянках ужо нарабіліся, так, з такімі тэмпамі і за пяцігодку пасёлак не пабудуеце.

Ляксей Дыванец зіркнуў спадылба на Чмыха, нічога не сказаў, пapляваў на рукі, узяў сякеру. Бліснула свежай заточкай, упілася ў смалістае бярно, пайшла гуляць у яго руках сякера. Ляксей увачавідкі зрабіў зацёсы, запахла смалой.

Зазвінелі сякеры, з усіх бакоў чулася гэканне, аканне, галасы. На Чмыха забыліся, як раптам яго голас:

— Стоп! Начальства сунецца!

Спыніліся як па камандзе. І сапраўды, праз шашу сунуўся Мацей. Ішоў ён нетаропка, выкідваючы наперад торс, ногі спачатку ставіў на насочкі, потым на імгненне заміраў, як абмацваў, затым апускаўся на пяткі. На сагнутай у локці руцэ Мацей трымаў счарнелую, патрэсканую цяслярскую скрынку, з якой вытыркалася тапарышча.

Калі ён падышоў, Ляксей раздражнёна кінуў:

— Позніўся, Мацей, то давай, колькі бёрнаў абчасалі, пазы рабі. Я не ўмею.

— Хы-ы, — Мацей паставіў на зямлю скрынку, — такой навукі. Вось глядзі!

Ён папляваў на далоні, старанна пацёр іх, узяў сточаную, шчарбатую сякеру, размахнуўся, гэкнуў.

Сякера адскочыла ад дзерава, як ад гумы, раз другі... Мацей то згінаўся, то разгінаўся, гэкаў, крактаў, пакідаючы на дзераве шчарбаціны.

— Не глумі! — аж прысеў Ляксей. — Ты што, сёння на свет нарадзіўся?

Мацей адкінуў сякеру, выпрастаўся, цяжка дыхаючы, выцер рукою пот з ілба, паволі асунуўся на бярно.

Мужчыны рагаталі:

— Але, Пятровіч, вось табе і на!

— Гэта не прэзідыум...

Выгляд у Мацея быў такі, хоць заплач, пашкадуй, суцеш. Але ніхто не шкадаваў. Тады да мужчын падбег Чмых, шмаргануў за каўнер Ляксея, які больш за ўсіх заходзіўся ад смеху.

— Ага, цяпер гагэчаце! Чаго, каб хто спытаўся? Такога цеслю звялі. Яму б рабіць ды рабіць, а вы яго пад грабеньчык!

— Ідзі прэч! — адштурхнуў яго Дыванец.

— Не чапай яго, — слаба папрасіў Мацей і адвярнуўся...

## Азімут

Для нашай здымачнай групы дзень, прама скажам, выдаўся не з лепшых. На кінастудыю вярталіся мы з такімі тварамі, нібы кожнаму з нас, рэжысёру, аператару і мне, надзелі гіпсавыя маскі. Для рэжысёра з сённяшняга дня я стаў чалавекам нікчэмным, бо мае героі, якіх ён «бачыў» у сцэнарыі вясёлымі, дасціпнымі, што ў любой сітуацыі за словам у кішэню не лезуць («Ай-яй, што ж гэта такое? Ды ў вас не сена, а пацяруха». Адказвалі хітравата: «Так, так... Снег белы, ды глядзяць, сена чорнае, ды ядзяць...»), перад камерай былі скаванымі, гаварылі нязвыкла для сябе: «Надвор'е сёлета кепскае, таму мы шырокім фронтам разгарнулі бітву за вялікае сена...»

Рэжысёр лічыў, што я, калі пісаў сцэнарый, пайшоў на падман, павёў не «па азімуту», як ён любіў казаць, бо некалі сам пасля школы хадзіў з геолагамі. Аператар, у сваю чаргу, злаваў на рэжысёра: «Ды ведаеш, колькі я «Кодака» ўгробіў? Ты ведаеш, як гэтую плёнку выбіваць у забеспячэнцаў?..»

Словам...

Дарога, кіламетраў сем ад вёскі, дзе жылі мае героі, якіх сёння мы для сябе назаўжды страцілі — не адкрываюцца яны нам перад кінакамерай пасля нязвыклых для іх слоў «драматургія», «звышзадача», «фінал» — была цяжкай да трасы. Дарога, набрынялая ад дажджоў, лужыны, вада свінцова-шэрая, з масляністымі лапікамі на паверхні. І наш аўтобус ліхаманкава трэсла, у салоне грымелі скрынкі з апаратурай, коўзаліся сюды-туды, але ўсё гэта было нішто ў параўнанні, як я ўжо

казаў, з тым, што хавалася пад маскамі на нашых тварах.

Я дакладна ведаў, што больш ніколі мне не быць на адной здымачнай пляцоўцы з гэтым рэжысёрам, чалавекам, як і я, не вельмі сталым, але геніяльным ва ўласным уяўленні пра свае творчыя магчымасці, у поглядах на жыццё, якія ў яго, як і ў кожнага кіношніка ад вахцёра да дырэктара фільма, пацвярджаюцца магічнымі і найважнейшымі словамі — «Я так бачу», быццам усе астатнія людзі нічога не разумеюць і не бачаць. Ведаў, што і аператар, нядаўні выпускнік інстытута кінематаграфіі, не паверыць больш рэжысёру, які перад здымкамі ўсё павучаў: «Ты мне гэтага здымі ў такім ракурсе, а таго ў гэтым...» Такім чынам, наша нетрывалае сяброўства (упершыню працавалі разам) рассыпалася, як разбітае шкло, — кіношнікі яшчэ горш за літаратараў не даруюць адзін аднаму ні вось такой «здрады», ні чужога поспеху.

То хай!

Хутчэй дамоў, у цёплую ўтульную кватэру, якая бы выратавальны круг ад усялякіх непрыемнасцей, ад такіх вось масак, што ў нас на тварах, ад назолы-дажджу, ад людзей, якія, калі пісаў сцэнарый і працаваў разам з імі на сенажаці, былі такімі шчырымі, па-сялянску памяркоўнымі, а тут раптам перад кінакамерай як звар'яцелі, не спраўдзілі нашых надзей.

А вось і паварот з прасёлачнай дарогі на трасу, мокрую, бліскучую стужку асфальту, раскроеную пажухлай травяной палоскай, і шэры цэментны, задраны няўклюдна ўверх брылёк аўтобуснага прыпынку, прыткнуты якраз на скрыжаванні.

На прыпынку — двое дарослых і дзіця.

Дзядзьку Міколу, нашаму шафёру, чалавеку бывалаиу, які за свой век пабачыў і такіх «геніяў», як мы, і просты люд, у такіх выпадках загадваць не трэба: прыткнуў аўтобус якраз да белай разлезлай цэментнай акантовачкі прыпынку, упусціў у салон праз расчыненыя дзверы волкі вецер, гукнуў: «Калі ў бок Мінска, дык хутчэй!»

Вядома, хутчэй! Сухенькія старыя рукі падаюць нам у салон дзяўчынку пяці-шасці год, мокрую ў сваёй балоневай куртачцы, як кураня; потым чуюцца ляскат абцасаў аб асфальт, затым у дзвярах з'яўляецца сам іх гаспадар. Ён у грубым, цяжкім чорным плашчы, у скураным капелюшы, акантоўка якога нагадвае азярцо. Бародка ў

яго клінком, беленькая. І акуляры. Кругленькія. Дужкі ля вушэй абматаны сіняй ізаляцыйнай стужкай.

За ім — жанчына. Год трыццаці. Ну акурат мадонна з мясаедаўскіх палотнаў. На такую паглядзіш і не ведаеш: зайздросціць мужу або не. Прыгажосць-то прыгажосць, але ж такая можа пры выпадку так ашчаперыць рукамі, што...

Аднак усё гэта, кавалачак натуральнага жыцця, што ўвайшло ў аўтобус, масак з нашых твараў не здымае — са сваёй работай мы не справіліся.

Месяцаца. Светачка, так жанчына, маці, называла дзяўчынку, садзіцца на пярэднім сядзенні тварыкам да нас. Сама жанчына і дзядуля — за намі, на адным сядзенні.

І вось аўтобус ірвануў так, быццам скінуў з плеч гару, толькі шыны шамацяць па мокрым асфальце ды раўчукі на шкле зусім скаселі.

А тут кіламетры праз тры моцны штуршок: спыняемся ля МАЗа, які стаіць на ўзбочыне, запэцканы з бакоў, але зямля пад ім сухая. На вялізным кузаве мокрыя кантэйнеры з надпісам: «Морфлот СССР». Ля машыны двое. Шафёр у прамасленай фуфайцы, чалавек малады, твар заклапочаны, і салдацік у параднай форме дэсантніка, таксама мокры.

— Так! Значыць, загараем, — дзядзька Мікола гупае на зямлю. — Дапамагчы?

— Дзякуй! Вы не дапаможаце. Кардан... — Шафёр нетаропка выцірае рукі анучай, глядзіць на наш паўпусты аўтобус. — У сталіцу?

— Так.

— Тады, баця, падкіньце салдаціка. Спяшаецца, меўся некуды заехаць, мо я і падвёз бы, але ж бачыце, што здарылася. А яму гадзіна — дзень. Сам нядаўна служыў, ведаю. Ён і пазвоніць у аўтабазу, адтуль прышлюць «лятучку».

— Падкіньце, падкіньце... — заўпарціўся салдацік. — Нікуды я не паеду! Адзін тут кукаваць будзеш?

— Ты, служба, па званні ніжэй за мяне. Як-ніяк я сяржант, хоць і запасу. Давай!

«Служба» і шафёр МАЗа моцна паціскаюць адзін аднаму рукі: потым салдацік бярэ з кабіны новенькі чамаданчык і нехаця ўсоўваецца ў аўтобус.

На падлогу з апраткі салдата сцякала вада, ён сумеўся, але дзядзька Мікола падахвоціў:

— Хутчэй! Сагрэйся, ускінь што на плечы. Хлопцы, пашукайце!

Дзядулька, які паспеў-такі ўжо задрамаць, калі ўвайшоў салдат, ажывіўся, апярэдзіў нас, працягнуў таму грубы брызентавы плашч:

— Атулі плечы!

Салдат плашч не ўзяў, нешта прамармытаў няпэўнае, агледзеўся, дзе б гэта сесці, засаромеўся, што на яго звяртаюць увагу.

— Дэмбель? — безуважна спытаў аператар, мабыць, каб што сказаць.

— Не. Так... Ваяж.

— Яфрэйтара Збруева? — паказаў сваю кіношную дасціпнасць рэжысёр. — Ну што ж, і гэта патрэбна.

Тым часам салдат месціўся на пярэднім сядзенні побач са Светкай, якая прыліпла тварыкам да шкла.

— Чаму? — паціснуў плячамі салдат. — Ехаў да сябравых сваякоў, але збіўся з тропу, гляджу, што нікуды не паспею, дык вырашыў заехаць да яго ў горад. Мне яшчэ служыць ды служыць.

Салдацік уладкаваўся, павярнуўся да нас, і тут мы заўважылі, што на грудзях яго побач са значкамі — медаль.

Маскі на нашых тварах прыўзняліся, ва ўсякім выпадку, я бачыў, як ажылі вочы рэжысёра, а аператар украдне нацэліў на салдаціка экспанометр.

— Чакай! — прыўзняўся з месца дзядуля. — Герой!

— Чаму? — здзівіўся салдат.

— Як чаму? Медаль жа... У майго ўнука такі ж, — паважна сказаў стары.

— Ці мала такіх.

— Мала не мала, а ўзнагарода! Ды яшчэ якая!

— А... — салдацік, яфрэйтар, яшчэ больш сумеўся, заёрзаў на месцы, відаць, пашкадаваў, што вось так неабачліва сеў ва ўсіх навідавоку. На яго здаровым загарэлым твары заміргалі вялізныя блакітныя вочы, з'явілася нейкая несур'ёзнасць.

— Подзвіг, значыць? — дапытваўся стары, можа, нават і не разумеючы, што нёмка так адразу.

— Ды не.

— А... Разумею, ваенная тайна. Так і ўнук казаў, я да яго еду.

— Тое, што тайна — дык тайна. А тут ніякай тайны, усё ясна як дзень.

— Няўжо? — не паверыў дзядуля. — І нічога не было. Медаль табе так сабе на грудзі, трымай!

— Чаму? Было.

— Ага, значыць, было... Ты мяне не ашукаеш, хоць я чалавек і не шыбка граматны. Ведаю, фінскую прайшоў, у апошнюю партызанам быў, так што... Калі не тайна, дык выкладвай!

Салдат уважліва паглядзеў на старога, на нас, усміхнуўся.

— Ды ўваж, — сказаў рэжысёр. — Цікава ж. Бачыш, у атца ўнук таксама служыў...

— О, тут здалёку трэба пачынаць.

— А ты здалёку, — сказаў я.

— Ну што ж? Я ў армію з інстытута прыйшоў...

Стары пры гэтых словах насцярожыўся, аж выцяггнуўся...

— Але, — працягваў салдат, — як і ўсе, каму падышоў тэрмін служыць, быў прызваны на абавязковую. Да арміі займаўся ў ДТСААФе і нават тры разы з парашутам скокнуў...

— Суччын кот! І наш жа з парашутам скакаў, — сказаў дзядуля, не зважаючы на нявестку ці то дачку, якая лёгенька таўханула яго ў бок, маўляў, людзі чужыя.

— З курса пайшоў служыць не адзін. Выпала мне быць з аднакурснікамі. Не скажу каб у інстытуце мы сябравалі. Звычайна пры сустрэчы: «Прывітанне —прывітанне... Як справы? Нічога...» Але ў майго таварыша неяк адразу ўсё пайшло ладам. Ён табе калі па мішэні страляць, дык за сто метраў цэліць у дзесятку, нібы ўсё жыццё паляўнічым быў. Ён табе і на кросе першы, ён табе і паласу перашкод пераадольвае гуляючы. І работы ніякай не баіцца: на кухню дык на кухню, вугаль разгружаць дык вугаль, адным словам, салдат усё павінен умець рабіць, — працягваў салдат.

— Во-во, — сказаў дзядок. — На тое ён і салдат.

— Дык вось. Гляджу я, а таварышу майму камандзіры адну падзяку, другую... А мяне на кожным кроку папраўляюць, выхоўваюць, значыць. Гэта не так раблю, тое не так. А ён як той цыркач: на турніку «сонца» круціць, гірамі, як мячыкамі, гуляе.

Пры слове «цыркач» Светка адліпла ад акна, падсунулася бліжэй да салдата, утаропілася ў яго.

— Дзядзя, ты з цырка?

— Не, што ты, салдат я, — усміхнуўся ён.

Але Светка не верыла.

— Смала, адчапіся, — сказала маці і растлумачыла: — Гэта ж мы калгасам у цырк ездзілі, дзяцей бралі. Дужа дачцэ спадабалася там.

Салдат зноў усміхнуўся дзяўчынцы, каўзануў руку ў кішэню, дастаў жменьку цукерак.

— Частуйся, Светка.

— А ты?

— Я? Ды салдаты цукерак не ядуць, еш. Іх мне далі салдаты і наказалі, каб я частаваў харошых хлопчыкаў і дзяўчынак, якія дарослых слухаюцца.

— А я слухаюся. І дзядулю, і маму, і тату. А вот Васька не слухаецца.

— Васька?

— Ага. Як збяжыць з дому, дык да вечара лахае недзе і мяне з сабой не бярэ.

— Васька — гэта брацік, блізняты яны ў мяне, — патлумачыла жанчына.

— Вунь яно што, — сказаў салдат. — Ты, Светка, скажы яму, каб слухаўся. А калі не шкада, дык і яго пачастуй цукеркамі.

— Не шкада, — уздыхнула дзяўчынка, хаваючы колькі цукерак у кішэню куртачкі.

— Так, так, так, — стары патрабаваў працягу расказу.

— Ага... Хутка мой таварыш стаў яфрэйтарам, як я цяпер, такім чынам, маім камандзірам. З таго ўсё і пачалося, сцяна між намі. Скажам, нешта загадваюць рабіць аддзяленню, дык ён усё целяе, каб цяжэйшае мне выпала, думаў, што знарок. Як жа мне было цярпець такое? З таго ж інстытута таварыш. Прыціснуў я яго: «Вось адслужым, расквітаемся...» А ён: «Дружба дружбай, а служба службай. Так заўжды будзе, пакуль сачка давіць будзеш». Вядома, я пакрыўдзіўся. Але на злосць ці яму, ці сабе пачаў старацца, гляджу — атрымліваецца. Вучэнні былі — вызначыўся я, камандзір падраздзялення нават паабяцаў: калі так пойдзе далей, дык магу і на пабыўку да бацькоў з'ездзіць. Я і пісьмо напісаў, што прыеду...

— І наш пісаў, лёгкі Савачка, — роспачна прамовіў стары, — ды чамусьці тады не пусцілі.

— Ацец, — сказаў аператар, — тут крыўдаваць не трэба. Служба ёсць служба, мала што магло быць.

— Канечне, — пацвердзіў салдат, — армія ж!.. Ад-

нойчы выклікае нас да сябе камандзір узвода, загадвае ляцець на верталёце на адзін запасны пункт, змяніць там двух дзяжурных, заступіць на іх месца, словам, сачыць, каб усё было як след, каб апаратура працавала і ўсё такое. Я ўзрадаваўся. Як-ніяк ад вока камандзіраў далей, ты там сам сабе гаспадар, ні табе адбою, ні табе пад'ёму, адпачывай ад пляца, ад заняткаў, радуйся. Там лес, грыбы, ад часці далёка і якая гадзіна хады да вёскі.

Але камандзір папярэджвае, каб пра паходы ў вёску і не думалі, дзяжурства ж. Мяркую: кажы, таварыш лейтэнант, туды верталёт раз у тыдзень прылятае, хто будзе ведаць, што ты робіш... І зажыў я на новым месцы, як чалавек цывільны, мне ніхто не загад! А таварыш раніцой узнімаецца як у казарме, апратку прасуе, каўнерык прышывае, бурчыць на мяне, але не дужа, якніяк мы ўдвух. Аднойчы я надумаў у вёску схадзіць, адпачыць, так сказаць. А ён: «Забараняю! Мы пры выкананні!..»

«Гэта я і сам ведаю, толькі ж усё працуе нармальна, што нам даручылі глядзець, верталёт будзе не хутка, я пайшоў!» На танцы нават трапіў, раніцой вярнуўся, а праз гадзіну верталёт па мяне прылятае, выклікаў таварыш.

— І ты думаеш, што ён зрабіў няправільна? — спытаў стары.

— Вядома, правільна, — пагадзіўся салдат. — Дысцыпліна і свядомасць, як разумею, тады ў мяне не дужа якія былі... Словам, «адпачываў» я колькі дзён на гаўптвахце, пабыўка мая знікла, як сонечны промнік.

— Ты яшчэ дзякуй, што мірным часам жывём, — сказаў стары. — За такое ў нас у партызанах, ведаеш, што б магло быць?

— Чаму ж не ведаю...

— Ацец, — умяшаўся рэжысёр, — час жа другі, сітуацыя не тая, навошта адразу ўжо так?

— Навошта, навошта, таму, міл-чалавек, што служыць трэба як паложана! — аж зазлаваў стары. — Мы тут, панімаеш, працуем-робім, на іх спадзяёмся, а каторы дык як узвей-вецер...

— Я з вамі поўнасцю згодзен, — працягваў салдат... — Я пра другое. Словам, крыўда ў мяне засталася, а яшчэ з дому пішуць: хваліўся, хваліўся, ды нешта не едзеш.

Салдацік змоўк, павярнуў галаву ў акно, доўга ўглядаўся ў мокры асфальт. Светка, прытуліўшыся да яго, спакойна пасапвала. Мне думалася: дарэмна ён пачаў здалёку, ды яшчэ так адкрыта пра сябе, можа, цяпер шкадуе. Вядома, калі мае ўзнагароду, дык няйнакш перамяніўся, навучылі камандзіры, таварышы. Можа, таму і такая адкрытасць. А чаго саромецца?

— Так, так, так, — падганяў яго стары. — А медаль за што?

— Медаль?.. Неўзабаве вучэнне было, панаехала вялікага начальства, словам, мы павінны былі паказаць, чаму нас навучылі ў арміі, на што здатныя мы, учарашнія школьнікі, рабочыя хлопцы, студэнты вось такія, як я. Трывога, яна заўсёды нечаканая. На досвітку трывога. Хапаем зброю, амуніцыю, парашуты. Адразу ў самалёты. Ляцім доўга, а камандзір яшчэ і яшчэ раз кожнаму задачу ставіць. Таварышу і мне — адразу ж у бой, а потым ісці да патрэбнага пункта, абясшкодзіць там радыёстанцыю «праціўніка».

— Па азімуту? — зноў паказаў сваю дасведчанасць рэжысёр.

— Так, па азімуту... З парашутам мне даводзілася многа скакаць, гэта я люблю. Перад кожным скачком пачуццё нейкае незвычайнае, невядомасць, прыгажосць, асабліва на досвітку, як сонца ўзыходзіць, здаецца, так і коціцца па самай зямлі, заўсёды хвалюешся, хоць і не паказваеш гэтага, невядомасць жа... Мне выпала скакаць першым. Шугаю ў люк... Праз нейкі час замест моцнага хлапка — лёгкі, і падзенне каменем не спыняецца... Карацей, зразумеў, што стропы заблыталіся... А ўнізе купалы таварышаў, тэхніка прызямляецца, ужо на зямлі падскоквае. Бачылі, ну хаця б як паказвалі па тэлевізары?

— Нават здымалі, — кажа аператар. — Толькі не з паветра, а з зямлі... Толькі, прабач, нешта ты, брацє блытаеш. Ты ж скокнуў першы, значыць, ляціш першы. Адкуль тады купалы таварышаў пад табой, а?

— Цікава, — усміхаецца салдат, — і сапраўды. Што ж гэта я?

— Так, так, так, — патрабуе стары. — Кажы, кажы!

— Кажу... Здалося тады, што гэта апошні міг жыцця... Але ля самай зямлі нейчыя рукі паспелі ўхапіць стропы майго парашута. Удвух на адным і прызямліліся. Адразу ў бой, праўда, рукі майго таварыша, а гэта быў

ён, стропамі крыху параніла, дык дзе ж ты будзеш у такой сітуацыі зважаць на гэта...

Тут я заўважыў, што пры слове «рукі» салдацік незнарок паглядзеў на свае рукі і інстынктыўна прыціснуў іх да сядзення. Але шнары былі... Не, нешта тут не тое. Заўважылі гэта і астатнія, стары сказаў:

— Далей што?

— Далей? Пайшлі па азімуту шукаць патрэбны пункт...

— О! — раптам узняў закарузлы палец стары. — Вось тут я цябе, браток, і спаймаў. Прызнайся, хто табе гэта расказваў?

— Як хто? — шчыра здзівіўся салдат. — Я сам удзельнічаў у гэтай сітуацыі. Чаму вы мне не верыце?

— Чаму? — стары прыўзняўся. — Ды мой унук амаль усё гэта, ну хіба што за некаторымі словамі, расказваў, што гэта было з ім і з яго таварышам. Тыдзень назад заязджаў.

— Унук?.. Даруйце, як яго прозвішча?

— Казыры мы, Пятрок Казыра.

На твары салдата здзіўленне, і раптам:

— Вось і маеш! Дык жа я з Петраком служыў, з намі гэта было! Выходзіць, гэта я да вас, дарагі дзядуля, павінен быў заехаць і перадаць, што Пятрок, можа быць, заявіцца, як здасць іспыты!

— Гэта я цяпер разумею, — сурова сказаў стары, — быў Пятрок, быў. Але ж навошта было яму мяне вадзіць за нос? Ён казаў, што спачатку дрэнна служыў, і я даваў, прызнаўся ж. Ты мне кажы, хто каго выратаваў.

Выгляд у старога быў разгублены, але разам з тым і рашучы. Жанчына бязгучна смяялася, гледзячы на яго, Светка па-ранейшаму спала, прыхіліўшыся да салдата. У гэты момант маскі з нашых твараў упалі, усміхаліся і мы: ды якая розніца хто каго? Галоўнае, што і той і другі вось у такой вельмі складанай сітуацыі, у адказны для часці момант засталіся сапраўднымі салдатамі, людзьмі без асабістых крыўд, адразу пайшлі ў бой, хай сабе і вучэбны, хай толькі такія баі і будуць... Рэжысёр стараецца ўпэўніць старога, але той не можа суняцца, бо разумее, што менавіта яго ўнук быў тым салдатам, які самавольна хадзіў у вёску, потым «адпачываў» на гаўптвахце: ён, аказваецца, прызнаўся ў гэтым. А тут салдацік расказвае... Ну добра, не захацеў дрэннае гаварыць пра таварыша...

— Эйч! Пачакай, Пятрок, пачакай! Дарма што герой! Вось прыеду ў вучылішча, якраз да яго кіруемся, пры ўсіх таварышах ды камандзірах зніму штаны ды па голым азадку папругай, папругай! Тады і верыў я, і не верыў яму, як расказваў, у нашым родзе абібокаў не было! Бацька яго служыў, дык прывёз фотакартку, дзе зняты ля сцяга палка. Цяпер працуе ў калгасе, на Дошцы гонару красуецца, з намі не паехаў, бо работы многа. Я фінскую прайшоў, у апошнюю нязломак быў і каб хоць раз каго з камандзіраў аслухаўся. А ён!..

— Не ўдасца, ацец, — сказаў рэжысёр. — Пятрок ваш чалавек ваенны, хто вам дазволіць адразу і па азадку? Герой жа ён.

— Гэта цяпер герой, — не сунімаўся стары, — а як служыць пачаў, га? Не, ты мяне, міл-чалавек, не супакойвай. Я спытаю, як гэта ён мой наказ выконваў? Што ён мне скажа.

— Супакойцеся, дзядуля. Ды не Пятрок то быў, я, я... Я пра сябе расказваў, навошта на яго зләваць? Да Петрака я і еду, армія не толькі нас сябрамі зрабіла, а братамі, разумееце?

— Ты мне не хітры! Вы мне там удвух адказ трымаць будзеце, — сказаў больш лагодна стары. Па яго маршчыністым твары каўзанулася хітраватая прыхаваная ўсмешка. Я разумеў, што як бы там ні было, а цяпер ён ганарыцца ўнукам, і, напэўна, каб не мы, староннія людзі, і не запал, то абняў бы салдата. — Ну добра, — раптам звярнуўся стары да рэжысёра, — гэта я не шыбка граматны, вы, бачу, чалавек вучоны, не просты. Скажыце вы мне, каб абодва дрэнна служылі ці хто адзін і не знайшлі гэты, як яго... азімут, так бы іх і ўзнагародзілі?

— Ды ні ў якім разе! — сказаў рэжысёр. — Вы дарэмна хвалюецеся. Калі ўжо адзін раз знайшлі яго, пайшлі па ім — у жыцці не страцяць.

— І я так думаю, — пагадзіўся стары. — Вось, скажам, Пятрок у інстытуце вучыўся, але ж, мусіць, палюбіў армію, раз цяпер хоча пераійсці ў вайсковае вучылішча. У нашым родзе афіцэраў не было, хай будзе... Толькі вось, цяпер думаю, мо не возьмуць, успомняць, што цывільным хацеў быць...

— Прымуць, — сказаў салдат. — У Петрака ад камандавання ўсякія паперы, дзе яго характарызуюць як трэба.

— Ну, Пятрок, Пятрок, — усё паўтараў стары... А мы глядзелі на яго і ўсміхаліся, толькі рэжысёр сказаў мне:

— Вось так, стары, разумееш, у чым наша бяда з нашымі героямі. Хочацца прыгожа сказаць пасля такога выпадку, шляху да іх сэрцаў не знайшлі, не па азімуту пайшлі.

— А хіба позна? — адказаў за мяне аператар.

## Зямля, словы, журавы...

*Светлай памяці маці*

...І мае гады ўжо не маладыя...

Колькі я сябе памятаю з пары ўсведамлення, што жыву на свеце, дык часта спыняюся на думцы, асабліва цяпер: ёсць, напэўна, і ў мяне хоць маленькая еднасць з зямлёй, словамі і журавамі. У чым, пакуль не магу разгадаць.

Успывае кругам памяці далёкая ранняя пагодлівая восень. Ледзь пакалыхваецца празрыстае полымя рабінавых кастроў, пазваньвае расплясканае апошнімі навальніцамі медзь лістоты. І першы нечаканы прымаразак, прабегшы ноччу па зямлі, лізнуў яе інеем, які цяпер, пры сонцы, распаўзаецца тонкім павуціннем усё далей у цень хаты, яблынь, плота, няскошанай пажухлай мяжы...

Маці выбірае бульбу. Я зграбаю адсырэлае за ноч бульбянішча, зношу яго ў кучу, падпальваю сухімі сасновымі трэскамі.

І вось ужо прэсна-гаркавы дымок віецца над зямлёй, спакваля раста̀е ў пакуль яшчэ крохкім блакіце.

Сцішаныя яблыні свецяцца буйнымі антонамі, якія час ад часу, як толькі дыхне ветрык, гулка шпокаюць на зямлю, іскрацца на яшчэ халаднаватым сонцы бурштынавыя кроплі.

Ад гэтага малюнка на душы ў мяне халаднавата-тужліва. Дзіцячым розумам прадчуваю апусценне і знямеласць зямлі, што яшчэ колькі часу назад радавала азёрамі разнатраўя і буйнай квеценню, светлай раніцай будзіла мноствам птушыных галасоў, зачароўвала на лугавой дарозе бязмежнай прасторай неба.

Цяпер — тужліва. Ажно баліць...

І раптам туга і боль знікаюць, як знікае адзінокая

хмурынка ў халаднаватым блакіце неба. Над нашай сядзібай, выплыўшы з-за лесу, з-за яго ізумруднага, прыпарушанага вохрай грэбеня — вяслуе жураўліны кліп.

Нізка-нізка...

Крылы-вёслы адліваюць змешанай з блакітам пацямнелай бронзай. І кожны павольны ўзмах нібы выбівае з паветра таемна-загадкавае кур-лы, кур-лы, кур-лы...

І паступова на сэрцы становіцца пяшчотна-радасна. Можа, таму, што я ніколі так блізка не бачыў і не чуў гэтых загадкавых птушак, а можа, наогул іх не чуў і не бачыў, але здагадаўся — яны!

Так, кур-лы, кур-лы, кур-лы... яны размаўлялі са мной у матчыных казках, перш чым адказаць на нашай людской мове на пытанне маці: «А дзе ж ваша радзіма, журавы?» — «Там, дзе чыстыя рэкі, пяшчотныя шчырыя словы і добрыя людзі, — на Белай Русі...»

І вось яны...

Маці стомлена разгінаецца ў баразёнцы, глядзіць спачатку ў неба, потым на мяне. Яе малады твар свеціцца, і блакітныя вочы азараюцца святлом, якое, здаецца мне, ліецца ў іх з невядомага і не спазнанага мною свету цудаў, кажа:

— Ляцяць, любыя... Казала я табе ўчора, сынок, паляцяць сёння...

Але, казала. І ў гэтым было невядомае мне раней разуменне ўсяго таго, што ёсць, было і будзе на зямлі, што павінна некалі прайсці і праз маю душу, калі пражыву доўга-доўга. А пакуль усё гэта мне яшчэ непадуладна, як непадуладны рабіны вятрам, сонца змроку.

— Скуль ты ведала? — зачаравана пытаю я.

— Я доўга слухала дзень, пачула шолах ветру, дыханне лесу, звон вады і ціхі шэпт іх крылаў... Пачула іх слова.

Жартуе ці пачынае новую казку?

— Чакай! — крычу я маці і бягу па вільготнай ужо зямлі за журавамі, махаю ім услед, прашу, каб скінулі па пярынцы. Мне дужа хочацца з імі ў далёкі край: што там у выраі, які ён?

— Дурненькі, — спыняе маці мяне, — рана табе ў дарогу. На іх дарозе будзе мала радасці, яны ляцяць на чужыну. І змрочна ім будзе пры чужым сонцы без сваёй зямлі і неба. Радасць іх будзе вясною...

Чаму знікла тады мая радасць?

Пазней ужо радасць найчасцей прыходзіла да мяне

вясновую жураўлінаю парою (маці заўсёды прадчувала дзень іх вяртання і клікала мяне ў пісьмах), хоць я бачыў, што кліны іх вышчарблены.

Тады, пакінуўшы ўсе свае справы, у самоце або радасці, я спяшаўся да месца свайго дзяцінства.

Прадчуванне дарогі да дому, якая павінна прынесці абнаўленне душы, ужо за некалькі дзён пачынала салодка трывожыць.

Звычайна, пакінуўшы цесны рэдакцыйны пакой, у якім заўсёды людна, я выходзіў на праспект. Праспект адразу аглушаў гулам машын, пахам гарачай гумы, цёплага асфальту, раздражняў шматлюднасцю, стракатасцю адзення, паслязімовым нязвыклым тлумам.

У такі час адно, што можа супакоіць, дык гэта скіраваць позірк на неба, дрэвы, лапікі зямлі.

Такой парою я нібы ўпершыню заўважаў, што карычневыя, нібы літыя, ліпы пачынаюць брацца ледзь улоўнай акварэльнай зелянінай, што ад лёгкага подыху ветру хвалюецца аксаміт дэкаратыўных траў, што пасля бруднага снегу, вымыты першым дажджом, здаецца блакітным асфальт і жоўта-зялёнае крохкае неба над горадам. Яно выглядае ненатуральным, чужым. Можа, таму, што я ніколі не бачыў чамусьці над горадам жураўоў.

Чужымі здаюцца і шматпавярховыя шэрыя дамы, хоць у іх вокнах гуляе сонца, хоць ты сам па сваёй ахвоце востравам свайго зямнога жыцця выбраў яго — горад, як выбрала яго большасць тых, сярод каго ідзеш па гэтай заасфальтаванай гарадской зямлі.

І мроіцца вясковае неба, і ты нібы чуеш высока-высока ў ім курлыканне жураўоў, такіх далёкіх і пакуль нябачных.

І тут, сярод мноства даўно звыклых для цябе і зразумелых слоў, раптам пачуеш адзінае, мяккае слова на мове маці...

І вось гэтыя людзі ідуць мне насустрач, абганяюць мяне, яны не зважаюць, што і я ёсць на зямлі, як недзе ёсць мая вёска, маці, журавы...

Я стараюся разгадаць, што цяпер, вясною, думае хоць адзін чалавек, які ідзе мне насустрач або побач са мной, і не магу зразумець, бо чужое жыццё, чужыя думкі непадуладны мне, як, мабыць, мае непадуладныя яму.

Можа, хто, як і я, цяпер у думках далёка адсюль, ад камяніц, гарадскога тлуму, шматаблічнасці, можа, ён,

як і я цяпер, недзе ля сваіх вытокаў, успамінае сваё маленства, сваю маці, сваіх журавоў, сваё блакітнае неба дзяцінства.

Але не спытаеш, не кінешся з роспытам, ведаеш, на цябе паглядзяць, як на дзівака, ап'янёнага вясной і ўспамінамі дзяцінства. Ты ведаеш, што горад твайго жыцця падазрона ставіцца да шчырасці, прастаты і дарослага дзівацтва і часта за ўсё гэта да жорсткасці выдае за дзікунства, як за дзікунства лічыць часам словы, сказаныя табой на мове маці.

І тады застаецца адно: як малітву шэпчучы словы мацерынага ліста, у якім яна кліча цябе дадому на прылёт жураўоў, хутчэй кінуцца на вакзал, каб выстаяць колькі ў разамлелай чарзе, перш чым у тваёй руцэ будзе білет дадому, як пропуск да аднаўлення душы і шчасця.

З таго імгнення мацней тарганецца сэрца, у яго з кожнай хвілінай няблізкай дарогі дадому будзе ўлівацца цяпло прадчування сустрэчы з блізкім, вечным і дарагім.

Да болю знаёмай дарогаю, што блакітна-шэрай стралой праразае мякка-аксамітныя палі, руні, шэра-зеленаватыя лясы, якая імкнецца да недасяжнага далягляду, я ўглядаюся наўкола, не трацячы надзею далёка-далёка ўбачыць шэрую нітачку жураўлінага кліна.

Але дарэмна, і радасць спакваля адкочваецца, як адкочваюцца ў берагі хвалі пасля паводкі, навейваючы тугу, якая будзе вярэдзіць да тае хвіліны, пакуль я не ўбачу маці і не пачую яе словы...

Вось яна стаіць ля веснічак, яна адчувала, ведала, хоць я і не паведамляў, што менавіта сёння гэтай светлай гадзінай я прыеду дадому, і твар яе маршчыністы свеціцца маладосцю. І ліпы, якія некалі я пасадзіў дубчыкамі, цяпер вышэзныя, і таямнічыя ў зеленаватым свячэнні, і крохкія галінкі вішні ля залітага сонцам акна, і шэпт маці «хутка прыляцяць журавы» — усё гэта нечым надзвычай родным і блізкім адгукнецца ў сэрцы.

Ізноў дзіва, ізноў хвалі пяшчоты накочваюцца на сэрца, туга нібы сціраецца з памяці, і яна, памяць, высвечваецца адным: дзяцінствам, словамі маці, жураўамі...

Мы стаім і амаль ні пра што не гаворым, нібы маці і без гэтага ведае ўсё тое, што было ў мяне пасля апошняй нашай сустрэчы, і я нібы таксама ведаю ўсё тое, што перажыла яна за час расстання, за час чакання мяне, вясны і жураўоў.

Мы чакаем журавоў...

І я думаю, што чалавек ніколі не можа падманупца ў сваім светлым чаканні...

І я думаю, што для гэтага і чаканне, каб чалавеку хоць ад часу пасля роспачы і тугі было светла...

І я думаю, што вечнасць жыцця ў аднаўленні...

Душы, неба і журавоў...

І вось яна...

І светла мне было заўсёды ад журaўлінай радасці, ад іх кур-лы, кур-лы, кур-лы... ля бацькавай хаты на сваёй зямлі пасля далёкіх і тужлівых маіх дарог, як казала маці, па чужыне... І ніколі не думалася, што аднойчы вось такою журaўлінаю парою мяне напаткае іх прылёт у час развітання...

Несуцешнае... Непадуладнае нікому, хто аднойчы прыйшоў у гэты свет, каб пазнаць святло, радасць, самоту і змрок...

Чорная раніца. Чужая, такая родная яшчэ ўчора зямля, і горка-даўкае, вільготна-туманкавае паветра.

Змрок... І раптам, як у далёкім дзяцінстве, над стрыхой нашай хаты — жывы шэпт крылаў. І як кропелька далёкага святла майго дзяцінства — журавы.

Маўклівы іх клін цягнуўся за знямелы шэры лес... І нешта тарганулася ў душы і на імгненне нібы адтала на сэрцы. Але толькі на імгненне, бо гэтая кропелька нечакана, як і з'явілася, знікла, растала ў шэра-чорным тумане. І толькі шэпт крылаў і апошнія словы маці з сасмяглых, збалелых і абяскроўленых вуснаў: «Заўтра прыляцяць журавы за...», і больш нічога.

І цяпер гэты шэпт крылаў, зямля і яе, мацеры, апошнія словы плывуць у маёй памяці, і праз боль і змрок прабіваецца кропелька святла, як надзея на вечнасць, пакуль ёсць мая зямля, словы мацеры і журавы...

## ЗМЕСТ

### Аповесці

Дамба . . . . . . . . . . . . 5
Напрадвесні . . . . . . . . . 69
Цяпло чужога сэрца . . . . . . 153

### Апавяданні

Пад грабеньчыкам . . . . . . 221
Азімут . . . . . . . . . . . 231
Зямля, словы, журавы . . . . 241

Саламаха У.

С 16 Цяпло чужога сэрца: Аповесці, апавяданні. — Мн.: Маст. літ., 1990. — 246 с.: іл.

ISBN 5-340-00442-2.

Соломахо В. Тепло чужого сердца: Повести, рассказы.

Які б ні быў складаны лёс, чалавек пераадольвае яго, калі ставіць перад сабою канкрэтную мэту. Пра гэта аповесць «Дамба», героі якой жывуць і працуюць у пасляваенныя гады. Пошук маладымі людзьмі свайго месца ў жыцці, першае каханне, радасці і расчараванні — праз усё гэта праходзяць героі аповесці «Напрадвесні». Аповесць «Цяпло чужога сэрца» і апавяданні прысвечаны сучаснасці. Аўтар (нар. у 1949 г. на Магілёўшчыне) даследуе праблемы экалогіі, востра ставіць пытанне аб адказнасці чалавека за свае ўчынкі.

С $\frac{4702120201-134}{М\ 302(03)-90}$ 28—90

ББК 84Бел7

*Литературно-художественное издание*

**Соломахо Владимир Петрович**

**Тепло чужого сердца**

Повести, рассказы

Минск, издательство «Мастацкая літаратура»

На белорусском языке

*Літаратурна-мастацкае выданне*

**Саламаха Уладзімір Пятровіч**

**Цяпло чужога сэрца**

Аповесці, апавяданні

Рэдактар І. І. Канановіч. Мастак Л. М. Шукалюкаў. Мастацкі рэдактар М. Я. Шкурпіт. Тэхнічны рэдактар М. Ц. Папкова. Карэктар Л. А. Дзядзюля.

ІБ № 3236

Здадзена ў набор 08..09.89. Падп. да друку 08.06.90. АТ 14914. Фармат 84×108¹/₃₂. Папера друк. № 1. Гарнітура літаратурная. Высокі друк. Ум. друк арк. 13,02. Ум. фарб.-адб. 13,23. Ул.-выд. арк. 14,09. Тыраж 7600 экз. Зак. 1687. Цана 1 р. 30 к.

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Дзяржаўнага камітэта БССР па друку. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Друкарня «Перамога». 222310, г. Маладзечна, вул. Таўлая, 11.